**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

**Кафедра сучаснай беларускай мовы**

# *ГАВОРЫМ ПА-БЕЛАРУСКУ*

**Вучэбны дапаможнік**
**па беларускай мове для замежных навучэнцаў**

*Пад рэдакцыяй Л.І.Сямешкі*

**Мінск 1999**

**Рэкамендавана да друку вучоным саветам філалагічнага факультэта**
**пратакол № 11 ад 13 мая 1999 г.**

***Аўтары*: Сямешка Л.І., Бадзевіч З.І., Белакурская Ж.Я., Ляшук В.М., Пацехіна А.А., Рамза Т.Р., Чахоўскі Г.К., Шкраба І.Р.**

***Рэцэнзенты:***

**доктар філалагічных навук**
**прафесар** **Цыхун Г.А.**

**загадчык кафедры славянскіх моў**
**Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага**
**універсітэта**
**кандыдат навук дацэнт** **Рабчынская І.А.**

**©Сямешка Л.І., ©Бадзевіч З.І., ©Белакурская Ж.Я., ©Ляшук В.М., ©Пацехіна А.А., ©Рамза Т.Р., ©Чахоўскі Г.К., ©Шкраба І.Р.**

## ЗМЕСТ


Стар.

**Прадмова** 7

**Уступны фанетыка-граматычны курс** 9

**I. Знаёмства. Сям'я. Прафесія. Беларускія імёны.** 26

**Знаёмства.** Тэматычны слоўнік.

Дыялогі.

Граматыка: *Зваротак. Род назоўнікаў.*

Граматыка: *Выражэнне спалучальных і супрацьпастаўляльных адносін.*

Тэматычны слоўнік. Дзеяслоў *быць*. Дзеяслоў *мець*.

Граматыка: *Прыналежныя прыметнікі. Родны склон адз.лік. Спалучэнне лічэбнікаў з назоўнікамі.*

**Сям'я.** Тэматычны слоўнік.

Тэкст *Алесева сям`я.*

Дыялогі.

Граматыка: *Пытальныя сказы.*

Тэкст *Цётка.*

Граматыка: *Найменне асобы паводле дзеяння. Абазначэнне супастаўляльных адносін.* Дыялогі.

Тэкст *Ефрасіння Полацкая.*

**II. Прамежкі часу. Працоўны дзень.** 51

**Адзінкі вымярэння часу.** Тэматычны слоўнік.

Граматыка*: Спалучэнне колькасных лічэбнікаў з адзінкамі вымярэння часу.*

Граматыка: *Формы вінавальнага склону назоўнікаў у абазначэннях часу.*

Граматыка: *Вінавальны склон назоўнікаў. Зваротныя дзеясловы. Спражэнне зваротных дзясловаў.*

Тэкст *Алесеў працоўны дзень.*

Граматыка: *Будучы час дзеясловаў. Утварэнне парадкавых лічэбнікаў.*

Дыялогі.

**Тэматычны слоўнік.** Дні тыдня. Поры года. Назвы месяцаў. Даты.

Дыялогі.

Граматыка: *Выражэнне часавых адносін у складаных сказах. Дзеясловы з семантыкай наяўнасці/адсутнасці ў безасабовых сказах.*

Граматыка: *Безасабовыя дзеясловы са значэннем стану прыроды.*

Тэкст *Работа ў школе.*

**III. Кватэра. Вясковая хата.**

**Кватэра.** Тэматычны слоўнік. 63

Тэкст *Кватэра Алеся Кавалёнка.*

Граматыка: *Месны склон назоўнікаў (месца) у форме адзіночнага ліку.*

Дыялогі.

**Вясковая хата.** Тэматычны слоўнік.

Тэкст *Міхасёва сядзіба.*

Граматыка: *Выражэнне прасторавых адносін у складаным сказе.*

Тэкст *Свой дварочак, як вяночак.*

Тэкст *Уваходзіны.*

Тэкст *У Мікалаеўшчыне.*

Дыялог.

Тэкст *У Вязынцы.*

**IV. Горад. Гарадскі транспарт. Мінск – сталіца Беларусі.** 86
**Арыентацыя ў горадзе.** Тэматычны слоўнік.
Тэкст *Дарога на работу.*
Граматыка: *Дзеясловы руху.*
Дыялогі.
Граматыка: *Асноўныя значэнні дзеясловаў руху з прыстаўкамі.*
Тэкст *Падземныя палацы.*
Граматыка: *Прыкладная колькасць (адлегласць).*
**Гарадскі транспарт**. Тэматычны слоўнік.
Тэкст *Беларускі музей над Пціччу.*
Дыялогі
Граматыка: *Словы катэгорыі стану з мадальным значэннем.*
Тэкст *Ліст да сябра.*
Дыялог.
Граматыка: *Выражэнне пералічальна-размеркавальных адносін.*
Тэкст *Дарогі на Беларусі.*
Граматыка: *I, II спражэнне дзеясловаў (адз. і мн. лік).*
Тэкст *Мінск сёння.*
Дыялог.
Граматыка: *Будучы час дзеясловаў. Прошлы час дзеясловаў.*
Тэкст *Старажытны Мінск.*
Граматыка: *Выказванне мэтавых адносін у складаным сказе.*
Граматыка: *Выказванне ўмовы ў складаным сказе.*
Тэкст *Палёт праз стагоддзі.*

**V. Магазіны. Пакупкі.** 114
**Прадуктовы магазін.** Тэматычны слоўнік. Дыялогі.
Тэкст *У магазіне.*
**Прамтаварны магазін.** Тэматычны слоўнік.
Тэкст *Дзень пакупак.*
Граматыка: *Загадны лад дзеяслова (імператыў).*
Дыялогі.
**Назвы колераў.** Тэматычны слоўнік.
Граматыка: *прыметнікі са значэннем колеру.*
Дыялогі.
Тэкст *Як апраналіся продкі беларусаў.*
Граматыка: *Азначальныя займеннікі сам, самы.*
Граматыка: *Указальныя займеннікі той, такі.*
Тэкст *Беларускі сувенір.*
Граматыка: *Вышэйшая ступень параўнання якасных прыметнікаў. Вышэйшая ступень параўнання прыслоўяў.Найвышэйшая ступень параўнання якасных прыметнікаў.*

**VI. Харчаванне. У рэстаране, кавярні. Беларуская нацыянальная кухня.**
**Харчаванне.** Тэматычны слоўнік. 131
Граматыка: *Творны склон назоўніка (адзіночны лік), прыметніка.*
Тэкст *Смачнага абеду, Алесь!*
Граматыка: *Творны склон займенніка (адзіночны лік).*
**У рэстаране, кавярні.** Дыялогі.
Граматыка: *Трыванне (від) дзеяслова. Утварэнне трывальных пар. Ужыванне дзеясловаў закончанага і незакончанага трывання.*

Тэкст *Беларуская нацыянальная кухня: 1) Хлеб – аснова ўсяго. 2) Бульба – другі хлеб беларуса. 3) Што ў нас на першае? 4) Цяпер пра мяса. 5) Беларускія напоі.*
Граматыка: *Выражэнне ўступальных адносін у складаным сказе. Значэнне ўступкі ў простым сказе.*
Тэкст *Народныя традыцыі застолля.*

**VII. Адпачынак. Падарожжа. Экскурсіі.** 153
**Падарожжа.** Тэматычны слоўнік.
Тэкст *Алесіна прапанова*. Дыялогі.
Граматыка: *Родны склон мн. ліку.*
Тэкст *Мінскі батанічны сад.*
Граматыка: *Месны склон мн. ліку.*
Тэкст *Мінскія аэрапорты.*
Дыялогі.
Граматыка: *Безасабовыя сказы.*
Граматыка: *Няпэўна-асабовыя сказы.*
Граматыка: *Выражэнне аб'ектных адносін.*
Тэкст *Браслаў.*
Тэкст *Нязменная памяць.*
Тэкст *Возера Свіцязь.*

**VIII. Часткі цела чалавека. Знешнасць. Рысы характару.** 169
**Тэматычны слоўнік.** Чалавек. Яго знешнасць.
**Тэматычны слоўнік.** Прыметнікі, якія выражаюць ацэнку. Рысы характару чалавека.
Дыялогі.
Тэкст К*астусь жэніцца.*
Тэкст *Неўміручая прыгажосць.*
Тэкст *Людзі зямлі беларускай.*

**IX. Мастацтва.**
**Мастацтва.** Тэматычны слоўнік. 177
Дыялогі.
**Тэатр. Кіно.** Тэматычны слоўнік.
Дыялогі.
Граматыка: *Адмоўныя займеннікі.*
**Жывапіс.** Тэматычны слоўнік.
**Літаратура.** Тэматычны слоўнік.
Граматыка: *Творны склон множнага ліку.*
Тэкст *У тэатры.*
Дыялог.
Граматыка: *Дзеепрыслоўе.*
Дыялогі.
Граматыка: *Выражэнне адмоўя словам няма.*
Тэкст *Тэатральная Беларусь.*
Тэкст *У падмурку беларускай драматургіі.*
Граматыка: *Выражэнне адносінаў спосабу дзеяння.*
Тэкст *"Дзікае паляванне караля Стаха".*
Тэкст *Як белая птушка…*

**X. Беларускія святы. Абрады.**
**Святы.** Тэматычны слоўнік. 204

Тэкст *Любімае свята.*
Граматыка: *Зборныя лічэбнікі (абодва, абедзве).*
Тэкст *Беларускія святы.*
Граматыка: *Пабочныя канструкцыі.*
Тэкст *Радаўніца.*
**Віншавальныя паштоўкі і тэлеграмы.** Тэматычны слоўнік.
Тэкст *Купалле.*
Граматыка: *Простая і ўскосная мова.*
Тэкст *Дзяды.*
Граматыка: *Беларуская пунктуацыя (табліца).*

**Слоўнік. Словарь. Vocabulary** 218

# Прадмова

Вучэбны дапаможнік "Гаворым па-беларуску" прызначаны для развіцця навыкаў і ўменняў беларускага вуснага маўлення. Ён разлічаны на пачатковы этап навучання замежных слухачоў кароткатэрміновых курсаў беларускай мовы, летніх лінгвістычных школ, а таксама тых, хто самастойна вывучае беларускую мову. Кніга можа быць выкарыстана ў якасці падручніка студэнтамі лінгвістычных ВНУ, якія спецыялізуюцца ў выкладанні беларускай мовы як замежнай.

Дапаможнік складаецца з уступнага фанетыка-граматычнага мінімуму і асноўнага лексіка-граматычнага курса, пабудаванага па тэматычным прынцыпе.

Уступны фанетыка-граматычны курс уключае асноўныя гукавыя і інтанацыйныя з'явы і найбольш важныя граматычныя структуры сучаснай беларускай мовы.

Асноўны курс структураваны лексічнымі тэмамі, якія забяспечваюць карыстанне мовай у розных камунікатыўных сітуацыях. Ён складаецца з 10 раздзелаў, прысвечаных найбольш важным аспектам культурна-бытавога жыцця: "Знаёмства. Сям'я. Прафесія", "Працоўны дзень", "Кватэра. Вясковая хата", "Горад. Гарадскі транспарт", "Магазіны. Пакупкі", "Харчаванне. Беларуская кухня", "Чалавек. Знешнасць. Рысы характару", "Падарожжа", "Мастацтва", "Святы і абрады".

Кожны раздзел уключае лексічны, граматычны матэрыял, вучэбна-тэматычныя – апісальныя і дыялагічныя – тэксты з сістэмай трэніровачных лексіка-граматычных і маўленчых практыкаванняў, а таксама тэксты этнакультуралагічнага характару, якія падаюць звесткі пра беларускую культуру і народныя традыцыі, для індывідуальнага чытання.

Усе раздзелы пачынаюцца з лексічнага комплексу, які змяшчае словы, словазлучэнні, выразы па пэўнай тэме, адабраныя з улікам іх практычнай значнасці. У пабудаваных на іх аснове дыялогах адлюстраваны тыповыя сітуацыі і паказана, якім чынам лексічны матэрыял можа быць выкарыстаны ў камунікатыўнай дзейнасці.

Граматычны матэрыял адпавядае зместу раздзелаў і змяшчае самыя неабходныя і ўжывальныя формы і канструкцыі (мадэлі, узоры, граматычныя табліцы), што складаюць аснову граматычнай сістэмы беларускай мовы.

Прапанаваная ў дапаможніку сістэма заданняў і практыкаванняў скіравана на фарміраванне і ўдасканаленне навыкаў і ўменняў прадуктыўнага маналагічнага і дыялагічнага маўлення ў сітуацыйна-абумоўленым кантэксце.

Усе каментарыі і тлумачэнні даюцца на беларускай мове. У канцы кнігі прыводзіцца беларуска-руска-англійскі слоўнік, які налічвае больш за 1000 адзінак актыўнай агульнаўжывальнай і тэматычнай лексікі.

Раздзелы падрыхтавалі:

*"Уступны фанетыка-граматычны курс"* – Т.Р.Рамза, Г.К.Чахоўскі, Л.І.Сямешка;

*"Знаёмства. Сям'я. Прафесія"* – В.М.Ляшук; Л.І.Сямешка;

*"Працоўны дзень"*– А.А.Пацехіна;

*"Горад. Гарадскі транспарт"* — Ж.Я.Белакурская, І.Р.Шкраба, Л.І.Сямешка;

*"Кватэра. Вясковая хата"* – З.І.Бадзевіч; Л.І.Сямешка

*"Магазіны. Пакупкі"* – І.Р.Шкраба;

*"Харчаванне. Беларуская кухня"*– Л.І.Сямешка;

*"Падарожжа"* – Т.Р.Рамза, Л.І.Сямешка;

*"Чалавек. Знешнасць. Рысы характару"* – А.А.Пацехіна;

*"Мастацтва"* – В.М.Ляшук, Л.І.Сямешка;

*"Святы і абрады"* – Г.К.Чахоўскі, Л.І.Сямешка;

*"Слоўнік"* – Г.К.Чахоўскі.

Аўтары выказваюць шчырую ўдзячнасць рэцэнзентам вучэбнага дапаможніка – доктару філалагічных навук прафесару Цыхуну Г.А. і загадчыку кафедры славянскіх моў

Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта кандыдату філалагічных навук дацэнту Рабчынскай І.А. за канструктыўныя заўвагі і парады.

Л.І.Сямешка

## УСТУПНЫ ФАНЕТЫКА-ГРАМАТЫЧНЫ КУРС

## Беларускі алфавіт

У беларускім алфавіце 34 літары. 10 літар ***а, е, ё, і, о, у, ы, э, ю, я*** служаць для абазначэння 6 галосных гукаў: [а], [э], [о], [і], [у], [ы]. 23 літары: ***б, в, г, д, дж, дз, ж, з, й, к, л, м, н, п, р, с, т, ў, ф, х, ц, ч, ш*** – абазначаюць 39 зычных гукаў: [б], [б′], [в], [в′], [γ], [γ′], [г], [г′], [д], [дж], [дз], [дз′], [ж], [з], [з′], [j], [к], [к′], [л], [л′], [м], [м′], [н], [н′], [п], [п′], [р], [с], [с′], [т], [ў], [ф], [ф′], [х], [х′], [ц], [ц′], [ч], [ш]. Літара ***ь*** не перадае гука.

У беларускай графіцы няма парных літар для абазначэння мяккіх гукаў. Мяккія зычныя гукі абазначаюцца на пісьме тымі самымі літарамі і напісаннем пасля іх мяккага знака (*дзень, конь, яблынька*) або напісаннем літар ***е, ё, ю, я*** (*белы, лёс, зіма, любіць, вясло*).

Зычныя злітныя гукі (афрыкаты) [дж], [дз] на пісьме абазначаюцца праз ***дж, дз***: *дажджы, дзякуй.*

Апостраф (′) – надрадковы знак, які літарай не з′яўляецца.

## ГАЛОСНЫЯ ГУКІ

У беларускай мове 6 галосных гукаў: [а], [о], [э], [у], [ы], [і].

### Націскныя галосныя

**1. Слухайце і паўтарайце:**

| | | |
|---|---|---|
| бак-бок-бук-бык | пар-пор-пэр | рак-рок-рык-рук |
| дам-дом-дум-дым | сыр-сэр | мак-мок-мук-мох-мах-мух |
| сам-сом-сум | сон-сын-сан | нос-нас |
| так-ток-тук | кот-кут-кат | лак-лук-лот |

**2. Чытайце:**

| | |
|---|---|
| вол-дол-тол-кол-хол | сок-ток-шок-бок-цок-чок |
| бук-жук-Кук-хук-тук | рык-зык-дык-бык-шык-чык |
| Жак-лак-мак-рак-так-бак | крок-крык-крук |
| дар-бар-жар-кар-мар | стук-сток-стык |

### Ненацiскныя галосныя *а, ы, у*

вада-парада-пашана-вадапады-чарапаха-самавар-дабранач
дыван-вымова-вы'бары-сырок-турысты'чны-шыпшы'на
буквар-пурпур-мухамор-субота-сурвэ'тка-цырата

### Ненацiскныя *о,э* пераходзяць у *а* (аканне)

| у | у ═ а | э' | э' ═ а |
|---|---|---|---|
| мова | стОл – стАлы' | кватэ'ра | цЭ'ны - цАна |
| размова | вОкны – Акно | крэ'сла | сЭ'рца – сАрдэ'чны |
| рамонак | дОм – дАмы' | табурэ'тка | рЭ'чка – рАчны' |

## ЗЫЧНЫЯ ГУКІ

Зычных гукаў 39: [б], [б′], [в], [в′], [γ], [γ′] (фрыкатыўныя), [г], [г′] (выбухныя), [д], [дж], [дз], [дз′], [ж], [з], [з′], [j], [к], [к′], [л], [л′], [м], [м′], [н], [н′], [п], [п′], [р], [с], [с′], [т], [ў] (нескладовы), [ф], [ф′], [х], [х′], [ц], [ц′], [ч], [ш].

### Цвёрдыя зычныя

**г**

**3. Паўтарайце:**

**[γ]** **Га-го-гу-га:** гак, гол, гон, гара, нага, галава, горла, гарт, голас, гонар, горды, горш, гума, гурба, гурт, густ, гурок, гэны, гэта

**[г]** **але:** ганак, гонта, гвалт, гузак, агрэ'ст, гвалтам

**[х]**

**Ха-хо-ху-ах-ох-ух-эх:** хата, хан, халадок, хвала, хор, хорам, хол, хованка, хук, хустка, хутка, худы', худаваты, мох, засох, дух, рух, пахмурна, чэх, подых, цэх

**г - [х]**

Бог[х], парог[х], плуг[х], рог[х], тварог[х]

**[к]**

**Ка-ко-ку-ак-ок-ук-ык:** кбва, кбрта, казб, кавэн, камбр, каласок, каршэн, кула, кошык, кум, кэра, кыш, мак, рак, сынук, сок, рок, жук, павэк, барсэк, бык, стык, нужык

**4. Слухайце і паўтарайце:**

Каму па каму, а каму і два камы. І тут гугу, і там гугу, і нічога разабраць не магу.

### Інтанацыя

| | | | |
|---|---|---|---|
| - - / _ | _ _ / - | / _ _ | / - - |
| **Гэта тата.** | **Гэта тата?** | **Хто гэта?** | **А гэта хто?** |

**5. Гаварыце паводле мадэлі: Хто гэта? — Гэта Ганна.**

Хто гэта? — Гэта ….. Ада, Ала, Тамара, Марына, Іван, Астап, Рыгор, Андрэй, Апанас.

**Гэта Ганна? — Так, гэта Ганна.**
**А гэта хто? — Гэта спадар Іван.**

**6. Паўтарайце:**

**[ж] – толькі цвёрды**

**Жа-жо-жу-жы-жэ:** жар, жарт, жаба, жонка, жорны, жур, журба, жуда, жучок, жыва, жы'та, жытны, жыжа, жэ'мчуг, жэтон.

**[ш] – толькі цвёрды**

**Ша-шо-шу-шэ-аш-ош-уш-эш-ыш:** шар, кбша, шорах, шолах, шорты, шуба, шум, мушу, шурпаты, шэпт, шэры, шэрстка, шыба, шыла, шыпы, наш, шалаш, аркуш, душ, гладыш.

**[ж] — [ш]**

Вуж[ш], лыж[ш]ка, важ[ш]ка, дарож[ш]ка, спраж[ш]ка, служ[ш]ка

**але:** слу[ж]ба, дру[ж]ба

**[ч] – толькі цвёрды**

**Ча-чо-чу-чы-чэ-ач-оч-уч-еч:** час, часовы, чаты'ры, чарапашка, чорны, чужак, чужы', чы'сты, начы'нка, чыгун, чэпчык, багач, ткач, памагач, плач, ночвы, абруч, рэч, лыч, тачка, рэчка, дачка, Галачка, сардэ'чны, рачны'.

**[дж] – толькі цвёрды**

**Джа-джо-джу-джы-джэ:** джала, хаджу, ваджу, ураджай, вэ'нджаны, гараджанка, джунглі, джыгіт, джэмпер.

**[дж] — [ч]**

[шч] [дж]
Дождж, лічба

**Інтанацыя**

| -- / - | / - - | - - / - | / - - |
|---|---|---|---|
| **Гэта пашпарт.** | **Што гэта?** | **Гэта пашпарт?** | **А гэта што?** |

**7. Гаварыце паводле мадэлі: Што гэта? — Гэта шафа.**

Што гэта? — Гэта … стол, крэ'сла, вазон, гаршчок, канапа, дыван, падлога, дах, ганак, прыступка, штора.

**8. Складзіце дыялогі паводле мадэлі:**

| | |
|---|---|
| — Гэта блакнот? | аловак – ручка |
| — Так, гэта блакнот. | кава – гарбата (чай) - сок |
| — А гэта што? | расчоска - шчотка |
| — Гэта сшытак. | шапка – хустка |

Санорных зычных гукаў 11: [в], [в′], [й], [л], [л′], [м], [м′], [н], [н′], [р], [ў]

**[р] – толькі цвёрды**

**9. Слухайце і паўтарайце:**

**Ра-ру-ры-рэ-ро:** рана, рада, раса, работа, парадак, рагаты, рух, ружа, руды, рука, русак, угору, Марына, падарунак, рыба, рыжы, рыса, стары, карыта, рэч, рэшата, рэбус, рогат, розны, розум, барока.

**Ар-ор-ур:** фарба, парта, камар, карат, гарады, цукар, морква, матор, тхор, куртка, турма, Мурка, мэр, сэрца.

**[л]**

**10. Слухайце і паўтарайце:**

**Ла-ло-лэ-лу-лы:** лак, Лада, лапа, ласка, ласы, салат, халат, лом, ложак, лук, лужына, лысы, малы, клык.

**[в]**

**Слухайце і паўтарайце:**

**11. Ва-во-ву-вэ-вы:** вага, вада, вараны, дываны, вайна, повар, водар, вольны, вочы, вопратка, вуж, вуда, вугаль, вуліца, вуха, вугор, вузел, завуч, вэлюм, вэрхал, выдых, вылет, выбар, выбары, выбух, выйгрыш, вынік, выпуск, травы, кавыль.

**[ў] – цвёрды**

ў утвараецца з **[л], [в], [у]**

| [Л] → [Ў] | | [В]→ [Ў] | |
|---|---|---|---|
| а) даЛа – даЎ | тоЎсты | б) траВа – траЎка | крыВі-кроЎ |
| чытаЛа – чытаЎ | жоЎты | грыВа- грыЎка | любоВі-любоЎ |

быЛа – быЎ доЎга здароВы – здароЎе

**[У]→ [Ў]**

в) сам **у**зяў - сама **ў**зяла

быў **у** нас – была **ў** нас

**Мяккія зычныя**

Мяккасць зычных абазначаецца **ь** (гука не ўтварае) і літарамі **е, ё, і, ю, я**

Соль, боль, конь, кіно, хітры, лёс, Люда, вёска, веды, мята.

**[й]**

**Ай-ой-ый-уй:** мой, твой, май, край, дай, бай, мый, шый, вый, буй

у пачатку слова ↘
галосных
пасля апострафа ➔ **е,ё,ю,я,і** ўтвараюць спалучэнні з **[j]**
ь
ў ↗

**[йа]:** я, яна, яно, яны, яма, ягада, ягня, янот, твая, мая, Рая, Мая, армія, станцыя, лінія, Касьян, сям'я;
**[йо]:** ён, ёрш, ёлка, ёмкі, раён, гаёк, радыё, паштальён, пад'ём;
**[йу]:** Юля, Юрась, юла, Юрмала, юннат, ЮНЕСКА, уюн, пяю, гуляю, размаўляю, чытаю, лью, б'ю, п'ю;
**[йэ]:** ежа, елка, Ерэван, Егіпет, баец, прыемна, праект, п'еса, прэм'ера;
**[йі]:** Іра, Ігар, іней, іхні, краі, у маі, вераб'і, аб'інецць.

**[л] - [л']**

**Лі-ля-лё-лю:** ліпа, літара, ліха, лішак, лімон, паліва, паліца, лямпа, ляда, лядок, лятучка, лялька, куля, Галя, Валя, Марыля, Люда, люстра, люты, салют, лёгка, кулёк, лёд, матылёк.
**Аль-оль-уль-эль-ыль:** альбом, жальба, сталь, толь, толькі, павольна, руль, моль, мадэль, стыль, Капыль, Гомель.

**12. Чытайце, выразна вымаўляючы [р] і [л], [л']:**
Лак-рак, лама-рама, маліна-Марына, вал-вар, жаль-жар, Лука-рука, шаль-шар, Валя-вара.

Вол вала павалок па валоках. У Піліпа папілі ліпавага пітва. Караблі лавіравалі, лавіравалі, ды не вы'лавіравалі. Усе бабры' дабры', адна вы'дра – ліха яе бяры'. Палолі поле, палівалі, на перапёлак палявалі. Болей знай, ды меней бай. Дай бог чутае бачыць.

**Інтанацыя**

\- - / - - - / -
**Што ты робіш? — Я чытаю.**

_ _ _ _ / - - - - - - / _
**А што робіць Алена? — Яна адпачывае.**

**13. Гаварыце паводле мадэлі: Што ты робіш? — Я пішу.**

Што ты робіш? — Я … пішу, гавару, чытаю, працую, адпачываю.
А што робіш ты? — А я …

Ты чытаеш? — Так, я чытаю.
— Не, я пішу.

Ты … пішаш, гаворыш, чытаеш, працуеш, адпачываеш.
Што робіць Віталь? Ён … піша, гаворыць, чытае, працуе, адпачывае.
Што робіць Алена? Яна … піша, гаворыць, чытае, працуе, адпачывае.

**Што ты рабіў? — Я чытаў. (Прошлы час = Imperfekt)**

Што ты рабіў? — Я … пісаў, гаварыў, чытаў, працаваў, адпачываў.
А што рабіў ты? — Я таксама …
Што рабіла Алена? — Яна … чытала, пісала, працавала, адпачывала

**[б] - [б'], [п] - [п']**

**14. Слухайце і паўтарайце:**
**Ба-бо-бу-бэ-бы-бі:** баба, баран, барабан, банка, рыбак, Люба, выбар, побач, бабы, босы, бочка, бомы, буда, будынак, бурак, выбух, бэзавы, бэлька, былы, былінка, грыбы, побыт, бінт, бітва.
**Па-по-пу-пэ-пі:** пан, пара, паша, паварот, пануры, капа, панцыр, побач, покрык, пошук, пудра, пунсовы, пэўны, напэўна, піск, шпіталь, папяросы.

**б - [п]**

**15. Вымаўляйце:** стэ[п], сы[п], зуб[п], голуб[п], дуб[п], зруб[п], дроб[п].

Паліпаў Піліп да ліпы прыліп. У пустой птушкі пустая песня. Бульба з булкай біліся, біліся, бульба булцы як дала, булка сплюшчылася. Пільшчыкі-пілавальшчыкі пілавалі піламі. Пілавалі, перапільвалі, наперапілоўваліся, пілавінне перапалавінілі.

**[в] - [в']**

**Вя-вё-ві-ве:** вялы, вялікі, вясна, сувязь, вёрткі, вёска, вілы, павідла, Віталь, Віктар, Віка, паветра, павеў, вейкі, навес.

**Ненаціскныя *['э], ['о]* пасля мяккіх зычных пераходзяць у *['а]* (аканне)**
**(графічна:** *е,ё → я***)**

**16. Чытайце:**

| | |
|---|---|
| Вёсны – вясна – веснавы' | **Е → Я** бЕлы – бЯлок |
| вёска – вясковы – вяскоўцы | бЕдны – бЯда |
| вербы – вярба – вербны | **Ё → Я** лЁн – лЯнок |
| вецер – вятры – вятрыска | мЁд – мЯдок |

**17. Гаварыце паводле мадэлі:** **Як ты пішаш? — Я пішу хутка.**

Як ты чытаеш? — Я чытаю … павольна, добра, дрэнна, па-беларуску, па-польску, па-руску, бегла.
Як піша Алена? — Яна піша … прыгожа, акуратна, старанна, добра, многа, мала, абы-як, неахвотна.

**[д], [т]**

**18. Вымаўляйце:** да-та, до-то, дэ-тэ, ды-ты, дам-там, дом-том, дома-Тома, душ-туш, двор-твор, дата-тата, дачка-тачка, плады-плыты.

Тэатр, дэсант, дэпутат, дыктант, дырэктар, дыск, тыгр, тыф, тэлевізар, тэлефон, тэлеграма, тэмпература, дырыжор, дыскатэка

**д - [т]**

**19. Чытайце:** мёд[т], лёд[т], захад[т], усход[т], горад[т], агарод[т], сад[т], ад[т]туль, ад[т]куль, алад[т]кі, клад[т]ка, салод[т]кі, буд[т]ка, перад[т], зрэд[т]ку, пад[т]казаць, ад[т]сячы, ад[т]пусціць.

Трапіў у нерат — ні ўзад, ні ўперад. Грамада за аднаго — і адзін за грамаду. Будзь здаровы на ўвесь год, як калядны лёд. Кожны гад мае свой яд.

**Д** і **Т** перад **С** = **[Ц]**

**[ц] [ц] [ц]**

**20. Вымаўляйце:** Гарадскі транспарт, суседскі дом, грамадская работа.

**21. Слухайце і паўтарайце:**

**Ца-цо-цу-цэ:** цана, цар, цаліна, цабэрак, цотны, цокаль, ланцуг, цуд, цукар, цукерка, цукарніца, цурацца, цырк, цыркач, цыбуля, цырульня, цыстэрна, цыгарэта, цымбалы, цырата, цэбар, цэмент, цэнзура, цэтлік, цэлафан.

**Ац-оц-эц:** палац, матрац, месяц, заяц, моцны, сырэц, кітаец, баец.

**[ц']**

**Ця-цё-це-цю-ці:** цяп-ляп, цяпка, цягач, цялё, цяжкі, цярпець, цягнуць, цёмна, цёпла, цётка, цень, цемень, цела, цеплыня, цешча, церушыць, цеціва, цецярук, цюль, цюльпан, цюкаць, цюбецейка, ціп-ціп-ціп, ціс, ціна, ціск, ціха, цішэць, ціхенька.

**Аць-ець-юць-іць:** зламаць, мець, браць, чытаць, кіпець, пяюць, чытаюць, вянуць, вязуць, рабіць, касіць, вазіць, варыць, смажыць.

## Дзеканне

**[д] →[дз'] перад Е,Ё,Ю,Я,І і [В']**
**перад суф. –ін, -ір, -ёр, -еец, -ейск**

**22. Слухайце і паўтарайце:**

**Дзе-дзё-дзі-дзю-дзя:** дзе, дзень, дзе-нідзе, дзед, дзеці, дзець, дзевяць, дзень у дзень, дзёгаць, дзёран, дзіця, дзік, дзіва, дзічка, студзень, глядзець, дзюна, дзюба, Дзюма, дзядзінец, дзядоўнік, дзядзечка, дзяліць, дзяржава, дзяцел, дзякуй, дзякаваць.

**Але:** дзын-дзын-дзын, дзынкаць, нэндза, пэндзаль, дзылінкаць.

сады – у садзе, гады – у годзе
два – дзве, Дзвіна – дзверы
вада – у вадзе, горад – у горадзе
іду – ідзеш, буду – будзеш

камандзір, індзеец, гвардзеец

**[дз'] - [ц']**

**23. Чытайце і паўтарайце:**

| **[ц']** | **[ц']** | **[ц']** | **[дз']** |
|---|---|---|---|
| лебедзь | медзь | рэдзька | малацьба |
| непагадзь | моладзь | Федзька | барацьба |
| мядзведзь | ледзь | дзядзька | барацьбіт |

Федзька з дзя'дзькам працаваў на малацьбе. Мядзведзь ледзь ходзіць.

Дзядзька дзякаваў мядзведзю —
дзядзьку выхадзілі ледзьве.

Дзядзьку дзякаваў мядзведзь —
дзядзька дыхае ледзь-ледзь.

**24. Чытайце, выразна вымаўляючы: [ц'] і [дз']:**
Ціна – Дзіна, ціск – Дзісна, церці – дзерці, цень – дзень, Цімка – Дзімка, цікаць – дзікі, цінькаць – дзінькаць.

**25. Гаворыце паводле мадэлі: Дзе тут тэатр? — Вось ён.**
Дзе тут кінатэатр (цырк, цырульня, гастраном, аптэка, ГУМ, банк, школа, універсітэт, інстытут, акадэмія)?
Вось ён. (Вось яна.)
Ён тут (побач, недалёка, там, блізка, злева, справа, перад вамі).

**26. Гаворыце паводле мадэлі: Ці гэта вуліца Багдановіча?**
**— Так, гэта яна.**
**— Не, гэта вуліца Кузьмы Чорнага.**

**Выкарыстайце пары слоў:** універмаг – універсам, бар – кавярня, рэстаран – кафэ, бібліятэка – музей.

**Цеканне**
**[т] →[ц'] перад Е, Ё, Ю, Я, І і [В']**
**перад суф. -ін, -ёр, -ік**

**27. Чытайце:**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| хаТа – хаЦе | выТок – выЦякаць | Цвік | лаЦінскі | кусТ -- кусЦік |
| леТа – аб леЦе | мяТу – мяЦеш | буЦвець | карЦіна, | білеТ – білеЦік |
| куТ – у куЦе | пляТу – пляЦеш | паЦвельваць | манЦёр | |
| furoТа – на рабоЦе | | | білеЦёр | |

**[с] - [с']**

**28. Слухайце і паўтарайце:**
**Са-со-су-сы-сэ-ас-ос-ус-ыс-ёс-іс-ес:** сам, сані, каса, салома, сон, сок, сом, сонца, сотня, сохнуць, галасок, валасок, сук, суп, суха, субота, посуд, сын, сыр, сыты, сыпаць, сыграць, сыходзіць, сэнс, сэрца, квас, клас, голас, рос, рыс, авёс, лес, ліс.
**Сі-се-сё-сю-ся:** сіні, сіла, сірата, сінічка, сіроп, бусел, сезон, секунда, секчы, селядзец, сейбіт, семя, сена, серада, сёмы, сёлета, сёння, Сёмуха, сюды, сюрпрыз, паўсюдна, сястра, сябар, сяляне, сякера, сядло, сяржант, сярэдні, сяўба.
**Ась-ось-усь-ысь, ісь-есь-ёсь-юсь-ясь:** карась, Стась, вось, лось, гусь, рысь, узяліся, ёсць, баюся, Ясь, Адась.

**29. Чытайце:** Усякай справе свой час. Касі, каса, пакуль раса, раса далоў, і мы дамоў. У савы савяня, у лася ласяня. Пісаў пісака, пісаў, перапісваў, ды так і не напісаў.

**30. Параўнайце:** сачы-сячы, садзіць-сядзіць, самі-сямі, сані-сені, сады-сядзі.

**[з] - [з']**

**31. Слухайце і паўтарайце:**
**За-зо-зу-зы-зэ-аз-оз-уз-ыз-эз:** завулак, зала, закон, замнога, завадзь, занава, загар, завоблачны, золата, золак, золкі, зорка, зона, зубр, зусім, зух, зухаваты, зычлівы, зыначыць,

зычыць, зэдлік, зэканоміць, азбука, азон, азарт, аздобіць, марозна, розны, гарбузік, абуза, капрызны, азызлы, чэзнуць.
**Зі-зе-зё-зю-зя:** зіма, Зіна, зімовы, зігзаг, Казімір, фізіка, зеніт, зеляніна, зерне, зенітка, зефір, газета, рэзерв, зёлкі, пазёмка, зямля, зязюля, заяць.

**[з] - [с]**

**32. Чытайце:** воз[с], сказ[с], туз[с], бліз[с]ка, каз[с]ка, раз[с]

| **[с]** | **[с]** | **[с]** | **[с]** |
|---|---|---|---|
| з кнігі | без сына | праз плот | цераз хату |
| з поля | без солі, | праз калена | цераз кірмаш |
| з холаду | без цукру | праз цябе | цераз плошчу |
| з цырульні | без цыбулі | праз хлопцаў | цераз схіл |

Сем седакоў не воз, абы конь вёз[с]. Бліз[с]ка то бліз[с]ка, ды каб[п] не было сліз[с]ка.

| **[з]** | **[з]** | **[з]** | **[з]** |
|---|---|---|---|
| з ракі | без брата | праз балота | цераз горад |
| з бульбы | без воза | праз жыта | цераз луг |
| з вады | без задору | праз Маню | цераз навалу |
| з лазы | без мэты | праз гараж | цераз радок |

**[с'] перад губнымі [п'], [в'], [м']**
**зубнымі [л'], [н'], [с'], [ц']**
**сярэднеязычным [j]**

**33. Слухайце і выразна вымаўляйце:**

Смех, смелы, смешна, смірна, смятана, смерць, свежы, святло, свет, свечка, сведка, Свір, Свіцязь, свята, свядомы, спевы, спелы, спіна, спісаць, спякота, спячы, спілаваць, спёка.

Сляды, слёзы, сліва, слімак, слізгота, паслядоўнасць, снег, снежань, сніцца, цісне, пракісне, снягір, сцежка, сцяна, сцерагчы, сціснуць, сцюжа, сцюдзёна, сцябліна, сесці.

Канферансье, манпансье.

**[з'] перад губнымі [б'], [в'], [м']**
**зубнымі [л'], [н'], [з'], [дз']**
**сярэднеязычным [j]**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| збіць | змяя | звяно | здзек | злева | знесці |
| збегчы | змяніць | звяры | здзівіць | злёт | знізіць |
| зберагчы | зменшыць | звязаць | здзерці | злічыць | знішчыць |
| збялець | змятаць | звярнуць | раздзел | зляпіць | зняважыць |
| | | ззяць | з'езд | | |
| | | ззянне | раз'езд | | |
| | | | з'імшыць | | |
| | | | з'ява | | |

**[з'] - [с']**

| **[з']** | **[з']** | **[с']** | **[с']** | **[с']** |
|---|---|---|---|---|
| з Мінска | без ветру | з пекла | з цемры | без цябе |
| з берага | без ліпы | з перцам | з цяпла | без Цімкі |
| з зімы | без Дзімы | з пенкай | з цягніка | без ціны |
| з Дзвіны | без няні | з пяску | з сілай | без ціску |
| з яблыкаў | без Юлькі | | | |

**Але:** толькі **[з], [с]** перад [г'], [к'], [х']:

| | | | |
|---|---|---|---|
| скіба | скеміць | згінаць | схема |
| скінуць | скептык | згібець | схіл |
| скіпідар | скептыцызм | згінуць | схіліць |
| сківаца | скетынг | згіб | схімічыць |

**34. Чытайце:**

З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, —
Ты выткана, дзіўная родная мова…

М.Танк "Родная мова"

**35. Гаварыце паводле мадэлі: Як цябе завуць? — Мяне завуць Васіль.**

Як Вас завуць? — Мяне завуць …
Як яго завуць? — Яго завуць … Алесь, Кастусь, Міхась, Пятрусь.
Як яе завуць? — Яе завуць … Зося, Алеся, Васіліса, Зінаіда.

**36. Слухайце і вымаўляйце: С перад Ш = [Ш]**

| **[ш]** | **[ш]** | **[ш]** |
|---|---|---|
| сшыць | бясшумны | расшываць |
| сшыты | бясшкодны | расштурхаць |
| сшытак | бясшчасны | расшпіліць |

**СЧ = [ШЧ]**

| **[шч]** | **[шч]** | **[шч]** |
|---|---|---|
| расчоска | | счапіць |
| расчысціць | бесчалавечны | счарсцвець |
| расчуліць | | счысціць |

**З перад Ш і Ч = [Ш]**

| **[ш]** | **[ш]** | **[ш]** | **[ш]** |
|---|---|---|---|
| без чалавека | з чайнікам | з шакаладкай | праз шкло |
| без чоўна | з часнаком | з шоўку | праз чыгунку |
| без шашак | з Чэрвеня | з шумам | праз чужых |
| без шва | з чытальні | з шыкам | праз шалік |

**З перад Ж і ДЖ = [Ж]**

| **[ж]** | **[ж]** | **[ж]** | **[ж]** |
|---|---|---|---|
| без жартаў | з жалобай | праз журботу | праз джунглі |
| без жалеза | з жыхарамі | праз жэрдку | праз жывот |
| без жэтона | з жахам | праз жонку | праз жыллё |

**ДЦ = [ЦЦ] або [Ц'Ц']**

**37. Чытайце:**

| [ц'ц'] | [ц'ц'] | [цц] |
|---|---|---|
| адценне | падціснуць | адцурацца |
| адціраць | падцягнуць | адцэджваць |
| адціскаць | падцерці | адцадзіць |

**ДЦ, ТЦ, ЧЦ = [ЦЦ]**

**[цц] [цц] [цц] [цц] [цц]**
У лодцы, у вопратцы, на печцы, селядцы, людцы.

**ДЧ, ТЧ = [ЧЧ]**

**[чч] [чч] [чч] [чч] [чч] [чч]**
Навагрудчына, пад чаромхай, ад чаго, лётчык, разведчык, выкладчык.

**38. Гаворыце паводле мадэлі: Адкуль вы прыехалі?**
**Я прыехаў з Германіі.**

Адкуль Вы прыехалі? — Я прыехала … з Беларусі, з Польшчы, з Балгарыі, з Аўстрыі, з Расіі, з Грэцыі.
А адкуль прыехала яна? — Яна таксама прыехала з Германіі.

**Падаўжэнне зычных**

**[н'], [л'], [с'], [з'], [дз'], [ш], [ч], [ж], [ц'] у інтэрвакальным становішчы падаўжаюцца.**

**39. Чытайце:**
**[Н'Н']**Асенні, вясенні, насенне, карэнне, паляванне, здарэнне, варэнне;
[**Л'Л'**]Вяселле, зелле, галлё, водгулле, Ілля, Купалле, ралля;
**[С'С']**Калоссе, кассё, Палессе, паднябессе, рыссю, воссю, узлессе;
**[З'З']**Палоззе, маззю, рыззё, граззю;
**[ДЗ'ДЗ']**Суддзя, асяроддзе, стагоддзе, бязлюддзе, моладдзю, мелкаводдзе, пападдзя;
**[ШШ]**Узвышша, застрэшша, зацішша, удушша, мышшу, цішшу;
**[ЧЧ]**Парэчча, ноччу, Случчына, ламачча, аблічча, сучча, запечча, уваччу;
**[ЖЖ]**Збожжа, падарожжа, раздарожжа, бязмежжа, сумежжа, ружжо, замужжа;
**[Ц'Ц']**Жыццё, Забалоцце, вецце, смакоцце, чуццё, куццял, смецце, сваццял.

Ілля наробіць гнілля. Жыццё як мёду піццё. Блуканне на цэлае ранне. Вось калі здарэнне: ні табакі, ні карэння. Далі зелля ад пахмелля.

**40. Гаварыце паводле мадэляў:**

| | |
|---|---|
| **— Прывітанне, Алесь!** | **— Дзень добры.** |
| **— Прывітанне, Аленка!** | **— Добры дзень.** |
| **— Што чуваць у цябе?** | **— Як маешся?** |
| **— Дзякуй, усё нармальна.** | **— Дзякуй, добра. а ты?** |
| | **— Дзякуй, таксама няблага.** |

**Прыстаўныя галосныя – *а, і***

Вымаўляюцца і пішуцца перад збегам зычных, які пачынаецца з [л], [м], [р], [ў], [в].

| | | | |
|---|---|---|---|
| **і***льдз*іна | **а***ржа*ны | | |
| **і***мх*і | **а***мш*эць | **але:** першая **льдзіна** | над **ільдзінай** |
| **і***рж*а | **а***ўт*орак | зялёны**я мх**і | **з і**мхоў |
| **і***льв*ы | **і**<u>*ст*</u>ужка [!] | глядзець н**а** **львоў** | выступаць **з і**львамі |
| **і***рдз*ець | **і**<u>*гр*</u>уша [!] | | |

**Прыстаўныя зычныя –** ***в, г***

**В** вымаўляецца і пішацца перад **о** і **у** (карэнным):

**в***о*сень — **в***у*гал
**в***о*блака — **в***у*чань
**в***о*бласць — на**в***у*ка
**але:** абласны, асенні — **о**рдэн, **О**рша, **о**пера, **У**краіна

**Г** толькі ў словах:
**г**эты
**г**эй
**Г**анна
**г**армата

**! Вока, вачэй, вачаняты; востры, вастрыць; навокал, ваколіца.**

***ГРАМАТЫКА***

## НАЗОЎНІК
### Сістэма склонаў у беларускай мове

| | |
|---|---|
| **Назоўны склон** | ***хто? што?*** |
| **Родны склон** | ***каго? чаго?*** |
| **Давальны склон** | ***каму? чаму?*** |
| **Вінавальны склон** | ***каго? што?*** |
| **Творны склон** | ***кім? чым?*** |
| **Месны склон** | ***па кім? па чым?*** |

**1. Адзіночны лік назоўнікаў (назоўны склон)**

а) (ЁН) мужчынскі род

<table>
<tr><td>дом<br>сын<br>вакзал</td><td rowspan="2">ш</td><td rowspan="4">аснова на цвёрды ці мяккі зычны + о<br>-а / -я</td></tr>
<tr><td>край<br>дзень<br>конь</td></tr>
<tr><td>бацьк-<br>тат-</td><td>а</td></tr>
<tr><td>дзядул-</td><td>я</td></tr>
</table>

б) (ЯНА) жаночы род

<table>
<tr><td>вад<br>сястр</td><td>-а</td><td rowspan="4">аснова на мяккі ці цвёрды зычны +<br>-а / -я</td></tr>
<tr><td>зямл-</td><td>я</td></tr>
<tr><td>соль<br>моладзь</td><td rowspan="2">ш</td></tr>
<tr><td>мыш<br>ноч<br>кроў</td></tr>
</table>

в) (ЯНО) ніякі род

<table>
<tr><td>сял-</td><td>о</td><td rowspan="4">аснова на мяккі ці цвёрды зычны +<br>-о/ -ё (пад націскам)<br>-а /-е (не пад націскам)</td></tr>
<tr><td>галл-</td><td>ё</td></tr>
<tr><td>мор-</td><td>а</td></tr>
<tr><td>пол-</td><td>е</td></tr>
</table>

**2. Множны лік назоўнікаў (назоўны склон)**

<table>
<tr><td>дам-<br>сын-</td><td rowspan="3">ы</td><td rowspan="3">аснова на цвёрды зычны</td></tr>
<tr><td>вод-<br>сёстр-<br>мыш-</td></tr>
<tr><td>сёл-<br>мор-</td></tr>
<tr><td>крај-<br>кон-<br>бацьк-</td><td rowspan="2">і</td><td rowspan="2">аснова на мяккі зычны і г, к, х</td></tr>
<tr><td>земл-<br>пал-</td></tr>
</table>

**41. Пастаўце пытанні да назоўнікаў паводле ўзору. Утварыце множны лік.**

**Узор:** ***Гэта студэнт. Хто гэта? Гэта студэнты.***

***Гэта часопіс. Што гэта? Гэта часопісы.***

| | |
|---|---|
| Гэта дацэнт. | Гэта аўтобус. |
| Гэта выкладчык. | Гэта машына. |
| Гэта газета. | Гэта дрэва. |
| Гэта кніга. | Гэта сабака. |
| Гэта падручнік. | Гэта кветка. |
| Гэта беларус. | Гэта яблык. |
| Гэта дзяўчынка. | Гэта апельсін. |
| Гэта хлопчык. | Гэта чалавек. |
| Гэта яблык. | Гэта пасажыр. |

| **суб'ект** | **прэдыкат** |
|---|---|
| Студэнт<br>Машына<br>Тэлефон<br>Гэта<br>Падручнік<br>Яна | піша.<br>імчыць.<br>звоніць.<br>падручнік.<br>новы.<br>выкладчык. |

## ПРЫМЕТНІК

**1. Адзіночны лік прыметнікаў (назоўны склон).**

а) мужчынскі род

| | | |
|---|---|---|
| бел-<br>чыст-<br>нов- | ы | аснова на цвёрды зычны |
| вялік-<br>доўг-<br>сух-<br>сін- | і | аснова на мяккі зычны і г, к, х |

б) жаночы род

| | | |
|---|---|---|
| бел-<br>чыста-<br>нов-<br>вялік-<br>сух- | ая | аснова на цвёрды зычны |
| сін- | яя | аснова на мяккі зычны |

в) ніякі род

| | | |
|---|---|---|
| бел-<br>чыст-<br>нов-<br>сух- | ае<br><br><br>ое | аснова на цвёрды зычны |
| сін- | яе | аснова на мяккі зычны |

| | | |
|---|---|---|
| ЯкІ | брат<br>дом | ? |
| ЯкАЯ | сястра<br>ручка | |
| ЯкОЕ | дзіця<br>крэсла | |

———————

| | | |
|---|---|---|
| Брат<br>Дом | прыгожЫ | . |
| Сястра<br>Ручка | прыгожАЯ | |
| Дзіця<br>Крэсла | прыгожАЕ | |

| | | |
|---|---|---|
| ЯкІ<br>ЯкАЯ<br>ЯкОЕ | прыгожы<br>прыгожая<br>прыгожае | дом!<br>дзяўчына!<br>калье! |

**2. Множны лік прыметнікаў (назоўны склон)**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| добр-<br>вялік- | ы<br>і | | добр-<br>вялік- | ыя<br>ія |
| добр-<br>сін- | ая<br>яя | →<br>← | добр-<br>сін- | ыя<br>ія |
| добр-<br>сін- | ае<br>яе | | добр-<br>сін- | ыя<br>ія |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ЯкІЯ | дамы<br>кнігі<br>крэслы<br>дзеці<br>сёстры | ? | →<br>← | Дамы<br>Кнігі<br>Крэслы<br>Дзеці<br>Сёстры | новЫЯ<br>ціхІЯ | .<br>. |

**42. Пастаўце пытанні да прыметнікаў паводле ўзору і адкажыце на іх.**

**Узор:** ***<u>белы</u>*** ***1. шалік 2. сукенка 3. паліто 4. парасоны***

***Які гэта шалік? — Гэта белы шалік.***
***Якая гэта сукенка? — Гэта белая сукенка.***
***Якое гэта паліто? — Гэта белае паліто.***
***Якія гэта парасоны? — Гэта белыя парасоны.***

*чорны*
1. касцюм 2. кава 3. мора 4. штаны
*малады*
1.чалавек 2. жанчына 3. пакаленне 4. людзі
*стары*
1.куст 2. ліпа 3. дрэва 4. каштаны
*першы*
1.клас 2. сустрэча 3. уражанне 4. радасці
*апошні*
1. тыдзень 2. субота 3. лета 4. месяцы
*хатні*
1. кот 2. расліна 3. заданне 4. жывёлы
*высокі*
1. дом 2. столь 3. акно 4. сцены
*нізкі*

1. стол 2. парта 3. крэсла 4. дзверы

*добры*

1. вечар 2. раніца 3. надвор'е 4. дні

**43. Спалучыце прыметнікі з назоўнікамі паводле ўзору:**

***(сіні) Гэта ___________ сшытак. — Гэта сіні сшытак.***

1. (вялікі) Гэта ________ акно.
2. (маленькі) Гэта ________хлопчык.
3. (беларускі) Гэта _________сімволіка.
4. (чысты) Гэта __________паветра.
5. (брудны) Гэта ________возера.
6. (галоўны) Гэта __________корпус.
7. (танны) Гэта ___________гальштук.
8. (дарагі) Гэта __________аўтамабілі.
9. (свежы) Гэта __________газета.
10. (чэрствы) Гэта __________хлеб.
11. (шырокі) Гэта ___________праспект.
12. (вузкі) Гэта __________вуліца.
13. (ветлівы) Гэта __________дзеці.

## ЗАЙМЕННІКІ

### Асабовыя і прыналежныя займеннікі

**1. Адзіночны лік прыналежных займеннікаў (назоўны склон)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Чый | гэта | аловак | ? |
| Чыя | | кніга | |
| Чыё | | партма-не | |
| Чые | | сшыткі | |

| **я** | **ты** | **ён** | **яна** | |
|---|---|---|---|---|
| мой | твой | яго | яе | муж. р. |
| мая | твая | | | жан.р. |
| маё | тваё | | | ніяк.р. |
| мае | твае | | | мн.л. |

| **мы** | **вы** | **яны** | |
|---|---|---|---|
| наш | ваш | іх | муж.р. |
| наша | ваша | | жан.р. |
| наша | ваша | | ніяк. р. |
| нашы | вашы | | мн.л. |

**44. Пастаўце пытанні да назоўнікаў паводле ўзору і адкажыце на іх:**

***1. бацька 2. сястра 3. браты (Я)***

***Чый гэта бацька? — Гэта мой бацька.***

***Чыя гэта сястра? — Гэта мая сястра.***

***Чые гэта браты? — Гэта мае браты.***

1. сябар; 2. сяброўка; 3. сябры (ты); 1. ліст; 2. папера; 3. канверт;4. паштоўка (мы); 1. спадніца; 2. рубашка; 3. шкарпэткі (вы); 1. пінжак; 2. куртка; 3. плашч (ён); 1. кава; 2. сок; 3. суп (яна); 1. піва; 2.ліманад; 3. кефір; 4. малако (мы).

**45. Адкажыце на пытанні паводле ўзору:**

**Узор: *У яе ёсць слоўнік. Чый гэта слоўнік? — Гэта яе слоўнік.***

1. У вас ёсць грошы. Чые гэта грошы?
2. У яго ёсць сябар. Чый гэта сябар?
3. У яе ёсць брат. Чый гэта брат?
4. У іх ёсць сябры. Чые гэта сябры?
5. У нас ёсць машына. Чыя гэта машына?
6. У мяне ёсць паліто. Чыё гэта паліто?

7. У цябе ёсць гадзіннік. Чый гэта гадзіннік?
8. У вас ёсць шахматы. Чые гэта шахматы?
9. У яе ёсць тэлефон. Чый гэта тэлефон?
10. У яго ёсць бра. Чыё гэта бра?
11. У іх ёсць кватэра. Чыя гэта кватэра?

**46. Дапоўніце сказы паводле ўзору:**

**Узор:** ***Тут працуе мой брат.***

***Гэта ___ пакой. Гэта ____пісьмовы стол. — Гэта яго пакой. Гэта яго пісьмовы стол.***

а) Тут жыве мая сястра.
1. Гэта _____ касцюм. 2. Гэта _______сумка. 3. Гэта _______рэчы.
б) Тут жыве мой калега.
1. Гэта _______дом. 2. Гэта _______пакой. 3. Гэта _______кнігі. 4. Гэта _________куртка. 5. Гэта _______шапка. 6. Гэта _______боты.
в) Тут жывуць мае сябры.
1. Гэта ______кватэра. 2. Гэта ______вокны. 3. Гэта _______крэсла. 4. Гэта _______посуд. 5.Гэта_______кава. 6. Гэта _______магнітафон.

## ДЗЕЯСЛОЎ
### Цяперашні час

### I спражэнне (на –аць / -яць)

**пісаць с/ш**

| | | | |
|---|---|---|---|
| піш | **у** | 1 | адз. лік |
| піш | **аш** | 2 | |
| піш | **а** | 3 | |
| піш | **ам** | 1 | мн. лік |
| піш | **аце** | 2 | |
| піш | **уць** | 3 | |

**чытаць**

| | | | |
|---|---|---|---|
| чыта | **ю** | 1 | адз. лік |
| чыта | **еш** | 2 | |
| чыта | **е** | 3 | |
| чыта | **ем** | 1 | мн. лік |
| чыта | **еце** | 2 | |
| чыта | **юць** | 3 | |

### II спражэнне (на –ыць / -іць)

**гаварыць**

| | | | |
|---|---|---|---|
| гавар | **у** | 1 | адз. лік |
| гавор | **ыш** | 2 | |
| гавор | **ыць** | 3 | |
| гавор | **ым** | 1 | мн. лік |
| гавор | **ыце** | 2 | |
| гавор | **аць** | 3 | |

**званіць**

| | | | |
|---|---|---|---|
| зван | **ю** | 1 | адз. лік |
| звон | **іш** | 2 | |
| звон | **іць** | 3 | |
| звон | **ім** | 1 | мн. лік |
| звон | **іце** | 2 | |
| звон | **яць** | 3 | |

### Прошлы час

| | | | |
|---|---|---|---|
| піса<br>чыта | **ў**<br>**ў** | муж. род | адз. лік |
| піса<br>чыта | **ла**<br>**ла** | жан. род<br>ніякі род | |
| піса<br>чыта | **лі**<br>**лі** | | мн. лік |

**Будучы час**

**(складаны)** **(просты)**

| | | |
|---|---|---|
| буд**у** пісаць<br>будз**еш** пісаць<br>будз**е** пісаць | 1<br>2<br>3 | адз. лік |
| будз**ем** пісаць<br>будз**еце** пісаць<br>буд**уць** пісаць | 1<br>2<br>3 | мн. лік |

| | | | |
|---|---|---|---|
| прачыта<br>прачыта<br>прачыта | **ю**<br>**еш**<br>**е** | 1<br>2<br>3 | адз. лік |
| прачыта<br>прачыта<br>прачыта | **ем**<br>**еце**<br>**юць** | 1<br>2<br>3 | мн. лік |

**Трыванне**

| **незакончанае** | **закончанае** |
|---|---|
| пісаць | **на**пісаць |
| чытаць | **пра**чытаць |
| званіць | **па**званіць |
| есці | з'есці |

**47. Пастаўце дзеясловы ў патрэбнай форме.**

1. Я (адпачываць). 2. Пятро (працаваць). 3. Студэнты (гаварыць). 4. Дзеці (гуляць). 5. Міхась (адпачываць). 6. Ты (працаваць)? 7. Твая маці (працаваць)? 8. Вы (працаваць). 9. Яна (адпачываць).

## ПРЫСЛОЎЕ

| **Прыметнік** | | → | **Прыслоўе** | |
|---|---|---|---|---|
| цёпл<br>халодн | **ы** | | цёпл-<br>халодн- | **а** |
| вузк<br>шырок<br>хутк | **і** | | вузк-<br>шырок-<br>хутк- | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Як | піша | Алена? | → | Алена | піша | хуткА<br>прыгожА<br>стараннА |

**48. Утварыце прыслоўі ад прыметнікаў паводле ўзору:**

**Узор: С*тудэнт чытае (хуткі). — Студэнт чытае хутка.***

Алесь (часты) тэлефануе дадому.
Выкладчык (павольны) чытае.
Студэнтка (дробны) піша.

Брат (рэдкі) тэлефануе бацькам.
Маці (старанны) прыбірае.
Алена (прыгожы) малюе.

# І. ЗНАЁМСТВА. СЯМ’Я. ПРАФЕСІЯ. БЕЛАРУСКІЯ ІМЁНЫ

## Знаёмства

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | з дзяўчынай |
| | | | | з юнаком |
| знаёмы — | незнаёмы | знаёміцца | з кім? | з чалавекам |
| знаёмая — | незнаёмая | пазнаёміцца | | з асобай |
| | | | | з мужчынам |
| | | | | з жанчынай |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | знаёмы чаавек | | людзі |
| (не) | знаёмая асоба | (не) знаёмыя | асобы |
| | знаёмае імя, прозвішча | | імёны, прозвішчы |

**49. Дапоўніце сказы словам *чалавек* у адпаведнай граматычнай форме.**
**Узор: *Я знаёмы з гэтым чалавекам.***

1. Я не знаёмы з гэтым ...
2. Я хачу пазнаёміцца з гэтым...

| | |
|---|---|
| | з Беларусі |
| Прыехаць адкуль? | з Расіі |
| | з Украіны |

| | | |
|---|---|---|
| | да чалавека | па імені (імю) |
| | да людзей | |
| Звяртацца да каго? | да хлопца | па прозвішчы |
| (чаго?) | да дзяўчыны | |
| | да жанчыны | |
| | да мужчыны | |
| | **як?** | |
| Зваць каго? | чалавека | |
| (што?) | людзей | |
| | хлопца | |
| | дзяўчыну | |
| | жанчыну | |
| | мужчыну | |

| **Імя** | **Імя па бацьку** | **Прозвішча** |
|---|---|---|
| Алесь | (Віталевіч) | Кавалёнак |
| Алеся | (Віталеўна) | Кавалёнак |

***ДЫЯЛОГІ***

**50. Прачытайце дыялогі.**

— Прабачце, якое Ваша імя?
— Маё імя Алена.
— Якое Ваша імя па бацьку?
— Сцяпанаўна.
— А якое ў Вас прозвішча?
— Маё прозвішча Леванович.

— Скажыце, калі ласка, ці ёсць ў Вас імя па бацьку?
— Не. У нас называюць людзей толькі па імені і прозвішчу.

— Прабачце, вы не Віталь Красуцкі?
— Так. Я Віталь Красуцкі. А вы хто?
— Я Міхась Дубровіч.
— Вельмі прыемна.

— Выбачайце, Вы Алена Сцяпук?
— Не. Я не Алена Сцяпук. А Вы, можа, Кацярына Ваўчок?
— Так. Я Кацярына Ваўчок.

— Хто Вы?// Як Вас завуць?
— Я Алеся Асіпенка. А як Ваша імя?
— Антось.
— А прозвішча?
— Зарэцкі.

| **мужчынскі род** | **жаночы род** |
|---|---|
| ***ён*** | ***яна*** |
| Міхал | Міхаліна |
| Васіль | Васіліна |
| Алесь | Алеся |
| Янка | Яніна |
| Уладзіслаў | Уладзіслава |

**! Уладзіслаў — Уладзіслав-а**

**51. Прачытайце. Вызначыце род назоўнікаў.**

Валянціна (яна) — ... род
Валянцін (ён) — ...род
Настасся (яна) — ... род
Пятрусь (ён) — ... род
Антось (ён) — ... род
Марыля (яна) — ... род
Янка (ён) — ... род

Янук (ён) — ... род

**52. Ператварыце мужчынскія імёны ў жаночыя.**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. Алесь<br>Мар'ян<br>Валянцін | + а(я) | 2. Васіль<br>Міхал<br>Ян | + іна | 3. Радаслаў<br>Браніслаў<br>Станіслаў | + а |

***ГРАМАТЫКА***

**Зваротак**

абазначае асобу ці прадмет, да якога звяртаюцца ў гаворцы.

| **Алена! Міхал!** | |
|---|---|
| спадар (Алесь)!<br>спадарыня (Алена)!<br>спадары!<br>спадарыні!<br>спадарства!<br>Шаноўны спадар!<br>Шаноўная спадарыня!<br>Шаноўнае спадарства! | Афіцыйны зварот |
| Міхал**е**! Алес**ю**!<br><br>друж**а**! сын**е**! кон**ю**! | Назоўнікі м.р. у клічным склоне шырока ўжываюцца ў мастацкай літаратуры, публіцыстыцы, літаратурна-размоўным стылі. |
| Цётка! Дзядзька!<br>Бабуля! Дзядуля!<br>Сынок! Дачушка! Унучак! | Неафіцыйны зварот да старэйшай асобы.<br><br>Неафіцыйны зварот да маладзейшай асобы. |
| (Мой) лес! Які ты прыгожы!<br>Рака маленства! Дзе ты?<br>Мой родны кут! Як ты мне мілы.<br>Мае найлепшыя сябры, мне не забыць ніколі вас. | У мастацкім стылі |

| | | |
|---|---|---|
| **Беларускі этыкет:** | Спадар Алесь<br>Спадар Алесь Кавалёнак | Спадарыня Алеся<br>Спадарыня Алеся Кавалёнак |

**53. Звярніцеся да свайго суседа ці сваёй суседкі па імені ў традыцыі беларускага этыкету.**

**Узор:** ***Спадар Адам, спадарыня Ева.***

**54. а) Дапоўніце звароты імёнамі:** *Якуб, Ганна, Міхась, Міканор, Анэля, Наста, Язэп, Сымон, Гапа, Адар'я.*

**Узор:** ***1. Паважаны (шаноўны) спадар Якуб, ...***

***2. Паважаная (шаноўная) спадарыня Ганна, ...***

**б) Скажыце, як звяртаюцца да людзей у традыцыі Вашай краіны?**

**55. Прачытайце.**

| Краіна | Нацыянальнасць | |
|---|---|---|
| | **ён** | **яна (+ к + а)** |
| Беларусь | беларус | беларус+к+а |
| Польшча | пал**як** | поль+к+а |
| Украіна | украін**ец** | украін+к+а |
| Германія | нем**ец** | нем+к+а |
| Англія | англічан**ін** | англічан+к+а |
| Венгрыя | венгр | венг**е**р+к+а |
| Аўстрыя | аўстры**ец** | аўстрый+к+а |
| Францыя | францу**з** | францу**ж**+ан+к+а / францу**з** + к + а |
| Славакія | слава**к** | слава**ч**+к+а |
| Чэхія | чэ**х** | чэ**ш**+к+а |

**56. Утварыце формы жаночага роду.**

**Узор:** ***Расія: расіянін — расіянка***

Балгарыя: балгарын —
Італія: італьянец —
Куба: кубінец —
Іспанія: іспанец —
Амерыка: амерыканец —

**57. Адкажыце на пытанне: Адкуль Вы?**

**Узор:** ***Я з Беларусі*** **!**

**Францыя → з Францыі**
**Польшча → з Польшчы**

***ГРАМАТЫКА***

**Мужчынскія і жаночыя найменні нацыянальнасцей**

| | | |
|---|---|---|
| **адз. л.** | беларус, балгар**ын**, англічан**ін**, кубін**ец** | беларуск**а** |
| | ↓ ↓ ↓ ↓ | ↓ |
| **мн. л.** | беларус**ы**, балгар**ы**, англічан**е**, кубін**цы** | беларуск**і** |

**58. Пастаўце ў сказы прыдатныя словы са слупка.**

1. Гэта мой знаёмы ... а) беларус
2. Гэта мая знаёмая б) беларуска
3. Гэта мае знаёмыя в) беларусы
г) беларускі

**!**

| |
|---|
| беларус і беларус → беларус*ы* |
| беларус і беларус**ка** → беларус*ы* |
| беларус**ка** і беларус**ка** → беларус**к***і* |

**59. Адкажыце на пытанне: Хто яны па нацыянальнасці?**

**Узор:** ***а) Міхась беларус. Антось беларус. Міхась і Антось беларусы.***
***б) Алена беларуска. Ганна беларуска. Алена і Ганна беларускі.***
***в) Міхась беларус. Алена беларуска. Міхась і Алена беларусы.***

1. а) Войтэк паляк. Адам паляк. Войтэк і Адам ...
   б) Эва полька. Зося полька. Эва і Зося ...
   в) Адам паляк. Эва полька. Адам і Эва ...

2. а) Паўло украінец. Тарас украінец. Паўло і Тарас ...
   б) Тарас украінец. Аксана украінка. Тарас і Аксана ...
   в) Леся украінка. Аксана украінка. Леся і Аксана ...

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **мы** | = | **я** | **і** | **...** |
| **вы** | = | **ты / вы** | **і** | **...** |
| **яны** | = | **ён / яна / яно** | **і** | **ён / яна / яно** |

**60. Падбярыце ў сказы прыдатныя займеннікі *(ён, яна, я, ты / Вы)***

1. а) Ён японец і ... японка. Яны японцы.
   б) ... японка і яна японка. Вы японкі.
   в) Вы японец і ... японец. Мы японцы.

2. а) Я італьянец і яна італьянка. ... італьянцы.
   б) Вы італьянец і ён італьянец. ... італьянцы.
   в) Яна італьянка і я італьянка. ... італьянкі.

***ГРАМАТЫКА***

## Спалучальныя і супрацьпастаўляльныя адносіны

| | | |
|---|---|---|
| **і**<br>**ды** | Я беларус **і** / **ды** ён паляк<br>Я сабраўся **і** / **ды** прыехаў | — *абазначэнні прыметы дзеяння адной якасці, іх спалучэнне* |
| **а** | Я беларус, **а** / **але** ён паляк | — *розныя нацыянальнасці* |
| **але** | Я хлопец, **а** / **але** ты дзяўчына | — *розны пол* |
| **аднак** | Я беларус, **але** / **аднак** прыехаў з Амерыкі | — *несупадзенне краіны і* |

| | Я з Украіны, **але / аднак** немец | *нацыянальнасці* |
|---|---|---|

**61. Дапоўніце ў сказы злучнікі са слупка:**

**Узор:** ***а) Я беларус, ... не славак*** || ***і***
***б) Я беларус ... яны беларусы*** || ***а***
***Я беларус, а не славак.***
***Я беларус і яны беларусы.***

1. а) Я немец, ... жыву ў Аўстрыі. || і
   б) Я немец ... жыву у Германіі. || але/аднак

2. а) Вы расіянка, ... я італьянец. || а
   б) Вы расіянка ... яна расіянка. || і

**!**

**Прабачце,** || **як Вас завуць?**
|| **як Ваша імя?**
|| **адкуль Вы?**

**Сям'я**

**сямейны чалавек**
**сямейнікі**
**сямейныя людзі**

**вяселле** **утварыць** | **што? сям'ю**
**завесці** |

**нявеста жаніх**
**Спраўляць што? вяселле**

Жаніць | каго? сына
Ажаніць | (што?) ажаніцца з кім? || з дзяўчынай
Браць у сям'ю каго? нявестку || з жанчынай
што? || з удавой
|| з развядзёнкай

Аддаваць | замуж каго? дачку **Выйсці замуж за каго?** || за хлопца
Аддаць | (што?) || за мужчыну
|| за ўдаўца
|| за разведзенага
Браць | у сям'ю каго? зяця,
Узяць | (што?) нявестку

Мецьо каго? || сям'ю / мужа/жонку / маці
Не мець каго? || сям'і / мужа / жонкі / маці

| | | | |
|---|---|---|---|
| (што?) | бацьку<br>дачку/дачок<br>сына/сыноў | (чаго?) | бацькі<br>дачк і /дачок<br>сына / сыноў |

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.** | я | маю | мы | маем | **1.** | я | | мы | |
| **2.** | ты | маеш | вы | маеце | **2.** | ты | меў/мела | вы | мелі |
| **3.** | ён<br>яна<br>яно | мае | яны | маюць | **3.** | ён<br>яна<br>яно | меў<br>мела | яны | |

**Адкажыце на пытанне: Ці маеце Вы сям'ю?**
**Адказ? Так. Я маю сям'ю. // У мяне ёсць сям'я.**
**Не. Я не маю сям'і. // У мяне няма сям'і.**

**сям'я якая?** **з дзецьмі**
**муж ←→ жонка** **брат ←→ сястра**

**бацька і маці** **сын і дачка**
**бацькі** **дзеці / дзіця**
**немаўляты / немаўля**

**62. Дайце сямейнікам беларускія імёны.**

**63. Дайце сямейнікам імёны, якія ўжываюцца ў вашай краіне.**

**Найменні бацькоў і дзяцей**

| бацькі | | дзеці | |
|---|---|---|---|
| маці | бацька | дачка | сын |
| мама | тата | дач**ушка** | сын**очак** |
| мат**ка** | тат**ка** | доч**ачка** | сын**уля** |
| мамачка | татачка | доч**анька** | сын**улька** |
| мат**улька** | тат**улька** | | |
| мат**улечка** | тат**улечка** | | |

**64. Прачытайце беларускую прымаўку:**
Мама дачушцы не маць і не маці, яна — мама, мамка, матка, матулька, матачка.

**65. Дапоўніце выказванне традацыйнымі беларускімі зваротамі:**
Тата сыночку не бацька, ён — тата ...

**Сямейнікі і сваякі**

| | | |
|---|---|---|
| **сваякі (кроўныя)** | муж | жонка |
| | бацька | маці |
| | сын | дачка |
| | дзед / дзядуля | баба / бабуля |
| | унук | унучка |
| | дзядзька | цётка |
| | пляменнік | пляменніца |
| | стрыечны брат | стрыечная сястра |

| | | |
|---|---|---|
| | свёкар | свякроўка / свякруха |
| **не кроўныя** | цесць | цешча |
| | зяць | нявестка |
| | швагер | швагерка |
| **няродныя** | айчым | мачаха |
| | пасынак | падчарка |

**66. Адкажыце на пытанне: Хто *ён* Вам/табе?**

**Узор:** ***(сваяк — дзядзька) Ён мне сваяк. Ён мой дзядзька.***

***(сваячка — цётка) Яна мне сваячка. Яна мая цётка.***

(сваячка — сястра)
(сваяк — брат)
(сваяк — пляменнік)
(сваячка — пляменніца)

**67.Прачытайце і перакажыце жарты. Назавіце *сямейнікаў*, пра якіх яны распавядаюць.**

Малы просіць у маці арэхаў.
— Развяжы торбачку ды і вазьмі сабе жменьку.
— Не хачу сам. Скажы, каб мне тата даў, — плача малы.
— Чаму ? — пытаецца маці.
— А у таты жменя большая.

**Каментарый:**

***Малы*** — малы сын, дзіця.

— Дзядуля, а ты быў маленькі?
— А як жа, унучак. І ў першы клас хадзіў, як ты.
— Відаць смешны ты быў са сваёй барадою.

**68. Прачытайце. Які са сказаў тлумачыць жарт?**

1. Унучак маленькі.
2. Дзядуля быў маленькі.
3. Унучак ходзіць у школу
4. Дзядуля хадзіў у першы клас.
5. Унучак не мае барады.
6. Дзядуля не меў барады ў першым класе

| **цяпер** | | **раней** | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1.я-мы | | 1.я | быў | мы | |
| 2.ты-вы | (ёсць) | 2.ты | быў/была | вы | былі |
| 3.ён | | 3.ён | быў | яны | |
| яна | | яна | была | | |
| яно | | яно | было | | |

**69. Прачытайце. Дапоўніце патрэбнымі словамі сказы са слупкоў.**

**Узор:** ***Маці ... маленькай, а дачушка ... маленькая /была — (ёсць)***

***Маці была маленькай, а дачушка маленькая.***

1. Дзядуля ... хлопчыкам, а ўнук і ... хлопчык. быў — ёсць
2. Сястра раней ... студэнткай, а цяпер яна ... настаўніца. была — (ёсць)
3. Сын раней ... школьнікам, а цяпер ён ... студэнт. быў — (ёсць)

**70. Прачытайце беларускія прыказкі. Падбярыце адпаведнікі ў вашай мове.**

Шануй бацьку з маткай: другіх не знойдзеш.
Бацькоў слухаць — гора не ведаць.
Якая матка, такое і дзіцятка.
Дзе ў сям'і лад, там і дзеці добра гадуюцца.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | **маю** | | **я** | | |
| | **маеш** | | **ты** | **каго?** | **дачку — дачок** |
| | **мае** | | **ён, яна, яно** | **што?** | **сына — сыноў** |
| **Ці** | **маем** | | **мы** | | **дзіця — дзяцей** |
| | **маеце** | | **вы** | | |
| | **маюць** | | **яны** | | |
| **Ці** | **ёсць** | **у** | **мяне** | | **дачка — дочкі** |
| | | | **цябе** | **хто?** | **сын — сыны** |
| | | | **яго, яе** | **што?** | **дзіця/дзеці** |
| | | | **нас** | | |
| | | | **вас** | | |
| | | | **іх** | | |

**! Пытальныя ветлівыя звароты** | **адказы**

| Пытальныя ветлівыя звароты | адказы |
|---|---|
| Як здароўе? | Нішто сабе! |
| Як маешся? | Нядрэнна. |
| **Як жыццё?** | Памаленьку / Як бог дасць. |
| Як жывяце? | Паціхеньку / Так і жывём. |
| Што новага? | Жывём – хлеб жуём. |
| | Дзякуй богу, нічога. |

**71. Задайце пытанне.**

| | |
|---|---|
| **Узор:** ***(дачку / дачка)*** | ***Ці маеце Вы дачку?*** |
| | ***Ці ёсць у Вас дачка?*** |
| (брата / брат) | Ці маеце Вы брата? |
| | Ці ёсць у Вас брат? |
| (сястру / сястра) | Ці маеце Вы сястру? |
| | Ці ёсць у Вас сястра? |
| (сына / сын) | Ці маеце Вы сына? |
| | Ці ёсць у Вас сын? |
| (бабулю / бабуля) | Ці маеце Вы бабулю? |
| | Ці ёсць у Вас бабуля? |
| (бацьку / бацька) | Ці маеце Вы бацьку? |
| | Ці ёсць у Вас бацька? |

**Адказ:**

| | |
|---|---|
| **Так, я** маю **...** | **каго?** |
| | **што?** |
| **Не, я не маю ...** | **каго?** |
| | **што?** |
| **Так, у мяне ёсць....** | **хто?** |

| |
|---|
| **Не, у мяне няма ... што? каго? чаго?** |

**72. Адкажыце на пытанне. Ці маеце Вы ...? Ці ёсць у Вас...?**

**Узор: (*брата – брат – брата*)** ***Я маю брата. У мяне ёсць брат.***
***Я не маю брата. У мяне няма брата.***

(сястру – сястра –сястры) Так. Я маю сястру. У мяне ёсць сястра.
(сына – сын – сына) Так. Я маю сына. У мяне ёсць сын.
Не. Я не маю сына. У мяне няма сына.
(цётку – цётка – цёткі) Так. Я маю цётку. У мяне ёсць цётка.
Не. Я не маю цёткі. У мяне няма цёткі.

**73. Прачытайце і адгадайце загадку.**

**Мая сям'я**

Васіль Вітка

Задам табе задачу я.
Паслухай, вось мая сям'я:
Дзядуля, бабка, брат.

У нас парадак, лад,
Заўсёды чыста ў хаце,
Бо ў хаце ў нас дзве маці,
Два бацькі, два сыны,
Дачка, пляменнік і сястра,
А самы меншы — я.

Цяпер злічыць пара —
Якая ў нас сям'я?
*(Бацька, маці, дачка, сын, нявестка і ўнук).*

***ГРАМАТЫКА***

**Прыналежныя прыметнікі**

**Прыналежныя прыметнікі** ўжываюцца для абазначэння прыналежнасці або дачынення да асобы. З'яўляюцца ў гэтай функцыі надзвычай частотнымі.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Міхал<br>Вінцук<br>Міхась<br>дзядуля +<br>Ганн**а**<br>сястр**а**<br>матк**а** | **аў / ав**<br>**оў / ов**<br>**ёў / ёв**<br>**еў / ев**<br>**ін**<br>**ын** | Міхал**аў** (брат)<br>Вінцук**оў** (сваяк)<br>Міхас**ёў** (сад)<br>дзядул**еў** (дом)<br>Ганн**ін** (муж)<br>сястр**ын** (гарод)<br>матч**ын** (сваяк) | Міхал**ав**а (сястра)<br>Вінцук**ов**а (сваячка)<br>Міхас**ёв**а (яблыня)<br>дзядул**ев**а (дача)<br>Ганн**ін**а (сястра)<br>сестр**ын**б (сваячка)<br>матч**ын**а (хата) |

**74. Утварыце прыналежныя прыметнікі.**

**Узор:** ***Багдан мае сад /-аў*** ***Багданаў сад***

| **Язэп мае сад** | **-аў** | **бабуля мае дом** | **-ін** |
|---|---|---|---|
| Вінцук мае сад | **-уў** | сястра мае дом | **-ын** |
| Кастусь мае сад | **-ёў** | цётка мае дом | **-ын** |
| Васіль мае сад | **-ёў** | Аленка мае дом | **-ын** |
| Янка мае сад | **-аў** | матка мае дом | |
| Алесь мае сад | **-еў** | | |
| дзядзька мае сад | **-аў** | | |
| зяць мае сад | **-еў** | | |

**75. Дапоўніце сказы адпаведнымі словамі са слупка:**

| | |
|---|---|
| 1. .. сваяк мае дзяцей | а) Васілёвы |
| 2. … сваячка не мае дзяцей | б) Васілёў |
| 3. … дзіця непаслухмянае | в) Васілёва |
| 4. … дзеці непаслухмяныя | |

**! Пытанне:** **Адказ:**

| | | |
|---|---|---|
| *колькі?* | Вам гадоў? | *Мне* … гадоў (год, гады). |
| | ў вас дзяцей, сыноў, дачок? | *У мяне* … дзяцей (дзіця) |

***ГРАМАТЫКА***

**Родны склон (адзіночны лік) назоўніка**

| | **Н.скл. адз. л.** | | **Р.скл. адз. лік** | | | **абазначаецца** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **м.р.** | сын<br>зяць | → | сын<br>зяц | **а**<br>**я** | аснова на цвёрды<br>аснова на мяккі | 1.Канкрэтныя прадметы: *стал**а***<br>2.меры даўжыні і вагі: *метр**а***<br>3.прамежкі часу: *дн**я**, год**а***<br>4.тэрміны: *алфавіт**а***<br>5.населеныя пункты, геаграфічныя назвы: *горад**а**, Гомел**я*** |
| | дождж<br>боль | → | даждж<br>бол | **у**<br>**ю** | аснова на цвёрды<br>аснова на мяккі | 1.Абстрактныя прадметы: *розум**у***<br>2.прасторавыя і часавыя паняцці: *луг**у***<br>3.рэчыўныя назоўнікі: *ячмен**ю***<br>*але: хлеб**а**, аўс**а***<br>4.зборныя прадметы: *народ**у**, лес**у***<br>5.з'явы прыроды: *гром**у*** |
| | тат **а**<br>бацьк **а**<br>суддз **я** | → | тат<br>бацьк<br>суддз | **ы**<br>**і**<br>**і** | аснова на цвёрды<br>аснова на г, к, х<br>аснова на мяккі | |
| **ж.р.** | шаш **а**<br>наг **а**<br>бабул **я** | → | шаш<br>наг<br>бабул | **ы**<br>**і**<br>**і** | аснова на цвёрды<br>аснова на г, к, х<br>аснова на мяккі | |
| **н.р.** | сонц **а**<br>пол **е** | → | сонц<br>пол | **а**<br>**я** | аснова на цвёрды<br>аснова на мяккі | |

**76. Пастаўце назоўнікі ў форму Р.скл.:**

1. Яна падышла да *(сцяна)*
2. Мы звярнуліся да *(чалавек)*
3. На небе цяпер няма *(сонца)*
4. Яны набліжаліся да *(лес)*
5. У мяне няма *(бабуля)*
6. Да *(боль)* знаёмыя мясціны

**!** Назоўнік ***маці*** мае нязменную форму для ўсіх склонаў і лікаў
адз. лік = мн. лік

**Канструкцыі з назоўнікамі Р.скл. мн. ліку**

Колькі ў вас ***(каго? чаго?)*** дачок, сыноў, дзяцей, палёў?
Колькі вы маеце ***(каго? чаго?)*** дачок, сыноў, дзяцей, палёў?
Колькі вам ***(каго? чаго?)*** гадоў?

**Канструкцыі з назоўнікамі Р.скл.**

**Няма** *(каго? чаго?)* **дачкі, дачок; сына, сыноў; дажджу, дажджоў.**
**Не мець** *(каго? чаго?)* **дачкі, дачок; сына, сыноў; дажджу, дажджоў.**
**Звяртацца да** *(каго? чаго?)* **дачкі, дачок; сына, сыноў; дажджу, дажджоў.**
**Запытацца ў** *(каго? чаго?)* **дачкі, дачок; сына, сыноў; дажджу, дажджоў.**
Прыехаць ***(адкуль?)*** з Францыі, з Іспаніі.
*Я* ***(адкуль?)*** з Францыі, з Іспаніі.

**77. Складзіце сказы з прыведзенымі канструкцыямі.**

***ГРАМАТЫКА***

**Лічэбнікі**
**Спалучэнне лічэбнікаў з назоўнікамі**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **1.** | адзін год | адзін сын | адна дачка | адно дзіця |
| **2.** | два гад**ы** | два сын**ы** (двое сын**оў**) | дзве дачкі | двое дзяцей |
| **3.** | тры гад**ы** | тры сын**ы** (трое сын**оў**) | тры дачкі | трое дзяцей |
| **4.** | чатыры гад**ы** | чатыры сын**ы** (чацвёра сын**оў**) | чатыры дачкі | чацвёра дзяцей |
| **5.** | пяць гад**оў** | пяць (пяцёра) сын**оў** | пяць дачок | пяцёра дзяцей |
| **6.** | шэсць гад**оў** | шэсць (шасцёра) сын**оў** | шэсць дачок | шасцёра дзяцей |
| **7.** | сем гад**оў** | сем (сямёра) сын**оў** | сем дачок | сямёра дзяцей |
| **8.** | восем гад**оў** | восем (васьмёра) сын**оў** | восем дачок | васьмёра дзяцей |
| **9.** | дзевяць гад**оў** | дзевяць (дзевя'цера) сын**оў** | дзевяць дачок | дзевя'цера дзяцей |
| **10.** | дзесяць гад**оў** | дзесяць (дзеся'цера) сын**оў** | дзесяць дачок | дзеся'цера дзяцей |

**78. Адгадайце загадку:**

У двух матак
Па пяцёра дзіцятак,
І ўсе аднагодкі,
Трое доўгіх,
Двое кароткіх… (В.Вітка)

*(рукі і пальцы.)*

**Колькі?**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **11** | адзінаццаць | **30** | трыццаць |
| **12** | дванаццаць | **40** | сорак |
| **13** | трынаццаць | **50** | пяцьдзесят |
| **14** | чатырнаццаць | **60** | шэсцьдзесят |
| **15** | пятнаццаць | **70** | семдзесят |
| **16** | шаснаццаць | **80** | восемдзесят |
| **17** | семнаццаць | **90** | дзевяноста |
| **18** | васемнаццаць | **100** | сто |
| **19** | дзевятнаццаць | **200** | дзвесце |
| **20** | дваццаць | **300** | трыста |
| **21…** | дваццаць адзін … | **…** | |

2, 3, 4 — 1
22, 23, 24 — 21
32, 33, 34 *гады* — 31 *год*
42, 43, 44 — 41
… — …

**79. Адкажыце на пытанне: Колькі вам гадоў?**

**Узор:** ***(21 - дваццаць адзін)*** ***Мне дваццаць адзін год***

(35 – трыццаць пяць)
(44 – сорак чатыры)
(28 – дваццаць восем)
(18 – васемнаццаць)
(54 – пяцьдзесят чатыры)
(55 – пяцьдзесят пяць)

**80. Адкажыце на пытанне: Колькі гадоў вашым дзецям (сыну, дачцэ, знаёмай, сябру)?**

**Узор:** ***(5 – пяць, 14 - чатырнаццаць)*** ***Майму сыну пяць гадоў, а маёй дачцэ чатырнаццаць гадоў)***

(3 – тры, год / 23 – дваццаць тры, 31 – трыццаць адзін)
(7 – сем, 9 – дзевяць)
(20 – дваццаць, 22 – дваццаць два)

**!** Пасля лічэбнікаў *два, тры, чатыры* — Н. скл. мн. л.
два *рублі, двары*
Пасля лічэбнікаў *пяць, шэсць, сем …* — Р. скл. мн. л.
пяць *рублёў, двароў*
Пасля *многа, мала, колькі, некалькі* — Р. скл. мн. л.

**81. Словы, змешчаныя ў дужках, пастаўце ў патрэбным ліку і склоне:**

1. Мы жывём тут ужо тры (год).
2. Я паеду ў Брэст на два (дзень).
3. У мяне з сабой мала (грошы).
4. Мне трэба заплаціць пяцьдзесят (рубель).
5. Мой сябра ажаніўся ў дваццаць (год).
6. Сярэдняя тэмпература летам у Мінску плюс дваццаць (градус).

7. Я вярнуся праз тры (месяц).

**Прафесія**

| **м.р., ж.р.** | | **м.р.** | **ж.р.** |
|---|---|---|---|
| філолаг<br>архіварыус<br>юрыст | а) | настаўні**к**<br>пісьмен**нік** | настаўні**ца** **к / ц**<br>пісьменні**ца** |
| педагог<br>мадэльер<br>рэжысёр<br>суддзя | б) | рэдактар<br>бібліятэкар<br>паэт<br>кантралёр<br>дырыжор | рэдактар**ка**<br>бібліятэка**р**ка<br>паэт**ка**<br>кантралёр**ка**<br>дырыжор**ка** |

**Узор:** школьні**к** – школьні**ца**
рэдактар – рэдактар**ка**

**82. Утварыце па мадэлі назвы прафесіі для жанчын.**
**Узор:** ***гандляр – гандлярка***

а) правад**нік**
дассед**чык**
кранаўш**чык**

б) доктар
рэдактар
дырыжор

працаваць **дзе?** | на заводзе
рабіць | на фабрыцы
у інстытуце
у школе
у банку
у офісе
ва універсітэце

працаўнік / працаўніца
***чаго?***
завод**а**
фабрык**і**

супрацоўнік / супрацоўніца
***чаго?***
універсітэт**а**
інстытут**а**
банк**а**
офіс**а**

прафесіянал
прафесіяналка

прафесійныя ***што?*** веды
навыкі
абавязкі

Па прафесіі я ***хто?*** | філолаг.

***ДЫЯЛОГІ***
**83. Прачытайце. Перакажыце дыялогі ў асобах.**

— Дазвольце з Вамі пазнаёміцца. Я Антось Зарэцкі. А якое Ваша імя?
— Алеся Асіпенка.
— Вельмі прыемна. Вы студэнтка?
— Не, я настаўніца.

— Прабачце, калі ласка, як Вас завуць?
— Мяне завуць Алесь Кавалёнак.
— Вы студэнт?
— Так, я студэнт.

— Прабачце, Вы часам не Алесь Кавалёнак?
— Я Кавалёнак, але Юрась, а не Алесь.
— Дык Вы, пэўна, Алесеў брат?
— Так, я Алесеў брат.

***ТЭКСТ***

**Алесева сям'я**

Майго беларускага сябра завуць Алесь Кавалёнак.

Яго сям'я даволі вялікая — маці, бацька, брат, сястра і бабуля. Алесева маці — Ганна — працуе настаўніцай. Яна вучыць дзяцей беларускай мове і літаратуры. Бацьку завуць Віталь. Ён інжынер.

Старэйшы Алесеў брат Юрась — юрыст. Ён жанаты. Яго жонка Алена працуе бібліятэкаркай. Яны маюць сына Кастуся і дачку Васілінку. Пляменнік ужо школьнік, а пляменніца яшчэ ходзіць у дзіцячы садок.

Алесева малодшая сястра Яніна замужам за музыкантам, імя якога Васіль. Яны пажаніліся нядаўна. Дзяцей у іх яшчэ няма. Алесю швагер падабаецца.

Бабуля Настасся пенсіянерка. Дзядулю звалі Мікола. Ён ужо памёр. Бацькавы маці і тата — баба Агата і дзед Піліп — жывуць у вёсцы.

Алесь студэнт, не жанаты. Жыве ён разам з бацькамі і бабуляй. Яго брат і сястра жывуць са сваімі сем'ямі асобна.

У доме Кавалёнкаў часта збіраюцца блізкія сваякі. Гэта матуліны браты і сёстры, Алесевы дзядзькі і цёткі. З іх дзецьмі — сваімі стрыечнымі братамі і сёстрамі — ён вельмі любіць сустракацца.

**84. Адкажыце на пытанні:**

1. Як завуць майго беларускага сябра?
2. Ці вялікая яго сям'я?
3. Кім працуе Алесева маці?
4. Як завуць брата?
5. Як завуць братаву жонку?
6. Ці маюць ён і яго жонка Алена дзяцей?
7. За кім замужам Алесева малодшая сястра Яніна?
8. Ці падабаецца Алесю швагер?
9. Дзе жывуць бацькавы маці і тата?
10. Хто часта збіраецца ў доме?

**85. Дапоўніце сказы:**

**Узор:** ***Майго сябра завуць … (Алесь,Алеся, Міхась) Кавалёнак —***
***Майго сябра завуць Алесь Кавалёнак***

Алесева маці працуе … *(бібліятэкаркай, настаўніцай, настаўнікам).*
Брат Юрась … *(разумнейшы, старэйшы, маладзейшы)* за Алеся.
Сястра Яніна замужам за … *(інжынерам, настаўнікам, музыкантам).*
Бацькавы маці і тата жывуць … *(у горадзе, у вёсцы, за мяжой).*

**86. Перакажыце тэкст дыялогам.**

***ДЫЯЛОГІ***

**Прачытайце дыялогі.**

— У Вас вялікая сям'я? / Ці вялікая ў Вас сям'я?
— Даволі вялікая.
— Хто ў Вашай сям'і?
— Маці, бацька, брат, сястра і бабуля.

— Вы жанаты? / Ці жанаты Вы?
— Не, не жанаты. Я халасцяк. Але маю нявесту.
— Як яе завуць?
— Алена.

— Вы замужам? / Ці замужам Вы?
— Так, замужам.
— Хто Ваш муж?
— Мой муж журналіст. / Ён журналіст. / Журналіст.

— Вы маеце дзяцей? / Ці маеце Вы дзяцей? / Ці ёсць у Вас дзеці?
— Так. Маю дачку і сына. / У мяне дачка і сын.
— Як іх завуць?
— Дачку завуць Алеся, а сына — Алесь.

**Перавядзіце дыялог у тэкст.**

**87. Раскажыце пра сваю сям'ю, адказваючы на пытанні.**

1. Ці вялікая ў Вас сям'я?
2. Хто ў Вашай сям'і?
3. Як завуць Вашых блізкіх?
4. Ці часта Вы сустракаецеся з блізкімі сваякамі?

**вялікая - малая**
**часта - рэдка**

**!** старэйшы брат — малодшы брат
старэйшая сястра — малодшая сястра

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| брат | старэйшы | | | | |
| | маладзейшы | | мяне – нас | | год |
| | | **за** | цябе – вас | **на** | 2, 3, 4 гады |
| сястра | старэйшая | | яго, яе – нас | | 5-10 гадоў |
| | маладзейшая | | | | |

**88. Дапоўніце канструкцыі лічэбнікамі 1, 3, 5.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| (старэйшы) брат | старэйшы | **за мяне на …** | **(год, гады, гадоў)** |
| (малодшы) брат | маладзейшы | | |

***Выразы, якія вам могуць спатрэбіцца:***

Дазвольце пацікавіцца,
як Вас завуць?
ці замужам Вы?
ці Вы жанаты
ці маеце Вы дзяцей?
ці даўно Вы замужам?

ці даўно Вы ажаніліся?

**89. Раскажыце пра сябе, выкарыстоўваючы наступныя мадэлі.**

1. Мяне завуць…

Я хачу пазнаёміць Вас з маім сябрам. Яго завуць…
Я хачу пазнаёміць Вас з маёй сяброўкай. Яе завуць…
(Пазнаёмцеся, калі ласка, з маім сябрам).

2. Я прыехаў **(адкуль?)** з Англіі (з Германіі…).

Я – з Англіі.

3. Па нацыянальнасці я **(хто?)** беларус / беларуска.

немец / немка — Вы немка?
— Так, я немка, але жыву ў Швецыі.
— А я – з Амерыкі. Але па нацыянальнасці я беларуска. Мае бацькі пераехалі ў Амерыку з Беларусі.

Я нарадзіўся (нарадзілася) **(дзе?)** у Беларусі (у Германіі, Японіі…).

4. Мне **(колькі?)** дваццаць (дзевятнаццаць, трыццаць, сорак, пяцьдзесят) гадоў.

Мне дваццаць адзін *год*.
два (тры, чатыры) *гады*.
пяць (шэсць, сем, восем, дзевяць) *гадоў*.

5. Па прафесіі я **(хто?)** (будучы) філолаг.

| | | |
|---|---|---|
| матэматык | настаўнік | юрыст |
| гісторык | будаўнік | урач |
| фізік | | перакладчык |

Мая спецыяльнасць – беларуская мова і літаратура

| | |
|---|---|
| матэматыка | юрыспрудэнцыя |
| фізіка | хірургія |
| гісторыя | славянскія мовы |
| біялогія | |

6. Я працую **(дзе?)** у школе (у інстытуце, у бальніцы, у тэатры, на заводзе, ва універсітэце).

Я вучуся **(дзе?)** у школе, ва універсітэце
на філалагічным факультэце

| | |
|---|---|
| матэматычным | медыцынскім |
| фізічным | гістарычным |
| юрыдычным | |

7. Я прыехаў (прыехала) у Беларусь першы раз.

Я быў (была) у Беларусі у мінулым годзе
два (тры, чатыры) гады назад
пяць (шэсць, сем) гадоў назад

8. Я (не) жанаты.
Я (не) замужам.

У мяне ёсць **(хто?)** сын (дачка)

брат (родны брат, стрыечны брат); два дваюрадныя браты
сястра (родная сястра, стрыечная сястра); дзве стрыечныя сястры

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| дачка | маці | цётка | бабуля (баба) | пляменнік | унук |
| сын | бацька | дзядзька | дзядуля (дзед) | пляменніца | унучка |

9. Мой брат старэйшы (маладзейшы) за мяне на адзін год

на два (тры, чатыры) гады
на пяць (шэсць, сем) гадоў

10. Я люблю **(што? він. скл.)** кнігі
музыку
спорт
тэатр
кіно

Мне падабаецца **(хто? што?)** гэты від спорту.
Я захапляюся **(чым?)** плаваннем
Я люблю **(што рабіць?)** чытаць кнігі
займацца спортам
слухаць музыку
гуляць у шахматы

**Каментарый:**

Канструкцыя ***мне падабаецца***… з'яўляецца сінанімічнай да канструкцыі *я люблю*… .
Я люблю чытаць = Мне падабаецца чытаць

Канструкцыя *я захапляюся...* блізкая да канструкцыі *я люблю*….
Я захапляюся плаваннем = Я люблю плаваць

**!** гаварыць / чытаць / пісаць — па-беларуску (па-польску, па-нямецку…) / на беларускай (польскай, нямецкай…) мове

***ГРАМАТЫКА***

**Пытальныя сказы**

| | | |
|---|---|---|
| **а) З пытальным словам** | | **Хто? Што? Які? Чый? Каторы? Дзе? Куды? Адкуль? Калі? Як?** |
| *Што* вы робіце? — Я *чытаю.* / *Чытаю.*<br>*Дзе* працуе ваш брат? — Мой брат працуе *ва універсітэце. / Ва універсітэце.*<br>*Калі* вы пачалі вывучаць беларускую мову? — Беларускую мову я пачаў вывучаць *сёлета. /Сёлета.* | | |
| *Што* (мне) рабіць?<br>*Як* (ёй) сказаць? | — *Нічога* не рабіце. / *Нічога.*<br>— *Так* і скажыце. | |
| **б) Без пытальнага слова** | | **Націск на слове, якое патрабуе ўдакладнення** |
| *Вы* вывучаеце беларускую мову? — *Я* вывучаю беларускую мову. / *Я*<br>Вы *вывучаеце* беларускую мову? — Я *вывучаю* беларускую мову. / *Вывучаю.*<br>Вы вывучаеце *беларускую* мову? — Я вывучаю *беларускую* мову. / *Беларускую.*<br>Вы вывучаеце беларускую *мову*? — Я вывучаю беларускую *мову. / Мову.* | | |

| в) З часціцай | Ці… Ці не… Хіба… Няўжо… |
|---|---|
| *Ці* пойдзеш ты ў кіно? *(нейтральны выраз)*<br>*Ці не* пойдзеш ты ў кіно? *(жаданне, каб пайшоў)*<br><br>*Хіба* ты пойдзеш у кіно? / Хіба ты не пойдзеш у кіно? *(недавер = не веру, што пойдзеш / што не пойдзеш)*<br><br>*Няўжо* ты пойдзеш у кіно?<br>*Няўжо* ты не пойдзеш у кіно? *(здзіўленне = ніколі б не падумаў, што пойдзеш / што не пойдзеш)* | Так, я пайду ў кіно. / Так.<br>Не, я не пайду ў кіно. / Не. |

**90. Прачытайце сітуацыі. З дапамогай пытальных сказаў з часціцамі *няўжо, хіба* выкажыце здзіўленне ці сумненне.**

1. Вы сустрэлі свайго даўняга знаёмага, які не пазнаў вас.
2. Ваш сябра не пазваніў і не папярэдзіў вас, што спозніцца на сустрэчу.
3. Вы даведаліся, што ваша сяброўка за год вывучыла кітайскую мову.
4. Ваш брат едзе ў камандзіроўку заўтра, а вы думалі, што праз тры дні.

**91. Складзіце пытанні, якія могуць быць выкарыстаны ў наступных сітуацыях:**

а) Уявіце, што вы кіраўнік фірмы. Вам трэба выбраць аднаго з трох прэтэндэнтаў, якога б вы залічылі ў свой штат.

б) Уявіце, што вы журналіст, якому трэба ўзяць інтэрв'ю ў вядомай актрысы (у вядомага палітыка, у пісьменніка).

***Выразы, якія вам могуць быць патрэбнымі***

1. Дзень добры!
   Рады вас бачыць!
   Прывітанне!

2. Як жывеш?
   Што новага?
   Як жыццё?
   Як маешся?

— Цудоўна!
— Нічога. Жыццё ідзе сваім ходам.
— Усё добра!
— Так сабе.
— Не вельмі.
— (Кепска)

3. Да пабачэння!
   Бывайце!
   Да заўтра!
   Усяго добрага!
   Пакуль!

4. Перадавай прывітанне **(каму?)**. — Дзякую, абавязкова перадам.
   Поспехаў! — Дзякую, і вам таксама.
   Папраўляйцеся! — Дзякую.

***ТЭКСТ***

**Цётка**

Не толькі выдатнай паэткай, але і яскравым прамоўцам, актыўнай грамадскай дзеячкай і асветніцай стала для нашай культуры Алаіза Пашкевіч (1876-1916). Большасці з нас гэта сціплая фельчарка вядомая пад іншым імем — Цётка. Такі псеўданім выбраны ёю нездарма. Ён не толькі лёгка запамінаецца, але перадае важную асаблівасць традыцыйнага беларускага этыкету: словам цётка звярталіся з пачцівасцю і адначасова сардэчнасцю да старэйшых жанчын.

Звароты былі часткай, дакладней, зачынам імені, ствараючы з ім гарманічнае адзінства. Выдатны беларускі паэт, перакладчык, фалькларыст і літаратуразнаўца Ніл Гілевіч тонка перадае гэтую адметнасць беларускай культуры, спазнаную на ўласным вопыце:

"У дзяцінстве, ды і пазней, я звяртаўся да знаёмых мужчын так: дзядзька Змітрок, дзядзька Тодар, дзядзька Тамаш, дзядзька Аніс, дзядзька Якім, дзядзька Кастусь... Да знаёмых жанчын у дзяцінстве сваім я звяртаўся ў духу нацыянальных звычаяў так: цётка Марыля, цётка Гілена, цётка Барбара, цётка Параска, цётка Рыпіна, цётка Луцэя, цётка Зося, цётка Еўка, цётка Тэкля... Нашы імёны — частка нашай мовы. Таму так натуральна гучаць яны ў беларускамоўным кантэксце. Гэта закон.

Паляка пазнаеш, што паляк, літоўца пазнаеш, што літовец, армяніна пазнаеш, балгарына пазнаеш — у кожнага народа свае імёны, чаму ж не пазнаць! Ёсць такія і ў нас, брбткі-беларусы. Пачуеш Міхась, Тамаш, Сымон, Антось, Язэп, Лукаш, Змітрок, Пятрусь, Абросім — ну ясна: з Беларусі людзі! Імя — гэта імя. Ёсць яно ў цябе сваё, спадчыннае, ад прадзедаў спакон вякоў данесенае, дык і шануй яго".

Безумоўна, пачуццё глыбокай пашаны да продкаў, сваёй слаўнай гісторыі давала Цётцы паэтычнае натхненне. Яшчэ ў большай меры яно напаўняла яе зайздроснай жыццёвай, духоўнай сілай. Цётка хацела бачыць свой народ сапраўднай шчаслівай сям'ёй, якую б з'яднала родная мова.

Таму так прагна ўзіралася ў сябе, у сваіх землякоў. Апявала іх працу, прыгажосць сваёй радзімы-бацькаўшчыны, адчувала сябе магутным дубам, вольным арлом, імклівай рэчкай, тонкай сцяблінкай.

Яе душа спявала — то вытанчанай скрыпкай, то тужлівай жалейкай, то сціплай дудкай, аднак ёй хацелася пачуць зладжаную магутную песню грамады. Яна выразна ўяўляла сабе гэтую велічную музыку. І пачыналася яна з чыстай мелодыі простых і шчырых слоў-зваротаў, якіх не шкадавалі і для чужых людзей, сведчачы сваю ветлівасць і павагу: брат, сястра, бацька, дзед, дзядзька, цётка...

А яшчэ беларуская мова захавала ў сваіх нетрах і шчодра дорыць сваім рупліўцам найстаражытнейшыя звароткі — многімі мовамі ўжо страчаныя, формы клічнага склону: *сынку, сыне, пане-браце, дружа, людцы, чалавеча, дзеду, голубе, суседзе, Піліпе*!

Даследчык гісторыі беларускай мовы прафесар Фёдар Янкоўскі падкрэсліваў, што клічны склон заўсёды быў прыналежнасцю гутарковай і паэтычнай мовы, сутнасць яго дасюль не змянілася.

Так і слова *цётка*. Яно называе бацькаву і матчыну сястру. Ім усё яшчэ звяртаюцца да жанчын. Яно напоўніла душэўнасцю і літаратурны псеўданім, нагадала пра старадаўні звычай.

**Каментарый:**

***Цётка (Алаіза Пашкевіч), 1876-1916*** — беларуская пісьменніца

***чаму ж не пазнаць*** — лёгка пазнаць

**92. Адкажыце на пытанні:**

1. Хто такая Цётка? Якое ў яе сапраўднае імя і прозвішча?
2. Чаму Цётка выбрала такі псеўданім?
3. Хто такі Ніл Гілевіч?
4. Як звяртаўся Ніл Гілевіч да знаёмых мужчын?
5. Як, у якім духу звяртаўся Ніл Гілевіч да знаёмых жанчын?
6. Ці можна па імені пазнаць прадстаўніка пэўнай нацыі? Якія народы называе Ніл Гілевіч?
7. Чаму трэба шанаваць спадчыннае імя?
8. Што давала Цётцы паэтычнае натхненне?
9. Якім хацела бачыць Цётка свой народ?
10. Што апявала Цётка?
11. Пералічыце беларускія словы-звароты.

12.Якія са слоў-зваротаў з’яўляюцца формамі клічнага склону?
13.Што падкрэсліваў лінгвіст Фёдар Янкоўскі?
14.Раскажыце пра псеўданімы пісьменнікаў Вашай краіны.

**93. Дапоўніце сказы:**

1. Алаіза Пашкевіч стала для нашай культуры не толькі…
2. Большасці з нас гэтая…
3. Яе псеўданім не толькі лёгка запамінаецца, але…
4. У дзяцінстве я звяртаўся да знаёмых мужчын так…
5. Да знаёмых жанчын я звяртаўся…
6. Пачуццё глыбокай пашаны да продкаў…
7. Цётка хацела бачыць свой народ…
8. Цётка апявала сваіх землякоў: іх працу, …
9. Яе душа спявала — …
10. А яшчэ беларуская мова захавала…

**94. Знайдзіце ў тэксце назвы асоб. У чым адметнасць беларускіх імёнаў? Якія фармальныя прыметы маюць імёны ў вашай мове?**

**95. Утварыце словы паводле ўзору.**

**Узор:** ***(які?) пачцівы —*** ***(што?) пачцівасць*** ***— (як?) пачціва***

ветлівы —
прыветлівы —
абыходлівы —
сардэчны —

**!** рупліў**ец** — рупліў**іца**

**96. Карыстаючыся словамі з тэксту і заданняў раскажыце пра знакамітых асоб Вашай краіны.**

***ГРАМАТЫКА***

**Найменне асобы паводле дзеяння**

| | |
|---|---|
| **- нік** | адкрывальнік, пісьменнік, захавальнік, распаўсюджвальнік |
| **- чык** | даследчык, дарадчык, выкладчык, загадчык, перакладчык |
| **- ар /- яр** | мысляр, штукар, друкар |
| **- ор / -ёр** | кантралёр, дырыжор, юніор |
| **- ач /- яч** | дзеяч, глядач, слухач, чытач |
| **- ец** | вайсковец, руплівец, падліковец |
| **- ц -** | прамоўца, выступоўца, дарадца |
| **- іст /-ыст** | фальклярыст, лінгвіст (лацініст, беларусіст), парашутыст |

**97. Прачытайце найменні асобы. Ці ёсць аналагічныя мадэлі ў Вашай мове? Прывядзіце прыклады.**

**!** **Хто?** літаратуразнаўц[а] | **м.р.**
літаратуразнавец[ ] |

Гэта — выдатн**ы** літаратуразнаўц**а** / Гэта — выдатн**ы** літаратуразнавец.

**Н.** літаратуразнаўц**а**, літаратуразнавец

| | | |
|---|---|---|
| | Р. | літаратуразнаўц**ы**, літаратуразнаўц**а** |
| адз.лік | Д. | літаратуразнаўц**у** |
| (Sing.) | В. | літаратуразнаўц**у**, літаратуразнаўц**а** |
| | Т. | літаратуразнаўц**ам** |
| | М. | (пры) літаратуразнаўц**у** |
| мн. лік | Н. | літаратуразнаўц**ы** |
| (Pl.) | Р. | літаратуразнаўц**аў** |
| | Д. | літаратуразнаўц**ам** |
| | В. | літаратуразнаўц**аў** |
| | Т. | літаратуразнаўц**амі** |
| | М. | (пры) літаратуразнаўц**ах** |

**98. Устаўце словы *знаўца* і *знавец* у адпаведнай форме.**

1. Ён выдатны ... (Н) старажытасці. 2. З Рыгорам Шырмам, з гэтым ... (Т) беларускага фальклора звязана цэлая музычная эпоха ў нашай музычнай культуры. 3. Нам нестае сапраўднага ... (Р). 4. Толькі сапраўднаму ... (Д) можна даручыць гэтыя бясцэнныя дакументы. 5. Упершыню сустракаю такога ... (В) беларускай гісторыі. 6. Пры такім ... (М) сусветнай культуры студэнты пачуваліся трохі разгублена.

**!**

**Не толькі ..., але ...**
**... , ды і ...**

***ГРАМАТЫКА***

**Абазначэнне супастаўляльных адносін**

| | | |
|---|---|---|
| **не толькі…, але і…** | Супастаўляльная інфармацыя, другая частка якой дапаўняе першую, часта нечаканую | *Ён **не толькі** спартовец, **але і** выдатнік* (як правіла, спартоўцы рэдка бываюць выдатнікамі) |
| | Сцвярджае наяўнасць, акрамя аднаго, іншых носьбітаў з пэўнай характарыстыкай | ***Не толькі** Ніл Гілевіч, **але і** ўсе яго аднагодкі звярталіся да знаёмых жанчын словам цётка.* |
| **…, ды і…** | Далучэнне да папярэдняй інфармацыі новых звестак, звязаных па змесце | *Цётка, **ды і** многія іншыя беларускія пісьменнікі, творча развівалі фальклорныя здабыткі.* |

**99. Знайдзіце ў тэксце сказы са злучнікамі не толькі ..., але, ды і.**

**100. Дапоўніце сказы словамі са слупка.**

1. Цётка не толькі выдатная ..., але і грамадская ...
2. Цётка выдатная ..., ды і грамадская ...

паэтка
дзеячка

***ДЫЯЛОГ***

**Прачытайце дыялог па асобах.**

— Ведаеце, што не толькі Цётка, але і многія іншыя беларускія пісьменнікі падпісвалі свае творы псеўданімамі?

— Не ведаю, але цікава было б даведацца.

— Псеўданімы, напрыклад, маюць выдатныя пісьменнікі, заснавальнікі сучаснай беларускай літаратурнай мовы Янка Купала і Якуб Колас.

— Што вы кажаце?!. Ну гэта ж трэба! А якія ў іх сапраўдныя імёны?

— Іх сапраўдныя імёны кожны беларус ведае яшчэ са школы. Іван Дамінікавіч Луцэвіч нарадзіўся на Купалле (6.07.1882 г.). Для беларусаў гэта старажытнае свята і зараз застаецца рамантычным і таямнічым. Кажуць, на Купалле апоўначы зацвітае папараць. Той, хто знойдзе кветку, стане шчаслівым, будзе разумець мову жывёл, птушак і раслін.

— Дык вось чаму так часта ў беларускай літаратуры ўпамінаецца папараць-кветка! А Якуб Колас?

— Яго завуць Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч.

— А чаму Колас?

— Колас — гэта сімвал жыцця, адраджэння, плён працы хлебароба, ён складаецца з некалькіх зярнятак... Тлумачэнняў шмат. І ўсе яны перадаюць сутнасць беларусаў — злітаванасць з прыродай, філасофскае стаўленне да рэчаіснасці, прывязанасць да сваёй зямлі.

**Каментарый:**

***Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) 1882-1942***
***Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) 1882-1956***

**Перакажыце дыялог у маналагічнай форме ад імя 1-й асобы, ад імя 3-й асобы.**

**101. Адкажыце на пытанні:**
1. З чым звязаны псеўданім Купалы.
2. Ці ёсць ў вашай культуры паданне пра папараць-кветку? Раскажыце яго.
3. Што сімвалізуе колас?
4. Што складае сутнасць беларусаў?

**!** **Рэплікі здзіўлення:** Вось табе і маеш!
Што вы кажаце?
Ну, гэта ж трэба!

**Нб табе!**

**102. Прачытайце радкі з твораў Янкі Купалы і звароты, ужытыя Якубам Коласам у паэме "Новая зямля". Знайдзіце формы клічнага склону:**

Янка Купала:

Выйдзеш ты на нівы, беларусе,
Напрадвесні, браце мой цярплівы.

Гуслям, княжа, не пішуць законаў.

Якуб Колас:

Міхал! Міхале! Уставай, Міхале, адзявайся!
Ах, мой ты божа, добры, мілы!
Ох, браце: смерць не разбірае.
Ну, пане, то пойдзем, браце,
Будзе цяпер змена.

*ТЭКСТ*

### Ефрасіння Полацкая

Імя Ефрасінні Полацкай (1120-1173), апякункі Беларусі, займае асаблівае месца ў нашай старажытнай гісторыі. Яно стала сімвалам імкнення душы да ведаў, да веры, таму і перажыло стагоддзі.

Ефрасіння была ўнучкаю легендарнага князя Усяслава Чарадзея, дачкою князя Георгія Усяславіча. Яна нарадзілася ў Полацку. Першае (свецкае) яе імя — Прадслава. Прадслава

ўмела чытаць і пісаць. Болей за ўсё на свеце яна шанавала кнігі. Да таго ж была дзяўчына надзвычай прыгожай.

Слава пра яе разнеслася далёка. Многія князі хацелі такую прыгажуню ўзяць за жонку. Аднак князёўна адмовіла ўсім жаніхам і таемна ўцякла ў манастыр, пастрыглася ў манашкі, узяла сабе імя Ефрасіння.

Доўгі час яна жыла ў адзіноце, перакладала і перапісвала кнігі. Яе пакойчык — "галубніца" месціўся ў царкве, у Полацкай Сафіі, што была пабудавана Усяславам Чарадзеем і захавалася да нашага часу. Неўзабаве князёўна заснавала жаночы манастыр, стала ў ім ігуменняю.

Вакол Ефрасінні аб'ядналася шмат аднадумцаў, якія пашыралі ў Полацкім княстве асветніцтва. Пры манастыры працавала школа, дзе акрамя іншых навук, дзеці спасцігалі законы красамоўства, а таксама вывучалі гісторыю сваёй дзяржавы і слаўнага роду полацкіх князёў.

Дзякуючы Ефрасінні меў магчымасць працаваць адзін з першых беларускіх дойлідаў — Іаан. Ён пабудаваў цудоўную па сваёй прыгажосці Спаса-Ефрасіннеўскую царкву.

Славутаму ювеліру Лазару Богшу Ефрасіння заказала зрабіць шасціканцовы крыж, аздоблены залатымі і срэбранымі пласцінамі. Гэты найкаштоўнейшы помнік даўніны захоўваўся аж да сярэдзіны XX стагоддзя і знік з музея ў гады II Сусветнай вайны. Да гэтага часу крыж так і не знойдзены, хоць яго шукае Інтэрпол.

Ефрасіння мела яшчэ адну бясцэнную каштоўнасць — абраз Маці Боскай, які яна атрымала ў падарунак ад свайго сваяка, візантыйскага імператара Мануіла Камніна. Паводле легенды яго стварыў адзін з дванаццаці апосталаў Ісуса Хрыста — Лука. Гэтым цудоўным абразом баслаўлялі ў Тарапцы траюрадную пляменніцу Ефрасінні, Аляксандру Брачыславаўну і вялікага князя Аляксандра Неўскага — на іх вяселлі.

У канцы свайго зямнога жыцця Ефрасіння Полацкая здзейсніла паломніцтва ў Іерусалім, да труны Ісуса Хрыста. У нялёгкай дарозе яе ў кожным горадзе сустракалі з вялікай пашанай. У Іерусаліме Ефрасіння Полацкая і памерла. Яе святыя мошчы з Іерусаліма былі перавезены ў Кіева-Пячорскую лаўру, а ў 1916 г. з вялікай пашанай дастаўлены ў Полацк і зараз пакояцца ў Спаса-Ефрассіннеўскай царкве, у якой некалі была келья Ефрасінні.

Пра гэтую самааднаную высакародную жанчыну сівая даўніна захавала унікальны помнік — "Жыціе", якое, як лічаць некаторыя навукоўцы, напісала яе родная сястра. Яна таксама пастрыглася манашкай і заўсёды была побач з Ефрасінняй. У "Жыціі" апякунка Беларусі параўноўваецца з сонечным промнем, які асвяціў Беларусь. Яе дзейснасць пакінула след не толькі ў гісторыі, але і ў душы беларускага народа, народа, адвеку звязанага з кнігай, народа, што з тых далёкіх часоў пракладваў ва ўсходнеславянскіх землях шляхі асветніцтва і адукацыі.

(Паводле Уладзіміра Бутрамеева)

**Каментарый:**

***пастрыглася ў манашкі (пастрыглася манашкай)*** – стала манашкай

**103. Адкажыце на пытанні:**

1. Калі жыла Ефрасіння Полацкая?
2. Кім з'яўляецца Ефрасіння Полацкая для Беларусі?
3. Сімвалам чанго стала яе імя?
4. Дзе нарадзілася Ефрасіння Полацкая?
5. Якое імя яна мела свецкае імя?
6. Якой дзейнасцю Ефрасіння Полацкая праславілася?
7. Які лёс крыжа Ефрасінні Полацкай?
8. Які бясцэнны абраз мела Ефрасіння Полацкая?
9. Дзе закончыла сваё зямное жыццё Ефрасіння?
10. Дзе зараз знаходзяцца яе святыя мошчы?

11.Які ўнікальны помнік распавядае пра Ефрасінню Полацкую?
12.З чым параўноўваюць апякунку Беларусі?

**104. Закончыце сказы:**

1. Ефрасіння была ўнучка. легендарнага…
2. Яна нарадзілася…
3. Аднак князёўна адмовіла ўсім жаніхам і…
4. Неўзабаве князёўна заснавала…
5. Вакол Ефрасінні аб'ядналася…
6. Дзякуючы Ефрасінні меў магчымасць працаваць…
7. У "Жыціі" апякунка Беларусі параўноўваецца з…

**105. Складзіце паводле тэксту дыялог.**

**106. Раскажыце пра вядомую жанчыну Вашай краіны.**

## ІІ. ПРАМЕЖК? ЧАСУ. ПРАЦО?НЫ ДЗЕНЬ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | стагоддзе | СУТКІ | дзень | ДЗЕНЬ | раніца |
| ЧАС | год | | ноч | | дзень |
| | месяц | | | | поўдзень |
| | дзень | | | | адвячорак |
| | гадзіна | | | | вечар |

| | | |
|---|---|---|
| хвіліна/мінута<br>секунда | | ноч |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| адзін | год∅, месяц∅, дзень∅,тыдзень ∅ | два, тры<br>чатыры | гад***ы***, месяц***ы,***<br>дн***і***, тыдн***і*** | пяць, | гад***оў***/год∅,<br>месяц***аў,***<br>дзён∅, тыдн***яў*** |
| адна | хвілін***а***/мінут***а***<br>гадзін***а*** | дзве<br>тры<br>чатыры | хвілін***ы***/мінут***ы***<br>гадзін***ы*** | шэсць<br>сем<br>і г.д. | хвілін∅/мінут∅<br>гадзін∅ |
| адны | суткі | двое,<br>трое | сутак | чацвёра,<br>пяцёра, | сутак |

**Парадкавыя лічэбнікі**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | першы | 11. | адзінаццаты | 30. | трыццаты |
| 2. | другі | 12. | дванаццаты | 40. | саракавы |
| 3. | трэці | 13. | трынаццаты | 50. | пяцідзесяты |
| 4. | чацвёрты | 14. | чатырнаццаты | 60. | шасцідзесяты |
| 5. | пяты | 15. | пятнаццаты | 70. | сямідзесяты |
| 6. | шосты | 16. | шаснаццаты | 80. | васьмідзесяты |
| 7. | сёмы | 17. | семнаццаты | 90. | дзевяносты |
| 8. | восьмы | 18. | васемнаццаты | 100. | соты |
| 9. | дзявяты | 19. | дзевятнаццаты | 1000. | тысячны |
| 10. | дзесяты | 20. | дваццаты | 1000000. | мільённы |

| | | | |
|---|---|---|---|
| ШТО? | раніца<br>дзень<br>вечар<br>поўдзень<br>Ноч<br>працоўны дзень<br>выхадны дзень<br>будні<br>свята | КАЛ?? | раніцай<br>удзень<br>увечар / увечары<br>апоўдні<br>уначы / ноччу<br>у працоўны дзень / працоўныя дні (В.)<br>у выхадны дзень / у выхадныя дні (В.)<br>у будні (В.)<br>у свята / у святы (В.) |

***– Колькі зараз гадзін?***
***– Скажыце, калі ласка, дакладны час.***
***– Скажыце, калі ласка, колькі зараз гадзін.***

**107. Пабудуйце сказы паводле ўзору.**

**Узор:** *Дакладны час сем гадзін.*

1 (адна), 21 (дваццаць адна) гадзіна, 8.15 (восем гадзін пятнаццаць хвілін/мінут), 12.00 (дванаццаць гадзін), 22 (дваццаць дзве) гадзіны, 20.45 (дваццаць гадзін сорак пяць хвілін/мінут).

**108. Запытайцеся ў свайго суседа (суседкі).**

а) — Скажы, калі ласка, дакладны час.
— ...
б) — Скажыце, калі ласка, колькі зараз гадзін.
— ...

**109. Выберыце словы, з якімі вы звернецеся**

а) да чужога незнаёмага чалавека;
б) да добрага знаёмага;
в) да сябра (сяброў).

1. — Прабачце, калі ласка, ці не скажаце дакладны час?
2. — Скажыце ж, колькі зараз гадзін.
3. — Колькі зараз?
4. — Колькі на тваім?

Пра што ў Вас спыталіся? Як вы адкажаце на наступныя пытанні?

1. — Ці ёсць у Вас (цябе) гадзіннік?
— ...
2. — Гадзіннік ёсць?
— ...

**Ужыванне парадкавых лічэбнікаў**
**пры абазначэнні часу**

Прыйсці *ў восем (гадзін)* = Прыйсці *а восьмай (гадзіне).*

Заняткі пачынаюцца *ў 8.15 (восем гадзін пятнаццаць хвілін)* – Заняткі пачынаюцца *ў пятнаццаць хвілін дзевятай / чвэрць дзевятай.*

Я прачынаюся *ў 7.30 (у сем гадзін трыццаць хвілін). —* Я прачынаюся *ў палове восьмай.*

! *Парадкавыя лічэбнікі ўжываюцца **толькі** пры абазначэнні гадзін сутак **ад 1 да 12**.*

**110. Дапоўніце рэплікі і прачытайце лічбы словамі.**

1. — Калі пачынаюцца лекцыі?
— Лекцыі пачынаюцца (8.30).
2. — Калі закончыцца фільм?
— Фільм закончыцца (20.15).
3. — Ці ты позна прачынаешся?
— Не, не позна, (6.30).
— Дык ты рана засынаеш?
— Так, у дзесяць гадзін вечара.
4. — Калі ты пазвоніш мне?
— Раніцай (9.00).

*гадзіннік ідзе — гадзіннік стаіць*
*гадзіннік адстае* = гадзіннік ідзе занадта павольна
*гадзіннік спяшаецца* = гадзіннік ідзе занадта хутка

**111. Вы ведаеце, што Ваш гадзіннік ідзе недакладна. Адкажыце на пытанні, спаслаўшыся на гадзіннік.**

1. — Чаму ты спазніўся на лекцыю?
— ...
2. — Ты чаму так рана прыйшоў?
— ...
3. — Чаму ты так нервуешся?
— ...

*спазняцца/спазніцца — прыйсці рана(загадзя)*

*наручны* гадзіннік *насценны* гадзіннік *падлогавы* гадзіннік *камінны* гадзіннік
будзільнік

**112. Прачытайце і перакажыце жарт.**

**Важная прычына**

*Настаўніца:* Юрась, ты чаму спазніўся на ўрок?
*Вучань:* У майго бацькі на гадзінніку цыферблат з памылкамі.

**113. Падайце прыдатныя прамежкі часу і дапоўніце рэплікі.**

1. — Ці спектакль *ужо* закончыўся?
   — *Не*, спектакль *яшчэ не* закончыўся. Закончыцца праз ....
2. — Ці Алеся закончыла школу?
   — Так, *ўжо* закончыла, ... таму.
3. — Ці гэта праўда, што Павел жэніцца?
   — Так, *ужо* ажаніўся ... таму
4. — Ці чула ты, што Алеся выйшла замуж?
   — *Не*, *яшчэ не* выйшла, праз ... будзем гуляць вяселле.

Для даведак: *некалькі хвілін, пару гадоў, тры месяцы, два тыдні, паўгадзіны, год, паўгода, тыдзень, некалькі дзён, дзень, дваццаць хвілін.*

**Прыблізнае ўказанне часу**

Час ці прамежак часу можна ўказаць дакладна: Я *працую* штодня (В.) *восем гадзін*, а можна ўказаць недакладна: Я працую штодня (В.) *гадзін восем*. Я працую штодня *каля* (Р.) *васьмі гадзін.*

**114. Трансфармуйце выдзеленыя сказы паводле ўзору.**

**Узор: — Калі ты прыйдзеш да мяне?**

**— (Я прыйду да цябе) *ў тры гадзіны.* ⇒ (Я прыйду да цябе) *гадзіны ў тры.* ⇒ (Я прыйду да цябе) *каля трох (гадзін).***

1. — Калі Алесь вернецца дадому?
   — *У восем гадзін вечара.*
2. — Як доўга працягваюцца лекцыі?
   — *Чатыры гадзіны.*
3. — Ці доўга ідзе спектакль?
   — *Спектакль ідзе тры з паловай гадзіны.*
4. — Ці доўга вы глядзелі фільм?
   — *Паўтары гадзіны.*
5. — Ці шмат часу вы правялі на экскурсіі?
   — *Два дні.*
6. — Колькі часу працягваюцца курсы беларускай мовы?
   — *Два месяцы.*

**115. Дапоўніце рэплікі ў дыялогах.**

1. Алесь: – Мама, я сёння вярнуся дадому позна.
   Маці: – Калі?
   Алесь: ...
2. Бацька: – Дзеці, я заўтра еду ў камандзіроўку.
   Дзеці: – Ці доўга будзеш у камандзіроўцы?
   Бацька: – ...
3. Вінцук: – Мы паспеем пасля кіно зайсці да Міхася.
   Алеся: А колькі часу ідзе фільм?
   Вінцук: – ...

***ДЫЯЛОГІ***

1. — Ці ідзеш ты ўжо дадому?
   — Не, я яшчэ зайду ў бібліятэку.
   — А калі пойдзеш дадому?
   — *Праз дзве – тры гадзіны.*
2. — Я чуў, ты вывучаеш японскую мову.
   — Гэта праўда.

— Ці даўно?
— Ужо *каля года*.
3. — Каця, ці ты пойдзеш сёння ў кіно?
— Калі?
— Гадзін у сем.
— Не ведаю яшчэ, ці *будзе* ў мяне сёння ўвечары *час*.
4. — Бабуля, звяжы мне шкарпэткі.
— Ці ж ты сама не ўмееш?
— Умею, дык мне *няма калі*.

**Вінавальны склон**

| | | |
|---|---|---|
| Убачыць | | чуж***ога*** чалавек***а*** |
| Запрэгчы | | сва***йго*** кан***я*** |
| Кахаць | | разумн***ага*** хлопц***а*** |
| Паслухаць | | родн***ага*** бацьк***у*** |
| Бавіць | | час∅ |
| Здаваць | **КАГО ?** | экзамен∅ |
| Успомніць | | далёк***ае*** сял***о*** |
| Узараць | | дзедав***а*** пол***е*** |
| Выпіць | | цёпл***ае*** малак***о*** |
| Убраць | | спел***ае*** збожж***а*** |
| Павіншаваць | ШТО ? | стрыечн***ую*** сястр***у*** |
| Парадаваць | | кахан***ую*** жонк***у*** |
| Падарыць | | чырвон***ую*** руж***у*** |
| Чытаць | | цікав***ую*** лекц***ыю*** |
| Гатаваць | | гусь∅ |
| Параніць | | лев***ую*** наг***у*** |

**116. Раскрыйце дужкі і пастаўце назоўнікі ў форму вінавальнага склону.**

1. Прафесар чытае студэнтам (лекцыя).
2. Аспірант піша (вялікі артыкул).
3. Селянін параніў (правая рука).
4. Студэнт абараняе (дыпломная работа).
5. Малыя дзеці п'юць (цёплае малако).
6. Марыля ўбачыла на двары (шэрая гусь).
7. Мінчане любяць (свой родны горад).

**117. Дапоўніце рэплікі формамі вінавальнага склону асабовых займеннікаў.**

| | |
|---|---|
| 1. — Дзе наш бацька?<br>— Не ведаю, я ... не сустрэў.<br>2. — Аліна, куды ты падзела маю зубную шчотку?<br>— Я ... не брала.<br>3. — Я не прынес ... кнігу.<br>— Шкада, я вельмі чакала ...<br>4. — Дзе можна ... сустрэць?<br>— ... лёгка знайсці ў інстытуце. | я — мяне<br>ты — табе<br>ён – яго<br>яна — яе |

**118. Прачытайце прыказкі, раскрыўшы дужкі і паставіўшы словы ў форме вінавальнага ці роднага склону.**

1. Знайшоў (нітка), знойдзеш і (клубок). 2. Не кладзі (паклон), калі (ты) не віншуюць. 3. Калі (хвоя) зрэзаў, то і (пень) прыбяры. 4. Не капаўшы (студня) (вада) не піць. 5. Каваль (конь) куе — і жаба (нага) дае. 6. Не выбірай (дзеўка) ў карагодзе, а шукай у агародзе.

***ТЭКСТ***

**У працоўны дзень**

Для сям'і Каваленкаў працоўны дзень пачынаецца ў 6.00 раніцы. Звоніць будзільнік. Мама будзіць Алеся, тата займае ванны пакой.

Алесь робіць гімнастыку, мыецца ў душы, брыецца. Матуля спяшаецца. Яна едзе да свайго завода каля гадзіны. Бабуля дае ўнуку і зяцю снеданне.

Хлопец збірае сумку і разам з татам выходзіць з дому. Алесь — студэнт універсітэта. Ва універсітэце выкладае беларускую мову яго бацька, ён прафесар.

З 8.15 да 14.00 Алесь на занятках. Гадзіны ў дзве ён прыязджае дадому на абед. Пасля абеду ідзе ў бібліятэку. Хлопец піша курсавую работу.

Удзень дома застаецца адна бабуля. У яе шмат працы. Яна купляе прадукты, гатуе абед, прыбірае ў кватэры. Яшчэ бабуля любіць глядзець серыялы. На гэта яна заўсёды знойдзе час.

Па вечарах Каваленкі дома. Пасля цяжкага працоўнага дня хочацца паглядзець тэлевізар, пачытаць кніжку ці паслухаць музыку. Але ў працоўныя дні на гэта няма часу. Тата ўключае камп'ютар і папраўляе сваю кнігу. Маці мые посуд і закладвае ў пральную машыну бялізну. Бабуля ўважліва слухае яе расказ пра надзённыя справы.

Парабіўшы ўсе справы, жанчыны будуць чакаць Алеся. Хлопец ведае, што маці і бабуля чакаюць яго. Алесь не спазняецца, у 22.00 ён звычайна ўжо дома.

**119. Адкажыце на пытанні да тэксту.**

1. Калі пачынаецца працоўны дзень Каваленкаў?
2. Хто гатуе тату і Алесю снеданне?
3. Дзе вучыцца Алесь?
4. Які прадмет выкладае яго бацька?
5. Што робіць Алесь у бібліятэцы?
6. Што робіць удзень дома бабуля?
7. Што робяць увечары Алесевы тата і маці?
8. Ці позна Алесь вяртаецца дадому?

**120. Дапоўніце сказы словамі з тэксту.**

1. Маці будзіць Алеся ў ... .
2. Алесева маці едзе на ....
3. Алесь выходзіць з дому разам з ....
4. Алесь знаходзіцца на занятках з ... да ... .
5. Пасля заняткаў Алесь прыязджае ... на абед.
6. Алесева бабуля любіць ... .
7. У працоўныя дні ў Каваленкаў няма часу, каб ...
8. Алесеў бацька піша ... .
9. Алесь ведае, што маці і бабуля ... .

**121. Адкажыце на пытанні. Выкарыстайце выразы ў рамцы.**

| | |
|---|---|
| 1. Што робіце вы звычайна ў працоўныя дні? А ў выхадныя?<br>2. Што робіце вы раніцай? Апоўдні? Увечары?<br>3. Якія заняткі падабаліся бы вам больш за ўсё, калі б вы былі дзіцем? Жанчынай? Мужчынам? | умывацца, накладваць макіяж, рабіць прычоску, займацца гімнастыкай, гатаваць, адпраўляць дзяцей у школу, брыцца, слухаць радыё, гуляць з сабакам, карміць ката;<br>хадзіць у школу, на працу, на лекцыі, у кіно, у тэатр; атрымліваць грошы, вучыць урокі, слухаць музыку, чытаць лекцыі, займацца спортам, сустракацца з сябрамі, прыбіраць у кватэры, чытаць кнігі (часопісы, газеты), прымаць ванну, глядзець тэлевізар, праць і прасаваць бялізну, хадзіць у госці, размаўляць па тэлефоне, рана класціся спаць, позна класціся спаць |

***ГРАМАТЫКА***

**Зваротныя дзеясловы**

Дзеясловы з постфіксам *-ся (-ца/-цца)* называюцца зваротнымі. Зваротны дзеяслоў не спалучаецца з дапаўненнем у форме вінавальнага склону.

| | |
|---|---|
| мыць (каго? што?) + Він.<br>Алеся *мые* (што?) бялізну. | мыцца<br>Алеся *мыецца (*= мые *сябе)*<br>ў ванне. |
| прывітаць (каго?) + Він.<br>Павел *прывітаў* (каго?) Алеся. | прывітацца<br>Сябры *прывіталіся*. |
| радаваць (каго?) + В?н.<br>Поспехі дзяцей *радуюць* (каго?) бацькоў. | Радавацца<br>Бацькі *радуюцца* поспехам дзяцей. |

**122. Раскрыйце дужкі, выберыце адпаведны дзеяслоў і складзіце сказы.**

1. Дзяўчына (прычэсвае, прычэсваецца) перад люстэркам. Дзяўчынка (прычэсвае, прычэсваецца) ляльку.

2. Хлопец (сустракае, сустракаецца) дзяўчыну. Хлопец (сустракае, сустракаецца) з дзяўчынай.

3. Вучань (вяртае, вяртаецца) кнігу ў бібліятэку. Вучань (вяртае, вяртаецца) дадому.

4. Маці (апранае, апранаецца) дзіця. Маці (апранае, апранаецца) у зімовае паліто.

5. Студэнт (рыхтуе, рыхтуецца) да экзамена. Студэнт (рыхтуе, рыхтуецца) дыпломную работу да абароны.

6. Алесь (брые, брыецца) дома. Цырульнік (брые, брыецца) кл?ента.

***ГРАМАТЫКА***

**Спражэнне зваротных дзеясловаў**

| мыцца, вучыцца | |
|---|---|
| Я мыю-ся, вучу-ся | Мы мыем-ся, вучым-ся |
| Ты мыеш-ся, вучыш-ся, | Вы мыеце-ся, вучыце-ся |
| Ён (яна, яно) мыец-ца, вучыц-ца | Яны мыюц-ца, вучац-ца |

**123. Пастаўце дзеясловы ў адпаведнай форме.**

1. Дзіця ўжо падрасло і (апранацца) само.

2. Хлопцы і дзяўчаты (сустракацца) і (знаёміцца) на дыскатэках.

3. Былыя студэнты філфака кожны год (збірацца) на вечар сустрэчы.

4. Раніцай добра (працавацца).
5. Ірына ніколі не (спазняцца) на працу.
6. Пенсіянеры ў працоўныя дні (заставацца) дома.

### Будучы час дзеяслова

Дзеясловы ў форме будучага часу абазначаюць дзеянне, якое будзе адбывацца потым, пасля заканчэння гутаркі. Формы будучага часу могуць быць простымі ці складанымі: *рабіць — раблю — буду рабіць* ці *зрабіць – зраблю*.

### Спражэнне дзеясловаў у будучым часе

| | | | |
|---|---|---|---|
| я<br>ты<br>ён, яна, яно<br>мы<br>вы<br>яны | буд*у* вучыцца<br>будз*еш* вучыцца<br>будз*е* вучыцца<br>будз*ем* вучыцца<br>будз*еце* вучыцца<br>буд*уць* вучыцца | я<br>ты<br>ён, яна, яно<br>мы<br>вы<br>яны | навуч*у*ся<br>навуч*ыш*ся<br>навуч*ыц*ца<br>навуч*ым*ся<br>навуч*ыце*ся<br>навуч*аң*ца |

**124. Пастаўце выдзелены дзеяслоў у форме будучага часу.**

1. Алесь Кавалёнак *прачынаецца* ў 6.00.
2. Матуля *спяшаецца*, бо ёй далёка ехаць да працы.
3. Хлопец *ідзе* ва ўніверсітэт разам з бацькам.
4. Алесь *піша* курсавую работу.
5. Бабуля *купляе* прадукты, *гатуе* абед, *прыбірае* ў кватэры.
6. Алесеў бацька *папраўляе* сваю кнігу.
7. У выхадныя дні Кавалёнкі глядзяць тэлевізар, чытаюць кнігі і слухаюць музыку.
8. Увечары маці і бабуля чакаюць Алеся.

| |
|---|
| Выбар простай ці складанай формы будучага часу залежыць ад ***трывання*** дзеяслова |

ТЫДЗЕНЬ: панядзелак, аўторак, серада, чацвер, пятніца, субота, нядзеля

| | |
|---|---|
| працоўны дзень | працоўныя дні |
| выхадны дзень / выхадны | выхадныя дні / выхадныя |
| будны (будзённы) дзень/будзень | будныя (будзённыя) дні / будні |
| святочны дзень/свята | святочныя дні / святы |

**125. Адкажыце на пытанне.**

*Што сёння за дзень?* — Сёння панядзелак (аўторак, серада, чацвер, пятніца, субота, нядзеля).

Н. *чацвер*
Р. *чацвярга*

Д. *чацвяргу*
В. *чацвер*
Тв. *чацвяргом*
М. *аб чацвяргу*

**126. Дапоўніце сказы словамі з рамкі. Вызначце час дзеясловаў.**

1. Я прыйду да цябе ... ... 2. Мы сустрэнемся з табой у ... ... 3. Ці маеш ты час у ... ...? 4. Дзе ты будзеш у ... ...? 5. ... ... пойдзеце у тэатр. 6. ... ... будзе канцэрт у філармоніі. 7. ... ... яны пойдуць у басейн.

| | |
|---|---|
| У (?) (+В.) | панядзелак<br>аўторак<br>сераду<br>чацвер<br>пятніцу<br>суботу<br>нядзелю |

***ДЫЯЛОГІ***

1. — Дзе ты працуеш?
— У школе.
— *Колькі дзён на тыдзень?*
— Шэсць, выхадны толькі ў нядзелю.
2. — У чацвер мы паедзем у лес.
— Але *па чацвяргах* у мяне ўрокі музыкі!
— У гэты чацвер свята, ці ты забыла?
3. — Як працуе ваша бібліятэка?
— Па будніх днях *з 9 гадзін* раніцы *да 9 гадзін* вечара.
— А ці адкрыта *па выхадных*?
— Так, але толькі *з 11 да 16.*
4. — Ці купіла мама абанементы ў басейн?
— Купіла.
— Як мы будзем хадзіць?
— Я і Алесь *па аўторках і пятніцах*, а мама і ты *па серадах і суботах.*

**127. Складзіце з дадзенага матэрыялу ўсе магчымыя сказы. Укажыце формы выражэння дакладнага часу.**

Увага: *хаджу, але выходжу.*

1. Я (выходзіць) з дому (рана, раніцай, позна, 7.00, у 19.15, у 14.30, 12.45, апоўдні, 11.00, удзень, увечар/увечары). 2. Мой працоўны дзень (пачынацца) (рана, позна, у 9.30, у 8.45, у 6 гадзін раніцы). 3. Я (хадзіць) у бібліятэку (па панядзелках, па аўторках, па серадах, па чацвяргах, па пятніцах, кожны дзень, адзін раз на тыдзень, адзін раз у месяц, у працоўныя/будзённыя дні). 4. Я (наведваць) тэатр (адзін раз у год, адзін раз у месяц, адзін раз на тыдзень, кожны месяц, па выхадных днях). 5. Заняткі працягваюцца (дзве гадзіны, сем гадзін, каля шасці гадзін, тры месяцы, два гады, пяць гадоў, адзін семестр, два семестры).

**128. Трансфармуйце словазлучэнні паводле ўзору.**

**Узор:** ***Мы кожны дзень ходзім у лес. – Мы штодня ходзім у лес.***

1. Студэнты ходзяць на заняткі *кожны дзень* (штодзень/штодня). 2. Мы з сястрой ходзім на канцэрты *кожны тыдзень* (штотыдзень). 3. Вучні школ *кожнае лета* (штолета) адпачываюць у лагерах адпачынку. 4. Глядзець тэлевізар *кожны вечар* (штовечар) — гэта шкадліва для здароўя. 5. *Кожны месяц* (штомесяц) трэба пакупаць новы праязны білет. 6.Малыя дзеці могуць плакаць *кожную хвіліну* (штохвіліны). 7. Гімнастыку трэба рабіць *кожную раніцу* (штораніцы). 8. *Кожную гадзіну* (штогадзіны) па радыё перадаюць навіны. 9.Мы ездзім да бабулі *кожны год* (штогод/штогоду).

**129. Складзіце ў парах дыялогі на тэму “Мой працоўны дзень”.**

**130. Сплануйце свой тыдзень наперад.**

**Поры года. Месяцы**

| ЗІМА | | ВЯСНА | | ЛЕТА | | ВОСЕНЬ | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 12. | снежань | 3. | сакавік | 6. | чэрвень | 9. | верасень |
| 1. | студзень | 4. | красавік | 7. | ліпень | 10. | кастрычнік |
| 2. | люты | 5. | май | 8. | жнівень | 11. | лістапад |

**131. Дапоўніце сказы назвамі месяцаў.**

**Узор:** ***Ліпень — самы цёплы месяц лета.***

1. ... — першы месяц зімы. 2. ... — першы месяц вясны. 3. ... — першы месяц лета. 4. ... — першы месяц восені. 5. ... — апошні месяц зімы. 6. ... — апошні месяц вясны. 7. ... — апошні месяц лета. 8. ... — апошні месяц восені. 9. ... — самы халодны месяц зімы. 10. ... — самы халодны месяц восені. 11. ... — самы цёплы месяц восені. 12. ... — сярэдзіна вясны. 13. ... — сярэдзіна лета. 14. ... — апошні месяц года. 15. ... — першы месяц года.

**132. Дапоўніце сказы словамі з рамкі.**

| | |
|---|---|
| КАЛІ ? | зімой/зімою/узімку<br>вясной/вясною/увесну<br>улетку/ летам<br>увосень/восенню |

1. У нас заўсёды холадна *(калі?)*..., а *(калі?)* ... цёпла. 2. Усё пачынае цвісці *(калі?)* ..., а вяне *(калі?)*... 3. Яблыкі спеюць *(калі?)*... 4. Ураджай збіраюць *(калі?)*... 5. *(Калі?)*... снег пакрывае зямлю.

**133. Адкажыце на пытанні, карыстаючыся словамі з рамкі.**

1. Свята Божага Нараджэння адзначаюць ... .... 2. Новы год пачынаецца ... ... 3. Мяцелі мятуць ... ... 3. Бярозавы сок збіраюць ... ... 4. Трава пачынае расці ... ... 5. Сады цвітуць ... ... 6. Студэнты абараняюць дыпломы ... ... 7. ... ... цвітуць ліпы. 8. ... ... збіраюць ураджай жыта. 9. ... ... пачынаецца навучальны год. 10. ... ... льюць халодныя дажджы. 11. ... ... на палі лажыцца першы снег.

| | |
|---|---|
| У,<br>(?)<br>(+ В.) | снежні<br>студзені<br>лютым<br>сакавіку<br>красавіку<br>маі<br>чэрвені<br>ліпені<br>жніўні<br>верасні<br>кастрычніку<br>лістападзе |

**Даты**

*Якое сёння чысло?*
*Калі гэта было?*
*Калі гэта здарылася?*

| | | |
|---|---|---|
| Нарадзіўся<br>ажаніўся<br>абараніўся | КАЛІ?<br>(Р.) | 6.07.1968<br>шост*ага* ліпен*я*<br>тысяча дзевяцьсот<br>шэсцьдзесят восьм*ага*<br>год*а* |

***Увага*!** Жнів*е*нь – жніўня, вера*се*нь – верасня, снеж*а*нь – снежня,
***але***: студз*е*нь – студз*е*ня, чэрв*е*нь – чэрв*е*ня, ліп*е*нь – ліп*е*ня,
***?*** лют*ы* — лют*ага*.

**134. Раскрыйце дужкі і адкажыце на пытанні паводле ўзору.**

**Узор:** ***Сёння чацвёртае/чацвёртага ліпеня (адна) тысяча дзевяцьсот дзевяноста дзевятага года.***

1. *Якое сёння число?* Сёння (5, красавік, 1678; 21, сакавік, 1999;).
2. *Якое ўчора было число?* Учора было (30, чэрвень, 1325; 16, снежань,).
3. *Якое пазаўчора было число?* Пазаўчора было (3, верасень, 1732; 7, май; 5 лістапад).
4. *Якое заўтра будзе число?* Заўтра будзе (9, кастрычнік, 2001; 29 люты).
5. *Якое паслязаўтра будзе число?* Паслязаўтра будзе (11, ліпень, 1857; 17, студзень; 13 жнівень, 2000).

| ПАЗАЎЧОРА | УЧОРА | СЁННЯ | ЗАЎТРА | ПАСЛЯЗАЎТРА |
|---|---|---|---|---|

**135. Дапоінўце сказ адпаведнай формай субстантываванага назоўніка *люты*.**

| |
|---|
| Н. лют***ы*** |
| Р. лют***ага*** |
| Д. лют***аму*** |
| В. лют***ы*** |
| Т. лют***ым*** |
| М. у лют***ым*** |

1. Хутка надышоў ... 2. У гэтым ... будзе 29 дзён. 3. Дзеці з радасцю чакалі ... 4. Усім надакучыў гэты ... 5. З ... прыйшлі вятры і завеі. 6. ... ў мінулым годзе быў надта халодны. 7. Хто з вас нарадзіўся 14 ...? 8. Мой бацька нарадзіўся ў ... 9. З ... пачынаецца другі семестр навучальнага года.

**136. Раскрыйце дужкі і складзіце сказы.**

1. (1, сакавік) – першы дзень вясны. 2. (27, жнівень) мы едзем на экскурсію. 3. Янка Купала нарадзіўся (7, ліпень, 1882 год). 4. (3, лістапад, 1882 год) нарадзіўся Якуб Колас. 5. У (1529 год) выйшла першая рэдакцыя “Статута Вялікага княства Літоўскага). 6. Францыск Скарына памёр (1541 год) у Празе.

**137. Адкажыце на пытанне:** ***Калі Вы нарадзіліся?***

**138. Раскажыце, што Вы плануеце зрабіць заўтра, паслязаўтра, у наступным месяцы, у наступным годзе.**

1. Заўтра я збіраюся ...
2. Паслязаўтра я пайду ...
3. У наступным месяцы (праз месяц) я ...
4. У наступным годзе (праз год) я ...

### Выражэнне часавых адносін у складаных сказах

| *калі? як доўга? з якога часу? да якога часу?* |
|---|

| | | |
|---|---|---|
| Кветкі зацвітаюць *(калі?)*, | *калі*<br>*як*<br>*як толькі* | прыходзіць вясна. |
| Дрэвы распускаюцца *(калі?)*, | *у той час як* | прыйдзе вясна. |
| Кветкі не зацвітаюць *(да якога часу?)*, | *пакуль* | не прыйдзе вясна. |
| Кветкі зацвітаюць *(калі?)*, | *ледзь*<br>*ледзь толькі* | прыйдзе вясна. |

**139. Аб’яднайце сказы пры дапамозе злучнікаў і злучальных слоў.**

**Узор:** ***Дзеці чакаюць. Вернецца маці дадому. – Дзеці чакаюць, калі вернецца маці дадому. Дзеці чакаюць, пакуль не вернецца маці дадому.***

1. Лістапад падчынаецца. Прыходзіць восень. 2. Раніца пачынаецца. Узыходзіць сонца. 3. Работа закончылася. Зрабілася цёмна. 4. Студэнты чакаюць. Прыйдзе прафесар. 5. Я прыеду. Ты мяне пазавеш. 6. Птушкі пяюць. Свеціць сонца. 7. Мы не пачнем працу. Не прыйдзе дырэктар.

**140. Дапоўніце сказы.**

1. Калі студэнты рыхтуюцца да экзамену, яны ... 2. Калі скончацца лекцыі, ...3. Пакуль не пачнецца зіма, ... 4. Як толькі прыходзіць лета, ... 5. Ледзь толькі прагляне сонейка, ... 6. Не прачынайся, ... 7. У вёсцы праца пачынаецца, ... 8. Як прыеду ў вёску, ...

*Для даведак*: няма маразоў, не губляюць дарма часу, усё навокал зелянее, мы пойдзем у кіно, пакуль цябе не абудзяць, ледзь толькі пачне світаць, пакуль цябе не просяць, сэрца радуецца.

***ТЭКСТ***

**Работа ў школе**

Работа ў школе наладзілася.

Малады настаўнік укладаў у яе сваю душу і сэрца. Кароткія зімнія дні праходзілі незаметна, іх не хапала на тое, каб як след правесці работу. Як толькі добра развіднялася і была магчымасць весці лекцыі, Лабановіч ішоў у школу, размеркаваўшы сваю работу між чатырох груп.

Многа патрабавалася ўмення на тое, каб кожная група была занята і не сядзела без работы. Многа трэба было энергіі і старання, каб кожная група была зацікаўлена і сваёй рабоце, каб увесь час трымаць школу на вышыні таго ці іншага настрою. Удзень вучні распускаліся на паўтары гадзіны для абеду. Пасля лекцыі зноў ішлі да самага вечара, пакуль не цямнела. Часта са старэйшымі вучнямі лекцыі вяліся і вечарамі пры лямпе. Потым настаўнік яшчэ доўга сядзеў над сшыткамі і папраўляў іх. Маладых сіл было многа; здавалася, ніколі не вычарпаеш іх, і расходаваліся яны так, як расходуе з восені заможны, але маладасведчаны і непрактычны гаспадар багаты збор ад свае нівы.

Але ў сваёй рабоце чэрпаў малады настаўнік поўную чару высокага задавальнення, назіраючы, як дзеці набіраліся ведаў, лёгка асільвалі тое, што яшчэ ўчора здавалася ім незразумелым і трудным. <...>Скончыўшы навучанне і перагледзеўшы работы вучняў, Лабановіч часта падводзіў падрахункі дню; пры гэтым разважаў ён і аб тым, як абысці тыя пахібы і памылкі, якіх так трудна бывае пазбегнуць у школе маладому, малавопытнаму настаўніку. <...>

(Якуб Колас "У палескай глушы")

**Каментарый:**

| | |
|---|---|
| (работа) наладзілася; *інф.* наладзіцца | паступтова змяніла сваю якасць на лепшую |
| укласці/укладваць душу(сэрца) *(ува што? куды?)* | *метафар.* выконваць нейкую справу вельмі старанна і адказна |
| сядзець без работы | не працаваць, нічога не рабіць (па ўласнаму жаданню ці вымушана) |
| папраўляць (правяраць) сшыткі | знаходзіць у пісьмовых работах вучняў памылкі і выпраўляць іх |
| чэрпаць сілы *(у чым? дзе?)* | *паэт.* знаходзіць магчымасць, сілу, жаданне для нейкіх спраў у знешніх крыніцах |
| заможны (чалавек) | багаты чалавек |
| маладасведчаны (чалавек) | той, хто не мае/мала мае дастатковых ведаў, вопыту, дасведчанасці |
| чэрпаць поўную чару*(чаго?)*/поўнай чарай *(што?)* | *паэт.* карыстацца чым-небудзь ці адчуваць што-небудзь як мага поўна |
| набірацца/набрацца *(чаго?)* | вучыцца, набываць знанн?, уменн?, вопыт |

знання/вопыту/мудрасці

| | |
|---|---|
| падводзіць рахункі/падрахункі *(чаго? чаму?)* (дню) | – *метаф.* аналізаваць удачы і недахопы ў працы ці ў жыцці за пэўны перыяд часу |

**141. Адкажыце на пытанні да тэксту.**

1. Як працаваў Андрэй Лабановіч у школе?
2. Калі Лабановіч пачынаў сваю працу?
3. Як праходзіў працоўны дзень маладога настаўніка?
4. Як арганізоўваў настаўнік работу вучняў?
5. Ці спраўляўся Лабановіч са сваёй работай?
6. Ці падабалася Лабановічу яго праца?
7. Як расходаваў свае маладыя сілы Лабановіч?
8. Ці задаволены быў Лабановіч сваёй працай?

**142. Укажыце, у якіх значэннях ужывае Я. Колас слова *работа*.**

**143. Раскажыце, што вы ведаеце пра працу настаўнікаў у Вашай краіне.**

**144. Раскажыце пра свой звычайны ці незвычайны працоўны дзень, пачаўшы расказ прыкладна так:**

У гэты дзень я прачнуўся (прачнулася) як звычайна (незвычайна, не так, як заўсёды)...

## III. КВАТЭРА. ВЯСКОВАЯ ХАТА

### I. КВАТЭРА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| стаяць | *дзе?* | на стале<br>на паліцы<br>у вазе<br>у буфеце (т / ц) | | |
| ставіць<br>паставіць | *дзе?* | у калідоры<br>у гасцёўні<br>на балконе<br>на падлозе (г / з) | *куды?* | у (на) кут<br>у (на) халадзільнік |
| размясціць<br>размяшчаць | *дзе?* | у спальні<br>у кабінеце<br>у кладоўцы | *як?* | уздоўж сцяны<br>каля акна<br>насупраць дзвярэй |
| ляжаць | *дзе?* | у (на) кніжнай шафе<br>у (на) пісьмовым стале | | |
| палажыць | *куды?* | на акно<br>на табурэтку<br>на крэсла | | |
| легчы | *куды?* | на канапу<br>на ложак | | |
| класці<br>пакласці | *куды?* | на буфет<br>на секцыю | *дзе?* | у кухні<br>у калідоры |
| вісець | *дзе?* | на вешалцы (к / ч)<br>на сцяне<br>на покуце (т/ ц)<br>на столі | | |
| вешаць<br>павесіць | *куды?* | на дзверы<br>на акно (вокны)<br>на сцяну | *што?* | гардзіны<br>занавескі<br>люстэрка<br>люстру<br>карціну |
| будаваць<br>збудаваць | *што?* | дом<br>хату<br>дачу<br>катэдж<br>лецішча | *дзе?* | у горадзе<br>у вёсцы |

| **Памяшканне** | **Часткі памяшкання** | **Мэбля** | **Прадметы быту** | **Электрычныя прыборы** |
|---|---|---|---|---|
| Гасцёўня<br>Спальня | акно<br>сцяна | ложак<br>канапа | настольнік<br>сурвэтка | тэлевізар<br>прайгравальнік |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Дзіцячы пакой<br>Кабінет<br>Кухня<br>Вітальня<br>Калідор<br>Ванны пакой<br>Туалет<br>Лоджыя<br>Балкон<br>Кладоўка | падлога<br>столь<br>дзверы<br>парог | спальны гарнітур<br>крэсла<br>табурэтка<br>зэдлік<br>стол<br>журнальны столік<br>вешалка | люстэрка<br>люстра<br>дыван<br>занавеска<br>фіранка<br>гардзіна<br>цюль | магнітафон<br>камп'ютэр<br>міксер<br>электрычная пліта |

**145. Прачытайце. Адкажыце, што абазначаюць гэтыя словы.**

**Узор:** ***Спальня – гэта памяшканне.***

| | **Гасціная …** | **настольнік …** |
|---|---|---|
| кухня … | люстэрка … | |
| калідор … | люстра … | |
| акно … | электрычная пліта … | |
| столь … | тэлевізар … | |
| падлога … | камп'ютэр … | |
| ложак … | дыван … | |
| канапа … | фіранка … | |
| крэсла … | | |

**146. Устаўце замест кропак прыдатныя па сэнсу дзеясловы. Выкарыстайце словы для даведак.**

**Узор:** ***Кніга … на паліцы. — Кніга ляжыць на паліцы.***

1. Падушка … на канапе. 2. Ваза … на стале. 3. Люстэрка … на сцяне. 4. Ложак … у спальні. 5. Тэлевізар … каля акна. 6. Вешалка … у прыхожай. 7. Кватэра … на другім паверсе. 8. Дыван … на падлозе.

*Словы для даведак:* ляжаць, стаяць, вісець, знаходзіцца..

| |
|---|
| **Што ляжыць на стале?**<br>На стале ляжыць *сурвэтка.*<br><br>**Дзе ляжыць сурвэтка?**<br>Сурвэтка ляжыць *на стале.*<br><br>**Дзе стаіць стол?**<br>Стол стаіць *у гасцінай.* |
| Адказ на пытальнае слова звычайна ў канцы сказа. |

**147. Разгледзьце малюнак. Адкажыце на пытанні. Выберыце для адказу патрэбныя словы.**

1. Што стаіць на журнальным століку? — На журнальным століку стаіць …
   а) ваза з кветкамі;
   б) лямпа.
2. Што стаіць у кніжнай шафе? — У кніжнай шафе стаіць (стаяць)…
   а) кнігі;
   б) прайгравальнік; в) карціна.
3. Што ляжыць на канапе? – На канапе ляжыць …
   а) кніга;
   б) занавеска;
   в) падушка.
4. Што вісіць на сцяне? – На сцяне вісіць … і …
   а) люстэрка;
   б) карціна;
   в) кніжная паліца.
5. Што вісіць на акне? – На акне вісіць (вісяць) …
   а) кашпо;
   б) гардзіна;
   в) занавескі.
6. Што вісіць на столі? – На столі вісіць …
   а) лямпа;
   б) люстра;
7. Дзе стаіць журнальны столік? – Журнальны столік стаіць …
   а) каля акна;
   б) каля кніжнай шафы;
   в) пасярэдзіне пакоя.
8. Дзе стаіць кніжная шафа? – Кніжная шафа стаіць …
   а) каля дзвярэй;
   б) каля акна.
9. Дзе стаіць піяніна? – Піяніна стаіць …
   а) каля дзвярэй;
   б) каля акна.
10. Што стаіць справа ад акна? – Справа ад акна стаіць …
   а) піяніна;
   б)вазон.
11. Што стаіць каля журнальнага століка? – Каля журнальнага століка стаіць …

а) крэсла;
б) канапа;
в) лямпа.

12. Што ляжыць на падлозе? – На падлозе ляжыць …
а) дыван;
б) кніга;
в) падушка.

**148. Раскажыце, якая мэбля ёсць: а) у вашым пакоі; б) у вашай кватэры; в) у аўдыторыі (класе).**

*ТЭКСТ*

**Кватэра Алеся Кавалёнка**

Сям'я Алеся Кавалёнка жыве ў новым дзевяціпавярховым доме на вуліцы Захарава. Ён знаходзіцца недалёка ад станцыі метро "Плошча Перамогі". Кавалёнкі пераехалі сюды нядаўна. Раней яны жылі на праспекце Пушкіна ў двухпакаёвай кватэры.

У доме ёсць усе выгоды: ліфт, газ, тэлефон, цёплая і халодная вада, цэнтральнае ацяпленне. Кватэра Алеся размешчана на чацвёртым паверсе. Яна добра спланавана: усе пакоі асобныя, вялікая кухня і прыхожая. Ёсць лоджыя і кладоўка. Спальня і дзіцячы пакой невялікія, але ўтульныя.

У гасцёўні справа ад дзвярэй стаіць канапа, насупраць яе – кніжная шафа і буфет. У куце каля акна – каляровы тэлевізар. Два крэслы і журнальны столік размешчаны пасярэдзіне пакоя. На століку стаіць заўсёды ваза з кветкамі. Маці любіць свежыя кветкі. Над канапай вісіць карціна. На падлозе ляжыць мяккі шарсцяны дыван. Сцены і столь паклеены светлымі шпалерамі. На вокнах блакітныя занавескі. Вечарам усе збіраюцца ў гасцёўні і глядзяць тэлевізар. У гэтым пакоі яны прымаюць і гасцей.

Харчуецца Алесева сям'я на кухні. Тут ёсць газавая пліта, халадзільнік, шафа для посуду, стол і чатыры табурэткі. Сцены кухні аздоблены дэкаратыўнымі талеркамі. Каля пасудамыйкі вісіць ручнік .

У вітальні на сцяне вісіць люстэрка і тэлефон, побач стаіць вешалка.

Алесева сям'я задаволена сваёй кватэрай.

**149. Адкажыце на пытанні.**

1. У якім доме жыве сям'я Алеся Кавалёнка?
— Сям'я Алеся Кавалёнка жыве ў … доме.
2. На якой вуліцы жыве Алесева сям'я?
— Алесева сям'я жыве на вуліцы …
3. Дзе раней жыла Алесева сям'я?
— Алесева сям'я раней жыла на … ў … кватэры.
4. Недалёка ад якой станцыі метро знаходзіцца Алесеў дом?
— Алесеў дом знаходзіцца …
5. Якія выгоды ёсць у доме Алеся?
— У доме Алеся ёсць …
6. На якім паверсе знаходзіцца кватэра Алеся?
— Кватэра Алеся знаходзіцца на …
7. Ці добра спланавана кватэра Алеся?
— Кватэра Алеся спланавана …
8. У якім пакоі вечарам збіраецца Алесева сям'я?
— Вечарам Алесева сям'я збіраецца …
9. Што робіць сям'я Алеся ў гасцёўні вечарам?
— Вечарам у гасцёўні сям'я Алеся …
10. Дзе Алесева сям'я прымае гасцей?

— Алесева сям'я прымае гасцей …
11. Дзе харчуецца сям'я Алеся ?
— Сям'я Алеся харчуецца …
12. Ці задаволена сям'я Алеся Кавалёнка сваёй кватэрай? / Задаволена сям'я Алеся Кавалёнка сваёй кватэрай?
— Сям'я Алеся Кавалёнка …

*ГРАМАТЫКА*

## Адносныя прыметнікі

| ***што?*** | ***які?*** | ***што?*** | ***які?*** |
|---|---|---|---|
| Блок | блоч-**Н**-ы | кніга | кніж-**Н-**ы |
| Гліна | глін-**ЯН**-ы | пісьмо | пісьм-**ОВ-**ы |
| Дрэва | драўл-**ЯН**-ы | журнал | журналь-**Н**-ы |
| Цэгла | цагл-**ЯН-**ы | колер | каляр-**ОВ**-ы |
| Шкло | шкл-**ЯН**-ы | вугал | вугл-**АВ**-ы |
| Дуб | дуб-**ОВ**-ы | кухня | кухон-**Н**-ы |
| Крышталь | крышталь-**Н**-ы | электрычнасць | электрыч-**Н**-ы |
| Дзіця | дзіяц-**ЯЧ-**ы | газ | газ-**АВ**-ы |
| Асфальт | асфальт-**АВ-**ы | | |

**150. Падбярыце да назоўнікаў прыдатныя па сэнсу прыметнікі.**

| | |
|---|---|
| а) Ваза, стол, пліта | гліняны, газавы, пісьмовы |
| б) тэлевізар, канапа, шафа | кніжны, каляровы, дубовы |
| в) дом, пакой | драўляны, дзіцячы |

**151. Устаўце замест кропак прыдатныя па сэнсу прыметнікі.**

| | |
|---|---|
| 1. Брат пабудаваў … дом. | цагляны |
| 2. У гасцёўні стаіць … столік. | журнальны |
| 3. На стале стаіць … ваза. | крыштальны |
| 4. Алесь купіў … гарнітур. | кухонны |
| 5. Дзверы ў калідоры … | дубовы |

*ГРАМАТЫКА*

## Месны склон назоўнікаў (месца)
## (дзе?)
## Адзіночны лік

**цвёрдая аснова**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Стол **ш** | | | Кніга ляжыць **на** сталЕ. |
| Сцян-**а** | ***на чым?*** | **-Е** | Карціна вісіць **на** сцянЕ. |
| Акн-**о** | → | | Вазон стаіць **на** акнЕ. |

**мяккая аснова**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Музей **ш** | | | Экспанаты размешчаны **ў** музеІ. |
| Глыбінн-**я** | **у** ***чым?*** | **-І** | Хата стаіць у глыбінІ двара. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Пол-**е** | → | | | Бацька працуе **ў** пол**І**. |

**зацвярдзелая аснова**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Трактар **ш**<br>Вуліц-**а**<br>Возер-**а** | ***на чым?***<br>→ | **-Ы** | Дровы прывезлі **на** трактар**Ы**.<br>Многа народу было **на** вуліц**Ы.**<br>Гусі плавалі **на** возер**Ы.** |

**на** ***г, к, х***

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Парог-**ш**<br>Страх-**а** | ***на чым?***<br>→ | **-Е** | **? / з**<br>**х / с** | Кот сядзіць **на** пароз**Е.**<br>Снег ляжыць **на** страс**Е.** |
| Мітынг **ш**<br>Мох **ш**<br>Люстэрк-**а** | ***на чым?***<br>→ | **-У** | **ш** | *Я* павінен быць **на** мітынг**У**.<br>Ляжаць **на** мох**У**.<br>Муха сядзіць **на** люстэрк**У**. |

**Выбар канчатка ў месным склоне залежыць ад тыпу асновы**

**быць**
*дзе?*

**!**

**у** тэатр-**ы**, але **на** спектакл-**і, на** балец-**е**
**у** школ-**е**, але **на** ўрок-**у**

**152. Пастаўце словы , змешчаныя ў дужках , у месным склоне.**
**Узор:** ***Брат жыве ў (Полацк). — Брат жыве ў Полацку.***

1. Курсы беларускай мовы працуюць пры *(універсітэт)*. 2. Летам Алесь будзе адпачываць на Мінскім *(мора)*. 3. Учора сястра была ў *(тэатр)*. 4. Маці працуе ў *(бібліятэка)*. 5. Высока ў *(неба)* ляціць самалёт. 6. Пісьмо ляжыць у *(канверт)*. 7. Бацька і сын былі на *(спектакль)*. 8.Дачка вучыцца ў *(школа)*.

**153. Устаўце прыдатныя па сэнсу прыназоўнікі** ***(на, каля, у, над).***
**Узор:** ***Алесь жыве … горадзе Мінску. — Алесь жыве ў горадзе Мінску.***

1. Дом Алеся знаходзіцца … вуліцы Захарава. 2. … яго трохпакаёвая кватэра. 3. Яна размешчана … чацвёртым паверсе. 4. … гасцёўні … куце стаіць каляровы тэлевізар. 5. … сцяны стаіць кніжная шафа і буфет. 6. … столі вісіць прыгожая люстра. 7. … акна стаіць вазон. 8. … акне вісяць блакітныя занавескі. 9. … падлозе ляжыць мяккі дыван. 10. … кухні стаіць халадзільнік і электрычная пліта. 11. … вітальні … сцяне вісіць тэлефон. 12. … вешалцы вісіць капялюш і паліто. 13. … ложку ляжыць падушка. 15. … піяніна вісіць карціна.

| | |
|---|---|
| я жыв-У | мы жыв-ЁМ |
| ты жыв-ЕШ | вы жыв-ЯЦЕ |
| ён (яна, яно) жыв-Е | яны жыв-УЦЬ |

**154. Прачытайце. Устаўце замест кропак прыдатныя па сэнсу займеннікі.**
**Узор: ... *(я, ты) жыву ў горадзе. — Я жыву ў горадзе.***

1. ... *(вы, мы)* жывём у горадзе.
2. ... *(яны, ён)* жывуць за горадам.
3. ... *(ты, мы)* жывеш у Мінску.
4. ... *(яна, ты)* жыве з братам.
5. ... *(ты, вы)* жывяце на праспекце Машэрава.
6. ... *(я, мы)* жыву з бабуляй.

**155. Прачытайце. Звярніце ўвагу на вымаўленне і правапіс адмоўнай часціцы *не* з дзеясловамі.**

| **Вымаўляецца** | **Пішацца** |
|---|---|
| **[н'а]** | |
| ня маю | не маю |
| ня бы'ў | не бы'ў |
| ня жы'ў | не жы'ў |
| **[н'э]** | |
| не стаіць | не стаіць |
| не вісіць | не вісіць |
| не ляжы'ць | не ляжы'ць |

**156. Правільна прачытайце:**

| | |
|---|---|
| 1. Кніга ляжы'ць на паліцы. | Кніга не ляжы'ць на паліцы. |
| 2. Ваза станць на стале. | Ваза не станць на стале. |
| 3. Карціна вісіць на сцяне. | Карціна не вісіць на сцяне. |
| 4. Брат мае кватэру. | Брат не мае кватэры. |
| 5. Сястра ходзіць у дзіцячы садок. | Сястра не ходзіць у дзіцячы садок. |
| 6. Юрась вучыцца ў школе. | Юрась не вучыцца ў школе. |
| 7. Міхась жыў у горадзе. | Міхась не жыў у горадзе. |

## Месны склон займеннікаў
## Асабовыя

| Назоўны склон | Месны склон |
|---|---|
| Я<br>Ты<br>Ён/яно<br>Яна | (аб/аба, на, па, у) мне<br>табе<br>ім<br>ёй |

! У беларускай мове прыназоўнік **аб** у месным склоне ўжываецца, як правіла, у навуковым і афіцыйна-дзелавым стылі*: Прыняты закон аб дзяржаўнай мове.*

Да прадмета гаворкі, думкі, пачуцця ў беларускай мове часцей ужываецца прыназоўнік **пра** і займеннік у форме вінавальнага склону: *думаць пра яго (мяне, цябе, нас).*

Кніга ляжыць на ма-ІМ (тва-ІМ ) стале.

ма-ЁЙ (тва-ЁЙ) паліцы.

Кніга ляжыць на гэт-. ЫМ стале.
гэт- АЙ паліцы

**157. Раскрыйце дужкі, пастаўце займеннікі ў форме меснага склону.**

**Узор:** ***Учора я быў у ( гэта) парку. — Учора я быў у гэтым парку.***

1.Піяніна стаіць у (мой) пакоі. 2. Сын вучыцца у (гэты) школе. 3. Маці працуе ў (гэты) бібліятэцы. 4. Бацька працуе ў (свой) фірме). 5. Лекцыя адбудзецца ў (гэты) аўдыторыі.

**158. Устаўце прыдатныя па сэнсу прыназоўнікі аб, пра разам з залежнымі словамі ў патрэбнай граматычнай форме.**

**Узор:** ***Сын атрымаў пасведчанне … (заканчэнне школы). — Сын атрымаў паседчанне аб заканчэнні школы.***

1. Бацька атрымаў пасведчанне …(*нараджэнне дачкі*).
2. Сыну выдалі дыплом …(*заканчэнне універсітэта*).
3. У сачыненні Алеся расказала…(*наша сяброўства*).
4. Бабуля часта ўспамінала… (*сваё дзяцінства*)

**Месны склон прыметнікаў**
**Адзіночны лік**

| | **Назоўны склон** | **Тып асновы** | **Месны склон** |
|---|---|---|---|
| ***Муж. род*** | дуж-Ы (сын)<br>мал-Ы<br><br>летн-І (дзень)<br>доўг-І | ***Цвёрдая аснова***<br><br><br>***Мяккая аснова і на Г, К,Х*** | (аб) дуж-ЫМ (сыне)<br>мал-ЫМ<br><br>летн-ІМ (дні)<br>доўг-ІМ |
| ***Жан. род*** | дуж-АЯ (дачка)<br>мал-АЯ<br><br>летн-ЯЯ (сукенка)<br>сін-ЯЯ<br><br>доўг-АЯ (сукенка)<br>лёгк-АЯ | ***Цвёрдая аснова***<br><br><br>***Мяккая аснова***<br><br><br>***Аснова на Г, К, Х*** | дуж-АЙ (дачцэ)<br>мал-ОЙ<br><br>(у) летн-ЯЙ (сукенцы)<br>сін-ЯЙ<br><br>(у) доўг-АЙ (сукенцы)<br>лёгк-АЙ |
| ***Ніякі род*** | мал-ОЕ (дзіця)<br><br>летн-ЯЕ (паліто)<br><br>сух-ОЕ (сена) | ***Цвёрдая аснова***<br><br>***Мяккая аснова***<br><br>***Аснова на Г, К, Х*** | (аб) мал-ЫМ (дзіцяці)<br><br>(у) летн-ІМ (паліто)<br><br>(у) сух-ІМ (сене) |

**159. Дапасуйце прыметнікі да назоўнікаў у форме меснага склону.**

**Узор:** ***Вада стаіць на лаўцы ў (пластмасавае вядро). — Вада стаіць на лаўцы ў пластмасавым вядры.***

1. Хлопцы стаялі на (*высокі бера ракі*).
1. Было цёмна і няўтульна ў (*вузкі калідор*).
2. Дзеці гуляюць ў (*жоўты пясок*).

3. Каструля стаіць на (*электрычная пліта*).
4. Студэнты былі ў Маскве на (*міжнародны кангрэс*).
5. Дзеці гадаваліся ў (*малая сям'я*).
6. Кот ляжыць на (*цёплы*) печы.
7. Зоры зіхацяць у (*сіняе неба*).

***ДЫЯЛОГІ***

**160. Прачытайце дыялогі. Складзіце на ўзор свае дыялогі.**

— Дзе жыве твой брат?
— У Мінску.
— На якой вуліцы?
— На вуліцы Купалы.
— Ці даўно ён там жыве?
— Нядаўна.
— А дзе ён жыў раней?
— На праспекце Машэрава.

— Вы жывяце ў блочным доме ці цагляным?
— У цагляным.
— У вашым доме ёсць сучасныя выгоды?
— Так, ёсць ліфт, тэлефон, электрычнасць, газ, цэнтральнае ацяпленне, халодная і гарачая вада.

**161. Прачытайце дыялогі ў парах.**

— Скажыце, калі ласка, у вас каляровы тэлевізар ці чорна-белы?
— Каляровы.
— Якой маркі?
— У нас "Гарызонт".
— Хто іх выпускае?
— Мінскі радыётэхнічны завод.
— Вы задаволены ім?
— Так. Ён мае сучасны дызайн і зручны ў карыстанні.

— У вас ёсць камп'ютэр?
— Так. Купілі нядаўна.
— Дзе вы яго размясцілі?
— На пісьмовым стале ў дзіцячым пакоі.
— А хто на ім працуе?
— Уся сям'я: я і жонка, сын і дачка.

**162. Прачытайце дыялог. Назавіце яго ўдзельнікаў. У якой сітуацыі ён мог адбыцца?**

— Добры дзень!
— Дзень добры!
— Гэта кватэра Алеся Кавалёнка?
— Не, ён тут не жыве. Нядаўна яны атрымалі новую кватэру і пераехалі жыць на вуліцу Захарава.
— Я – Алесеў сябра. Мы разам вучыліся ў школе. Зараз я жыву ў Брэсце. Прыехаў праведаць бацькоў і вельмі хацеў бы ўбачыцца з Алесем. Можа, вы ведаеце яго адрас?
— Так, ведаю. Запішыце: вуліца Захарава, дом 10, кватэра 68.

— А нумар тэлефона?
— 234-51-06.
— Вялікі дзякуй. Ці не падкажаце яшчэ, як лепш даехаць да вуліцы Захарава?
— Зручней на метро. Прыпынак "Плошча Перамогі".
— Шчыра дзякую.Бывайце здаровы.
— Усяго вам добрага.

**163. Прачытайце дыялог. Складзіце па аналогіі свой дыялог.**

— Алесь, ці не пара нам купіць новы спальны гарнітур?
— Вольга, а куды стары?
— На дачу.
— Добрая думка. А які ты хочаш?
— Мне падабаецца мэбля італьянскай вытворчасці. Яна сучасная і вельмі прыгожая.
— Не, для нашай спальні італьянскі гарнітур наўрад ці падыдзе.
— Чаму ?
— Спальня малая.
— Тады які?
— Мне, напрыклад,да спадобы гарнітур "Мара". Іх робяць у Маладзечна.
— З якога матэрыялу?
— З дубу. Да таго ж гарнітур аздоблены мастацкай разьбой.
— Алесь, гэта старамодная мэбля.
— Не зусім так.Ён не старамодны, а зроблены ў народным стылі.
— Добра, паедзем заўтра ў мэблевы магазін і паглядзім гэты гарнітур.

**164. Дапоўніце дыялогі рэплікамі. Пашырце сітуацыю.**

А. — На якой вуліцы ты жывеш? *(Купалы, Мележа, Заслаўская, Голубева)*.
— …
— Твой дом далёка ад метро? *(далёка, блізка, не вельмі, побач з домам)*
— …
— На якім паверсе твая кватэра? *(першым, другім, трэцім, чацвёртым, пятым)*

Б. — Твая сястра даўно атрымала кватэру? *(даўно, нядаўна, у гэтым годзе, у мінулым годзе)*
— …
— А дзе яна раней жыла? *(за горадам, у вёсцы, на вуліцы Прытыцкага)*
— …
— Яна задаволена сваёй кватэрай? *(не вельмі, не зусім)*
— …
— А што ёй не падабаецца *(малая кухня, малы калідор, няма балкона, лоджыі)*

В. — Дзе стаіць у вас канапа? *(каля сцяны, каля акна, уздоўж сцяны, пасярэдзіне пакоя)*
— …
— Якая ў вас канапа? *(сучасная, абцягнутая велюрам (скурай), старамодняя, аздобленая разнымі дэталямі)*
— …

**165. Складзіце дыялогі ў наступных сітуацыях:**

1. Вы сустрэлі свайго знаёмага і хочаце даведацца, дзе ён зараз жыве, дзе працуе. Ён паведамляе вам свой адрас і месца працы.
2. Ваш сябра купіў новы тэлевізар. Вы хочаце даведацца, якой маркі ён купіў тэлевізар, хто іх выпускае, колькі каштуе, які дызайн.

3. Ваша жонка (маці) вырашыла купіць новы кухонны гарнітур. Ёй падабаецца сучасная мэбля, а вам старадаўняя. Вы абгрунтоўваеце сваю думку, але жонка (маці) не пагаджаецца з вамі.

## II. Вясковая хата

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| запрашаць<br>запрасіць | ***куды?*** | у вёску<br>у хату<br>за стол | ***калі?*** | у нядзелю<br>у панядзелак |
| расці<br>вырасці | ***дзе?*** | у агародзе<br>у садзе<br>на градзе | | |
| абаграваць<br>абагрэць | ***што?*** | хату<br>пакой | | |

**166. Прачытайце, запомніце, што абазначаюць гэтыя словы.**

| | | |
|---|---|---|
| **Сядзіба** | дом | двор |
| | хата | агарод |
| | хлеў | сад |
| | гумно | кветнік |

| | **м.р.** | **ж.р.** | **н.р.** |
|---|---|---|---|
| **Свойская жывёла** | кот | кошка | кацяня |
| | сабака | сучка | шчаня |
| | бык | карова | цяля |
| | кабан | свіння | парася |
| | казёл | каза | казляня |
| | баран | авечка | ягня |
| | гусак | гусь | гусяня |
| | качар | качка | качаня |
| | певень | курыца | кураня |
| | конь | кабыла | жарабя |

**167. Словы, што стаяць у дужках, пастаўце ў патрэбнай граматычнай форме. Назавіце словы, у якіх на месцы *д* стала *дз*.**

**Узор*: Ружы, вяргіні, флёксы растуць у (кветнік). — Ружы,вяргіні,флёксы растуць у кветніку.***

1. Морква, цыбуля, агуркі растуць у *(агарод)*.
2. Яблыкі, грушы, слівы растуць у *(сад)*.
3. Карова, авечка, свіння жывуць у *(хлеў)*.

**168. Прачытайце верш "Смачны горад". Скажыце, што ў ім расце.**

Смачны горад —
сад-гарод.
Незвычайны тут
народ:
моркаўка,
капуста —

паласатыя
бакі,
бручка,
рэпка
і салат
ды і кропу,

кожнаму
па густу…
Памідоры ёсць,
гуркі —
маку шмат.
Добры горад-гарадок,
гэта
школьны наш садок.

Авяр'ян Дзеружынскі

**169. Адкажыце на пытанні.**

1. Што яшчэ можа расці ў "Смачным горадзе"?
2. Якім адным словам называюць усіх "жыхароў" "Смачнага горада"?

***ТЭКСТ***

**Міхасёва сядзіба**

Алесеў сябра Міхась родам з Лагойшчыны. Ён жыве ў вёсцы Гайна, за шэсцьдзесят кіламетраў ад Мінска. У нядзелю ён запрасіў Алеся ў госці. Алесь з задавальненнем прыняў запрашэнне. Яму хацелася паглядзець, як жыве яго сябра, і адпачыць ад гарадской мітусні.

У Міхася ўласны драўляны дом. Ён ашаляваны дошкамі і пафарбаваны ў зялёны колер. Вокны ў хаце і верандзе аздоблены прыгожай разьбой.

Перад домам невялікі агародчык. Тут растуць розныя кветкі: астры, цюльпаны, гладыёлусы, фіялкі. Але Міхасёва жонка асабліва любіць вяргіні і ружы.

За домам сад і агарод. Тут расце цыбуля, гуркі, морква, кроп, фасоля, буракі, бульба. У цяпліцы – памідоры.

Міхась мае і невялікую гаспадарку. Ён трымае карову, свіней, курэй і авечак

Хата Міхася на чатыры пакоі: святліца, спальня, гасцёўня і кухня. Святліцай гаспадары называюць гасцёўню. Яна на тры акны. Двума вокнамі яна выходзіць на ўсход, а адным — на поўдзень.Таму з ранку да вечара тут свеціць сонца. Мэбля ў гэтым пакоі сучасная. Ёсць мяккая канапа і два крэслы, каляровы тэлевізар, буфет. На падлозе дыван.

Цудоўным упрыгожаннем у хаце Міхася з'яўляецца старадаўняя мэбля. Яна размешчана ў гасцёўні. Пасярэдзіне пакоя стаіць круглы стол з разнога дубу і шэсць крэслаў. Справа ад дзвярэй стаіць дубовы буфет. Гэтыя рэчы захоўваюць гісторыю. Іх зрабіў Міхасёў прадзед. Праўнук беражліва ставіцца да іх і ганарыцца майстэрствам свайго прадзеда. На покуце вісіць абраз, упрыгожаны вышытым ручніком. На вокнах вазоны. На падлозе ляжыць саматканы дыван.

На кухні злева ад дзвярэй печ. Яна з'яўляецца своеасаблівым цэнтрам у вясковай хаце. У ёй вараць ежу сабе і жывёле. Печ абагравае хату. Узімку добра пагрэцца на ёй. На сценах вісяць шафкі для посуду. Справа ад дзвярэй стаіць халадзільнік, побач стол.

У верандзе стаіць газавая пліта, стол і лава, на якой стаяць вёдры з вадой. Перад верандай пад дахам высокі ганак.

Алесь упершыню быў у вёсцы. Ён з цікавасцю аглядаў Міхасёву сядзібу. Схадзіў у сад, агарод. Агледзеў гаспадарчыя пабудовы.

У канцы вёскі ёсць возера. Вечарам тут збіраюцца рыбакі. Міхась з Алесем таксама пайшлі на рыбалку. Ідучы да возера, Алесь з цікавасцю аглядаў вёску. Вуліца не шырокая, але асфальтаваная. Яна патанае ў зеляніне садоў. Двары сялянскіх сядзіб акуратна агароджаны плотам. Перад дамамі цвітуць кветкі.

Алесю пашанцавала і на возеры. У той вечар ён злавіў вялікага шчупака. Раніцай Міхасёва жонка зварыла юшку, напякла бліноў і частавала Алеся. Алесю вельмі спадабалася ў вёсцы.

Міхась вельмі гасцінны. Да яго часта заходзяць суседзі. "Добры дзень у хату!" – так вітаюцца вяскоўцы.

**Каментарый:**

***мітусня*** – бязладны рух, мільганне перад вачыма

***покуць*** – вугал, кут у хаце, дзе вісіць абраз ці стаіць стол

***абраз*** – малюнак Бога ці святога ў выглядзе партрэта як прадмет рэлігійнага пакланення
***патанаць*** *перан.* – закрывацца, станавіцца мала прыкметным сярод чаго-небудзь

**170. Адкажыце на пытанні.**
1. Адкуль родам Міхась?
2. Дзе ён жыве?
3. За колькі кіламетраў ад Мінска размешчана яго вёска?
4. Чаму Алесю хацелася паехаць у вёску?
5. У якім доме жыве Міхась?
6. Як выглядае Міхасёў дом?
7. Што размешчана перад домам? за домам?
8. Якая ў Міхася гаспадарка? Што ён трымае?
9. На колькі пакояў Міхасёва хата?
10. Якая мэбля размешчана ў святліцы? у гасцёўні?
11. У якім пакоі знаходзіцца печ?
12. Чым з'яўляецца печ у вясковай хаце? Чаму?
13. Дзе размешчана газавая пліта?
14. Што знаходзіцца перад верандай?
15. Якая вуліца ў вёсцы?
16. Каго злавіў Алесь у возеры?
17. Чым частавала Міхасёва жонка раніцай Алеся?
18. Як вітаюцца вяскоўцы пры ўваходзе ў хату?

**171. Якое памяшканне або пакой Міхасёвай хаты апісаны ў кожным падпункце?**

а) Мэбля ў гэтым пакоі сучасная. Ёсць мяккая канапа, два крэслы, каляровы тэлевізар і буфет.

б) Пасярэдзіне пакоя стаіць круглы стол з разнога дубу і шэсць крэслаў. Справа ад дзвярэй стаіць дубовы буфет, аздоблены разнымі дэталямі. На падлозе ляжыць саматканы дыван. На покуце вісіць абраз.

в) Злева ад дзвярэй стаіць печ. У ёй гаспадыня варыць ежу сабе і жывёле.

г) Тут стаіць газавая пліта. Побач стол, лаўка, на якой стаяць вёдры з вадой.

**172. Адкажыце на пытанні:**
1. Дзе вы жывяце? (краіна? горад? пасёлак?)
2. У якім доме вы жывяце?
3. Колькі ў ім паверхаў? (пад'ездаў?)
4. На якім паверсе ваша кватэра?
5. Як спланавана ваша кватэра (дом)?
6. Якія выгоды ёсць у кватэры (доме)?
7. Ці маеце вы асобны пакой?
8. Як абстаўлена ваша кватэра (дом)?
9. Якія рэчы стаяць у вашым пакоі?
10. Ці падабаецца месца, у якім размешчаны ваш дом?
11. Ці доўга вам дабірацца да працы (вучобы)?

Лагойскі раён – Лагой-ШЧЫН-а
Мінская вобласць – Мін-ШЧЫН- а
Віцебская вобласць – Віцеб -ШЧЫН -а
Гомельская вобласць – Гомель -ШЧЫН -а
Магілёўская вобласць – Магілёў -ШЧЫН -а

Брэсцкая вобласць – Брэст-ЧЫН-а
Гродзенская вобласць – Гродзен -ШЧЫН -а
Мядзельскі раён – Мядзель -ШЧЫН -а

**173. Замяніце ў сказах афіцыйныя ўласныя назвы неафіцыйнымі.**
**Узор:** ***Міхась родам з Лагойскага раёна. — Міхась родам з Лагойшчыны.***

1. Вольга родам з Вілейскага раёна.
2. Алеся родам з Зэльвенскага раёна.
3. Мая бабуля родам з Браслаўскага раёна.
4. Міхасёва жонка родам з Магілёўскай вобласці.
5. Мой брат працуе настаўнікам у Пінскім раёне.
6. Бацькі Алеся жывуць у Маладзечанскім раёне.

**174. Прачытайце і перакажыце жарт. Як вы яго зразумелі?**

Дзяўчына вырашыла збегчы з дому,каб выйсці замуж за любага хлопца. Хлопец ноччу прыйшоў да каханай, прыставіў лесвіцу да акна і пытае:
— Ці гатова ты?
— Цішэй, бацька пачуе…
— Не турбуйся, бацька ўнізе трымае лесвіцу!

**175. Правільна прачытайце.**

| **[у]** | **[ва]** |
|---|---|
| у аптэцы | ва універсітэце |
| у вёсцы | ва універсаме |
| у інстытуце | ва універмагу |

| **[з]** | **[с]** |
|---|---|
| з бацькам | з поля |
| з братам | з хаты |
| з маці | з кнігі |

| **[б'эз]** | **[б'аз]** | **[б'эс]** | **[б'ас]** |
|---|---|---|---|
| без барады | без вока | без пакоя | без поля |
| без рукі | без носа | без кабінета | без столі |
| без білета | без вуха | без падлогі | без хаты |

**Выражэнне значэння месца (прыназоўнік+назоўнік)**

***дзе?***
**жыць**
↓

| | | |
|---|---|---|
| у горадзе | на вуліцы | за мяжой |
| у вёсцы | на праспекце | за горадам |
| у Мінску | на плошчы | |
| у Беларусі | на пятым паверсе | |
| у доме № 10 | на дачы | |
| у кватэры № 5 | | |

***куды?***

**ехаць**

у Маскву — на Украіну
у Парыж — на Каўказ
у Германію

**176. Закончыце выказванне. Выкарыстайце прыдатныя па сэнсу прыназоўнікі *у, на.***
**Узор:** ***Міхась жыве ў Беларусі. Ён едзе вучыцца ў Польшчу.***

1. Алесь жыве ў Расіі. Ён едзе …Украіну.
2. Стась жыве ў Лондане. Ён едзе …Вільню.
3. Ніна жыве ў Аўстраліі. Яна едзе … Германію.

**177. Прачытайце.Устаўце прыдатныя па сэнсу прыназоўнікі са значэннем месца *каля, на, сярод, у.***

**Мая вёска**

… лесу стаіць невялікая вёска Залессе. Мясціны тут сапраўды прыгожыя. … шырокім лузе пасуцца каровы. … лугах і палях параскіданы астраўкі пералескаў. Улетку дзецям тут раздолле. Бегаюць яны … бліжэйшы лясок ў грыбы і ў ягады. Звініць усё нававолле іх вясёлымі галасамі.

***ГРАМАТЫКА***

**Выражэнне пrасторавых адносін у складаным сказе**

| | | |
|---|---|---|
| | **там – дзе (тут – дзе) –** | |
| **Там ,** | ***паказвае на месца знаходжання*** | **ДЗЕ нядаўна было балота,** цяпер каласіцца жыта**.** |
| | **туды – куды —** | |
| **Куды** вецер вее**,** | ***паказвае накірунак*** | **ТУДЫ** голле гнецца**.** |
| | **адкуль – дзе** | |
| **Адтуль*,*** | ***удакладняе месца (накіраванне)дзеяння*** | **ДЗЕ канчаўся лес,** на паляну выйшаў лось**.** |

**178. Устаўце ў складаныя сказы прыдатныя па сэнсу злучнікі *дзе, куды.***

1. За акном,… гусцеў вячэрні змрок, шумеў моцны вецер. 2. Там, … канчалася возера, пачыналася поле. 3. Пойдзем туды, … віднеюцца яркія агні. 4. Мы стаялі там, … бярэ свой пачатак рака. 5. Там, … было поле, пабудавалі новы мікрараён. 6. Іду туды, … вочы глядзяць.

**179. З двух простых сказаў утварыце складаны сказ са значэннем месца. Выкарыстайце пры гэтым злучнік *дзе.***

**Узор:** ***Мы знаходзім месца. Рака бярэ свой пачатак. — Мы знаходзім месца, дзе рака бярэ свой пачатак.***

1. Алеся спынілася на паляне. Многа расце суніц.
2. Цікава глядзець на вячэрняе неба. Мільгаюць яркія зоры.

3. Добра ў лузе ляжаць. Прыемна пахнуць кветкі.
4. Там грукнуў моцны гром. Стаяла чорная хмара.

**Суфіксы з памяншальна-ласкальным значэннем**
**Назоўнік (*-ік-, -ык-, -к-, -чык-)***

| | |
|---|---|
| дом – дом-**ік** | Вёска – вёсач-**к**-а |
| стол – стол-**ік** | Дарога – дарож-**к**-а |
| нож-нож-**ык** | рука-руч-**к**-а |
| пакой – пакой-**чык** | дрэва – дрэў-**ц**-а |

**Прыметнік *(-еньк-, -эньк-, -аньк-)***

Малы- мал-**еньк**-і
Халодны – халодн-**еньк**-і
Лёгкі – лёг-**еньк**-і
Вясёлы-вясёл-**еньк**-і
Дарагі – дараж-**эньк**-і
Высокі – высоч-**аньк**-і

**180. Прачытайце. Назавіце словы з памяншальна-ласкальным значэннем Ад якіх слоў яны ўтвораны?**

**Даведалася…**

З горада ў вёску да бабы і дзеда прыехала ўнучка Насцечка.
— Дзед, што ты робіш? – спытала Насцечка.
— Касу кляпаю, — заўсміхаўся дзед.
— А навошта табе каса?
— Касою я накашу карове сена. Кароўка з'есць яго і дасць нам малака. А з малачка будзе і смятанка, і тваражок, і масла.
— А ты, бабуля, што робіш? — падышла бліжэй да бабулі Насцечка.
— Я сяку бульбу, — лагодна адказала бабуля. — Усыплю сюды мукі, развяду цёпленькаю вадою ды свіней накармлю Вырастуць свінні – і мяса, і сальца, і каўбаскі будуць.
(Паводле Барыса Сачанкі)

***ТЭКСТ***

**Свой дварочак, як вяночак**

**1.Матэрыял на будоўлю дома**

У беларусаў існавала цэлая асэнсаваная сістэма звычаяў і абрадаў. Яны былі арганічнай часткай духоўнай культуры народа. Усё багацце прыкмет, павер'яў і звычаяў улічваў кожны селянін, які збіраўся для сябе пабудаваць новую хату.

Будаўніцтва пачыналася з выбару месца і адпаведных матэрыялаў.

Дрэва на будоўлю, лічылася, лепш за ўсё ссякаць тады, калі Месяц знаходзіцца ў сваёй апошняй квадры ("ветаху"), тады яно будзе трывалае. Ссечанае ў маладзік дрэва нядоўга паслужыць гаспадару. Самымі спрыяльнымі месяцамі для нарыхтоўкі драўніны лічыліся сакавік і красавік. Веснавы сок рабіў дрэва мацнейшым.

Вельмі важна было правільна нарыхтаваць мох. Гаспадар павінен быў пайсці ў панядзелак у лес, наскубці вялікую жменю моху і пакласці на чыстай зямлі. Тое самае патрэбна было зрабіць і ў аўторак, і ў сераду, і ў часвер і г.д. А ў нядзелю трэба было пайсці да гэтых кучак і паглядзець, пад якой з іх не было мошак, чарвякоў. Толькі ў той дзень тыдня, калі была наскублена гэта кучка, можна было рыхтаваць мох для будаўніцтва. Селянін спадзяваўся, што ў хаце не завядуцца кузуркі.

На падмурак нельга было браць каменне з могілак. Сям'ю будуць даймаць хваробы і няшчасці.

**Каментарый:**

*маладзік* – Месяц у першай квадры

*кузурка* – маленькае насякомае

**181. Адкажыце на пытанні.**

1. Калі лічылася лепш нарыхтоўваць драўніну на дом ?Чаму?
2.У які дзень лепш было нарыхтоўваць мох ?
3. Чаму забаранялася пад падмурак браць каменне з могілак?

## 2. Месца пад хату

На Беларусі існавала шмат спосабаў, якімі карысталіся сяляне пры выбары месца пад хату. На месца, дзе меркавалі будаваць хату, ставілі чыгунок з павуком. Калі за ноч павук спляце павуцінне, то месца лічылася добрым. У некаторых раёнах Беларусі ставілі на ноч пасудзіну з мёдам. Калі за ноч у пасудзіне з'яўляліся мурашкі — месца ўдалае.

Ніколі не будавалі хату на спрэчнай зямлі або тых месцах, дзе былі знойдзены чалавечыя косткі ці хто-небудзь парэзаў ці пасёк вострым прадметам (нажом, сярпом, касой) нагу ці руку.

Падрыхтоўчыя работы скончаны. За працу браліся цесляры. Пры заснаванні хаты клалі пад вугал манеты, кавалкі хлеба, сыру, а часам і галаву пеўня. Гэта было ахвяраваннем дамавіку.

Вядомы і такі звычай. Пад усе чатыры вуглы клалі кавалачкі ладану ці пасвячоныя зёлкі. Гэтым засцерагалі хату ад перуноў.

Шмат павер'яў было звязана з апошнім вянцом. Пры завяршэнні будаўніцтва гаспадар перакладаў праз апошні вянец асвечанае яйка. Пасля яго закопваў каля хаты. Лічылася, што вецер не будзе зрываць страху. А каб у хаце заўсёды быў дастатак, гарышча ўсцілалі мохам, а па ім сеялі авёс. Калі авёс узыдзе — яго прысыпалі пяском.

(Паводле Таццяны Кухаронак)

**Каментарый:**

*дамавік* – у славянскай міфалогіі: добры або злы дух, што жыве ў доме

*вянец* – апошнія (ці першыя) бярвенні зруба

*чыгунок* – круглая выпуклая пасудзіна з металу для гатавання стравы

*цясляр* – рабочы, які займаецца грубаў апрацоўкай драўніны, узвядзеннем драўляных будынкаў

*зёлкі* – лекавыя травы

*гарышча* – памяшканне, прастора паміж столлю і дахам у будынку

**182. Адкажыце на пытанні.**

1. Як беларусы выбіралі месца для будаўніцтва?
2. Што трэба было ведаць гаспадару і цеслярам пры будаўніцтве хаты?
3. Якія традыцыі існавалі (існуюць) у вас на радзіме пры будаўніцтве дома?

## Назвы маладых істот

**Узор:** ***цял я (ё) — цял ят ы***
***гус ян я (ё) — гусян ят ы***

| | **дзіцяня (ё)** | **дзіцяняты** |
|---|---|---|
| Н. | цял **я**, гуся **я (ё)** | цялят **ы**, гусянят **ы** |
| Р. | цяляц **і**, гусяняц **і** | цялят, гусянят |

| | | |
|---|---|---|
| Д. | цял**яц і**, гусян**яц і** | цялят **ам**, гусянят **ам** |
| В. | цял **я (ё)**, гусян **я (ё)** | цялят, гусянят |
| Т. | цял **ём**, гусян **ём** | цялят **амі**, гусянят **амі** |
| М. | (пры) цял**яц і**, гусян**яц і** | (пры) цялят **ах**, гусянят **ах** |

**183. Прачытайце. Назавіце словы, якія абазначаюць маладых істот. Чые яны дзеці?**

**Дзеці і дзіцяняты**

Пра дзяцей ёсць вельмі добрая легенда. Жанчына некалі паскардзілася чараўніку, што рукі адвальваюцца: дзеці да года не ходзяць, цяляты, ягняты, жарабяты. Усіх на руках насі. Той узяўся дапамагчы. Кінуў цераз высокі плот жарабя — пабегла, цяля — таксама, ягня — і яно пабегла. “Ну, кажа, давай дзіця”. Матка абурылася: “Эге, так я табе і дам дзіця цераз высокі плот кідаць”. — Ну то тады і насі...”.

(Паводле Уладзіміра Караткевіча)

**Каментарый:**

***Рукі адвальваюцца*** — вельмі стаміліся

***Так я табе і дам дзіця...*** — не дам дзіця**...**

**!** **дзіця — дзеці** — пра чалавека
**дзіцяня — дзеці — дзіцяняты** — пра жывёл, птушак і насякомых

**184. Адкажыце на пытанні:**

1. На што скардзілася жанчына чараўніку?
2. Чаму ў яе адвальваюцца рукі? (Дзеці...)
3. Ці ўзяўся чараўнік дапамагчы?
4. Што ён зрабіў з жарабём, цялём і ягнём? (Кінуў...)
5. Што сказала чараўніку матка, калі ён хацеў узяць дзіця?
6. Што адказаў матцы чараўнік?
7. Чаму матка не дала дзіця чараўніку? Адказ можаце выбраць з прапанаваных у дужках. (Ёй вельмі падабаецца насіць дзіця на руках. Ёй зусім не цяжка насіць дзіця на руках. Яна пашкадавала сваё дзіця).
8. Перакажыце легенду.
9. Перакажыце легенду ў дыялогу (Аўтар, чарадзей, маці).

**185. Утварыце формы множнага ліку.**

**Узор:** ***ваўчаня — ваўчаняты***

Птушаня — ...; жарабя — ...; бусляня — ...;
рысяня — ...; лісяня — ...

**186. Прачытайце скорагаворку:**

Ідзе скорагаворка са скорагаварчанятамі (Рыгор Барадулін)

**Якім словам у тэксце абазначана “маці”?**
**Якім словам абазначаны “дзеці”?**
**Утварыце форму адзіночнага ліку назоўніка *скорагаварчаняты.***

**187. Прачытайце. Устаўце замест дужак прыдатныя па сэнсу словы, якія абазначаюць маладых істот.**

**У вёсцы**

У будцы спіць сабака і малое (…). Куры і малыя (…) дзяўбуць зерне. З пашы прыйшлі каровы і двое малых (..). На ліпе сядзіць бусел і двое малых (…). Над полем праляцела чарада птушак і малых (…). Цішыню парушыў крык варон і малых (…).

*Словы для даведак:* шчаня, кураняты, цяляты, бусляняты, птушаняты, вараняты.

**188. Прачытайце верш. Назавіце словы з памяншальна-ласкальным значэннем і словы, якія абазначаюць маладых істот.**

**Прыемныя качаняты**

Ходзяць гусі ланцужком:
Гусачкі за гусаком,
А за імі — гусяняты
І малыя качаняты!
Прытуліла, як свая,
Іх гусіная сям'я.
(Зянон Марозаў)

***ТЭКСТ***

**Уваходзіны**

Нарэшце дом збудаваны. Наступіў час перасялення. Звычайна першым ішоў гаспадар з гаршком, у якім нёс жар з вуголлем. Ён абносіў гаршчок уздоўж сцен, спыняўся на імгненне ў кожным куце. Пасля гэтага ставіў гаршчок на прыпечак і адразу запальваў у печы. Так выганялі нячысцікаў. А напярэдадні перад гэтым у новы дом праз акно запускалі пеўня. Калі певень спяваў, гэта лічылася добрым знакам – будзе вясёлае жыццё.

Пры ўваходзінах (улазінах) трэба было памазаць мёдам усе чатыры куты, каб жыццё было салодкае. Пераход у новы дом прымяркоўвалі да поўні.

Першымі рэчамі, якія заносілі ў хату, быў абраз і стол. Іх заносілі гаспадар ці гаспадыня. Калі яны не мелі дзяцей, гэта рабілі іхнія родзічы, у якіх былі дзеці. Добра было, каб абраз уносіла цяжарная жанчына. Жыццё павінна быць доўгім.

У дзень перасялення ў новую хату гаспадары запрашалі гасцей, а таксама святара, каб асвяціць новае жыллё. Госці неслі падарункі. Пры ўваходзе ў хату госць кідаў грошы на печ: на багатае жыццё.

На ўваходзінах не было спецыяльных абрадавых песень, гульняў. Бяседу вёў найбольш дасціпны і вясёлы гаспадар. Хто-небудзь з гасцей стараўся падкласці пад сяннік якую-небудзь жалезную рэч, каб у сям'і нарадзіўся сын – прадаўжальнік сямейнага роду.

Гаспадары імкнуліся як мага лепш пачаставаць гасцей, бо верылі, што ў гэтым выпадку ў новай хаце сям'я будзе жыць заможна.

(Паводле Таццяны Кухаронак)

**Каментарый:**

***жар*** – яркае гарачае вуголле без полымя
***прыпечак*** – месца, пляцоўка перад чалеснікамі печы
***поўня*** – фаза Месяца, калі відзён увесь яго дыск
***цяжарная*** – жанчына, якая чакае дзіця
***сяннік*** – матрац, набіты сенам ці саломай

**189. Адкажыце на пытанні.**

1. Хто першы і з чым павінен быў зайсці ў новую хату? Што ён рабіў? Для чаго? У што верыў?
2. Якія рэчы ўносіліся першымі? Хто іх заносіў?
3. Як імкнуліся гаспадары прыняць гасцей? Чаму?
4. У чым мудрасць народнай псіхалогіі пры святкаванні ўваходзін?

5. Як святкуюць уваходзіны ў вас на радзіме?

**190. Прачытайце і перакажыце жарт.**

Бацька прыйшоў з крамы. У руках ён трымае торт і падае праз парог сыну:
— Занясі на кухню.
Жонка пярэчыць мужу:
— Праз парог не падаюць!
Бацька адказвае:
— Добра, тады я пастаўлю за парогам.
Сын гаворыць:
— Тады і я пайду за парог.

**191. Прачытайце прыказкі і падбярыце адпаведнікі ў вашай мове. У якіх сітуацыях вы маглі б іх выкарыстаць?**

1. Свая хатка як родная матка.
2. Якая Агатка, такая і хатка.
3. Кожнае сяльцо мае сваё нараўцо.
4. Што сяльцо, то нараўцо, што хутарок, то гаварок.
5. Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.
6. Дома і салома ядома.

***ТЭКСТ***

**У Мікалаеўшчыне**

Пры самым беразе Нёмана раскінулася вёска Мікалаеўшчына. Тут прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады славутага беларускага пісьменніка Якуба Коласа.

Прыгожыя шырокія вуліцы абсаджаны маладымі таполямі. Над добротнымі сялянскімі пабудовамі ўзвышаецца школа – вялікая белая камяніца з чырвоным чарапічным дахам. Паабапал вуліцы новыя хаты, пакрытыя шыферам ці чарапіцай, акуратныя плоцікі, на дахах – тэлевізійныя антэны. Усюды відаць руплівая рука гаспадыні: на вокнах гардзіны, ля прызбы цвітуць вяргіні

Завітаем у сядзібу бацькоў Якуба Коласа. Тут размешчаны дзве сялянскія забудовы. У адной – музей. Другая – копія той, дзе жыла дружная вялікая сям'я. Сядзібу акружаюць высокія разложыстыя ліпы. Іх пасадзіў яшчэ Якуб Колас. Яны пакалыхваюць лісцем, нібы вітаюць гасцей.

У хаце-музеі ўсё кранае душу. Вось печ-ляжанка, дзе халоднымі зімовымі вечарамі збіраліся дзеці паслухаць байкі дзядзькі Антося. А во дзяжа, у якой маці рашчыняла смачныя блінцы. Стол каля акна. Усю ноч прасядзелі за ім Якуб Колас і Янка Купала ў першае сваё спатканне. Моцнае іх сяброўства на доўгія гады пачыналася ў гэтай хаце.

(Паводле Сяргея Тарасава)

**Каментарый:**

***камяніца*** – каменны або цагляны будынак
***прызба*** – невысокі, звычайна земляны насып уздоўж сцяны хаты, зроблены для уцяплення памяшкання
***дзяжа*** – драўляная, крыху звужаная к верху пасудзіна для заквашвання цеста
***чарапіца*** – матэрыял з абпаленай гліны або з цэментава-пясчаных раствораў у выглядзе пласцінак для пакрыцця даху
***сядзіба*** – жылыя і гаспадарчыя пабудовы разам з садам, агародам, якія складаюць адну гаспадарку ў сельскай мясцовасці
***кранаць душу*** – моцна хваляваць, расчульваць каго-небудзь

**192. Адкажыце на пытанні.**

1. Дзе знаходзіцца сядзіба бацькоў Якуба Коласа?
2. Як выглядае вуліца вёскі Мікалаеўшчыны?
3. Па чым бачна, што тут жывуць руплівыя гаспадары?
4. Што ёсць у хаце-музеі Якуба Коласа?
5. Чыё сяброўства пачыналася ў гэтай хаце?

**193. Узнавіце сітуацыю, выкарыстаўшы наступныя словы і спалучэнні слоў:**

Вёска Мікалаеўшчына; прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады; завітаем у сядзібу; размешчаны дзве забудовы; у адной; другая; кранае душу; усю ноч прасядзелі; сяброўства пачыналася.

**Выражэнне стану чалавека ці навакольнага асяроддзя**
**(словы катэгорыі стану)**
***як?***

| **Чалавека** | **прыроды** |
|---|---|
| ↓ | ↓ |
| **На душы** | **У пакоі** |
| **добра- дрэнна** | **утульна – няўтульна** |
| **весела- сумна** | **цёмна – светла** |
| **лёгка- цяжка** | **холадна – цёпла** |

**194. Падбярыце антонімы да слоў катэгорыі стану.**

**Узор:** ***На душы весела. -- На душы сумна.***

1. Ціха ў заснежаным лесе. 2. Было шумна на вуліцах горада. 3. Гарачы дзень. У хаце было душна. 4. На дварэ дождж. У лесе было холадна. 5. Пакойчык невялікі, у ім чыста і ўтульна. 6. У хаце было не прыбрана, брудна, няўтульна.

**195. Падбярыце сінонімы да слоў катэгорыі стану.**

**Узор:** ***На душы весела. – На душы радасна.***

1. Добра было ў лесе. 2. Прыемна было слухаць спевы птушак. 3. Як слаўна ў лесе летам! 4. Люба глядзець на зялёны луг. 5. Трывожна на сэрцы, неспакойна. 6. У лесе хлопцам зрабілася не проста страшна, а жудасна.

**196. Выкажыце сваю думку з дапамогай слоў катэгорыі стану пры наступных сітуацыях:**

а) Вы прыйшлі да сябра ў кватэру. У доме прыбрана, усе рэчы ляжаць на сваім месцы. Як вы перададзіце стан кватэры?
б) Кватэра добра асвятляецца сонцам і вялікая па памерах. Як вы перададзіце стан кватэры?
в) Раніцай вы прыйшлі ў лес. Тут чыстае і свежае паветра.Навокал цішыня. Як вы перададзіце стан навакольнага асяроддзя?
г) Вы з прыемнасцю слухаеце сучасную музыку. Як вы перададзіце свой псіхічны стан?
д) Вы любуецеся багатым ураджаем у садзе восенню. Як вы перададзіце сваё захапленне?

*Словы для даведак*: чыста, акуратна, утульна, прыгожа, ціха, радасна, лёгка, добра, хораша, прыемна, слаўна, спакойна, люба.

***ДЫЯЛОГ***

— Дзень добры ў хату!

— Добры дзень, Сымон.

— Прыйшоў да цябе я, Міхась, параіцца. Бачу, што ты добры гаспадар. Хату адбудаваў – люба глянуць. І ў хаце ўсё з толкам зроблена.

— Дзякую за добрыя словы, сусед. А што ў цябе за клопат, Сымон?

— Клопат ў мяне вялікі. Вырашыў змяніць планіроўку дома.

— А які ў цябе дом?

— Аднапавярховы. Цагляны. Пад домам гараж, майстэрня і кладоўка пад гародніну. У доме – кухня, дзіцячая спальня і агульны пакой. Але ж вельмі нязручна мець кухню побач са спальняй.

— Безумоўна, гаспадыні раніцай трэба гатаваць есці, а дзеці спяць. Добра, калі кухня ізалявана ад іншых пакояў.

— Вось я і думаю надбудаваць мансарду, а на верандзе зрабіць кухню.

— Нядрэнна. А як жонка ставіцца да тваёй задумы?

— Згодна. Але баіцца, што будуць вялікія выдаткі.

— Ведаеш, Сымон, я б параіў табе звярнуцца ў праектнае бюро да архітэктара. Ён складзе індывідуальны праект, зробіць разлік. Тады дакладна будзеш ведаць, колькі табе будзе каштаваць гэта перабудова.

— Відаць, Міхась, маеш рацыю. А дзе знаходзіцца ў Мінску праектнае бюро?

— На вуліцы Якуба Коласа, дом 4.

— Дзякую за параду. Заставайся здаровы.

— Усяго табе добрага!

**197. Складзіце дыялогі паводле наступных сітуацый:**

1. Вы збіраецеся будаваць новы дом і раіцеся з архітэктарам адносна:

а) тыпу дома;

б) колькасці паверхаў, пакояў, вокан;

в) будаўнічага матэрыялу.

2. Вашы знаёмыя пабудавалі дачу. Вы цікавіцеся:

а) дзе знаходзіцца іх дача;

б) на колькі паверхаў дом;

в) з якога матэрыялу зроблена дача;

г) якія пабудовы яшчэ ёсць на ўчастку.

***ТЭКСТ***

### У Вязынцы

Калі будзеце ехаць электрычкай з Мінска на Маладзечна, то праз паўгадзіны пачуеце аб'яву: "Станцыя Вязынка". Перад вамі – маляўнічы куток беларускай зямлі, радзіма народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.

Тут, у Вязынцы, жыў яго бацька Дамінік Луцэвіч з жонкай Бянігнай. Тут 7 ліпеня 1882 года нарадзіўся іх сын Янка. Дзень нараджэння Янкі прыпаў на свята Купалля. Паводле народнай легенды ў купальскую ноч цвіце кветка папараць Таму, хто сарве гэту цудоўную кветку, яна прынясе шчасце. Захоплены чароўнай паэзіяй гэтай легенды, малады Іван Луцэвіч і выбраў сабе псеўданім Купала.

Цяпер у Вязынцы Капалаўскі мемарыяльны запаведнік. Адноўлена хата, у якой будучы паэт вучыўся хадзіць, з якой убачыў свет.

Пераступаем парог – і мы ў пакоі.

Адразу кідаецца ў вочы печ з прыпечкам. Пасярод хаты вісіць калыска, падвязаная да бэлькі. На сцяне – бацькава стрэльба. А каля лаўкі – самапрадка, на якой маці прала кудзелю, каб пасля на кроснах ткаць палатно.

Каля хаты – сажалка, растуць старыя ліпы і бярозы, таполі і бэз. А далей раскінуліся палеткі.

На Купалле ў Вязынцы заўсёды шмат гасцей. Там праходзіць Свята паэзіі. Паэты і артысты чытаюць вершы, а дзяўчаты водзяць карагоды.

(Паводле Сяргея Тарасава)

**Каментарый:**

***кідацца ў вочы*** – міжвольна запыняць на сабе ўвагу; быць асабліва прыкметным
***самапрадка*** – прыстасаванне для ручнога прадзення кудзелі
***кудзеля*** – валакно лёну, канапель, апрацаванае для прыгатавання нітак
***кросны*** – ткацкі станок
***калыска*** – плецены або драўляны дзіцячы ложак
***бэлька*** – драўляны, жалезны або жалезабетонны брус, які ўмацаваны канцамі ў дзве процілеглыя сцяны і служыць падтрымкай насцілу (падлогі, столі)

**198. Адкажыце на пытанні.**

1. Чым вядома Вязынка?
2. Як звалі бацьку Янкі Купалы?
3. Чаму Янка выбраў сабе псеўданім Купала?
4. Як выглядае хата, у якой нарадзіўся Янка Купала?
5. Як і якія рэчы растаўлены ў хаце-музеі Янкі Купалы?
6. Што адбываецца ў Вязынцы на Купалле?

**199. Складзіце дыялог паводле тэксту.**

**200. Узнавіце сітуацыю, выкарыстаўшы наступныя спалучэнні слоў:**

У Вязынцы жыў; выбраў псеўданім Купала; адноўлена хата; кідаецца ў вочы.

**201. Прачытайце прыказкі. Назавіце сінонімы да слова *радзіма*.**

Кожнаму свой куток мілы.
Айчыну любіць – патрыётам быць.
Дзе маці нарадзіла, там і радзіма.
Хто роднага краю цураецца, той і маткі сваёй адцураецца.

## IV. ГОРАД. ГАРАДСКІ ТРАНСПАРТ.
## МІНСК – СТАЛІЦА БЕЛАРУСІ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| вуліца | парк культуры і | | мастацкі | карцінная галерэя |
| плошча | адпачынку | | этнаграфічны | выстаўка |
| завулак | тэлецэнтр | **музей** | краязнаўчы | экспанат |
| жылы | гасцініца, атэль | | гістарычны | наведвальнік |
| квартал | прадпрыемства | | літаратурны | музейны фонд |
| раён | паштамт | | | архіў |
| праспект | помнік | | | калекцыя |
| прыгарад | тэатр | | | рэстаўрацыя |
| | цырк | | | |
| | філармонія | | | |
| | царква | | | |
| | храм | | | |

| | |
|---|---|
| **жыць** | **на** вуліцы |
| **стаяць** | праспекце |
| **знаходзіцца** | бульвары |
| **размяшчацца** | плошчы |

**у** завулку
раёне
квартале
цэнтры горада
будынку

## І. Гарадскі транспарт

| | | | |
|---|---|---|---|
| аўтобус | вадзіцель | паездка *на чым?* | М.скл. **на** аўтобусе |
| тралейбус | шафёр | | тралейбусе |
| трамвай | | | трамваі |
| метро | | | таксі |
| таксі | машыніст | | **у** метро |

**метро** лінія метро
станцыя
платформа
эскалатар спускацца на эскалатары / падымацца на эскалатары

**маршрут** аўтобуса
**прыпынак** тралейбуса
трамвая
таксі

**уваход — выхад** **стаянка таксі**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | ***В.скл.*** | | | ***В.скл.*** | |
| везці | **каго?** | пасажыраў | сустракаць | **каго?** | сяброў |
| | | студэнтаў | | | гасцей |
| | | дзяцей | | | экскурсантаў |
| | **што?** | груз | | **што?** | аўтобус |
| | | | | | цягнік |

набываць/купляць білеты/талоны на праезд у чым? (***М.скл.)*** у гарадскім транспарце
набываць / купляць жэтоны на праезд у метро
набываць / купляць дзе? ***(М.скл.)*** у магазіне
вадзіцеля
кіёску

**202. Падбярыце прыдатныя па сэнсу дзеясловы.**

1. Музей "Беларуская батлейка" … на вуліцы Рабкораўскай.
2. Кафэ "Бульбянае" … на праспекце Францыска Скарыны.
3. Мінскі планетарый … у Цэнтральным дзіцячым парку.
4. Скульптурная кампазіцыя герояў з твораў Якуба Коласа … у цэнтры плошчы Якуба Коласа.
5. Палац спорту … на набярэжнай ракі "Свіслач".
6. Магазін "Вянок" … у Траецкім прадмесці.

*Словы для даведак:* знаходзіцца, размяшчаецца.

**203. Падбярыце прыдатныя па сэнсу прыназоўнікі.**

1. Кафэ "Сем пятніц" знаходзіцца … праспекце Францыска Скарыны.
2. Магазін "Кірмаш" знаходзіцца … мікрараёне "Паўднёвы Захад".
3. Выстаўка слуцкіх паясоў размешчана … Палацы мастацтва.

4. Ён жыве … Замкавай вуліцы.
5. Яна стаіць … прыпынку таксі.
6. Музей сувязі размяшчаецца … будынку Галоўпаштамта.

*Словы для даведак:* на, у.

***ТЭКСТ***

**Дарога на работу**

Міхась — стрыечны брат Алеся Кавалёнка. Ён жыве ў сталіцы, у мікрараёне "Паўднёвы Захад". Міхась працуе далёка ад дома, у цэнтры горада. Таму яму даводзіцца карыстацца гарадскім транспартам. Міхась ездзіць на працу тралейбусам або аўтобусам. Талоны на праезд ён купляе або ў кіёску, або ў вадзіцеля. Лініі метро ад цэнтра да Міхасёва мікрараёна пакуль няма.

Паездка на тралейбусе ці аўтобусе займае дваццаць пяць — трыццаць хвілін. Міхась выходзіць на прыпынку "Чыгуначны вакзал" і далей хвілін пятнаццаць ідзе пяшком па ціхай зялёнай вуліцы. Па дарозе Міхась звяртае ўвагу на афішы тэатраў, на новыя выстаўкі ў краязнаўчым музеі, на кнігі ў вітрынах кнігарні.

Міхась прыкладны пешаход. Ён уважліва сочыць за светлафорам і пераходзіць вуліцу па пешаходнай сцежцы.

**204. Адкажыце на пытанні:**

1. Хто такі Міхась?
2. Дзе жыве Міхась?
3. Міхась працуе далёка ад дома?
4. Ці карыстаецца ён гарадскім транспартам?
5. На чым едзе на працу Міхась?
6. Колькі часу займае паездка?
7. На якім прыпынку Міхась выходзіць?
8. Дзе праходзіць маршрут Міхася?
9. Што прыцягвае ўвагу Міхася па дарозе?
10. Ці прыкладны Міхась пешаход? Чым вы гэта можаце пацвердзіць?

**205. Дапоўніце сказы.**

1. Міхась — …
2. Ён жыве ў …
3. Міхась ездзіць …
4. Паездка на тралейбусе займае …
5. Па дарозе Міхась звяртае ўвагу на …
6. Ён пераходзіць вуліцу …

**206. Узнавіце сіутацыю, выкарыстаўшы наступныя ключавыя словы:**

Ідзе, пераходзіць, ездзіць, выходзіць.

**207. Пастаўце пытанні і адкажыце на іх.**

**Узор: —*Дзе ты набываеш талоны на праезд у аўтобусе?***
***— Я набываю талоны на праезд у аўтобусе ў вадзіцеля.***

1. **— …** у тралейбусе?
**— …**

2. **— …** у трамваі?
**— …**

3. — **...** у метро?
— **...**

4. — **...** у гарадскім транспарце?
— **...**

***ДЫЯЛОГ***

— Скажыце, калі ласка, у вас ёсць талоны на праезд у гарадскім транспарце?
— Колькі вам патрэбна?
— Думаю, дастаткова чатырох.

**208. Дапоўніце дыялогі, выкарыстаўшы матэрыял папярэдняга дыялогу:**

а) — Дайце, калі ласка, праязны білет на праезд у тралейбусе.
— ?
—

б) — Я хацеў бы (хацела б) набыць талоны на праезд у гарадскім транспарце.
— ?
—

в) — Ці прадаяце вы праязныя білеты на ўсе віды транспарту?
—?
—

г) — У вас можна набыць / купіць білеты на праезд у гарадскім транспарце?
— ?
—

д) — У вас ёсць жэтоны на праезд у метро?
— ?
—

**209. Дапоўніце дыялагічныя адзінствы:**

**Узор: — *На чым ты едзеш ва універсітэт?***
***— Я еду ва універсітэт на трамваі.***

1. — На чым ён едзе ў вёску?
— ... .
2. — На чым вы ездзіце ў парк?
— ... .
3. — На чым яны едуць у госці?
— ... .
4. — На чым яна ездзіць у лес?
— ... .
5. — На чым яны едуць у адпачынак?
— ... .
6. — На чым ты едзеш у цэнтр горада?
— ... .

***ГРАМАТЫКА***

**Дзеясловы руху**

***М.скл.***
**па чым?**
**Ісці** **хадзіць**

**чым?**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ісці** | ***М.скл.*** | | горадзе | ***Т.скл.*** | вуліцай |
| | **па чым?** | **па** | сталіцы | **чым?** | паркам |
| **хадзіць** | | | вуліцы | | скверам |
| | | | шашы | | лесам |
| | | | тратуары | | |
| | | | пераходзе | | |
| | | | пешаходнай сцежцы | | |
| | | | плошчы | | |
| | | | мікрараёне | | |
| | | | двары | | |
| | | | парку | | |
| | | | скверы | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **ісці** | | | пеша |
| | **як?** | пяшком | пешшу |
| **хадзіць** | | | пехатой / -ю |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | *В.скл.* | | *В.скл* | | *М.скл* | | *М.скл* |
| **я** | ідУ ў парк | **мы** | ідзЁМ у парк | **я** | хаджУ па парку | **мы** | ходзІМ па парку |
| **ты** | ідзЕШ у парк | **вы** | ідзЯЦЕ ў парк | **ты** | ходзІШ па парку | **вы** | ходзІЦЕ па парку |
| **ён (яна, яно)** | ідзЕ ў парк | **яны** | ідУЦЬ у парк | **ён (яна, яно)** | ходзІЦЬ па парку | **яны** | ходзЯЦЬ па парку |

**Дождж ідзе. Цягнік ідзе. Спектакль ідзе.**
**Гадзіннік ідзе. Жыццё ідзе. Вясна ідзе.**

***М.скл.***
**на чым?**
**ехаць** **ездзіць**
**чым?**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ехаць** | ***М.скл.*** | | машыне | ***Т.скл.*** | машынай |
| | **на чым?** | **на** | аўтобусе | **чым?** | аўтобусам |
| **ездзіць** | | | тралейбусе | | тралейбусам |
| | | | трамваі | | трамваем |
| | | | цягніку / поездзе | | цягніком / поездам |
| | | | электрычцы | | электрычкай |
| | | | метро | | |
| | | | таксі | | |
| | | | матацыкле | | |
| | | | веласіпедзе | | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | *М.скл.* | | *М.скл* | | *Т.скл* | | *Т.скл* |
| **я** | едУ на машыне | **мы** | едзЕМ на машыне. | **я** | езджУ аўтобусам | **мы** | ездзІМ аўтобусам |
| **ты** | едзЕШ на | **вы** | едзЕЦЕ на | **ты** | ездзІШ | **вы** | ездзІЦЕ |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **ён (яна, яно)** | машыне едзЕ на машыне | **яны** | машыне. едУЦЬ на машыне | **ён (яна, яно)** | аўтобусам ездзІЦЬ аўтобусам | **яны** | аўтобусам ездзЯЦЬ аўтобусам |

па чым?
**бегчы — бегаць**
чым?

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **бегчы** / **бегаць** | ***па чым?*** | **па** | лесе<br>вуліцы<br>сцежцы<br>скверы<br>полі | ***чым?*** | лесам<br>вуліцай<br>сцежкай<br>скверам<br>полем |

***М.скл.***
на чым? / чым?
**плыць — плаваць**
па чым?

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **плыць** / **плаваць** | ***М.скл*** ***на чым?*** | **на** | караблі<br>параходзе<br>лодцы<br>чаўне<br>плыце<br>катамаране<br>байдарцы | ***чым?*** | параходам |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **плыць** / **плаваць** | ***М.скл*** *па чым?* | **па** | возеры<br>рацэ<br>акіяне<br>моры |

***М.скл.***
на чым?
**ляцець — лятаць**
***Т.скл.***
чым?

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ляцець** / **лятаць** | ***М.скл.*** ***на чым?*** | **на** | самалёце<br>верталёце<br>паветраным шары<br>дэльтаплане | ***Т.скл.*** ***чым?*** | самалётам |

Дзеясловы руху абазначаюць **накіраваны рух** ад аднаго прадмета / аб'екта да другога (рух без перапынку, у адным накірунку і ў адзін час):

| **куды?** | | **адкуль?** |
|---|---|---|
| ***В.скл.*** | | ***Р.скл.*** |
| Ён *ідзЕ* ***ў*** кнігарню. | ***ісці*** | Ён *ідзЕ* ***з*** кнігарні. |

| | | |
|---|---|---|
| Ты *ляцІШ* ***у*** Гомель.<br>Я *едУ* ***да*** сястры.<br>Вы *плывЯЦЕ* ***да*** берага.<br>Мы *бяжЫМ* ***на*** працу. | ***ляцець***<br>***ехаць***<br>***плыць***<br>***бегчы*** | Ты *ляцІШ* ***з*** Гомеля.<br>Я *едУ* ***ад*** сястры.<br>Вы *плывЯЦЕ* ***ад*** берага.<br>Мы *бяжЫМ* ***з*** працы. |

або **ненакіраваны рух** у розных напрамках (рух як працэс, рух, які адбываецца ў розны час): *хадзіць, ездзіць, лятаць.*

**!** Беспрыставачныя дзеясловы руху маюць форму незакончанага трывання, бо дзеянне адбываецца без указання на мяжу.

Дзеясловы з прыстаўкамі набываюць значэнне закончанага трывання.

**210. Падбярыце прыдатныя па сэнсу дзеясловы.**

1.Я гляджу ў акно і бачу, як пасажыры (ісці, хадзіць) на пасадку.
2. Я (ехаць, ездзіць) у вагоне поезда са сваім сябрам.
3. Звычайна мы разам (ехаць, ездзіць) у адпачынак на мора.
4. Мы (плыць, плаваць), купаемся, (ісці, хадзіць) на экскурсіі.
5. Дамоў мы (ляцець, лятаць) на самалёце.
6. Мы (бегчы, бегаць) на стаянку таксі.

**211. Падбярыце прыдатныя па сэнсу прыназоўнікі. Перабудуйце сказы, замяніўшы назоўнікі супрацьлеглымі (антанімічнымі) па значэнні.**

**Узор: *Яна ідзе … майстэрню. – Яна ідзе ў майстэрню.***
***Яна ідзе з майстэрні.***

1. Мы ідзем … тэатр.
2. Мы ляцім … Брэст.
3. Ты едзеш … пляменніка.
4. Лодка плыве … вострава.
5. Ён бяжыць … абед.
6. Яна спяшаецца … прыём да ўрача.
7. Птушкі ляцяць … вырай.

***ДЫЯЛОГІ***

**212. Падбярыце прыдатныя па сэнсу дзеясловы руху, пастаўце іх у адпаведным часе, асабовай форме і ліку. Прачытайце дыялогі ў парах.**

— Ты займаешся спортам?
— Так, вечарамі я *(ісці – хадзіць)* у басейн.
— Ты *(ісці – хадзіць)* туды кожны дзень?
— Тры-чатыры разы на тыдзень. Звычайна я вяртаюся з працы, вячэраю, а потым *(ісці – хадзіць) (плыць – плаваць).*
— А басейн далёка ад твайго дома?
— Не надта. Патрэбна *(ісці – хадзіць)* хвілін дваццаць, а назад я звычайна *(ехаць – ездзіць)* на аўтобусе.
— Напэўна, ты ўжо добра *(плыць – плаваць)*?
— Пакуль не вельмі. Але спадзяюся, што ў наступным годзе я *(плыць – плаваць)* добра.

— Чаму ты не *(ісці – хадзіць)* на лекцыю? Сёння вельмі цікавая лекцыя прафесара Самусевіча.
— Я дрэнна сябе адчуваю.

— Што здарылася? Ты *(ісці – хадзіць)* да ўрача?

— Так. Я *(ісці – хадзіць)* у паліклініку і думаю, чаму мне так не шанцуе. Я так марыў паслухаць лекцыю прафесара, тым больш што ён толькі што вярнуўся з Парыжа і хутка зноў туды паедзе.

— Як ты лічыш, што скажа ўрач?

— Думаю, ён параіць два-тры дні пабыць дома, не *(ісці – хадзіць)* на вуліцу, не *(бегчы – бегаць)*, не скакаць і прымаць лекі.

— Ну што ж, хутчэй папраўляйся. У нядзелю мы збіраемся *(плыць – плаваць)* па Мінскім моры.

— Дзякуй. Пастараюся хутчэй вылечыцца.

**213. Прачытайце прыказкі, паставіўшы прыдатныя дзеясловы ў адпаведнай асабовай форме:**

1. Блізка відаць, ды далёка (ісці, хадзіць).
2. Дарма (ісці, хадзіць) — ногі адбіць.
3. Любіш (ехаць, ездзіць), любі і саначкі цягаць.
4. Баяцца воўка — у лес не (ісці, хадзіць)
5. Хто шмаруе, той і (ехаць, ездзіць).
6. Паволі (ехаць, ездзіць) — далёка станеш.

**У якіх сітуацыях можна выкарыстаць прыказкі? Падбярыце адпаведнікі ім у вашай мове.**

## Асноўныя значэнні дзеясловаў руху з прыстаўкамі

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | ***Р.скл.*** | | | ***Р.скл.*** | |
| **падысці** | *каго?* | сябра | **адысці** | *каго?* | сябра |
| **да** | *чаго?* | прыпынку | **ад** | *чаго?* | прыпынку |
| **пад'ехаць** | | магазіна | **ад'ехаць** | | магазіна |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | ***В.скл.*** | | | ***Р.скл.*** | |
| **увайсці** | | дом | **выйсці** | | дома |
| **у** | *куды?* | парк | **з** | *адкуль?* | парку |
| **заехаць** | | майстэрню | **выехаць** | | майстэрні |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | ***В.скл.*** | | | ***В.скл.*** | |
| **перайсці** | | другі бок вуліцы | **перайсці** | | вуліцу, праспект |
| **на** | *куды?* | | | *што?* | |
| **пераехаць** | | другі бок праспекта | **пераехаць** | | вуліцу, праспект |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | ***В.скл.*** | | | ***Р.скл.*** | |
| **адпраўляцца** | *куды?* | у Віцебск | **адпраўляцца** | | пятай платформы |
| | ***В.скл.*** | | **з** | *адкуль?* | шостага пуці |
| **адпраўляецца** | *калі?* | раніцай, у сем гадзін | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | ***В.скл.*** | | | ***Р.скл.*** | |
| **прыбываць** | *куды?* | у Віцебск<br>на пятую<br>платформу шосты пуць | **прыбываць** | *адкуль?* | **з** Віцебска |
| | ***Т.скл.*** | | | | |
| **прыбывае** | *калі?* | вечарам<br>у дзесяць гадзін | | | |

Спражэнне дзеясловаў з прыстаўкамі супадае са спражэннем адпаведных беспрыставачных дзеясловаў.

**214. Падбярыце прыдатныя па сэнсу прыназоўнікі. Замяніце апавядальныя сказы пытальнымі.**

**Узор:** ***Ён пераходзіць … другі бок дарогі. – Ён пераходзіць на другі бок дарогі.***
***Ён пераходзіць на другі бок дарогі?***

1. Ён ад'ехаў … стаянкі.
2. Поезд адпраўляецца … шостай платформы.
3. Мы ляцім … Полацк заўтра.
4. Яны прылятаюць … Варшавы вечарам.
5. Яны заедуць … майстэрню заўтра.
6. Вы пераходзіце … другі бок вуліцы.
7. Яна адпраўляецца … адпачынак восенню.

**215. Раскажыце аб тым, як вы знайшлі цырк, магазін "Паўлінка", кафэ "Вясна", цырульню, дзіцячую чыгунку, планетарый, атэлье "Прыгажуня", музей імя Янкі Купалы.**

**Узор:** Мы лёгка знайшлі тэатр. Дайшлі да аўтобуснага прыпынку, селі на аўтобус і паехалі. Праехалі тры прыпынкі, выйшлі з аўтобуса і перайшлі на другі бок. Дайшлі да скрыжавання, павярнулі направа і там убачылі тэатр. З тэатра мы вярталіся на метро.

**216. Пастаўце пытанні самастойна да кожнага з тэкстаў і адкажыце на іх:**

**Узор:** ***Пасля матча Алесь з сябрам вярталіся дамоў. Яны многа гаварылі пра матч, пра стадыён, пра футбалістаў.***

| | |
|---|---|
| ***1. Дзе адбываўся матч?*** | ***1. Матч адбываўся на стадыёне.*** |
| ***2. Адкуль вярталіся Алесь з сябрам?*** | ***2. Яны вярталіся са стадыёна.*** |

**1. Заняткі скончыліся. Студэнты ідуць дамоў і гавораць пра інстытут.**
1. Дзе былі студэнты?
2. Адкуль ідуць студэнты?

**2. Алесева цётка жыве ў Віцебску. Яна запрасіла пляменніка ў госці. Алесь абяцаў прыехаць да яе летам.**
1. Куды паедзе Алесь летам?
2. Дзе ён будзе жыць?
3. Адкуль ён вернецца дамоў?

**3. Вечарам Алесь з сястрой былі ў кінатэатры. Да пачатку сеанса яны зайшлі ў буфет.**
1. Дзе вечарам былі Алесь з сястрой?
2. Колькі часу яны былі ў буфеце?

**217. Прачытайце сітуацыі. Перакажыце іх ад першай асобы, выкарыстоўваючы дзеясловы руху.**

Вы ўваходзіце ў аўтобус, кампасціруеце талон. Праз два прыпынкі да вас падыходзіць кантралёр і гаворыць: "Ваш талон, калі ласка!" Вы шукаеце талон у сумцы. Яго там няма.

Вы едзеце ў адпачынак на Канарскія астравы. Наперадзе ў вас два вольныя тыдні. Вы на сёмым небе ад шчасця. Вы прыязджаеце ў порт, падымаецеся на борт карабля, знаходзіце сваю каюту. Але нечакана выяўляецца, што ваша месца занятае.

**Каментарый:**

***быць на сёмым небе ад шчасця*** **–** быць вельмі шчаслівым

***ТЭКСТ***

**Падземныя палацы**

Мінск з кожным годам маладзее. Узнікаюць новыя кварталы жылых дамоў, шырокія праспекты і вуліцы. У 1984 годзе ў Мінску з'явілася метро.

Як не падзівіцца, не палюбавацца прыгажосцю станцый нашага метро! Ні адна з іх не падобна на другую. У кожнай сваё аблічча, свае адметныя рысы. Афармлены яны з вялікім густам, без лішняй раскошы.

Спынімся на адной з іх — "Плошча Якуба Коласа". Яна названа ў гонар славутага беларускага пісьменніка Якуба Коласа. Архітэктура і мастацкае афармленне перонная залы нагадвае беларускую хату. Прыглушанае святло лямпаў. Дваццаць шэсць калон абліцаваны кафляй з нацыянальным арнаментам. Устаўкі з керамікі адлюстроўваюць беларускія народныя святы, абрады, працу і быт беларусаў. Усё гэта жывіла творчасць вялікага песняра беларускага народа Якуба Коласа. Падлога з паліраванага граніту цёмных і светлых таноў. Вакол чысціня, парадак.

З такім жа густам афармлены і ўсе астатнія станцыі. Інтэр'ер кожнай станцыі адпавядае яе назве.

На першай лініі метро пакуль што дзевяць станцый. Не так даўно адкрыўся рух на другой лініі метро. На чарзе — будаўніцтва трэцяй. Вялікая будучыня ў Мінскага метро!

(з часопіса "Бярозка")

**218. Адкажыце на пытанні:**

1. Калі ў Мінску з'явілася метро?
2. У гонар каго названа станцыя "Плошча Якуба Коласа"?
3. Раскажыце, як выглядае станцыя "Плошча Якуба Коласа".
4. Ці ёсць метро ў вашым горадзе? Апішыце адну са станцый метро.

**219. Дапоўніце сказы:**

1. У 1984 годзе ў Мінску …
2. Архітэктура і мастацкае афармленне перонная залы нагадвае …
3. Устаўкі з керамікі адлюстроўваюць …
4. На першай лініі метро …
5. Не так даўно адкрыўся рух …

**СХЕМА ЛІНІЙ МІНСКАГА МЕТРО**

**220. Разгледзьце схему ліній мінскага метро. Адкажыце на пытанні.**

1. Колькі ліній мае мінскае метро?
2. Назавіце станцыі, якія знаходзяцца на першай лініі.
3. Якія станцыі знаходзяцца на другой лініі?
4. На якой станцыі патрэбна рабіць перасадку / перасаджвацца, каб трапіць на другую (іншую) лінію?
5. Колькі новых станцый будуецца?
6. Як яны будуць называцца?

**221. Карыстаючыся схемай, раскажыце, як вы даедзеце:**

1. Ад станцыі "Няміга" да станцыі "Акадэмія навук".
2. Ад станцыі "Пушкінская" да станцыі "Плошча Якуба Коласа".
3. Ад станцыі "Фрунзенская" да станцыі "Парк Чалюскінцаў".

**Узор:** ***Праезд ад станцыі "Маладзёжная" да станцыі "Плошча Перамогі".***

Я заходжу ў метро, спускаюся на эскалатары (іду) на платформу і чакаю электрычку. Саджуся ў вагон і праязджаю дзве станцыі. Затым на станцыі "Купалаўская" ("Кастрычніцкая") раблю перасадку / перасаджваюся на другую лінію і праязджаю адну станцыю. Выходжу з вагона, іду да выхаду (падымаюся на эскалатары да выхаду). Выходжу з метро.

**222. Замест кропак устаўце прыдатныя словы. Адкажыце на пытанні, сфармулюйце пытанні самастойна:**

1. — У вас прадаюцца … на праезд у метро? (*жэтоны*)
   —… .
2. Як называюцца станцыі ў … метро? *(мінскім)*
   — … .
3. Каля станцыі метро "Інстытут культуры" ёсць … таксі? *(стаянка)*
   — … .
4. — …?
   — Я звычайна еду ў другім … .*(вагоне)*

5. — …?
— Я раблю перасадку / перасаджваюся на … "Купалаўская" *(станцыі)*
6. — …?
— На першай … мінскага метро дзевяць станцый. *(лініі)*

**!** Гарадскі транспарт працуе да гадзіны ночы, а таксі — кругласутачна.

### *ГРАМАТЫКА*

**Прыблізная колькасць (адлегласць) выражаецца:**

| Дакладная колькасць | Прыблізная колькасць | Спосаб выражэння |
|---|---|---|
| 1. Мы праехалі **пяць кіламетраў.** | 1. Мы праехалі **кіламетраў пяць** | *1. Адваротны парадак у спалучэнні лічэбніка з назоўнікам* |
| 2. Дзяўчынка ехала **шэсць кіламетраў.**<br>Ён едзе на працу **за сем кіламетраў.** | 2. Дзяўчынка ехала **кіламетраў з шэсць.**<br>Ён едзе на працу **за кіламетраў сем.** | *2. Адваротны парадак з прыназоўнікамі з (са)* |
| 3. Машыны праехалі **дзвесце кіламетраў.** | 3. Машыны праехалі **дзвесце-трыста кіламетраў.** | *3. Два лічэбнікі* |
| 4. Мы праплылі **сто метраў.** | 4. Мы праплылі **метраў сто-дзвесце.** | *4. Адваротны парадак і два лічэбнікі.* |
| 5. Турыст прайшоў **пяцьдзесят кіламетраў.**<br>Дзядулю **семдзесят гадоў.** | 5. Турыст прайшоў **каля пяцідзесяці кіламетраў.**<br>Дзядулю **пад семдзесят гадоў / каля сямідзесяці гадоў / за семдзесят гадоў.** | *5. Спалучэнне лічэбнікаў з назоўнікамі з прыназоўнікамі каля, пад, за, з.* |

**223. Замяніце дакладную колькасць прыблізнай.**

1. Да парка мы даехалі на аўтобусе, а потым пятнаццаць хвілін ішлі пяшком.
2. Мы з сябрам разам дайшлі да прыпынку, а потым дзесяць хвілін ехалі на аўтобусе.
3. Маёй маці сорак гадоў, а бацьку пяцьдзесят.
4. Алесь вучыўся ва універсітэце пяць гадоў, а потым тры гады выкладаў матэматыку ў школе.
5. Я еду да бабулі на цягніку тры гадзіны.
6. Мой брат едзе на працу дваццаць хвілін на аўтобусе, а потым дзесяць хвілін на метро.
7. Экскурсанты ездзілі па горадзе на аўтобусе дзве гадзіны, а потым тры гадзіны адпачывалі ў гасцініцы.

**224. Прачытайце і перакажыце жарт.**

Едзе вадзіцель на "Мерседэсе", Бачыць, на вяршаліне высокай сасны вісіць "Запарожац", а пад сасной яго ўладальнік разгублена глядзіць на сваё аўто. Вадзіцель прэстыжнага аўтамабіля спыняецца і пытае: "Як гэта магло здарыцца, што аўтамабіль аказаўся так высока?" Той у роспачы адказвае: "Гаварылі мне, што матор слабы, але пра тое, што ён баіцца сабак, я не ведаў!"

***Каментарый:***
***"Запарожац"*** — марка машыны.
***аўто*** — аўтамабіль / машына

## II. Арыентацыя ў горадзе

| | | |
|---|---|---|
| **шукаць**<br>**адшукаць** | *В.скл.*<br>што? | аўтобусны (тралейбусны, трамвайны) прыпынак / прыпынак аўтобуса (тралейбуса, трамвая)<br>дом<br>кватэру<br>банк |
| **знаходзіць**<br>**знайсці** | *В.скл.*<br>што? | атэль / гасцініцу<br>кафэ<br>музей<br>кнігарню<br>універсам<br>універмаг<br>станцыю метро<br>туалет<br>пошту<br>тэлефон/тэлефон-аўтамат<br>міжнародны перагаворны пункт<br>чыгуначны вакзал / аўтобусны вакзал<br>абменны пункт<br>атэлье<br>стаянку таксі |

| | | |
|---|---|---|
| **шукаць**<br>**адшукаць** | *В.скл.*<br>каго? | сяброўку<br>маці<br>калегу<br>студэнтку<br>сястру<br>вадзіцеля<br>афіцыянта<br>прадаўца<br>касіра<br>экскурсавода<br>настаўніка |

| | | |
|---|---|---|
| **Дзе знаходзіцца** | *Н.скл.*<br>што? | музей<br>архіў<br>карцінная галерэя<br>вуліца Кузьмы Чорнага<br>Батанічны сад<br>універсітэт<br>Дом Урада<br>галоўпаштамт<br>газетны кіёск<br>падземны пераход<br>булачная |
| **Дзе размяшчаецца**<br>**размешчаны (а)** | *Н.скл.*<br>што? | тэатральная каса<br>бюро даведак<br>буфет<br>аптэчны кіёск<br>калекцыя<br>музейны фонд<br>экспазіцыя |

| | |
|---|---|
| Дзе знаходзіцца *што?*<br>— галоўпаштамт | — Побач *з чым*? Са станцыяй метро "Плошча Незалежнасці".<br>— Каля *чаго*? Гарвыканкома.<br>— Непадалёку ад *чаго*? Ад універсітэта.<br>— Насупраць *чаго*? Гасцініцы Мінск.<br>— Злева / справа ад *чаго*? Ад магазіна "Дзіцячае адзенне".<br>— У пачатку *чаго*? Праспекта Скарыны. |

| | |
|---|---|
| | — На рагу *чаго*? Праспекта Скарыны і вуліцы Свярдлова. |
| Дзе знаходзіцца *што?*<br>— студэнцкі інтэрнат | — Каля *чаго*? Каля стадыёна "Дынама".<br>— Непадалёку ад *чаго*? Ад станцыі метро "Першамайская".<br>— Насупраць *чаго*? Канцэртнай залы "Мінск".<br>— Злева / справа ад *чаго*? Ад атэльe "Дожджык".<br>— У пачатку *чаго*? Вуліцы Кастрычніцкай.<br>— На рагу *чаго*? Вуліцы Кастрычніцкай і вуліцы Ульянаўскай. |

***ДЫЯЛОГІ***

**225. Дапоўніце дыялог:**

— Скажыце, калі ласка, як … на галоўпаштамт?
— Вам патрэбна сесці на … .
— Колькі мне трэба праехаць …?
— Гэта зусім блізка, рукой падаць, усяго два … .
— На жаль, у мяне няма талонаў на … .
— Не хвалюйцеся, талоны можна купіць на кожным кроку, а таксама ў … .

*Словы для даведак:* трапіць, тралейбус, прыпынкаў, прыпынкі, праезд, вадзіцеля.

**!** *рукой падаць* — блізка
*на кожным кроку* — усюды

**226. Адкажыце на пытанні, дапоўніце дыялогі.**

**Узор: — Скажыце, калі ласка, адсюль далёка да станцыі метро?**
**— Калі ісці пяшком, то хвілін пятнаццаць хадзьбы, калі ехаць тралейбусам "адзінкай" ці "двойкай", то хвілін пяць язды.**

1. — Скажыце, калі ласка, адсюль да вакзала далёка?
—
2. Кафэ "Сем пятніц" адсюль далёка?
—
3. — Колькі часу нам спатрэбіцца, каб дабрацца да музея Гісторыі Вялікай Айчыннай вайны?
—
4. — Скажыце, калі ласка, да бліжэйшага кінатэатра далёка?
—
5. — Скажыце, калі ласка, ці далёка аптэка?
—
6. — Скажыце, калі ласка, адсюль да плошчы Перамогі далёка?
—

**Каментарый:**

***Адзінка, двойка, тройка, чацвёрка, пяцёрка*** і г.д. — гэта назоўнікі з лікавым значэннем. Яны могуць ужывацца для абазначэння адпаведнага нумару тралейбуса, аўтобуса ці трамвая (№ 1 — "адзінка" і г.д.)

**227. Прачытайце дыялог у парах. Перавядзіце дыялог у маналог.**

— Гэта тралейбусны прыпынак?
— Так, гэта тралейбусны прыпынак.
— Я магу адсюль даехаць да плошчы Перамогі?
— Так, вам патрэбна сесці на тралейбус і праехаць пяць прыпынкаў.
— Дзе можна купіць талоны на праезд?

— Талоны прадаюцца ў вадзіцеля.

***ТЭКСТ***

**Беларускі музей над Пціччу**

На рацэ Пціч, непадалёку ад Мінска, знаходзіцца Воўчкавіцкае вадасховішча. На поўнач ад яго, паміж вёскамі, размясціўся музей пад адкрытым небам. Афіцыйная назва — Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту.

Музеі пад адкрытым небам існуюць у многіх краінах свету. У Еўропе іх некалькі соцень. Ідэя стварэння падобнага беларускага музея належыць беларускаму мастаку Фердынанду Рушчыцу яшчэ ў пачатку XX стагоддз, але толькі ў 1981 годзе на пагорках у вярхоўях Пцічы пачалося будаўніцтва.

Беларускія вучоныя вылучаюць на тэрыторыі Беларусі шэсць этнаграфічных раёнаў: Цэнтральная Беларусь, Панямонне, Паазер'е, Падняпроўе, Усходняе Палессе, Заходняе Палессе. Кожны рэгіён прадстаўлены ў музеі невялікай вёсачкай на 5-6 сядзіб канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Апроч таго, мяркуецца паказаць і мястэчка як своеасаблівае паселішча. Ужо адбудаваны тры сектары: Цэнтральная Беларусь, Падняпроўе і Паазер'е. У кожным будынку — старадаўнія рэчы, якімі карысталіся нашы дзяды. У хатах і гаспадарчых памяшканнях адноўлены інтэр'еры, што існавалі калісьці Наогул, у музеі можна пазнаёміцца з тым, як жылі і чым займаліся нашы продкі.

(Паводле Сымона Барыса)

**Каментарый:**

***вадасховішча*** – вадаём непрыроднага паходжання для назапашвання і захавання запасаў вады;
***вярхоўе*** – частка ракі, блізкая да яе вытокаў;
***сядзіба*** – жылыя і гаспадарчыя пабудовы разам з садам, якія складаюць адну гаспадарку;
***мястэчка*** – пасёлак з прыкметамі горада.

**228. Адкажыце на пытанні.**

1. Як называецца беларускі музей пад адкрытым небам?
2. Дзе ён размясціўся?
3. Ці існуюць падобныя музеі ў іншых краінах Еўропы?
4. Каму належыць ідэя стварэння такога музея ў Беларусі?
5. Калі пачалося будаўніцтва музея?
6. Якія этнаграфічныя раёны вылучаюць на тэрыторыі Беларусі?
7. Якім чынам рэгіёны прадстаўлены ў музеі?
8. Якія сектары ўжо адбудаваны?
9. Які характар маюць інтэр'еры ў хатах і гаспадарчых памяшканнях?

**229. Адкажыце сцвярджальна / адмоўна на пытанні:**

**Узор: *— Ты шукаеш аўтобусны прыпынак?***
***— Так, я шукаю аўтобусны прыпынак.***
***— Не, я шукаю стаянку таксі.***

1. — Вы шукаеце тралейбусны прыпынак?
— …
— …
2. — Вы шукаеце трамвайны прыпынак?
— …
— …
3. — Вы шукаеце стаянку таксі?
— …
— …

4. — Вы шукаеце станцыю метро?
— …
— …

**Узор:** ***Ты шукаеш прыпынак тралейбуса? – Так, я шукаю прыпынак тралейбуса.***
***— Не, я не шукаю тралейбусны прыпынак.***

1. — Вы шукаеце прыпынак гарадскога транспарту?
— …
— …
2. — Вы шукаеце тэлефон-аўтамат?
— …
— …
3. — Вы шукаеце універсам?
— …
— …
4. — Вы шукаеце кніжны магазін?
— …
— …

***ДЫЯЛОГІ***

**230. Прачытайце дыялогі ў парах.**

— Да пачатку спектакля 40 хвілін. Мая прапанова, Юрка, не перасаджвацца на трамвай, а ехаць аўтобусам загадзя, каб мець час прайсці да тэатра пешшу.
— Але мы яшчэ не ведаем дакладна, дзе ён знаходзіцца.
— Не турбуйся, зараз мы запытаемся ў прахожых.

— Скажыце, калі ласка, дзе знаходзіцца тэатр Оперы і балета?
— Тэатр знаходзіцца непадалёку ад цырка, справа ад парка Янкі Купалы.
— Дзякуй.

— Прабачце, я шукаю фундаментальную бібліятэку Акадэміі навук. Дзе яна знаходзіцца?
— Бібліятэка знаходзіцца на вуліцы Батанічнай, насупраць кінатэатра "Кастрычнік".
— А як туды даехаць?
— Зручней за ўсё спусціцца ў метро і праехаць тры станцыі.
— Дзякую.

***ГРАМАТЫКА***

**Словы катэгорыі стану з мадальным значэннем**

| | | |
|---|---|---|
| ***можна***<br>***трэба*** | *ехаць прама* | ***нельга***<br>***не трэба*** |

**231. Дапоўніце сказы прыдатнымі па сэнсу мадальнымі словамі *можна, трэба / патрэбна, варта, нельга.***

1. На жаль, вам … *ехаць* у адваротным кірунку.
2. ... *ехаць* прама, але лепш павярнуць на наступнай вуліцы налева.

3. Каб хутчэй дабрацца да вакзала, вам … *павярнуць* адразу налева, а потым паехаць прама.
4. Каб прыехаць своечасова, вам … ўжо сёння *завяршыць* усе справы.
5. Па гэтай вуліцы … *ездзіць* на грузавым транспарце.
6. … *браць* білеты сёння ці … *зрабіць* гэта заўтра.
7. На вакзал … ісці прама.
8. Каб патрапіць у бібліятэку, … павярнуць налева і прайсці адзін квартал назад.
9. Па гэтай дарозе … ехаць толькі на легкавым транспарце.
10. Вам … ехаць у купэйным вагоне, бо дарога не блізкая.

***ТЭКСТ***

**Ліст да сябра**

20.06.99
г. Мінск

Дарагі Збышак!

Ты пытаешся, як даехаць з чыгуначнага вакзала да Акадэміі навук. Ахвотна растлумачу табе твой маршрут.

З чыгуначнага вакзала ты адразу трапляеш на Прывакзальную плошчу. Прама перад табою, насупраць вакзала, два вышынныя будынкі з вежамі. Яны падобныя на вароты. Іх называюць "варотамі горада".

Прывакзальная плошча — канцавы прыпынак многіх аўтобусных і тралейбусных маршрутаў гарадскога транспарту. Тут спыняецца трамвай.

Тралейбусны прыпынак "Плошча Незалежнасці" побач з вакзалам, злева ад падземнага перахода.

Калі будзеш мець час, я раю табе паехаць тралейбусам № 1. Яго маршрут пачынаецца з Плошчы Незалежнасці і праходзіць па асноўнай магістралі горада — праспекце імя Францыска Скарыны. Праедзеш восем прыпынкаў. Справа па руху тралейбуса ты ўбачыш прыгожы будынак з калонамі і прыступкамі. Гэта галоўны корпус Акадэміі навук.

Зручней дабірацца ў Акадэмію навук, безумоўна, на метро. Уваход у метро насупраць чыгуначнага вакзала, на Прывакзальнай плошчы. Патрэбна праехаць чатыры станцыі. Твая станцыя называецца "Акадэмія навук". Дарога займае прыкладна дзесяць-дванаццаць хвілін.

Да сустрэчы.

Алесь

**232. Выберыце правільны варыянт адказу:**

1. Дзе знаходзяцца высокія будынкі з вежамі?
а) на Прывакзальнай плошчы;
б) злева ад вакзала;
в) на правым баку вуліцы;
г) насупраць вакзала.

2. Дзе знаходзіцца тралейбусны прыпынак "Плошча Незалежнасці"?
а) блізка каля вакзала;
б) справа ад падземнага пераходу;
в) насупраць вакзала;
г)побач з вакзалам.

3. Дзе пачынаецца маршрут тралейбуса № 1?
а) з плошчы Незалежнасці;
б) з вакзала;
в) з Прывакзальнай плошчы;

г)  побач са станцыяй метро.

4. Колькі тралейбусных прыпынкаў патрэбна праехаць да Акадэміі навук?
а) чатыры;
б) пяць;
в) тры;
г) восем.

5. Дзе размяшчаецца галоўны корпус Акадэміі навук?
а) недалёка ад вакзала;
б) побач з плошчай Якуба Коласа;
в) справа па руху тралейбуса;
г) злева ад руху тралейбуса.

6. Чым зручней (за ўсё) дабірацца да Акадэміі навук?
а) на тралейбусе;
б) на трамваі;
в) на метро;
г) на аўтобусе.

7. Колькі часу займае паездка на метро да станцыі "Акадэмія навук"?
а) дваццаць хвілін;
б) пятнаццаць хвілін;
в) восем хвілін;
г) дзесяць-дванаццаць хвілін.

**233. Выберыце адпаведны варыянт адказу:**

1. Прывакзальная плошча (*прыгожая, вялікая, добраўпарадкаваная, утульная).*
2. Маршрут тралейбуса № 1 пачынаецца *(ад вакзала, ад плошчы Незалежнасці, з Прывакзальнай плошчы).*
3. Галоўны корпус Акадэміі навук *(прыгожы, высокі, доўгі, прыземісты).*
4. Зручней за ўсё можна даехаць да Акадэміі навук *(тралейбусам / на тралейбусе, аўтобусам / на аўтобусе, на метро, на таксі).*
5. Паездка на метро працягваецца *(доўга, нядоўга, зусім мала, хвілін дзесяць-дванаццаць).*
6. Паездка / падарожжа на тралейбусе *(захапляльная, цікавая, доўгая).*
7. Больш за ўсё мяне прываблівае паездка *(на аўтобусе, на трамваі, на метро, на таксі).*

***ДЫЯЛОГ***

**234. Прачытайце дыялог па парах. Растлумачце, як знайсці букіністычную кнігарню.**

— Прабачце, можна вас на хвіліну?
— Калі ласка!
— Я шукаю гасцініцу "Свіслач". Ці не дапамаглі б вы мне?
— З задавальненнем. Відаць, вы прыезджы?
— Так, я прыехаў з Віцебска.
— Вы, напэўна, навуковец?
— Так, як вы здагадаліся?
— Па акулярах. Звычайна ўсе навукоўцы носяць акуляры, а таксама вялікія партфелі.
— Вы вельмі назіральны.
— Палічу гэта за камплімент. Вось там праз вуліцу і Ваша гасцініца.
—Шчыры дзякуй!

***Выразы, якія вам спатрэбяцца***

**Дапамажыце мне, калі ласка, зарыентавацца.**
**Я, здаецца, трошкі заблудзіў.**

**235. Прачытайце прыказкі. Падбярыце адпаведнікі ў вашай мове:**
1. Іголкай дарогу не мераюць.
2. Дарога мучыць, але вучыць.
3. Невядомая дарога на канцы языка.
4. Хто пытае, той не блукае.
5. Язык Вільні дапытае.

## *ГРАМАТЫКА*

**Пералічальна-размеркавальныя адносіны выражаюцца**
пры дапамозе злучнікаў *або, або-або, ці, ці-ці, не то – не то, ці то – ці то, ні-ні, то-то*

| | | |
|---|---|---|
| **або / або — або** | Міхась ездзіць у адпачынак *або* на мора, *або* да бацькоў у вёску. | ***Узаемавыключэнне пэўных з'яў, іх несумяшчальнасць*** |
| **ці / ці — ці** | Высадзіце мяне, калі ласка, *ці* на гэтым скрыжаванні, *ці* на наступным. | |
| **не то – не то /** | Пачуўся далёкі голас *не то* грому, *не то* цягніка. | ***Сумненне, меркаванне*** |
| **ці то – ці то** | *Ці то* птушка, *ці то* самалёт віднеўся высока ў небе. | |
| **ні – ні** | У гэтым годзе я не адпачываў *ні* зімой, *ні* летам. | ***Адмаўленне*** |
| **то – то** | Дарога ідзе *то* лесам, *то* полем. | ***Папераменнае чаргаванне*** |

Блізкія значэнні выражаюць злучнікі *або-або, ці-ці; не то-не то, ці то-ці то.*

**236. Замяніце злучнікі сінанімічнымі:**

**Узор: *Ці то сініца, ці то іншая птушка весела зацілікала. — Не то сініца, не то іншая птушка весела зацілікала.***
1. Маці вярталася з працы або ў сем гадзін вечара, або ў восем.
2. Кастусь займаецца на спартыўнай пляцоўцы або раніцай, або вечарам.
3. Яна не то спала, не то аб нечым думала.
4. Песні жанчын чуліся ці ў лесе, ці за рэчкай.
5. Стары лес шумеў ці на гром, ці на вецер.

## *ТЭКСТ*

### Дарогі на Беларусі

Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, на перасячэнні гандлёвых шляхоў з захаду на ўсход, з поўначы на поўдзень. Таму будаўніцтва дарог тут распачалося вельмі даўно. Спачатку былі пракладзены **бальшакі**, шырыня якіх дасягала 15 метраў. У канцы XVII стагоддзя былі пабудаваны шырокія **шляхі** з Віцебска на Смаленск, са Слоніма на Пінск. У першай палове XIX стагоддзя былі пракладзены буйныя **магістралі**: Маскоўска-Варшаўская **шаша** і **шаша** Пецярбург – Кіеў, або, як яе называлі, Беларускі **тракт**. Важнае месца мелі і пракладзеныя ў гэты час **грунтавыя дарогі** Вільня – Гродна – Беласток, Вільня – Мінск – Бабруйск, Віцебск – Рыга.

Найбольш густой была **сетка дарог** на тэрыторыі Панямоння, дзе старадаўнія **тракты** і прылеглыя да іх мясцовыя **шляхі** былі непасрэдна звязаны з Вільняй і Гродна.

Буйныя дарогі будаваліся з удзелам мясцовага насельніцтва. Сяляне, што пражывалі паблізу дарог на адлегласці да 30-50 вёрст, павінны былі выдзяляць конныя падводы і пешых работнікаў.

У залежнасці ад прызначэння дарогі падзяляліся на **паштовыя, гандлёвыя і прасёлачныя**. Уздоўж іх на адлегласці 17-22 вёрст размяшчаліся станцыі для гасцей і экіпажаў, карчма.

Па гандлёвых дарогах перавозіліся сельскагаспадарчыя тавары — хлеб, лён, пянька, сала, мёд. Частка іх дастаўлялася да рачных прыстаней, адкуль яны ішлі на экспарт у прыбалтыйскія парты, на Варшаву, а таксама на поўдзень да Чарнаморскага ўзбярэжжа.

Прасёлачныя дарогі, асабліва тыя, якія вялі да феадальных замкаў, былі ўпарадкаваны не горш, а нават і лепш, чым гандлёвыя.

Дарога, якая звязвала Маскву з Варшавай, была **брукаванай**. У другой палове XIX стагоддзя цвёрдае пакрыццё мелі і буйныя **магістралі**, што звязвалі Пецярбург з Кіевам (праз Віцебск – Гомель), Брэст з Кіевам, Віцебск са Смаленскам.

Асноўную ролю ў транспартных зносінах выконвалі звычайныя **грунтовыя** дарогі, рух на якіх быў магчымы толькі на працягу 8-10 месяцаў.

Многія дарожныя збудаванні — масты, гаці, зробленыя з дрэва, мелі арыгінальную канструкцыю, з'яўляліся ўзорам дойлідства. Яны і сёння здзіўляюць нашых сучаснікаў.

(Паводле Віктара Цітова)

**Каментарый:**

***Бальшак*** — вялікая дарога
***шлях*** — шырокая, прыстасаваная для руху транспарту дарога
***магістраль*** — цэнтральная або шырокая дарога з вялікім рухам
***шаша*** — дарога, вымашчаная шчэбенем, пакрытая асфальтам або іншым цвёрдым пакрыццём
***грунтовая дарога*** — дарога без спецыяльнага пакрыцця
***сетка дарог*** — сукупнасць дарог
***тракт*** — шырокая праезджая дарога
***вярста*** — мера даўжыні, роўная 1, 06 км
***конная падвода*** — запрэжаны воз
***пешыя работнікі*** — работнікі пяхотныя, не конныя
***экіпаж*** — лёгкая пасажырская павозка
***карчма*** — пітны дом з начлегам
***пянька*** — канаплянае валакно
***прыстань*** — плывучае або стацыянарнае збудаванне для прычальвання і стаянкі, выгрузкі і пагрузкі суднаў, высадкі і пасадкі пасажыраў
***феадальны замак*** — замак, які належаў феадалу
***брукаваная дарога*** — укладзеная каменем дарога
***гаць*** — насціл з бярвення, галля, ламачча для праезду цераз балота ці гразкае месца
***дойлідства*** — архітэктура

**237. Адкажыце на пытанні:**

1. Дзе знаходзіцца Беларусь?
2. Якой шырыні дасягалі бальшакі?
3. Паміж якімі буйнымі гарадамі Беларусі былі пракладзены шляхі?
4. Калі былі пракладзены Маскоўска-Варшаўская шаша і Беларускі тракт?
5. Дзе на тэрыторыі Беларусі адзначалася найбольш густая сетка дарог?
6. Ці прымала ўдзел у будаўніцтве дарог мясцовае насельніцтва?
7. Як падзяляліся дарогі ў залежнасці ад прызначэння?
8. Якія сельскагаспадарчыя тавары перавозіліся па гандлёвых дарогах?
9. Ці былі ўпарадкаваны ў тыя часы прасёлачныя дарогі?
10. Якія брукаваныя дарогі былі на Беларусі ў XIX стагоддзі?

11. Якую ролю ў транспартных адносінах выконвалі грунтовыя дарогі?
12. Якія дарожныя збудаванні да сённяшняга часу здзіўляюць нашых сучаснікаў?
13. Запішыце сінанімічны рад слоў-назваў дарог, якія сустрэліся ў тэксце.

*ГРАМАТЫКА*

### Спражэнне дзеясловаў

У цяперашнім і будучым часе дзеясловы спрагаюцца. У залежнасці ад характару асабовых канчаткаў вылучаюцца два тыпы спражэнняў дзеясловаў — першае і другое. У 1-ай асобе адзіночнага ліку асабовыя канчаткі абодвух тыпаў спражэння супадаюць.

### Цяперашні час
### I спражэнне

#### адзіночны лік

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **я**<br>**ты**<br><br>**ён (яна, яно)** | вяз**У** дачку<br>вязЕШ дачку<br>вязЕ дачку | інфіні-тыўная аснова на мяккі зычны | бяр**У** кнігу<br>бярЭШ кнігу<br>бярЭ кнігу | інфіні-тыўная аснова на галос-ны | палашчУ бялізну<br>палошчАШ бялізну<br>палошчА бялізну | інфі-ніты ўная асно-ва на галос ны | **ск / шч** |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **я**<br><br>**ты**<br><br>**ён (яна, яно)** | чытаЮ аповесць<br>чытаЕШ аповесць<br>чытаЕ аповесць | інфіні-тыўная аснова на га-лосны | пякУ хлеб<br>пячЭШ хлеб<br>пячЭ хлеб | інфініты ўная аснова на га-лосны | берагУ маці<br>беражЭШ маці<br>беражЭ маці | інфіні-тыў-ная ас-нова на зад-нея-зычны | **к / ч**<br>**г / ж** |

#### множны лік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **мы**<br><br>**вы**<br><br>**яны** | вязЁМ дачку<br>везЯЦЕ дачку<br>вязУЦЬ дачку | бярОМ кнігу<br>берАЦЕ кнігу<br>бярУЦЬ кнігу | палошчАМ бялізну<br>палошчАЦЕ бялізну<br>палошчУЦЬ бялізну | чытаЕМ аповесць<br>чытаЕЦЕ аповесць<br>чытаЮЦЬ аповесць | пячОМ хлеб<br>печАЦЕ хлеб<br>пякУЦЬ хлеб | беражОМ маці<br>беражАЦЕ маці<br>берагУЦЬ маці |

### II спражэнне
#### адзіночны лік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **я**<br><br>**ты**<br><br>**ён (яна, яно)** | марУ аб вясне<br>марЫШ аб вясне<br>марЫЦЬ аб вясне | інфінітыў-ная ас-нова на галосны | лічУ яблыкі<br>лічЫШ яблыкі<br><br>лічЫЦЬ яблыкі | інфінітыў-ная аснова на галосны | снЮ вёску<br>снІШ вёску<br>снІЦЬ вёску | інфінітыў-ная аснова на галос-ны |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **я** | стаЮ на прыпынку | інфінітыўная аснова на галосны | купляЮ часопіс | інфінітыўная аснова на галосны | кашУ луг | інфінітыўная аснова на галосны | **с / ш**<br>**п / пл** |
| **ты** | стаІШ на прыпынку | | купляЕШ часопіс | | косІШ луг | | |
| **ён (яна, яно)** | стаІЦЬ на прыпынку | | купляЕ часопіс | | косІЦЬ луг | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **я** | важУ сына | інфінітыўная аснова на галосны | **з / ж** |
| **ты** | возІШ сына | | |
| **ён (яна, яно)** | возІЦЬ сына | | |

**множны лік**

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **мы** | марЫМ аб вясне | лічЫМ яблыкі | снІМ вёску | стаІМ на прыпынку | купляЕМ часопіс | косІМ луг | возІМ сына |
| **вы** | марЫЦЕ аб вясне | лічЫЦЕ яблыкі | снІЦЕ вёску | стаІЦЕ на прыпынку | купляЕЦЕ часопіс | косІЦЕ луг | возІЦЕ сына |
| **яны** | марАЦЬ аб вясне | лічАЦЬ яблыкі | снЯЦЬ вёску | стаЯЦЬ на прыпынку | купляЮЦЬ часопіс | косЯЦЬ луг | возЯЦЬ сына |

**!** Адрозненне паміж дзеясловамі I і II спражэння выразней за ўсё выяўляецца ў 3-й асобе множнага ліку. У 3-й асобе I спражэння канчаткі *–уць (-юць),* II спражэння *-аць (-яць).*

**Будучы час дзеясловаў**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **я** | *В.скл.* *М.скл.* | | *В.скл.* *М.скл.* |
| | пайдУ **ў** інстытут, палячУ **на** верталёце. | **мы** | пойдзЕМ **у** інстытут, паляцІМ **на** верталёце. |
| **ты** | пойдзЕШ **у** інстытут, паляцІШ **на** верталёце. | **вы** | пойдзЕЦЕ **ў** інстытут, паляцІЦЕ **на** верталёце. |
| **ён (яна, яно)** | пойдзЕ **ў** інстытут, паляцІЦЬ **на** верталёце. | **яны** | пойдУЦЬ **у** інстытут, паляцЯЦЬ **на** верталёце. |

У значэнні будучага часу ўжываецца і цяперашні час: *Самалёт ляціць заўтра, у шаснаццаць гадзін.*

***мы едзем — мы паедзем***
***мы купляем — мы купім***
***мы сустракаемся — мы сустрэнемся***

Такім чынам, дамовіліся. Устаём заўтра рана, купляем білеты і едзем. Сустракаемся каля вакзала, а шостай гадзіне. Да пабачэння.

**!** Спражэнне дзеясловаў з прыстаўкамі супадае са спражэннем адпаведных беспрыставачных дзеясловаў.

**238. Прааналізуйце табліцы.**

**239. Пастаўце дзеясловы ў адпаведных асабовых формах у цяперашнім часе.**

1. Мой брат *(працаваць)* на Мінскім трактарным заводзе.
2. Я *(гасцяваць)* у бабулі.
3. Ты *(начаваць)* у сябра?
4. Мы *(бачыць)* прыгожы карабель.
5. Вы *(спаць)* з адчыненай форткай?
6. Яны *(любіць)* свой горад.

**240. Падбярыце прыдатны асабовы займеннік.**

1. … шые прыгожую сукенку.
2. … думаеце аб новым спектаклі?
3. … марым аб паездцы на экскурсію.
4. … сяджу ў цяністым скверы.
5. … просіш у бібліятэцы новую кнігу.
6. … малоцяць залатое зерне.

**241. Прачытайце тэкст. Замяніце займеннікі ў форме 1-й асобы адз. ліку на формы 2, 3 асобы адз. ліку і 1, 2, 3 асобы множнага ліку:**

Я іду па вуліцы, пераходжу на другі бок і падыходжу да вакзала. Я ўваходжу ў памяшканне, падымаюся на другі паверх і купляю білет на поезд.

**242. Дапішыце прыдатныя па сэнсу канчаткі дзеясловаў:**

1. Хто з кнігаю друж…, той ніколі не туж…
2. Добра поле ўзар…, хлеба больш збяр…
3. Што пасе…, тое пажн…
4. Адной рукою вузел не завяж…
5. Хто пасе… вецер, той пажн… буру
6. Рукі перамог… аднаго, а веды перамог… тысячу

**!** Дзеясловы *бегчы, есці, даць* і вытворныя ад іх *(адбегчы, прыбегчы, з'есці, паесці, аддаць, перадаць)* — **рознаспрагальныя.**

Дзеяслоў *бегчы* ў 3-й асобе множнага ліку ўжываецца з канчаткам 1-га спражэння, а ў астатніх асобах множнага ліку і ў адзіночным ліку — з канчаткамі 2-га спражэння.

| **БЕГЧЫ** | | | |
|---|---|---|---|
| **адзіночны лік** | | **множны лік** | |
| **я**<br>**ты**<br>**ён (яна, яно)** | бягУ ў школу<br>бяжЫШ у школу<br>бяжЫЦЬ у школу | **мы**<br>**вы**<br>**яны** | бяжЫМ у школу<br>бяжЫЦЕ ў школу<br>бягУЦЬ у школу |

**243. Адгадайце загадкі:**
1. Два браты бягуць у рэчку купацца.
2. Бягуць — скрыпяць, стаяць — маўчаць.
3. Галаву ядуць, цела выкідаюць, а скуру носяць.
4. Кідаю не палку, б'ю не галку, скубу не пер'е, ем не мяса.
5. Не разаб'еш гаршчок, то не з'ясі і кашы.

6. Бегае свінка, залатая свінка, ільняны хвосцік.

*Словы для даведак:* вёдры, новыя боты, лён, рыба, арэх, іголка.

## III. Мінск – сталіца Беларусі

***ТЭКСТ***

### Мінск сёння

Сёння Мінск — буйны прамысловы, культурны, навуковы цэнтр рэспублікі. У гады Вялікай Айчыннай вайны ён быў знішчаны амаль цалкам, захавалася толькі некалькі будынкаў і храмаў XVII-XVIII стагоддзяў. Мінчане аднавілі свой горад, пабудавалі сучасныя жылыя раёны і прыгожыя плошчы.

Цэнтральная магістраль — праспект імя Францыска Скарыны. Яго даўжыня 8 кіламетраў. Злева і справа ад яго прасторныя плошчы — Якуба Коласа, Перамогі, Кастрычніцкая, Незалежнасці. На пачатку праспекта знаходзіцца будынак галоўнага паштамта. На праспекце размяшчаюцца сучасныя універсальныя магазіны і кінатэатры. Здалёк можна пазнаць велічны будынак Нацыянальнай акадэміі навук. Цэнтральны батанічны сад заўсёды чакае сваіх наведвальнікаў.

Горад перасякае рака Свіслач з прылеглымі зялёным паркамі і скверамі. Мінчане любяць гуляць па набярэжнай.

Увечары пасля заканчэння працоўнага дня запальваюць агні шматлікія тэатры, філармонія, цырк.

**244. Адкажыце на пытанні:**
1. Як называецца цэнтральная магістраль Мінска?
2. Якая даўжыня праспекта імя Францыска Скарыны?
3. Якія плошчы знаходзяцца злева і справа ад праспекта?
4. Ці ёсць на праспекце сучасныя універсальныя магазіны і кінатэатры?
5. Якая навуковая ўстанова знаходзіцца на праспекце?
6. Якая рака перасякае горад?
7. Ці любяць мінчане гуляць па набярэжнай?
8. Якія культурныя ўстановы запальваюць свае агні вечарам?

**245. Складзіце паводле тэксту дыялог.**

**246. Раскажыце пра свой родны горад.**

1. Як называецца ваш родны горад?
2. Дзе знаходзіцца ваш горад?
3. Якая гісторыя ўзнікнення вашага горада?
4. Якія архітэктурныя помнікі знаходзяцца ў вашым горадзе? Як называецца галоўная вуліца вашага горада?
5. Якія прамысловыя прадпрыемствы размешчаны ў вашым горадзе?
6. Ці ёсць у вашым горадзе тэатры?
7. Як называюцца навучальныя ўстановы вашага горада?
8. Якія віды транспарту абслугоўваюць жыхароў вашага горада?

***ДЫЯЛОГ***

**247. Прачытайце дыялог ў парах. Прапануйце наведаць Траецкае прадмесце, Чырвоны касцёл.**

— Гэта група італьянскіх турыстаў? Добры дзень!

— Добры дзень!

— Я ваш экскурсавод, Марына Казіміраўна. Буду дапамагаць вам знаёміцца з нашым горадам.

— Марына Казіміраўна! Было б добра наведаць Дамініканскі касцёл. Мы многа чулі пра яго.

— Наведаем абавязкова, бо гэта цікавы помнік барока.

*ГРАМАТЫКА*

**Прошлы час дзеясловаў**

Дзеясловы ў прошлым часе змяняюцца па родах і ліках.

| **адзіночны лік** | | | **множны лік** |
|---|---|---|---|
| ***мужчынскі род*** | ***жаночы род*** | ***ніякі род*** | |
| Хлопчык прыйшоў са школы. | Дзяшчынка прыйшла са школы. | Дзіця прыйшло са школы. | Дзеці прыйшлі са школы. |

**248. Пастаўце дзеясловы *хадзіць, бегаць, лятаць* у форме прошлага часу мужчынскага роду; дзеясловы *ісці, ляцець, дайці* — у форме прошлага часу жаночага роду; дзеясловы *выйсці, адысці, прыбегчы* — у форме прошлага часу ніякага роду.**

*ТЭКСТ*

**Старажытны Мінск**

Мінску ўжо больш за 900 гадоў. У старажытнасці яго называлі Менск або Менеск. Упершыню такая назва ўпамінаецца ў летапісе 1067 года.

Старажытным архітэктурным ядром Мінска было Старое месца. На сутоку дзвюх рэк — Нямігі і Свіслачы — быў пабудаваны драўляны Мінскі замак. Гэта было ў XI стагоддзі. Побач узняўся мураваны храм. Недалёка ад замка размяшчаўся рамесніцкі пасад з гандлёвай плошчай, якая называлася Ніжні рынак. Цяпер гэта плошча 8 Сакавіка. У XVI стагоддзі сфарміраваўся новы цэнтр горада на Высокім рынку. Цяпер гэта месца мае назву "Плошча Свабоды".

**Каментарый:**

***суток*** — месца, дзе зліваюцца два водныя патокі

***пасад*** — *гіст.* пасёлак

**249. Адкажыце на пытанні:**

1. Колькі гадоў Мінску?
2. Як называлі Мінск у старажытнасці?
3. Калі ўпершыню ўпамінаецца Мінск у летапісе?
4. Якая забудова было архітэктурным ядром старажытнага Мінска?
5. Што пабудавалі на сутоку Нямігі і Свіслачы?
6. Калі ўзнік Мінскі замак?
7. Што размяшчалася непадалёк ад замка?
8. Як называўся новы цэнтр горада?
9. Якія сучасныя плошчы ўзніклі на гістарычным месцы Мінска?

*ГРАМАТЫКА*

**Выражэнне мэтавых адносін у складаным сказе**

**Мэтавыя адносіны** афармляюцца пры дапамозе злучнікаў *каб, для таго каб, на тое каб, абы,* якія паказваюць на мэту або прызначэнне таго, пра што паведамляецца ў сказе.

| | | |
|---|---|---|
| **каб** | Стылістычна нейтральны і найбольш ужывальны | *Каб хоць на міг уваскрэсла каханне, глянь іншы раз на яе.* |
| **для таго, каб на тое, каб** | Выкарыстоўваецца ў кніжных стылях | *Трэба спяшацца жыць, для таго каб ніводзін дзень не прапаў дарэмна.* *Работа зроблена дасканала, на тое каб яе не перарабляць.* |
| **абы** | Мае размоўны характар, выкарыстоўваецца нячаста. | *Яна прасядзела на вуліцы, абы не паказвацца маці.* |

**!** У такіх сказах можа мець месца і прамы, і адваротны парадак размяшчэня дадананай часткі:

*Яна ўзяла таксі, каб не спазніцца на поезд.*

*Каб не спазніцца на поезд, яна ўзяла таксі.*

**250. Замест кропак устаўце прыдатную па сэнсу дадуную частку:**

1. Мы ідзём на рэчку, ...
2. Школьнікі садзяцца ў аўтобус, ...
3. Яна ідзе ў інстытут, ...
4. Студэнты ідуць у музей, ...
5. Мы ідзём у лес, …

*каб пазнаёміцца з новай экспазіцыяй музея А.Міцкевіча.*
*каб здаць экзамен.*
*каб назбіраць грыбоў.*
*каб адправіцца на экскурсію.*
*каб пазагараць і пакупацца..*

**251. Прачытайце і перакажыце жарты Як вы іх зразумелі?**

**Аматар прагулак**

Міхась і Кастусь сустракаюцца на рагу вуліцы. Абое адчуваюць сябе непрывычна. Нарэшце адзін гаворыць:

— Усё ж прыемна калі-нікалі размяць ногі!

— Так, вельмі прыемна! А ў цябе што, таксама вадзіцельскае пасведчанне адабралі?

**Заспакоіў**

Тоне карабель. Усе пасажыры ў паніцы кідаюцца да шлюпак. І толькі адзін спакойна падыходзіць да капітана і пытаецца:

— Ці далёка да зямлі? Я — выдатны плывец.

— Адна міля, — змрочна адказвае капітан.

— А ў які бок плыць?

— Вертыкальна ўніз.

***ГРАМАТЫКА***

**Выражэнне ўмовы ў складаным сказе**

**Умоўныя адносіны** афармляюцца пры дапамозе злучнікаў *калі, як, каб, раз, толькі,* якія паказваюць на рэальную або магчымую ці пажаданую ўмову, пры якой адбываецца або можа адбывацца дзеянне.

| | | |
|---|---|---|
| **калі як** | Умоўныя адносіны, пераважна з часавым адценнем | *Ураджайным будзе лета, калі снегу аж да акон.* *Калі пераходзіш вуліцы, трэба быць вельмі асцярожным.* *Як камарна, то і хлебна.* |

| | | |
|---|---|---|
| **каб** | Умоўныя адносіны, якія ўскладнены дадатковым адценнем мэты | *Зрабілі б мы нямала, каб сілы нам хапала.* |
| **раз** | Дадатковыя прычынныя адносіны | *Добрыя весці, раз запрашаюць сесці.* |
| **толькі** | Дадатковае абмежавальнае значэнне | *Усё будзе як след, трэба толькі папрацаваць.* |

У сказах такога тыпу можа мець месца прамы і адваротны парадак размяшчэння даданай часткі.

*І баран бы касіў, калі б хто касу насіў.*

*Калі б хто касу насіў, і баран бы касіў.*

**252. Замест кропак устаўце прыдатную па сэнсу або галоўную, або даданую частку:**

1. Мы паедзем на экскурсію, ...
2. Калі ты мне дапаможаш пачысціць бульбу, ...
3. Яна паедзе на навуковую канферэнцыю, ... .
4. Калі будуць білеты ў тэатр, …
5. Калі будзе добрае надвор'е, ... .
6. ..., то ніколі не трапіш у аварыю.

мы зможам паглядзець на ігру любімых артыстаў.
*як толькі прыдзе запрашэнне.*
*калі не будзе дажджу.*
*я прыгатую дранікі.*
*Калі будзеш паводзіць сябе асцярожна на дарозе.*
*самалёт адправіцца своечасова.*

**253. Прачытайце прыказкі. Падбярыце адпаведнікі ў вашай мове:**
1. Блізка то блізка, але каб не было слізка.
2. Хто ціха ходзіць, той густа месіць.
3. Каня не дагледзіш — далёка не заедзеш.
4. Не лятай высока, бо нізка сядзеш.

***ТЭКСТ***

**Палёт праз стагоддзі**

Вось мы ў Мінску XII стагоддзя, які належаў полацкаму князю Усяславу Чарадзею.

Вялікай славай карыстаўся гэты князь сярод сваіх сучаснікаў. Жыццё Усяслава, поўнае прыгод і подзвігаў, натхняе і сёння паэтаў. Розум, энергія і знаходлівасць, з якой ён абараняў свае княства, яго ўменне знайсці выхад з самых цяжкіх і складаных абставін здзіўлялі людзей, рабілі моцнае ўражанне нават на ворагаў. За поспехі Усяслава, яго спрытнасць і рашучасць, людзі лічылі яго чараўніком. У народзе хадзілі чуткі, быццам князь Усяслаў умее абярнуцца ў рысь ці ваўка і блукае ўначы па дарогах. Казалі, быццам ён можа ператварыцца ў туман і знікнуць у адным месцы, каб апынуцца непрыкметна ў другім, дзе яго зусім не чакаюць.

Гэта пра Усяслава вобразна гаворыць невядомы аўтар "Слова аб палку Ігаравым": "Ён на кані памчаў да горада Кіева і дакрануўся кап'ём да залатога пасада Кіеўскага. Скочыў ад іх лютым зверам (лютым зверам называлі ў тыя часы рысь). Апоўначы з Белграда ахінуўся сіняй імглой, а на раніцу, узняўшыся, адчыніў браму ў Ноўгарадзе, разбіў славу Яраслава і скочыў воўкам да Нямігі з Дудутак… Усяслаў князь людзям суд судзіў, князям гарады дзяліў, а сам уначы воўкам блукаў. З Кіева да пеўняў дасягаў Тмутаракані… Яму ў Полацку рана званы пазванілі ў Сафіі святой, а ён у Кіеве звон чуе".

Часта даводзілася Усяславу трапляць у цяжкае і як быццам бязвыхаднае становішча. Вось і сёння бязрадасны дзень для Чарадзея. Халодны сакавіцкі дзень 1067 года. Усяляк

намагаецца Усяслаў захаваць незалежнасць Полацкай зямлі ад вялікіх князёў кіеўскіх, але сілы няроўныя. Вялікі князь кіеўскі Ізяслаў рушыў з двума братамі на Полацкую зямлю і падступіў да Мінска.

Мінчане замкнуліся ў горадзе. Яны ўпарта супраціўляліся спачатку на валу, потым у вузкіх вуліцах пасада. Але кіеўскія воіны ўзялі Мінск.

Потым, праз колькі год, аўтар "Слова аб палку Ігаравым" скажа пра гэтыя падзеі: "На Нямізе снапы сцеляць галовамі, малоцяць цапамі булатнымі, жыццё кладуць на таку, душу веюць ад цела. Нямігі бо крывавыя берагі не дабром засеяны, засеяны касцямі сыноў рускіх".

У сувязі з бітвай на берагах Нямігі ўпершыню трапіў Мінск на старонкі гісторыі. Пад 1067 годам упершыню было ўпамянута яго імя ў летапісе.

Таму гэты год, такі няшчасны для маладога Мінска, год руйнавання, і лічыцца пачаткам яго гістарычнага жыцця.

Пад знакам вайны і разбурэння ўвайшоў наш горад у гісторыю, у літаратуру. З гэтага часу ён усё часцей упамінаецца ў гістарычных дакументах, і кожны раз зноў і зноў у сувязі з войнамі, бітвамі, пажарамі і няшчасцямі.

Такі быў яго лёс.

Такі быў лёс усёй нашай краіны. Яго вызначыла геаграфічнае становішча зямлі, якую потым пачалі называць беларускай — на скрыжаванні вялікіх дарог між Усходам і Захадам, Поўначчу і Поўднем, у самым цэнтры Еўропы.

(Паводле Віталя Вольскага)

**254. Адкажыце на пытанні:**

1. Каму належаў Мінск у XII стагоддзі?
2. Якімі рысамі характару заслужыў полацкі князь Усяслаў славу і павагу ў сваіх сучаснікаў?
3. Чаму князя празвалі чарадзеем?
4. Як апісвае Усяслава Чарадзея аўтар "Слова аб падку Ігаравым"?
5. Якім выдаўся для УсяславаЧарадзея сакавіцкі дзень 1067 года?
6. Як вы разумееце словы: "На Нямізе снапы сцеляць галовамі, малоцяць цапамі булатнымі, жыццё кладуць на таку, душу веюць ад цела. Нямігі бо крывавыя берагі не дабром засеяны, засеяны касцямі сыноў рускіх".
7. У сувязі з чым упершыню трапіў Мінск на старонкі гісторыі?
8. Які год лічыцца для Мінска пачаткам яго гістарычнага жыцця?
9. Што вызначала лёс Мінска і Беларусі на працягу стагоддзяў?
10. Якія часавыя формы дзеяслова ужывае аўтар для апісання гістарычнага мінулага Мінска?

**255. Раскажыце, ці спадабаўся вам Мінск.**

## V. МАГАЗІНЫ. ПАКУПКІ
### Прадуктовы магазін

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **ХЛЕБ** | булка<br>абаранкі<br>сушкі<br>піражок<br>пячэнне<br>піровкнае | **САДАВІНА—<br>ГАРОДНІНА** | бульба<br>морква<br>цыбуля<br>памідоры<br>буракі<br>салата<br>радыска<br>фасоля | маліны<br>яблыкі<br>слівы<br>грушы<br>апельсіны<br>вішні<br>клубніцы<br>парэчкі |
| **РЫБА** | рыба жывая<br>салёная<br>вэнджаная<br>марожаная<br>ікра | | | |
| **МЯСА —<br>МАЛАКО** | свініна<br>бараніна<br>ялавічына<br>цяляціна<br>смятана<br>вяршкі<br>тварог | **КВЕТКІ** | гваздзікі<br>ружы<br>лілеі<br>цюльпаны<br>бэз<br>гладыёлусы<br>вяргіні<br>язмін | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| прадаваць<br>прадаць | ***што?*** | прадукты | ***каму?*** | пакупніку |
| купляць<br>купіць | ***што?*** | гародніну | | |
| загортваць<br>загарнуць | ***што?*** | сувенір | ***у што?*** | у паперу |
| адразаць<br>адрэзаць | ***што?*** | сыр | ***ад чаго?*** | ад кавалка |
| узважваць / зважваць<br>узважыць / зважыць | ***што?*** | цукеркі | ***каму?*** | дзіцяці |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| плаціць<br>заплаціць | ***куды?*** | у касу | ***каму?*** | прадаўцу |
| наліваць<br>наліць | ***што?*** | сок | ***у што?*** | у шклянку |
| насыпаць<br>насы'паць | ***што?*** | цукар | ***куды?*** | у пакет |
| гандляваць | ***чым?*** | кветкамі | | |

| | |
|---|---|
| бутэлька малака | слоік мёду |
| пачак пячэння | бохан (буханка) хлеба |
| плітка шакаладу | бляшанка сардзін |
| кілаграм бульбы | каробка цукерак |
| пакет круп | дзесятак яек |

**256. Дапоўніце сказы:**

| | |
|---|---|
| 1. Кожны дзень Мікола купляе *(што?)* | у пакет |
| 2. Восенню на вуліцах прадаюць *(што?)* | дзецям |
| 3. Пакупнік папрасіў загарнуць сыр *(у што?)* | у касу |
| 4. Цыгарэты забараняецца прадаваць *(каму?)* | бутэльку малака |
| 5. За выбраны тавар трэба заплаціць *(куды?)* | у паперу |
| 6. Змітрок насыпаў цукеркі *(у што?)* | ад буханкі хлеба |
| 7. Адрэжце, калі ласка, палову *(ад чаго?)* | садавіну |

**257. Складзіце сказы паводле ўзору:**

**Узор:** ***Ці любіце вы малако? — Так, я люблю малако.***
***Не, я люблю не малако, а вяршкі.***

Ці любіце вы абаранкі?
Ці любіце вы памідоры?
Ці любіце вы салёную рыбу?
Ці любіце вы гладыёлусы?
Ці любіце вы бараніну?

**258. Прачытайце дыялогі. Дзе і ў якой сітуацыі яны могуць адбыцца? Перавядзіце дыялагічнае маўленне ў маналагічнае.**

— Дайце, калі ласка, паўкілаграма каўбасы і дзвесце грамаў шынкі.
— Вам парэзаць?
— Шынку парэжце, а каўбасу адным кавалкам.

— Хацеў бы купіць французска-беларускі слоўнік.
— Апошняе выданне ўжо разышлося.
— Шкада. А якое ёсць?

— Выданне пазамінулага года.
— Гэта мяне задавальняе.
— Заплаціце, калі ласка, у касу.

— Нам патрэбны кветкі для ўшанавання юбіляра. Ці не дапамаглі б вы нам штонебудзь выбраць?
— Раю вам купіць цёмна-чырвоныя гваздзікі. Яны рэдкага гатунку і выглядаюць вельмі ўрачыста.
— Можа, нам спыніцца на тых жоўтых ружах?
— Не думаю. Мужчыну лепш паднесці гваздзікі. Гэта ўжо сталая традыцыя.
— Добра. Загарніце, калі ласка, букет.

— Добры дзень, Іна.
— Прывітанне, Міхаль.!
— Дзе ты купіла такія добрыя яблыкі?
— Побач, у краме "Садавіна-гародніна".
— І па колькі?
— Па рынкавай цане.
— Гэта вельмі дорага. Лепш я вазьму слоік яблычнага варэння.

**Каментарый:**

Канструкцыя ***Па колькі?*** мае размоўны характар ад *Па колькі рублёў (каштуе)?* і ўжываецца ў гутарковым стылі. Нейтральны сінанімічны выраз *Колькі каштуе?*

| |
|---|
| адзін кілаграм — 1 кг; два кілаграмы — 2 кг |
| адзін грам — 1 г; дзесяць грамаў — 10 г |
| 500 грамаў = паўкілаграма = 0,500 кг |
| 1 кілаграм і 200 грамаў — 1,200 кг |
| адзін літр — 1 л; два літры — 2 л |
| паўлітра — 0,500 л |

**259. Складзіце сказы, ужываючы абазначэнні вагі і аб'ёму.**

| | |
|---|---|
| Я купляю 1 … мінеральнай вады. | |
| Вы купляеце 0,500 … крухмалу. | кілаграм |
| Яны купляюць 5 … бензіну. | грам |
| Мы купляем 300 … цукерак. | літр |
| Яна купляе 2 … пернікаў. | |
| Ён купляе 250 … вяндліны. | |

**260. Растлумачце прадаўцу жаданне набыць малако, чай, сыр, алей, мяса. Выкарыстайце наступныя варыянты:**

Дайце, калі ласка …
Я хацеў бы (хацела б) набыць …
Ці ёсць у вас у продажы …
Папрашу адрэзаць кавалак …
Мне трэба купіць …
Зважце, калі ласка, кілаграм …
Ці прадаяце вы …

**261. Дзе можна купіць?**
1) муку, цукар, крупы, карыцу, перац, гваздзіку, воцат, алей;
2) слоўнікі, даведнікі, энцыклапедыі, альманахі, зборнікі;
3) мяса, кансервы, малако, масла, віно, цукеркі;
4) газеты, часопісы, паштоўкі, маркі, праязныя талоны.

*Для даведак*: у кнігарні, у гастраноме, у газетным кіёску, у краме "Бакалея".

***ТЭКСТ***

**У магазіне**

У Зосі сёння няма заняткаў. Яна хоча дапамагчы маме і прыгатаваць абед сама. Зося збіраецца ў магазін. Спачатку ў гастраноме яна купляе кілаграм мяса, пакет рысу і бутэльку алею. Не забылася Зося і пра гародніну. З задавальненнем выбірае маладую бульбу, цыбулю і моркву. А што купіць на дэсерт? Зося доўга не разважае. Усе любяць шакаладнае марожанае. Засталося купіць чорны хлеб і булкі. Нарэшце Зося зрабіла ўсе пакупкі. Трэба спяшацца дадому.

**262. Адкажыце на пытанні:**
1. Што купіла Зося ў гастраноме?
2. Што Зося выбрала з гародніны?
3. Што Зося купіла на дэсерт?
4. Які хлеб купіла Зося?

**263. Прачытайце сказы. Звярніце ўвагу на чаргаванне зычных.**

| | |
|---|---|
| На стале ляжыць каробка. | У каробцы ляжаць цукеркі. |
| У халадзільніку стаіць бутэлька. | У бутэльцы малако. |
| У руках прадаўца бляшанка. | На бляшанцы надпіс "Сардзіны". |
| Плітка шакаладу падабаецца дзецям. | На плітцы прыгожы малюнак. |

**264. Пакажыце чаргаванні ў наступных словах шляхам словазмянення.**

**Узор: *булка – булцы***

Радыска, сушка, буханка, смятанка, паштоўка, кніжка.

**265. Адкажыце на пытанні:**
1. Якія малочныя прадукты вы любіце? Дзе іх купляеце?
2. Што вы звычайна выбіраеце з садавіны і гародніны? Дзе вы робіце пакупкі?
3. Па якія прадукты вы ідзяце ў магазін, калі запрашаеце на вячэру гасцей?
4. Ці наведваеце вы кандытарскі магазін? Які асартымент яго тавараў?
5. Якія прадукты вы купляеце для дыетычнага харчавання?
6. Ці можна купіць у вашым горадзе экзатычныя фрукты? Якія?
7. Ці даручаеце вы сваім дзецям рабіць пакупкі ў магазіне? У якім? Калі?
8. Якім хлебабулачным вырабам аддаюць перавагу члены вашай сям'і?
9. Ці ёсць у вашым раёне універсальны прадуктовы магазін? У чым яго адметнасць?

**266. Прачытайце і перакажыце жарт.**

Старэнькі селянін, прыехаўшы ў горад, заходзіць у шыкоўны магазін і пытае:

— Ці не тут прадаюцца хамуты?

— Не, стары, — адказваюць яму два франты, — тут прадаюцца дурні.

— Бач! — круцячы галавою, дзівіцца стары. — Відаць, і торг ідзе добра, бо толькі два і засталося.

**Каментарый:**

***хамут*** **–** частка конскай вупражы

**Прамтаварны магазін**

***жаночае адзенне***

| | |
|---|---|
| сукенка | халат |
| касцюм | спадніца |
| кофта | блузка |
| жакет | |

***мужчынскае адзенне***

| | |
|---|---|
| гарнітур | пуловер |
| кашуля | штаны |
| світар | піжама |

| ***сезоннае адзенне*** | | ***абутак*** | | ***галаўныя ўборы*** | |
|---|---|---|---|---|---|
| паліто | футра | туфлі | пантофлі | капялюш | касынка |
| плашч | кажух | боты | чаравікі | берэт | хустка |
| куртка | шорты | басаножкі | | шапка | панама |
| купальнік | плаўкі | | | | |

| | | |
|---|---|---|
| апранаць (ца) — апрануць (ца) | | адзенне |
| | ***што?*** | вопратку (апратку) |
| надзяваць — надзець | | строі (разм.) |

'адзець, нацягнуць на сябе'— апрануць (паліто, капялюш); надзець (плашч, шапку)

'надзець сабе на ногі' — абуць (боты, чаравікі)

| | | |
|---|---|---|
| выбіраць — выбраць<br>прымерваць — прымерыць | ***што?*** | кашулю |
| пад густ быць<br>выбіраць | ***што?*** | сукенку |
| да спадобы (прыйсціся) | ***каму?*** | пакупніку |

| | |
|---|---|
| | са скуры, скураны, скураная, скуранoe |
| сукенка *якая?* | з бавоўны, баваўняны, баваўняная, баваўнянае |
| касцюм *які?* | з паркалю, паркалёвы, паркалёвая, паркалёвае |
| паліто *якое?* | з шэрсці, шарсцяны, шарсцяная, шарсцяное |
| | з шоўку, шоўкавы (шаўковы), шоўкавая, шоўкавае |
| | з аксаміту, аксамітны, аксамітная, аксамітнае |

**267. Назавіце дапаўненні да жаночага касцюма; да мужчынскага касцюма; да жаночага і мужчынскага касцюма.**

Шалік, шляпа, касынка, сумка, рэмень, брошка, пальчаткі, гальштук, запанкі, патрфель.

**268.** 1. Вы збіраецеся на прыём. Вы хочаце добра выглядаць. Што вы апранеце? Апішыце дэталі вашага туалета.

2. Вы едзеце адпачываць на мора. Што вы пакладзяце ў дарожную сумку?

3. Прыйшла вясна. Вы пераглядаеце свой гардэроб. Якое адзенне вы схаваеце да новага зімовага сезона?

4. Вы расказваеце сяброўцы аб сваіх уражаннях ад знаёмства з новымі мадэлямі адзення славутага мадэльера. На што вы звернеце яе ўвагу?

***ТЭКСТ***

**Дзень пакупак**

Вольга і Ганна — сяброўкі. У вольны дзень яны намерыліся наведаць ЦУМ. Гэта вялікі універсальны магазін сталіцы. Ён даволі папулярны, бо знаходзіцца ў самым цэнтры горада. Вольга шукае падарунак свайму сябру-аднакласніку. Ганна хоча купіць новыя пальчаткі.

Сёння ля прылаўкаў мала народу. Дзяўчаты паднімаюцца на другі паверх. Тут прадаюцца тавары для мужчын. Самы патрабавальны пакупнік можа набыць пінжак, штаны, касцюм, кашулю, гальштук пад свой густ. Вольга выбірае прыгожы шарсцяны шалік да дэмісезоннага паліто.

Жанчын заўсёды цікавіць трэці паверх. Тут прадаецца жаночае адзенне. У вітрынах выстаўлены элегантныя сукенкі, спадніцы, блузкі, курткі, прыгожыя туфлі і боты. Вольга прымерыла модны берэт, але ён ёй замалы. У секцыі сезонных тавараў дзяўчаты ўбачылі прыгожыя пальчаткі. Выбар быў багаты, а прадаўшчыцы ветлівыя. Вольга выбрала чорныя скураныя пальчаткі і засталася задаволеная сваёй пакупкай. Для малодшай сястры Ганна купіла белы паркалёвы каўнерык і цёплыя баваўняныя шкарпэткі.

**Каментарый:**

***ЦУМ*** – складанаскарочанае слова: цэнтральны універсальны магазін

**269. Адкажыце на пытанні:**

1. Калі Вольга і Ганна намерыліся наведаць ЦУМ? *(у нядзелю, у вольны дзень, у час адпачынку)*
2. Што мінчане называюць ЦУМам? *(магазін рэстаран, салон)*
3. Дзе знаходзіцца ЦУМ? *(у цэнтры горада, у новым раёне, каля вакзала)*
4. Што хоча купіць Вольга? *(зімоваае паліто, падарунак сябру, цёплую бялізну)*
5. Дзе прадаюцца тавары для мужчын? *(на другім паверсе, каля выхаду, побач з кафетэрыем)*
6. Што можа выбраць пакупнік пад свой густ? *(гальштук, кашулю, штаны, шапкі, купальнікі)*
7. Якія тавары выстаўлены ў вітрынах? *(сукенкі, спадніцы, плашчы, чаравікі)*
8. Чаму Вольга не купіла берэт? *(ён быў замалы, ён не спадабаўся, ён быў не модны)*
9. Якія пальчаткі выбрала Вольга? *(прыгожыя, чорныя, доўгія, скураныя)*
10. Што купіла Ганна для малодшай сястры? *(новую ляльку, цёплыя шкарпэткі, летні капялюшык)*

**270. Складзіце паводле тэксту дыялог, які мог адбыцца паміж Вольгай і Ганнай.**

**271. Адкажыце на пытанне, ужываючы прыметнікі:**

| | | |
|---|---|---|
| **ЯКІ ВЫ КУПІЛІ** | берэт?<br>капялюш?<br>купальнік?<br>плашч?<br>пояс? | скураны<br>шарсцяны<br>саламяны<br>аксамітны<br>шоўкавы |

**272. Адкажыце на пытанні:**

1. Як апранаецца ваш сусед? *(модна, з густам, элегантна,...)*
2. Якое адзенне вы лічыце найбольш зручным? *(спартыўнае, адзенне з натуральных тканін, )*
3. Што звычайна вы носіце ў халоднае надвор'е? *(паліто, куртку, плашч, ...)*
4. Якія галаўныя ўборы носяць жыхары поўдня? поўначы? *(панама, самбрэра, шапка, чалма,...)*
5. У чым вы ходзіце ў тэатр? *(у гарнітуры, у сукенцы, у вячэрнім ансамблі, ...)*
6. Які абутак вы носіце дома? *(тапкі, басаножкі, пантофлі, ...)*

***ГРАМАТЫКА***

**Загадны лад дзеяслова (імператыў)**

Загадны лад дзеяслова выражае заахвочванне да дзеяння, загад або просьбу. Выражаецца формай 2-ой асобы адзіночнага або множнага ліку, якая ўтвараецца ад асновы цяперашняга часу з дапамогай канчаткаў або без іх.

***І. Націск на канчатку***

| | | |
|---|---|---|
| (насіць) | нашу — насі /це/ | **ш / с** |
| (лавіць) | лаўлю' — лаві /це/ | **ўл / в** |
| (купіць) | куплю' — купі /це/ | **пл / п** |

***ІІ. Націск на аснове***

| | | |
|---|---|---|
| (вудзіць) | вуджу — вудзьо /це/ | **дж / дз'** |
| (сеяць) | сею — сейо /це/ | |
| (быць) | буду — будзьо /це/ | **д /дз'** |

***ІІІ. Зваротныя дзеясловы***

| | |
|---|---|
| (апранацца) | апранаюся — апранайся, апранайцеся |
| (дакранацца) | дакранаюся — дакранайся, дакранайцеся |
| (пытацца) | пытаюся — пытайся, пытайцеся |

**!** Дзеясловы *біць, віць, піць, ліць* утвараюць формы загаднага ладу *бі /це/, ві /це/, пі/це/, лі /це/*; дзеяслоў *дай* — форму *дай /це/*, дзеяслоў *есці* — *еш /це/*, дзеяслоў *ісці* — *ідзі/це/.*

| | | |
|---|---|---|
| *апрануць — апрані* | *што?* | паліто<br>сукенку<br>капялюш |

| | | |
|---|---|---|
| *купіць — купі* | *што?* | хлеб<br>газету<br>гальштук |
| *здымаць — здымі* | *што?* | павязку<br>шапку<br>чаравікі |
| *паказаць — пакажы* | *што?* | вуліцу<br>пакупку<br>малюнак |

| **Няхай (хай) + форма дзеяслова 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку** | |
|---|---|
| Няхай (хай) | дарує<br>даруюць |
| Няхай (хай) | прыязджае<br>прыязджаюць |
| Няхай (хай) | супакоіцца<br>супакояцца |

**273. Пастаўце дзеясловы ў форме загаднага ладу:**
1. Маша, (паглядзець), якія прыгожыя туфлі.
2. (Паказаць), калі ласка, мужчынскі світар.
3. Мама, (купіць) мне новыя джынсы.
4. Тамара, (зняць) сукенку, (апрануць) купальнік.
5. Дзеці, (ісці) у кнігарню і (купіць) падручнік.

**274. Знайдзіце дзеясловы, якія па значэнню нельга ўжыць з пададзенымі назоўнікамі:**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| купі<br>надзень<br>наведай<br>пакажы | *кашулю* | *кнігу* | *выставу* | *тавар* |

**275. Прачытайце дыялогі, назавіце іх удзельнікаў. Пастаўце дзеясловы ў форме загаднага ладу.**

— Пеця, сёння на дварэ холадна, *(надзець)* футра.
— Я хачу ісці ў куртцы.
— Курку будзеш насіць вясною.
— Тады я здыму світар, апрану цёплую кашулю.

— *(Паказаць)*, калі ласка, зялёную спадніцу.
— Яна прадаецца разам з зялёным жакетам.
— Жакет зашпільваецца на гузікі?
— Не, ён на маланцы.
— Дзякую, але гэты гарнітур мне не падабаецца.

— Добры дзень, Алена Паўлаўна.
— Добры дзень.
— Ці не пашыеце вы мне сукенку?
— Фасон ты ўжо выбрала, Юля?
— Так. Каўнер вузкі, спадніца ў складкі, пояс са спражкай.
— Ну што ж, давай пачнем кроіць матэрыю.

— Марынка, я купіла табе новы спартыўны касцюм.
— Ой, які прыгожы! Дзякуй, мама. Сіні колер мне заўсёды падабаўся.
— *(Надзець)* яго, пабачым, ці пасуе табе.

**276. Прачытайце прыказкі. Як вы разумееце іх змест?**
Купіў не купіў, а патаргавацца можна.
Першага торгу не мінай.
За што купіў, за тое і прадаю.
Не мела баба клопату, купіла парася.

**277. Утварыце дзеяслоўныя формы загаднага ладу супрацьлеглага значэння.**

надзень плашч — *(здымаць)* плашч;
абуй боты — *(разуваць)* боты;
апрані касцюм — *(распрануць)* касцюм;
загарні пакунак — *(разгарнуць)* пакунак;
прадай кнігу — *(купіць)* кнігу.

**278. Складзіце сказы з дзеясловамі загаднага ладу, якія выражаюць:**
1. просьбу паведаміць аб наяўнасці патрэбнага тавара;
2. параду ўстрымацца ад пакупкі;
3. загад пайсці ў магазін па хлеб;
4. заклік купляць свежыя вячэрнія газеты.

**279. Прачытайце і перакажыце жарт.**

Шавец аддае новыя боты і гаворыць:
— Бярыце вашы боты. Тыдні са два яны будуць трошкі ціснуць.
— Э, нічога! Два тыдні я пахаджу ў старых чаравіках, а боты няхай пастаяць.

**280. Прачытайце беларускія прыказкі. Як вы разумееце іх сэнс?**
Пазнаюць нашу дачку і ў андарачку.
Балі ды гулі ў лапці абулі.
Вялікі пан ды падраны жупан.

**Каментарый:**

***Андарак*** – народная адзежына беларускіх жанчын – саматканая спадніца ў клетку або ў палосы;

*лапці*, адз. ***лапаць*** – сялянскі абутак, які насілі ў даўнейшыя часы, плецены з лыка, бярosты або вяровак;

***жупан*** – народнае верхняе жаночае і мужчынскае адзенне з каляровага сукна.

## Назвы колераў

***чырвоны     аранжавы   жоўты***

***зялёны     блакітны   сіні***

***фіялетавы***

*ГРАМАТЫКА*

**Невытворныя прыметнікі**

***жоўты сіні***
***белы чорны***

**Вытворныя прыметнікі**

1. утвараюцца ад асноў назоўнікаў з дапамогай суфіксаў:

| | |
|---|---|
| | блакіт + -**н**- — *блакітны* (шар) |
| **-н-** | лімон + **-н-** — *лімонны* (світар) |
| | шакалад + **-н-** — *шакаладны* (загар) |
| **-ав-** | маліна + **-ав-** — *малінавы* (берэт) |
| **-ёв-** | вішня + **-ёв-** — *вішнёвы* (абрус) |
| **-ов-** | ружа + **-ов-** — *ружовы* (халат) |

2. утвараюцца ад прыметнікаў колеру пры дапамозе суфіксаў *–ават- (-яват-)*, якія абазначаюць непаўнату якасці:

карычневы + -**яват-** — *карычняваты* (чамадан)
жоўты + **-ават-** — *жаўтаваты* (пясок)
чырвоны + **-ават**- — *чырванаваты* (яблык)

**281. Падбярыце да складаных найменняў колеру аднасастаўныя адпаведнікі:**

Светла-сіні, бледна-жоўты, светла-чырвоны, цёмна-сіні, светла-карычневы, цёмна-чырвоны, светла-фіялетавы.

*Для даведак*: блакітны, палавы', васільковы, ружовы, ліловы, бэжавы, бардовы.

**282. Адкажыце на пытанні:**
1. Які колер мае ваш нацыянальны сцяг?
2. Якія колеры ўтвараюць спектр?
3. Якія моры называюцца паводле колеру?
4. Якія колеры ў славян маюць сімвалічны сэнс — радасці і жалобы?
5. Якія колеры называюцца ахраматычнымі?

**Параўнайце:**
шэрая качка — шэрая асоба
крыклівая афарбоўка — крыклівае дзіця
спакойны колер — спакойны характар
халодны тон — халодны вецер

**283. Дапоўніце словазлучэнні, ужываючы прыметнікі ў належнай граматычнай форме:**

| | |
|---|---|
| **Хлеб бывае** | **зялёны і чырвоны** |
| **Перац бывае** | **белы і чырвоны** |
| **Віно бывае** | **чорны і белы** |
| **Касачы бываюць** | **сіні і жоўты** |

**284. Прачытайце і перакажыце дыялогі:**

— Я хацела б выбраць шоўкавую сукенку.
— Якога колеру вы жадаеце?
— Што-небудзь у шэра-сіняй гаме.
— Калі ласка, прымерце гэтую, са светла-попельным адценнем.
— Сапраўды прыгожа. Ці пасуе мне гэты колер?
— Так, гэты колер вам да твару.

— Юрась Рыгоравіч, добра, што вы завіталі да нас у рэдакцыю, трэба абмеркаваць афармленне вашай кнігі. Вокладка карычневага і залаціста-жоўтага колераў. А назва кнігі будзе набрана белымі літарамі.
— Я думаю, што на залацістым фоне лепш успрымаюцца літары чорнага колеру.
— Чорны колер не падыходзіць. Ён сімвалічна замацаваны і не стасуецца з сэнсам загалоўка.
— Пакінем ваш варыянт.

**285. Адкажыце на пытанні, ужываючы назвы колераў.**

1. Якія ў вас вочы? – (*блакітныя, зялёныя, карыя, шэрыя, чорныя, сінія…)*
2. Якія ў вас валасы? – *(русыя, чорныя, белыя, рыжыя, сівыя, светлыя…)*
3. Якую вы сёння апранулі кашулю? (сукенку) – *(белую, карычневую,зялёную, ружовую, шэрую, крэмавую…)*
4. Аўтамашыне якога колеру вы аддаяце перавагу? – *(чырвонага, белага, бэжавага, сіняга, салатнага, жоўтага…)*

***ТЭКСТ***

**Як апраналіся продкі беларусаў**

З часоў Полацкага і Турава-Пінскага княстваў (X-XII стст) да нас дайшлі ўзоры тканін (ільняных, шарсцяных, пяньковых, шаўковых) галаўных убораў, абутку. Асноўным прадметам як жаночага, так і мужчынскага касцюма была тунікападобная кашуля. Яна мела круглы, чатырохвугольны або касы выраз, які аздабляўся вышыўкай ніткамі, пацеркамі, металічнымі пранізкамі або тасьмой. Былі і кашулі з высокімі каўнярамі. Зашпільваліся яны на гузікі, завязваліся шнурком. У жанчын кашулю дапаўняла панёва, а ў мужчын — порты. Верхнім адзеннем былі світы, наплечныя пакрывалы, кажухі.

Значную ролю ў адзенні адыгрываў пояс з тканіны, скуры, сплецены з нітак, часта яго насілі з металічнымі спражкамі. Бытавалі ў тыя часы кофты, сарафаны і фартухі. Фарбы для адзення атрымлівалі з дзікіх раслін, дрэў, выкарыстоўваліся і мінеральныя фарбавальнікі.

Адзенне знатных людзей шылі з дарагіх прывазных тканін і ўпрыгожвалі вышыўкай залатымі ніцямі і каштоўнымі камянямі. Жанчыны насілі па дзве сукенкі (доўгую ніжнюю з вузкімі рукавамі і верхнюю — кароткую і з шырокімі рукавамі). Пашыраны быў скураны абутак (асабліва ў гарадах), які ўпрыгожваўся вышыўкай.

(Паводле Людмілы Дучыц)

**Каментарый:**

***пранізка*** – ад *пранізваць*, тонкі шнурок, які прашываецца праз тканіну.
***панёва*** –від жаночага адзення, спадніца з некалькіх полак, непасшываных у даўжыню.
***порты*** мн. – штаны, пашытыя з ільняной або бабаўнянай тканіны.

*світа* – верхняя вопратка з сукна.

**286. Адкажыце на пытанні:**

1. З якога гістарычнага часу дайшлі да нас старажытныя галаўныя ўборы, абутак, тканіны?
2. Які асноўны прадмет старажытнага беларускага касцюма? Як ён выглядаў?
3. Як упрыгожвалі кашулю?
4. У ансамблі з чым насілі кашулю мужчыны? жанчыны?
5. Што служыла старажытным беларусам верхнім адзеннем?
6. Які выгляд меў пояс?
7. Якім спосабам фарбавалі адзенне?
8. Якое адзенне насілі знатныя людзі?
9. З чаго рабілі абутак? Як яго ўпрыгожвалі?

***ГРАМАТЫКА***

**Азначальныя займеннікі *сам, самы***

| | **значэнне** | **прыклады** | **скланенне** |
|---|---|---|---|
| ***сам*** <br> ***сама*** <br> ***само*** | паказвае, што дзеянне ўтвараецца аб'ектам самастойна, без чыёй-небудзь дапамогі | хворы *сам* апрытомнеў; яна *сама* здагадалася; акно *само* адчынілася | **Н.** сам, сама, само, самі <br> **Р.** самога, самой, самога, саміх <br> **Д.** самому, самой, самому, самім <br> **В.** самога, самую, само, як Н. або Р. <br> **Т.** самім, самой, самім, самімі <br> **М.** самім, самой, самім, саміх |
| ***самы*** <br> ***самая*** <br> ***самае*** | паказвае на крайнюю мяжу пашырэння дзе-яння, з'явы або праяў-лення якасці | (скокнуў) пад *самую* столь; *самыя* розныя лёсы; у *самы* разгар працы | **Н.** самы, самая, самае, самыя <br> **Р.** самага, самай, самага, самых <br> **Д.** самаму, самай, самай, самым <br> **В.** самую**,** як Н. або Р <br> **Т.** самым, самай, самым, самымі <br> **М.** самым, самай, самым, самых |

**287. Дапоўніце сказы:**

| | |
|---|---|
| Гасцям падарылі … | і ў самой кнігарні |
| Чарга пакупнікоў цягнулася … | сам сабе |
| Гэты маршрут выбралі … | самыя прыгожыя кветкі |
| Кнігі прадавалі на вуліцы і … | да самага выхаду |
| Прадаўшчыца параіла звярнуцца да … | самі турысты |
| Прымерыўшы абноўку, Антось спадабаўся… | самога дырэктара магазіна |

**288. Устаўце займеннікі *сам* або *самы*:**

Да (*самога, самага)* вечара;
з *(самімі, самымі)* шчырымі пачуццямі;
заўсёды заставацца *(самім, самым)* сабой;
нечакана для *(самога, самага)* аўтара;
падзяліцца *(самім, самым)* запаветным;
сесці на тым *(самім, самым)* месцы;

ні *(самому, самаму)* паглядзець, ні людзям паказаць;
змагацца з *(самім, самым)* сабой;
па *(самім, самым)* вялікім рахунку.

***ГРАМАТЫКА***

**Указальныя займеннікі *той, такі***

| | значэнне | прыклады | скланенне |
|---|---|---|---|
| ***той*** | указвае на прадмет | той сад<br>тая думка<br>тыя сябры | **Н.** той, тая, тое, тыя<br>**Р.** таго, той, таго, тых<br>**Д.** таму, той, таму, тым<br>**В.** як Н. або як Р., тую<br>**Т.** тым, той, тым, тымі<br>**М.** (аб) тым, той, тым, тых |
| ***такі*** | указвае на прымету або якасць прадмета | такі шчыры;<br>не такая, як усе | **Н.** такі, такая, такое, такія<br>**Р.** такога, такой, такога, такіх<br>**Д.** такому, такой, такому, такім<br>**В.** як Н. або Р., такую, як Н. або Р.<br>**Т.** такім, такой, такім, такімі<br>**М.** (аб) такім, такой, такім, такіх |

**289. Устаўце займеннікі ў адпаведнай граматычнай форме:**

1. Не шкада *(тыя)* грошай, што патрачаны на кнігі.
2. *(Такі)* багатага выбару тавараў мы не чакалі.
3. Чэкі прабіваюць не ў гэтай, а ў *(тая)* касе.
4. Прымерце, калі ласка, сукенку яшчэ *(такі)* фасону.
5. Я аддаю перавагу *(той)* прадаўцу, які прыязна ўсміхаецца.
6. З *(такія)* рысамі твару лепш насіць не капялюш, а берэт.

**290. Прачытайце прыказкі, растлумачце іх значэнне. У якіх прыказках ужыты займеннікі *той, такі*, у якіх прыказках ужыта прыслоўе *так*?**
Не тая гаспадыня, што збярэ гаспадарку, а тая, што ўдзержыць.
Як пасцелеш, так і выспішся.
Якая матка, такое і дзіцятка.
Не той хлеб, што ў полі, а той, што ў гумне.
Як дбаеш, так і маеш.
Які млын, такі і ставок, які бацька, такі і сынок.

***ТЭКСТ***

**Беларускі сувенір**

Кожны, хто прыязджае пазнаёміцца з Беларуссю, на развітанне з прыемнасцю набывае нацыянальны сувенір. Доўгія гады ён будзе нагадваць пра гасцінны край і яго людзей.

Найбуйнейшы мінскі магазін сувеніраў называецца "Паўлінка". Пазнаёмімся з ім бліжэй.

Паэтычны вобраз сінявокай Беларусі ўзнік, пэўна, ад блакітнага колеру кветак ільну — нацыянальнага багацця рэспублікі. Паліцы крамы скрозь застаўлены жартоўнымі фігуркамі жней, пастушкоў і ваданосак. Срабрыстыя валокны льну дапаўняюцца каляровымі ніткамі і тасьмою, нагадваючы колішняе народнае адзенне.

Народнае мастацтва красамоўна прадстаўлена і такім рамяством, як пляценне з саломкі. Простыя ў выкананні, з двух-трох пучкоў саломы, залацістыя паўліны, грывастыя коні, алені з галінастымі рагамі здзіўляюць пакупнікоў вобразнасцю і дэкаратыўнасцю. Такіх саламяных фігурак нідзе, акрамя Беларусі, не робяць. Гэта гонар сучасных народных промыслаў. Саламяная пластыка набыла шырокую вядомасць і нават атрымала назву "беларуская саломка".

Яшчэ не так даўно на кожным рынку можна было бачыць цэлыя россыпы гліняных цацак-свістулек: пеўнікаў, козлікаў, лялек. Сучасныя мастакі ствараюць цікавыя іх варыянты, узяўшы ўсё лепшае ад народных майстроў-ганчароў. Гранічная спрошчанасць фігурак і адметны колер палівы — празрыстай, зялёнай, карычневай — прываблiваюць многіх наведнікаў "Паўлінкі".

Нацыянальныя беларускія сувеніры не залежваюцца ў магазіне падарункаў, іх ахвотна раскупляюць і на кірмашах і святах як арыгінальныя мастацкія творы.

(Паводле Яўгена Сахуты)

**Каментарый:**

***Ваданоска,*** м. ***ваданос*** – той, хто носіць ваду.

***Беларусь сінявокая.*** Гэты вобраз звязваецца таксама з беларускімі азёрамі, якіх каля 11 тысяч. Яны, вялікія і малыя "вочы зямлі", і нарадзілі паэтычную асацыяцыю.

***свістулька*** – невялікі свісток

***паліва*** – тонкі слой шклопадобнага покрыва на керамічным вырабе.

**291. Адкажыце на пытанні:**

1. Навошта турысты купляюць сувеніры?
2. Дзе можна набыць беларускія сувеніры?
3. Чаму Беларусь называюць сінявокай?
4. Якія фігуркі робяць з ільну?
5. Якія дэкаратыўныя ўпрыгожанні фігурак нагадваюць старажытнае народнае адзенне?
6. Якая тэхніка працы з саломкай?
7. Якія фігуркі робяць з саломкі?
8. Якія сувеніры робяць з гліны?
9. Чым пакрываюць гліняныя цацкі перад абпальваннем у печы?
10. Якога колеру паліву выкарыстоўваюць майстры-ганчары?
11. Ці папулярныя нацыянальныя беларускія сувеніры ў пакупнікоў?
12. Дзе яшчэ можна набыць беларускія сувеніры, акрамя спецыялізаваных крам?
13. Якія вырабы народных промыслаў пашыраны ў вашай краіне? Дзе іх можна набыць?

**292. Складзіце паводле тэксту дыялог, які мог адбыцца ў магазіне "Паўлінка".**

***ГРАМАТЫКА***

**Вышэйшая ступень параўнання якасных прыметнікаў**

Формы вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў паказваюць, што якасць або ўласцівасць праяўляецца ў прадмеце ў большай або меншай ступені ў параўнанні з іншым прадметам.

1. *Простая форма* вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў утвараецца пры дапамозе суфіксаў *–ейш- (-эйш)*.

| **аснова на *г, к, х, д, т*** | **чаргаванні** | **ужыванне** |
|---|---|---|
| дара**г** і— дара**ж**эйшы<br>гор**к**і — гар**ч**эйшы | *г / ж*<br>*к / ч* | гарчэйшы **за** палын<br>прыгажэйшая, **чым** здавалася |

| | | |
|---|---|---|
| сухі – сушэйшы<br>малады – маладзейшы<br>багаты – багацейшы | *х / ш*<br>*д / дз'*<br>*т / ц'* | маладзейшы **за** сябра |

2. *Складаная форма* вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў утвараецца пры дапамозе прыслоўяў *больш / болей, менш / меней.*

| | | |
|---|---|---|
| моцны | *больш* моцны<br>*менш* моцны | ***Новая кніга больш цікавая, чым старая*** |
| вясёлы | *больш* вясёлы<br>*менш* вясёлы | ***Дзяўчаты больш баязлівыя, чым хлопцы*** |

3. Значэнне ўзмацнення параўнання якасці можа перадавацца прыслоўямі *куды, яшчэ.*

*куды* слабейшы — ***Сапернік аказаўся куды слабейшы***
*яшчэ* даўжэйшы — ***Наступны дзень здаўся яшчэ даўжэйшы***

**Заўвага:** Прыметнікі *малы, вялікі, добры, дрэнны* ўтвараюць форму вышэйшай ступені параўнання з дапамогай суфікса *–ш-*, які далучаецца да іншай, чым зыходная, асновы:

малы — мен**ш**ы
вялікі — боль**ш**ы
добры — леп**ш**ы
дрэнны — гор**ш**ы

**293. Складзіце сказы, ужываючы простую форму ступені параўнання прыметнікаў.**
**Узор:** ***Брат старэйшы за сястру.***

1. Новы дом *(прыгожы)* за стары.
2. Мёд *(салодкі)* за цукар.
3. Пачуццё абавязку *(моцнае)* за страх.
4. Зубр *(вялікі)* за аленя.
5. Нёман *(шырокі)* за Свіслач.
6. Вадарод *(лёгкі)* за паветра.

**294. Утварыце ўсе формы вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў.**
Дробны, дарагі, блізкі, новы, свежы, даўні, важны, востры, строгі, зялёны, гучны, спакойны, гарачы, разумны, халодны.

***ГРАМАТЫКА***

## Вышэйшая ступень параўнання прыслоўяў

Форма вышэйшай ступені параўнання прыслоўяў абазначае высокую якасць прыметы дзеяння безадносна да параўнання або ў сувязі з параўнаннем.

1. *Простая форма* вышэйшай ступені параўнання прыслоўяў утвараецца пры дапамозе суфіксаў *–ей (-эй, -ай).*

| **аснова на *г, к, х, д, т*** | **чаргаванні** | **ужыванне** |
|---|---|---|

| | | |
|---|---|---|
| стро**г**а – стра**ж**эй<br>высо**к**а – вы**ш**эй (вы**ш**ай)<br>ці**х**а – ці**ш**эй<br>цвёр**д**а – цвяр**дз**ей<br>прос**т**а – прас**ц**ей | ***г / ж***<br>***к / ш***<br>***х / ш***<br>***д / дз'***<br>***т / ц'*** | Цішэй едзеш – далей будзеш.<br>Хлопцы беглі спрытней **за** дзяўчат.<br>Пасярэдзіне рака цячэ павольней, **чым** пры берагах. |

2. *Складаная форма* вышэйшай ступені параўнання прыслоўяў утвараецца пры дапамозе слоў *больш / болей, менш / меней*.

*больш* дасціпна
дасціпна
*менш* дасціпна — ***Госць стаў пачувацца больш вольна***
***Інфармацыя пададзена менш падрабязна***
*больш* удала — ***Кошык несці больш зручна, чым мех.***
удала
*менш* удала

**Заўвага:** Пры ўтварэнні формы вышэйшай ступені параўнання прыслоўі *мала, многа, добра, дрэнна* мяняюць аснову:

мала — менш
многа — больш
добра — лепш
дрэнна — горш

**295. Складзіце сказы, ужываючы простую форму ступені параўнання прыслоўяў:**

1. У нас мала часу, гаварыце *(коратка)*.
2. *(Добра)* сто сяброў, чым сто рублёў.
3. Бярозы выпускаюць лісты *(рана)* за алешыну.
4. Зімой хатнія кветкі паліваюць *(рэдка)*, чым летам.
5. Ад спеваў лясных птушак стала *(весела)* на душы.
6. Стрэлы чуліся штораз *(ціха)*.

**296. Складзіце дыялог на тэму "У кавярні". Выкарыстайце формы вышэйшай ступені параўнання прыслоўяў.**

***ГРАМАТЫКА***

## Найвышэйшая ступень параўнання якасных прыметнікаў

Формы найвышэйшай ступені параўнання прыметнікаў паказваюць, што якасць або ўласцівасць праяўляецца ў якім-небудзь прадмеце ў гранічна высокай ступені ў параўнанні з усімі супастаўляльнымі прадметамі.

1. Простая форма найвышэйшай ступені параўнання прыметнікаў утвараецца пры дапамозе прыстаўкі *най-*, якая далучаецца да формы вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў:

| | |
|---|---|
| мацнейшы + **най-** = ***най****мацнейшы* | Тыгр – *наймацнейшы* драпежнік сярод звяроў. |
| ярчэйшы + **най-** = ***най****ярчэйшы* | Адна з *найярчэйшых* зорак – Альтаір. |
| лепшы + **най-** = ***най****лепшы* | Час – *найлепшы* лекар. |

2. Складаная форма найвышэйшай ступені параўнання прыметнікаў утвараецца пры дапамозе спалучэння займенніка *самы* або прыслоўяў *найбольш, найменш* з якасным прыметнікам:

| | | |
|---|---|---|
| дарагі | **самы** дарагі<br>**найменш** дарагі<br>**найбольш** дарагі | *Самы дарагі* ўспамін пра маленства. |
| цікавы | **самы** цікавы<br>**найменш** цікавы<br>**найбольш** цікавы | *Найбольш цікавы* твор пісьменніка падказаны жыццём. |

**297. Складзіце сказы, ужываючы прыметнікі ў форме найвышэйшай ступені параўнання.**

1. *(Вялікае)* задавальненне прыносіць праца.
2. Апоўдні сонца стаіць у зеніце – *(высокай)* кропцы неба.
3. *(Ранняе)* славянскае гарадзішча на тэрыторыі Беларусі – Хатомель.
4. *(Выдатнай)* фігурай Адраджэння быў Францыск Скарына.
5. Адна з *(галоўных)* рыс характару беларуса – гасціннасць.
6. *(Стары)* батанічны сад Беларусі – парк пры Горацкай акадэміі.

**298. Раскажыце пра выдатныя мясціны вашага краю, ужываючы формы вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў.**

## VI. ХАРЧАВАННЕ. У РЭСТАРАНЕ, КАВЯРНІ. БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУХНЯ

***Снеданне, сняданак*** — **снедаць**
***Абед, полудзень*** — **абедаць, палуднаваць**
***Вячэра*** — **вячэраць**

**ГАТАВАЦЬ** / **ЗГАТАВАЦЬ** **што?** — **страву**, **ежу**

**варыць** / **зварыць** *што?* — бульбу, гародніну, суп, каву, кампот
**пячы** / **спячы** *што?* — хлеб, булку, аладкі
**смажыць** / **падсмажыць** *што?* — бульбу, мяса, рыбу
**тушыць** / **стушыць** *што?* — мяса, рыбу, гародніну

**піць** — ваду
**выпіць, напіцца** — вады
**есці** — хлеб, бульбу, мяса
**наесціся** — хлеба, бульбы, мяса

Яда — ежа — страва

| | |
|---|---|
| 1. я ем | 1. мы ядзім, ямо |
| 2. ты ясі | 2. вы ясце |
| 3. ён (яна, яно) есць | 3. яны ядуць |

**Што можна згатаваць**
**(меню)**

| *Закуска* | *Першая страва* | *Другая страва* | *Дэсерт* |
|---|---|---|---|
| салата з капусты | крупнік | катлеты | кампот |
| салата з гуркоў і памідораў | рыбная юшка | верашчака | кісель |
| квашаніна, халоднае | грыбная поліўка | біфштэкс | марожанае |
| вінегрэт з селядцом | кіслая капуста | дранікі | кава |
| фаршыраваны шчупак | суп малочны | смажаная качка | чай з лімонам |

***Гарнір да мяса:***
смажаная бульба
тушаная гародніна
макароны / локшына
рыс

***Прыправы***:
алей
воцат
гарчыца
маянэз
смятана
кроп
лаўровы ліст
перац
соль

***Хлеб:***
жытні (жыта)
пшанічны (пшаніца)

**299. Да назоўнікаў падбярыце прыдатныя па сэнсу прыметнікі.**

а) кава, чай, малако — **салодкі, белы, халодны, кіслы, цёплы**
б) хлеб, булка, піроўжнае — **свежы, белы, чорны, смачны, чэрствы**

**300. Замест кропак устаўце прыдатныя па сэнсу прыметнікі ў належнай форме.**

1. У гэтым супе мала гародніны. Ён вельмі…
2. Я не магу есці гэта мяса. Яно вельмі …
3. Я люблю … хлеб, але для здароўя больш карысны….
4. Я не люблю … рыбу, але мне даспадобы … .
5. Смятана вельмі … . Я не магу яе выліць з слоіка.

**густы**
**свежы**
**рэдкі**,
**цвёрды**
**салёны**
**чэрствы**
**густы**

**301. Пастаўце дзеясловы ў адпаведнай асабовай форме.**
1. Дзе ты сёння (вячэраць)? 2. Я (снедаць) у 8 (восем) гадзін. 3. Беларусы (называць) бульбу другім хлебам. 4. У сталоўцы (гатаваць) смачную каўбасу. 5. Вы (выпіць) сок? 6. Сёння мы (паабедаць) дома. 7. Заўтра я (зварыць) гарохавы суп. 8. Алесь учора (абедаць) у рэстаране. 9. Як ты (харчавацца)? 10. Колькі разоў на дзень вы (есці)? 11. Марыля ўжо (прагаладацца). 12.Янка яшчэ не (пакаштаваць) аладкі.

**Посуд (пасудзіна)**

*каструля* *чайнік* *патэльня / скаварада*

гаршчок
збан
кубак
сподак

нож відэлец талерка сталовая лыжка
чайная лыжка

шклянка чарка, келіх фужэр кухаль

абрус сурвэткі

**302. Адкажыце на пытанні:**
1. Што звычайна гатуюць у каструлі?
2. Што можна згатаваць на скаварадзе?
3. Якую лыжку кладуць побач з кубачкам?
4. Якой лыжкай вы ясце суп?
5. Вам падабаецца піць чай з кубка ці з шклянкі? А вашым бацькам?
6. Якія напіткі звычайна п`юць з чаркі? З фужэра? З кухля?

*ГРАМАТЫКА*

## Творны склон назоўніка

***хто? што?*** Назоўны склон — ***кім? чым?*** Творны склон

**мужчынскі род**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| хлеб | ш | | хлеб | ам |
| стол | ш | | стал | ум |
| конь | ш | | кан | ём |
| чай | ш | → | ча | ем |
| пясок | ш | | пяск | ум |
| стараст | а | → | стараст | ам |
| Жэн | я | | Жэ'н | ям |
| суддз | я | | суддз | ёй |
| Міш | я | | Міш | ам |

**ніякі род**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| акн | у | | акн | ум |
| мор | а | | мор | ам |
| пол | е | → | пол | ем |
| дзіц | ё | | дзіц (дзіц) | ем (ём) |

**жаночы род**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| кава | а | | кав | ай |
| вад | а | → | вад | уй |
| любоў | ш | | любоў | ю |
| соль | ш | → | солл | ю |
| ноч | ш | | ночч | у |
| Жэн | я | | Жэ'н | яй |

**303. Пастаўце назоўнікі, змешчаныя ў дужках, у творным склоне.**

Я сябрую з (Пеця, Толя, Мікола, дзядзька, старшыня, Кузьма).

| | |
|---|---|
| 1. – *З кім* ён размаўляе?<br>-- Ён размаўляе з *братам і сястрой.* | **значэнне сумеснасці** |
| 2. – *Якую* каву вы любіце?<br>-- Я люблю *каву з лімонам.* | **азначальнае (якаснае) значэнне** |
| 3. – *Як* студэнты слухаюць лекцыю?<br>-- Студэнты слухаюць лекцыю *з цікавасцю.* | **акалічнаснае значэнне** |

**304. Замяніце канструкцыю *"без + родны склон назоўніка"* канструкцыяй *"з + творны склон назоўніка".***

**Узор: *Я ем суп без хлеба. — Я ем суп з хлебам.***

1. Я п'ю чай без цукру.
2. На дэсерт падалі піражнае без крэму.
3. Гэтая салата без сыру.
4. Я люблю пірагі без капусты.
5. Я п'ю каву без малака.

**305. Сфармулюйце пытанні паводле ўзору.**

**а) Узор: *Бацька быў на стадыёне <u>з сынам.</u> — <u>З кім</u> быў бацька на стадыёне?***

1. Дзяўчына пазнаёмілася *з мастаком.*
2. Дзеці былі ў музеі *з настаўніцай.*
3. Яна размаўляла па тэлефоне *з сяброўкай.*

**б) Узор: *Мама прыгатавала салату <u>з рыбай</u>. — <u>Якую</u> салату прыгатавала мама?***

1. Мы елі суп *з мясам і рысам.*
2. Я люблю хлеб *з маслам.*
3. Сястра п'е чай *з варэннем.*

**в) Узор: *Галінкі падаюць <u>з шумам</u>. — <u>Як</u> падаюць галінкі?***

1. Госці *з ахвотаю* елі пірог.
2. Сябры *з прыемнасцю* пагаварылі.
3. Вучні *з пашанай* віталі пісьменніка.

**306. Прачытайце дыялог, паставіўшы назоўнікі, змешчаныя ў дужках, у творным склоне.**

**У гасцях**

— Вам каву ці чай?
— Каву, калі ласка.
— З (малако)?
— Так. Я люблю каву з (малако і цукар).
— Вось, калі ласка. А вам?
— Мне чай з (лімон).
— Калі ласка. А вось піражкі. Гэтыя з (рыба), а тыя з (капуста).
— Дзякую. Якія смачныя піражкі!
— Ешце на здароўе.

| | |
|---|---|
| 1. — *Чым* вы звычайна пішаце?<br>— Звычайна я пішу *шарыкавай ручкай.* | **інструментальнае значэнне прылады ці сродку дзеяння** |

| | |
|---|---|
| 2. — *Кім* задаволены бацька?<br>— Бацька задаволены *старэйшым сынам.*<br>3. — *Чым* захапляецца дзяўчына?<br>— Дзяўчына захапляецца *класічнай музыкай.* | **аб'ектнае значэнне** |

**307. Адкажыце на пытанні паводле ўзору.**

**Узор:** ***Чым цікавіцца Алесь? (старажытая беларуская літаратура) —***
***Алесь цікавіцца старажытнай беларускай літаратурай.***

1. Чым захапляецца Алесева сястра? *(новая гісторыя)*
2. Кім ганарыцца бацька? *(малодшая дачка)*
3. Чым любаваліся турысты? *(прыгожы пейзаж)*
4. Чым выпраўляе памылкі настаўнік? *(чырвоны аловак)*
5. Чым ён разрэзаў яблык? *(востры нож)*
6. З чым есць кашу хлопчык? *з (гарачае малако)*

***ТЭКСТ***

**Смачнага абеду, Алесь!**

Сёння Алесь не можа дачакацца канца заняткаў. Ён вельмі хоча есці. Раніцай Алесь позна прачнуўся і не паспеў як след паснедаць. Ухапіў толькі бутэрброд з сырам і выпіў шклянку гарбаты. Гэтага мала. Увогуле юнак любіць добра паесці. Звычайна на снеданне ён з'ядае яечню з вяндлінай ці амлет з гароднінай, ладны кавалак халоднага мяса або рыбы, некалькі бутэрбродаў. Алесева мама пячэ вельмі смачныя пірагі. Асабліва падабаецца Алесю пірог з вішнёвым варэннем. Таму часта яго сняданак завяршаецца кавалкам пірага з чаем.

Алесю ўсё цяжэй і цяжэй засяродзіцца на лекцыі. У думках хлопец даўно ўжо ў сталоўцы. Што ён возьме на абед? На першае гэта будзе фасолевы суп з мясам ці рыбная юшка. Затым – біфштэкс са смажанай бульбай і салатай ці сялянская каўбаса з тушанай гароднінай. Можна ўзяць яшчэ мачанку з блінамі. Яе смачна гатуюць у студэнцкай сталовай. На дэсерт Алесь вып'е каву. І абавязкова закажа што-небудзь салодкае. Сёння ён з ахвотаю з'есць арэхавае піражнае з крэмам.

А вось, нарэшце, і чаканы званок. Смачнага абеду, Алесь!

**Каментарый:**

***ладны*** – вялікі

***мачанка*** – своеасаблівая падліва з мяса, рабрынак і сала, замешаная мукой, у якую мачаюць бліны

**308. Выберыце правільны варыянт і закончыце сказы:**

1. Алесь не можа…

а) дачакацца абеду;
б) канца заняткаў;
в) перапынку.

2. Раніцай Алесь позна прачнуўся…

а) і спяшаўся на заняткі;
б) і не паспеў паесці;
в) як след паснедаць.

3. Алесь ухапіў толькі…

а) бутэрброд з сырам і выпіў кубачак кавы;
б) кавалачак пірага з варэннем;
в) бутэрброд з сырам і выпіў шклянку гарбаты.

4. Звычайна на снеданне Алесь з'ядае…
а) амлет з вяндлінай ці біфштэкс з яйкам, пірог з вішнёвым варэннем;
б) яечню з вяндлінай, ладны кавалак халоднага мяса або рыбы, некалькі бутэрбродаў;
в) яечню з вяндлінай ці амлет з сырам, невялікі кавалак халоднага мяса або рыбы, некалькі бутэрбродаў.

5. Часта яго сняданак завяршаецца…
а) пірагом з вішнёвым варэннем;
б) кавалкам пірага з кавай;
в) кавалкам пірага з чаем.

6. Што ён возьме на абед? На першае гэта будзе…
а) суп гарохавы з мясам ці рыбная юшка;
б) суп малочны ці грыбная поліўка;
в) фасолевы суп з мясам ці рыбная юшка.

7. На другое будзе…
а) біфштэкс з макаронамі ці сялянская каўбаса з салатай;
б) біфштэкс са смажанай бульбай ці сялянская каўбаса з тушанай капустай;
в) біфштэкс са смажанай бульбай і салатай ці сялянская каўбаса з тушанай гароднінай.

8. Сёння ён з ахвотаю з'есць…
а) што-небудзь салодкае;
б) арэхавае піражнае з крэмам;
в) вып'е каву з марожаным.

**309. Адкажыце на пытанні да тэксту:**
1. Што сёння раніцай з'еў Алесь?
2. Што звычайна есць Алесь на снеданне?
3. Чым завяршаецца звычайна Алесеў сняданак?
4. Які пірог асабліва падабаецца Алесю?
5. Што збіраецца ўзяць Алесь на абед? на першае? на другое?
6. Што возьме Алесь на дэсерт?
7. Якое піражнае з ахвотаю з'есць Алесь?

**310. а)** Перакажыце тэкст ад імя Алеся (ад 1-й асобы);
**б)** Складзіце паводле тэксту дыялог.

**311. Адкажыце на пытанні:**
1. Што вы звычайна ясце на снеданне?
2. Які сняданак падабаецца вам найбольш?
3. Якую каву вы больш любіце: чорную ці з малаком?
4. З якіх страў складаецца звычайна ваш абед?
5. Якія першыя стравы вы любіце?
6. З чаго пачынаецца ваш абед?
7. Хто, як правіла, гатуе ежу ў вашай сям'і? Ці ўмееце вы гатаваць? Вы лічыце сябе добрым кухарам?

***ГРАМАТЫКА***

**Творны склон займенніка**

| **Назоўны склон** | **Творны склон** | **Назоўны склон** | **Творны склон** |
|---|---|---|---|

| | | | |
|---|---|---|---|
| я | мной (-ою) | мы | намі |
| ты | табой (-ою) | вы | вамі |
| ён | ім | яны | імі |
| яна | ёй, ёю | | |
| яно | ім | | |

**Брат размаўляе *са мной (з табой, з ёю, з ім, з намі, з вамі, з імі)***

**312. Закончыце сказы, паставіўшы займеннікі ў творным склоне.**

**Узор:** ***Добры дзень! Мне вельмі трэба пагаварыць з (вы). — Добра дзень! Мне вельмі трэба пагаварыць з вамі.***

1. Гэта мая жонка. Я хачу пазнаёміць вас з *(яна)*
2. Гэта ваш брат? Пазнаёмце мяне з *(ён)*
3. Мы збіраемся ў тэатр. Хочаце пайсці з *(мы)*?
4. Я купіў табе білет у кіно. Пойдзеш з *(я)*?
5. Гэта ж Алеся! Хіба ты не пазнаў *(яна)*? Чаму ты не павітаўся з *(яна)*?
6. Ты ідзеш у сталовую? Можна мне пайсці з *(ты)*?
7. Дазвольце з *(вы)* пазнаёміцца.
8. Гэта мае бацькі. Я жыву з *(яны)*
9. Гэта маё кацяня. Я люблю гуляць з *(яно)*
10. Твой брат сёння дома? Мне трэба параіцца з *(ён)*.

| | |
|---|---|
| Ён хоча пагаварыць з | *вашым (тваім, маім, нашым, сваім)* братам<br>*вашай (тваёй, маёй, нашай, сваёй)* сястрой |
| Мой сын сябруе з | *гэтым* хлопчыкам<br>*гэтай* дзяўчынкай |

**313. Адкажыце на пытанні паводле ўзору.**

**Узор:** ***З чым вы павіншавалі сваіх бацькоў? (гэта вялікае свята) — Мы павіншавалі сваіх бацькоў з гэтым вялікім святам.***

1. Чым вы пачаставалі сяброў? *(гэтая свежая садавіна)*
2. З кім вы хочаце сустрэцца? *(свой стары сябра)*
3. З чым пілі дзеці гарбату? *(гэтае смачнае варэнне)*
4. Чым мы былі задаволены? *(наша экскурсія)*
5. Чым не задаволены студэнты? *(сваё харчаванне)*
6. Чым зацікавіўся пісьменнік? *(маё апавяданне)*
7. З кім ён хоча пазнаёміцца? *(твая малодшая сястра)*

**314. Прачытайце і перакажыце жарт.**

Адзін малады чалавек абедаў у вельмі эканомнай гаспадыні. Ён падняўся з-за стала зусім галодны. На развітанне гаспадыня ветліва кажа яму:

— Прашу вас, заходзьце яшчэ калі-небудзь да мяне паабедаць.

— З прыемнасцю, — адказаў госць, — хоць цяпер.

**315. Адкажыце на пытанні:**

1. З якіх страў складаецца абед у вас на радзіме?
2. Што з першых страў звычайна гатуюць?
3. Што найчасцей гатуюць на другое?
4. Што падаюць на дэсерт?

5. Якія салаты звычайна гатуюць у вас дома?
6. Якія беларускія стравы вы ўжо пакаштавалі? Ці ведаеце, як іх гатаваць?

**316. Прачытайце прыказкі і падбярыце адпаведнікі ў вашай мове. У якіх сітуацыях вы маглі б іх выкарыстаць?**
1. Кашу маслам не сапсуеш.
2. Даражэйша не сняданне, а прывітанне.
3. Не ў час лыжка па абедзе.
4. Хвалілася рэдзька, што з мёдам смачная.

## У рэстаране, кавярні

| | | |
|---|---|---|
| рэстаран | **заказваць** | **браць** |
| кавярня / кафэ | ***што?*** | ***што?*** |
| сталовая (сталоўка) | **заказаць** | **узяць** |
| бар | | |
| закусачная | | |

| | |
|---|---|
| афіцыянт (-ка) | столік на дзвюх (на трох, на чатырох) |
| меню | |

***Выразы, якія вам могуць спатрэбіцца***

Я галодны (галодная); Я прагаладаўся (прагаладалася); Я хачу есці. Мне хочацца есці; Я хачу піць.

— Тут свабодна? Гэта вольныя месцы? Гэты стол не заняты?
— Прабачце, тут занята.
— Смачна есці! Смачнага абеду (снедання)! Смачнай вячэры!
— Калі ласка, рахунак! Колькі з мяне (за каву)? Колькі каштуе кава?

***ДЫЯЛОГІ***

### Пара абедаць

Ганна — З самага ранку мы сёння працуем. Ужо без чвэрткі трынаццаць.
— Ці не пара адпачыць?
Вольга — Маеш рацыю. Па праўдзе сказаць, я ўжо добра прагаладалася. Самы час папалуднаваць.
Ганна —Так. Мне таксама захацелася есці. Дзе тут паблізу можна падсілкавацца?
Вольга — На тым тыдні адчыніўся пасля рамонту рэстаран “Крыніца”. Гэта даволі прыстойны рэстаран і зусім побач. Там можна паабедаць.
Ганна — Баюся, што гэта зойме многа часу. А палове другой у мяне сустрэча з вашым дырэктарам. Можа дзе непадалёку ёсць кавярня ці сталовая?
Вольга — Метраў за трыста адсюль бар “Духмяны”. Там заўсёды свежае печыва, смачная кава, ёсць розныя салаты, бутэрброды.
Ганна — Добра было б з`есці што-небудзь гарачае.
Вольга — У такім разе пойдзем у дыетычную сталоўку. Там самаабслугоўванне, ніколі не бывае чэргаў і заўсёды вялікі выбар першых страў.
Ганна — Ці ёсць там якія нацыянальныя беларускія стравы?
Вольга — Але. З першых страў можна ўзяць грыбную крупеню, ці зацірку на малацэ. Па старадаўніх беларускіх рэцэптах гатуюць там бабку з грыбамі, дранікі з тварагом.
Ганна — Цудоўна. З прыемнасцю пакаштую беларускія стравы.

**317. Адкажыце на пытанні:**

1. Што збіраюцца рабіць Ганна і Вольга?
2. Дзе прапануе Вольга паабедаць сёння? Як аргументуе яна сваю прапанову?
3. Чаму Ганна не пагаджаецца паабедаць у рэстаране "Крыніца"? у бары "Духмяны"?
4. Дзе паабедаюць сёння Ганна і Вольга?
5. Чаму яны спыніліся на дыетычнай сталовай?
6. Якія нацыянальныя беларускія стравы там гатуюць?

**Перавядзіце дыялог у маналагічнае маўленне і перакажыце яго ад імя 1-й асобы.**

**У рэстаране**

Яўген — Скажыце, калі ласка, гэтыя месцы вольныя (не занятыя)?
Афіцыянт — Выбачайце, гэты столік, на жаль, заняты. Але той, каля акна, вольны. І накрыты акурат для дзвюх асоб. Вось вам меню. Што вы будзем заказваць?
Аркадзь — Я вазьму, вяндліну з капустай, бульбу з грыбамі ў гаршчэчку і які-небудзь сок.
Яўген — Я папрашу халаднік і мачанку. Скажыце, калі ласка, якія у вас ёсць сокі?
Афіцыянт — Ёсць яблычны сок. Маем таксама мінеральную ваду і апельсінавы напітак.
Аркадзь — Мне мінеральную ваду.
Яўген — А мне яблычны сок.
Аркадзь — Калі ласка, бутэльку мінеральнай вады і шклянку соку.

**318. Прачытайце яшчэ раз урыўкі з дыялога і складзіце па аналогіі дыялогі, выкарыстаўшы прапанаваныя ў дужках словы.**

**--** Што Вы будзеце заказваць?
— Я вазьму вяндліну з капустай, бульбу з грыбамі ў гаршчочку і які-небудзь сок.
— (гарохавы суп, біфштэкс з падсмажанай бульбай, шклянку чаю; бутэрброд з шынкай, кубачак кавы; малочны суп катлету па-мінску з тушанай гароднінай, кубачак шакаладу і г.д.)

— Я папрашу халаднік і мачанку.
— (рыбную юшку і дранікі; боршч і свіную адбіўную з бульбяным пюрэ; булён з птушкі і блінчыкі з мясам; грыбны суп і тушанага карпа і г.д.)

— Скажыце, калі ласка, якія ў вас ёсць сокі?
— Ёсць яблычны сок. Маем таксама мінеральную ваду і апельсінавы напітак.
— (таматны сок, ліманада, вішнёвы сок, слівавы сок, чай з лімонам, бярозавы напітак, какава, кава чорная, абрыкосавы напітак і г.д.)

**У кавярні**

— Добры вечар. Магу я ўзяць у Вас заказ?
— Мы пакуль не вырашылі, што заказаць. Што Вы нам параіце?
— У нас вельмі смачна гатуюць смажанку з сялянскай каўбасой.
— А з салатаў што?
— Магу параіць салату з пячурак (шампіньёнаў) або крабаў.
— А піва у вас ёсць?
— Ёсць піва “Старажытнае” і “Лідскае”.
— Мы возьмем дзве смажанкі, дзве салаты з крабаў і два кухлі “Старажытнага”.
— Што-небудзь на дэсерт?
— Дзякуем, дэсерт мы закажам пазней.
— Калі ласка. Смачна есці!

— Будзеце абедаць?

— Не, мы хацелі б выпіць кавы.
— Калі ласка, вам чорную ці з малаком?
— Мне чорную каву без цукру.
— А мне, калі ласка, з малаком.
— Пірожныя будзеце заказваць?
— Так, прынясіце два. І рахунак, калі ласка.
— Добра. Зараз прынясу.

— Вы ўжо выбралі што-небудзь, спадар?
— Так. Я вазьму толькі рыбную салату.
— Піць што-небудзь будзеце?
— Грамаў 50 белага віна.

**319. Прачытайце сітуацыі. Складзіце па іх дыялогі.**

1. Вы заказваеце абед у кавярні. Афіцыянт прапануе вам вялікі выбар страў. Але вы не вельмі галодныя. Вы хочаце з'есці што-небудзь лёгкае на абед.

2. Вы заказваеце вячэру ў рэстаране. Гэта будзе грунтоўная вячэра з келіхам віна, дэсертам. Вам прыходзіць думка заказаць фірменную страву.

**320. Прачытайце і перакажыце жарт.**

У рэстаране наведвальнік звяртаецца да афіцыянта:
— Прабачце, што вы мне прынеслі, чай ці каву?
— А хіба самі вы не адчуваеце?
— Не.
— У такім разе, якое гэта мае значэнне!

***ГРАМАТЫКА***

### Трыванне (від) дзеяслова

Катэгорыя трывання абазначае адносіны дзеяння да яго мяжы (вылучае дзеянні абмежаваныя і неабмежаваныя ў часе).

**Закончанае трыванне** ***(што зрабіць?)*** абазначае мяжу дзеяння — пачатак *(зазвінець, пабегчы)* ці завяршэнне дзеяння *(дачытаць)*, яго вынік *(наесціся, паразімаваць)*.

**Незакончанае трыванне** ***(што рабіць?)*** абазначае дзеянне як працэс (працяглае ў часе), без указання на яго мяжу *(спяваць, працаваць)*.

### Утварэнне трывальных пар дзеяслова

Два семантычна тоесныя дзеясловы, якія маюць розныя трывальныя значэнні, утвараюць трывальную пару. Параўн.:

1. Я *адчыняў* акно *(незаконч. трыв.)*
2. Я *адчыніў* акно *(законч. трыв.)*

1. Прафесар *чытае* лекцыю *(незаконч. трыв.)*
2. Прафесар *прачытае* лекцыю *(законч. трыв.)*
3. Прафесар *будзе чытаць* лекцыю *(незаконч. трыв.)*

Дзеясловы закончанага трывання адрозніваюцца ад дзеясловаў незакончанага трывання *прыстаўкамі* і *суфіксамі*, якія ўваходзяць у іх склад.

### Утварэнне дзеясловаў закончанага трывання (ЗТ) ад дзеясловаў незакончанага трывання (НЗТ) з дапамогай прыставак (*перфектывацыя)*

Пры ўтварэнні ЗТ выкарыстоўваюцца прыстаўкі **на-, па-, з- (с-), а-(аб-), вы-, пра-, пад-, пера-, пры-, у-, уз-, раз-, папа- і інш**.

**321. Прааналізуйце табліцу:**

| № п/п | Незакончанае трыванне | Закончанае трыванне | Прыстаўка |
|---|---|---|---|
| 1 | пісаць<br>**(што рабіць?)**<br>вучыць | **на**пісаць — Сёння я *напісаў* сябру<br>**(што зрабіць?)**<br>**на**вучыць — Брат *навучыў* мяне плаваць | **на-** |
| 2 | будаваць<br>саліць | **па**будаваць — Мы *пабудавалі* новы дом<br>**па**саліць — Ці *пасаліў* ты суп? | **па-** |
| 3 | варыць<br>планаваць | **з**варыць — Маці *зварыла* кампот<br>**с**планаваць — Мы загадзя *сплана-валі* свой адпачынак | **з- (с-)** |
| 4 | чытаць<br>дыктаваць | **пра**чытаць — Я *прачытаў* цікавую кнігу<br>**пра**дыктаваць — Настаўнік *прадыктаваў* сказ | **пра-** |
| 5 | валодаць<br>трэсці | **а**валодаць — Я добра *авалодаў* беларускай моваю<br>**аб**трэсці — Дзеці *абтрэслі* яблыню | **а- (аб-)** |
| 6 | мыць<br>вучыць | **вы**мыць — Хлопчык *вымыў* рукі<br>**вы**вучыць — Я *вывучыў* верш | **вы-** |

**322. З дапамогай прыставак, змешчаных у табліцы, утварыце формы дзеясловаў закончанага трывання.**

1. маляваць,карміць, друкаваць;
2. знаёміць, вячэраць, абедаць;
3. лавіць, жаць, есці;
4. кансультаваць, аналізаваць, біць;
5. мераць, мыць, ліць;
6. сушыць, церці, расці.

**323. Дадайце да слоў прыстаўкі і запішыце новыя словы.**

**Узор:** ***[з- (с-)] жаць – зжаць, казаць – сказаць***

1. з- (с-) — будаваць, ехаць, паліць, есці, гатаваць, рушыць
2. раз- (рас-) — лічыць, сыпаць, блытаць, жаваць, біць, кідаць, чысціць, ліць, даць
3. уз- (ус-) — лезці, класці, хваляваცца, важыць, трымацца, несці

**324. Утварыце формы закончанага трывання ад наступных дзеясловаў.**
**Узор:** ***цалавацца — пацалавацца***

Сварыцца, мірыцца, скардзіцца.

**325. Выкарыстайце ў сказах формы закончанага трывання ад дзеясловаў *снедаць, абедаць, вячэраць.***

Форму закончанага трывання з прыстаўкай **па-** утвараюць дзеясловы на **–ець**, якія паказваюць на змены вонкавага выгляду чалавека ці прадмета.

| | | |
|---|---|---|
| паўнець | папаўнець | За апошні час яна *папаўнела.* |
| жаўцець | пажаўцець | Лісце на дрэвах *пажаўцела.* |
| чырванець | пачырванець | Ён *пачырванеў* ад сораму. |
| святлець | пасвятлець | Неба *пасвятлела.* |

**Утварэнне дзеясловаў незакончанага трывання**
**ад дзеясловаў закончанага трывання з дапамогай суфіксаў**
***(імперфекцыя)***

| | | |
|---|---|---|
| **а)** | **закончанае трыванне** | **незакончанае трыванне** |
| | перапіс**а**ць | перапіс**ва**ць |
| | прачыт**а**ць | прачыт**ва**ць |
| | перабудав**а**ць | перабудо**ўва**ць |
| | выкан**а**ць | выкон**ва**ць |
| | выбел**і**ць | выбель**ва**ць |
| | падсал**і**ць | падсоль**ва**ць |

У дзеясловах з аднолькавай прыстаўкай суфіксы **–а- (-я-), -ы-, -і-** паказваюць на закончанае трыванне, суфіксы **–ва- (-оўва-, -ёўва-)** паказваюць на незакончанасць дзеяння.

**б)** Дзеясловы незакончанага трывання таксама могуць мець суфікс **–а- (-я-)**. У такім разе яны супрацьпастаўлены дзеясловам закончанага трывання з суфіксам **–ы-(-і-)**

вырашаць (НЗТ) — вырашыць (ЗТ)
ку**пл**яць (НЗТ) — ку**п**іць (ЗТ) ***(п / пл)***

**! Трывальныя пары з рознымі каранямі слоў.**

браць / узя'ць
шукаць / знайсці
гавары'ць / сказаць
класці / палажы'ць

**Ужыванне дзеясловаў закончанага і незакончанага трывання** залежыць ад дзеяння, якое яны абазначаюць.

| **Незакончанае трыванне *(што рабіць?)*** | **Закончанае трыванне *(што зрабіць?)*** |
|---|---|
| 1.Дзеянне звычайнае, якое паўтараецца на працягу нейкага часу (у цяп., пр., буд. часе)<br>*Кожны дзень* я *ўстаю* ў сем гадзін. | 1.Адзінкавае дзеянне ў прошлым ці будучым часе.<br>Учора я *ўстаў* рана. |

| | |
|---|---|
| Ён *часта званіў* па тэлефоне.<br>*Праз тыдзень* я *буду ездзіць* у інстытут на машыне. | Заўтра я *пазваню* сябру. |
| 2.Дзеянне, якое адбываецца на працягу пэўнага часу (працэс) (у цяп., пр., буд. часе)<br>*Увесь вечар* я *глядзеў* тэлевізар.<br>Цяпер я *чытаю* часопіс.<br>Заўтра *цэлы дзень* я *буду працаваць*. | 2.Закончанае дзеянне ў прошлым ці будучым часе, якое мае ці будзе мець вынік.<br>Я *прачытаў* часопіс.<br>Я *прачытаю* гэты часопіс. |
| 3.Два <u>адначасовыя</u> дзеянні (у цяперашнім, прошлым ці будучым часе).<br>Яны *сядзяць* у крэслах і *слухаюць* музыку.<br>Яны *ішлі* і *размаўлялі*. | 3.Два <u>паслядоўныя</u> дзеянні (у прошлым ці будучым часе).<br>Ён *прачытаў (прачытае)* часопіс і *паклаў (пакладзе)* яго на стол. |

Дзеясловы незакончанага трывання спалучаюцца са словаформамі *доўга, кожны дзень, цэлы дзень, штодзённа, рэгулярна, часта* і інш.

**!** Калі адзінкавае дзеянне адбываецца ў час дзеяння-працэсу, ужываюцца дзеясловы розных трыванняў.

Калі я *гуляў* (НЗТ) у парку, да мяне *падышоў* (ЗТ) мой сябра.

Калі я *пісаў* (НЗТ) пісьмо брату, я *ўспомніў* (ЗТ) пра яго просьбу.

**!** З дзеясловамі *пачынаць / пачаць, працягваць / працягнуць, заканчваць / закончыць (скончыць), вучыцца / навучыцца, падабацца / спадабацца* ўжываецца толькі інфінітыў дзеясловаў незакончанага трывання:

Ён *пачаў працаваць* у 9 гадзін.
Ён *працягвае працаваць* увесь дзень.
Ён *скончыў працаваць* вечарам.

Мне *падабаецца вучыцца.*
Я *вучуся маляваць.*
Я *навучылася* добра *гатаваць*.

**326. Пастаўце замест кропак змешчаныя ў дужках дзеясловы ў адпаведнай граматычнай форме. Растлумачце ваш выбар.**

**а)** 1. Сёння я хачу … што-небудзь смачнае на абед. Калі я …, я не люблю, каб мне перашкаджалі. (гатаваць — згатаваць)
2. Дзе вы звычайна … малако? Учора мы … малако ў нашым гастраноме. (купляць — купіць)
3. Я выйшаў на вуліцу і …, што забыў зачыніць дзверы. Старыя людзі часта … сваю маладосць. (успамінаць — успомніць)
4. Я … цябе са святам. Заўтра я пазваню сябру і … яго са святам. (віншаваць — павіншаваць)
5. Я з задавальненнем … вам Мінск, калі вы прыедзеце. Брат любіць … свае маркі. (паказваць — паказаць)
6. Мне падабаецца, калі вы … . Убачыўшы мяне, яна … . (усміхацца — усміхнуцца)

**б)** — Алё, гэта Міхась Шыловіч?
— Так. З кім маю гонар *(гаварыць)?*
— Гэта Мікола Залескі. Як *(жыць*), Міхась?
— Дзякую. Памаленьку. А ты як *(мецца)*?
— Усё ў парадку. Дзякую Хачу *(запрашаць)* цябе з Аленай да нас на абед у суботу.
— Дзякую за запрашэнне. З якой нагоды?
— Я *(атрымаць)* павышэнне па службе.
— Мае сардэчныя віншаванні. Рады за цябе. Гэта варта адзначыць.
— *(Чакаць)* вас у суботу а палове трэцяй.
— Дзякую. Абавязкова *(прыйсці)*.
— Тады да сустрэчы!

— Бывай!

**327. Прачытайце жарт, выбраўшы патрэбную форму дзеясловаў закончанага ці незакончанага трывання. Перакажыце жарт.**

У краму увайшла жанчына і (прасіць / папрасіць) паказаць ёй пару пальчатак. прадавец (класці / пакласці) перад ёй некалькі пар, але жанчыне не спадабаўся іх колер. Нарэшце прадавец (пытаць / запытаць) яе, які ж колер ёй патрэбны.

— Колер малака і гарачай кавы, — (адказваць / адказаць) жанчына.

Тады прадавец спакойна і сур'ёзна (пытаць / запытаць):

— А вам з цукрам ці без цукру?

## БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУХНЯ

***ТЭКСТ***

Беларуская кухня ўстойліва захоўвае багатыя і цікавыя нацыянальныя традыцыі. З глыбіні вякоў дайшлі да нас многія самабытныя стравы. Добра вядомыя ў Беларусі і за яе межамі смажанка, мачанка, верашчака, дранікі, пячысты… Шырока выкарыстоўваюцца ў беларускай кулінарыі грыбы, лясныя ягады і травы, рачная рыба.

Кулінарнае мастацтва заўсёды было цесна звязана з бытам, культурай, звычаямі народа. Беларусы, як і іншыя славянскія народы, здаўна займаліся земляробствам. Жыта, пшаніца, ячмень, авёс, грэчка, гарох — культуры, вядомыя на Беларусі з самых старажытных часоў. Чорны жытні хлеб і іншыя вырабы са збожжа многа вякоў былі асновай харчавання.

***1. Хлеб – ўсяму галава.***

Белы пшанічны хлеб у нас пякуць рэдка. Беларус любіць чорны хлеб і сумуе па ім, трапіўшы туды, дзе яго няма. Раней пяклі яго на паду, на капусных або кляновых лістах, а пасля, спырснуты вадою, астываў хлеб пад ручніком, напаўняючы хату найлепшым у свеце пахам. Няма нічога смачней, як адрэзаць гарачую духмяную лусту, густа пасаліць яе і з'есці.

З дзяцінства выхоўвалі пашану да хлеба. З ім ішлі на радзіны, у сваты, на вяселле і іншыя ўрачыстасці. Хлебам-соллю сустракалі дарагіх гасцей. Многа прыказак склаў народ пра хлеб: "Хлеб над усім пануе", "Хлеб — усяму галава", "Хлеб у доме — гаспадар, на працы — сябра, у дарозе — таварыш".

Хлеб даставаўся цяжка. Кінуць яго быў смяротны грэх. Калі ж хлеб незнарок падаў, яго трэба было падняць, пацалаваць і сказаць: "Даруй, божухна". Хлеб абагаўлялі.

Найбольш старажытны хлебны выраб у славян — каравай. Беларусы да нашых дзён пякуць яго на вяселле як сімвал дабрабыту. Звычайна каравай мае круглую форму, зверху ўпрыгожаны зробленымі з цеста фігуркамі птушак, жывёл, чалавечкаў, галінкамі з кветкамі.

Да сярэдзіны XX ст. у беларускай кулінарыі былі пашыраны замяняльнікі хлеба: *сачні, драчоны, скавароднікі*. Іх гатавалі з жытняй, ячменнай, зрэдку пшанічнай мукі. *Скавароднікі* звычайна пяклі з кіслага цеста. *Сачні* — тоўстыя мучныя бліны — часта рабілі з начынкай з бульбы, яблыкаў, вішань, сліў і г.д. Для *драчоны* бралі сыроватку ці свежае малако, а таксама хлебны, кляновы або бярозавы квас. Часта драчоны пяклі прэснымі. Сяляне бралі іх з сабою на сенакос, у дарогу. З лепшых гатункаў пшанічнай мукі пяклі *хрусты, каржаны, пернікі,* з квашанага цеста рабілі пірагі (з грыбамі, капустай, яйкамі, ягадамі і г.д.). З мучных страў вельмі папулярныя былі *клёцкі, зацірка, кулеш, локшыны, наліснікі,* з крупяных — *крупнік, пячона* (запечаная прасяная каша), *жур* (аўсяны кісель), *панцак, гушча* і інш. Іх гатавалі з мясам, смажаным салам, малаком, маслам.

**328. Узнавіце сітуацыю, выкарыстаўшы наступныя словы ці выразы:**

Беларус любіць чорны хлеб; пашана да хлеба; хлеб абагаўлялі; каравай; замяняльнікі хлеба.

**329. Адкажыце на пытанні:**

1. Што было асновай харчавання беларусаў на працягу многіх вякоў?
2. Як ставяцца беларусы да хлеба?
3. Якія прыказкі пра хлеб вядомы ў беларусаў? Як вы іх разумееце? Ці мае падобныя прыказкі ваш народ?
4. Што такое каравай? Ці пякуць у вашай краіне каравай на вяселле?
5. Якія вырабы маглі замяняць хлеб?
6. З чаго і як пяклі сачні? Скавароднікі? Драчоны?
7. Якія яшчэ стравы гатавалі з мукі?
8. Якія стравы гатаваліся з круп?

**330. Складзіце паводле тэксту дыялог.**

***2. Бульба – другі хлеб беларуса.***

Абавязковы атрыбут беларускага стала – бульба. Яе завуць другім хлебам. Беларусы ведаюць каля тысячы страў з бульбы. Ад звычайнай, печанай і да клёцак "з душамі" (вялізныя клёцкі з цёртай бульбы, начыненыя мясам), да бульбы, фаршыраванай грыбамі і запечанай у гарачай печы, дранікаў, бабкі. Апісаць усе спосабы немагчыма. Але і проста вараная, з падгарэлымі вяршкамі, высыпаная на абрус на стале яна – дзіва! Бяры і еш. А да яе сала, салёныя агуркі (з кропам, халодныя) і селядзец. Або зялёны канапляны ці залаты сланечнікавы алей, масла ці міска кіслага халоднага малака.

(Паводле Уладзіміра Караткевіча)

**331. Адкажыце на пытанні:**

1. Што з'яўляецца атрыбутам беларускага стала?
2. Колькі страў з бульбы ведаюць беларусы?
3. Што такое клёцкі "з душамі"?
4. Якая бульбу, паводле аўтара, -- дзіва?
5. З чым ядуць бульбу?

**332. Дапоўніце сказы:**

1. Абавязковы атрыбут …
2. Беларусы ведаюць …
3. Ад звычайнай, печанай і …
4. Але і проста вараная …
5. А да яе …

## Кулінарныя рэцэпты

### Бульбянка з мясам

Бульбу зварыць, патаўчы, дадаўшы гарачае малако, масла і яйкі. Палавіну пюрэ пакласці роўным слоем на змазаную тлушчам скавараду. Зверху пакласці мясны фарш, змешаны з падсмажанай цыбуляй, і накрыць яго астатнім пюрэ. Усё гэта разгладзіць, памазаць узбітым яйкам і запячы.

8 бульбін, 200 г свінога фаршу, 3 яйкі, 2 цыбуліны, 1 шклянка малака, 3 сталовыя лыжкі масла, тлушч, соль.

### Бабка бульбяная з свінінай

Абабраную сырую бульбу нацерці на тарцы, дадаць муку, соль, молаты перац, падсмажаныя кавалачкі свініны і цыбулю. Масу перамяшаць, выкласці ў гаршчок, змазаны тлушчам, і запячы.

10 бульбін, 250 г свініны, 1 цыбуліна, 1 сталовая лыжка мукі, 1 сталовая лыжка тлушчу, перац, соль.

***3. Што ў нас на першае?***

У беларускай кухні склаўся багаты асартымент першых страў. Але галоўнай была *"капуста"* з кіслай або свежай капусты. Затым ішлі *"поліўка"* – дужа тлусты гарачы суп, падбоўтаны мукой, *"панцак"* – пярловы суп з грыбамі. *"Булён"* – адкуль такая назва невядома, бо гэта проста бульбяны суп, зашквараны салам, а зусім не французскі "бульён". Супы па сезону – шчаўе, маладая крапіва з яйкамі. Славуты *халаднік* з халодным мясам і гуркамі. Малочныя супы і сярод іх *"гушча наліўная"* – уласна пшанічная каша, залітая гарачым малаком. І ўрэшце *квас*, род баршчу з буракоў. У чырвоны празрысты адвар клалі мяса ці рыбу, грыбы і розныя прыправы. Словам, як пісаў Якуб Колас:

І вось вячэра пачалася!
Спыніцца мушу я на квасе:
Ён колер меў чырванаваты;
Тут быў таран, мянёк пузаты,
Шчупак, лінок, акунь, карась,
Кялбок і ялец, плотка, язь,
Яшчэ засушаныя з лета.
Але не ўсё яшчэ і гэта:
Аздоблен квас быў і грыбамі,
Выключна ўсё баравічкамі;
Цыбуля, перчык, ліст бабковы —
Ну, не ўясісь, каб я здаровы!

**333. Адкажыце на пытанні:**

1. Якая з першых страў была галоўнай у беларусаў?
2. Што такое "поліўка"? "панцак"? "булён"?
3. Які суп "па сезону" гатуюць беларусы?
4. Што такое "гушча наліўная"?
5. Што такое беларускі "квас"?
6. Што клалі ў квас? Знайдзіце адказ ва ўрыўку з паэмы Якуба Коласа "Новая зямля".

***4. Цяпер пра мяса.***

Здаўна спажывалі беларусы і мяса. Найчасцей елі свіное мяса, бараніну. Але свініна надзейна займае першае месца. Аднак на сялянскім стале каўбасы, вяндліна і іншыя мясныя стравы былі толькі на святы ці сямейныя ўрачыстасці. Галоўным было раней сала. Цяпер сала ўсё больш саступае месца летнім і зімнім каўбасам, паляндвіцам і іншаму. Вэнджаную ў капцільні шынку і так ядуць і закусваюць, і проста перакусваюць, калі раптам перад абедам забурчала ў жываце… Ядуць, вядома, і ялавічыну, і бараніну. Ну і, вядома, птушка займае сваё месца на стале. У азёрных і балотных мясцовасцях, дзе і стрэльбы ёсць і на рынак дужа не адвязеш, у сезон ядуць усё, аж да качак, запечаных з прыправамі ў гліне. Гэта на паляванні. І рэдка мне даводзілася есці нешта смачнейшае. Дужа смачная таксама качка з бруснічным варэннем, крышанымі бурачкамі і яблыкамі. З мясных страў на святы ў беларускіх вёсках гатуюць *пячысты, вантрабянку, паляндвіцу, каўбасу, квашаніну, верашчаку, мачанку* і інш.

Вось як апісвае Якуб Колас беларускі святочны стол:

А на стале тым — рай ды годзе,
Што рэдка трапіцца ў народзе,
Ляжала шынка, як кадушка,
Румяна-белая пампушка,
Чырвона зверху, сакаўная,
Як бы агонь у ёй палае,
А ніз бялюткі, паркалёвы;
Кілбасы-скруткі, як падковы,
Між сцёган, сала і грудзінак
Красуе ўсмажаны падсвінак,
Чысцюткі, свежы і румяны,
Як бы паніч той надзіманы.
Муштарда, хрэн — адно дзяржыся,
У рот паложыш — сцеражыся!
А пірагі, як сонца, ззялі,
І ў роце бабкі раставалі.
Са смакам елі і багата —
На тое ж даў Бог людзям свята.

**334. Адкажыце на пытанні:**

1. Якому гатунку мяса аддаюць перавагу беларусы?
2. Якія мясныя стравы звычайна на святочным стале беларусаў?
3. Знайдзіце ў тэксце ўрыўка з паэмы "Новая зямля" назвы традыцыйных беларускіх мясных страў.
4. Якія мясныя стравы гатуюць у вашай краіне?

***5. Беларускія напоі (напіткі).***

Нацыянальныя беларускія напоі — гэта квас і, перш за ўсё, *бярозавік, кляновік*. Сок бярозавы п'юць і свежы, даўшы яму перабрадзіць і крыху закіснуць. Так ён зберагаецца ў бочцы да жніва. Кіславата-салодкі, рэзкі, дужа добры ў спёку. Гатуюць таксама квас яблычны, грушавы, слівавы і квас з жытняга хлеба — жытняй (часам ячнай, аўсянай ці пшанічнай) мукі і жытняга ці ячнага соладу.

З даўніх часоў варылі напіткі з мёду. Мядовы напітак быў звыклым пачастункам на вяселлях, княжацкіх пірах.

Найбольш просты і старажытны спосаб прыгатавання мядовага напою — перавар мёду з вадою, які злівалі ў бочкі і пакідалі брадзіць на некалькіх тыдняў. Гатавалі мёд таксама з рознымі зёлкамі, перцам, хмелем. Карыстаецца папулярнасцю крупнік, звараны з мёдам, вострымі прыправамі, травамі і карэннем, а таксама "тройчы дзевяць" — лячэбная настойка на дванаццаці сямі травах.

Здаўна была вядома на Беларусі гарэлка — "гарэлае віно" (аравійскае вынаходства). У Вялікае княства Літоўскае гарэлку прывозілі генуэзцы. Даведаўшыся сакрэт вытворчасці гарэлкі, беларусы з XIV стагоддзя сталі гатаваць яе з мясцовай сыравіны. Будаваліся спецыяльныя вінакурні — "бровары". Але гэта была прывілея толькі пануючых колаў грамадства, іншым сацыяльным пластам забаранялася гнаць і прадаваць гарэлку.

Любяць беларусы моцнае хатняе піва, а на паўночным усходзе — брагу. Робяць таксама віно з яблыкаў, розныя наліўкі — *рабінаўку, кмяноўку, вішнёўку*.

| | | |
|---|---|---|
| **!** бяроза | бяроз**ав**ы (сок) | бярозав**ік** |
| клён | кілян**ов**ы (сок) | кляндов**ік** |
| рабіна | рабін**ав**ая (настойка) | рабінаў**к**а |
| кмен | кмян**ов**ая (настойка) | кмяноў**к**а |
| вішня | вішн**ёв**ая (настойка) | вішнёў**к**а |

**335. Адкажыце на пытанні:**

1. Што з'яўляецца нацыянальным беларускім напіткам?
2. З чаго гатуюць квас?
3. Якія іншыя напіткі здаўна вядомыя ў Беларусі?

## Кулінарныя рэцэпты

### Кляновік

Кляновы сок адцадзіць праз марлю і зліць у ліпавую кадку. Дадаць цукру ці мёду, накрыць няшчыльна вечкам. Паставіць у цёмнае халаднаватае месца на тры-сем дзён. Час ад часу перамешваць. Дадаць змелены ячмень.

2,5 л кляновага соку, 15-20 г ячменю, цукар.

**Квас хлебны**

Жытні хлеб нарэзаць лустачкамі, падсушыць, крыху абсмажыць. У драўляную бочку наліць гарачай вады, дадаць падсушаны хлеб, прарошчаны змолаты ячмень, мёд. Усё перамяшаць і паставіць на два-тры дні для закваскі ў цёмнае халаднаватае месца. Перыядычна здымаць пену. Квас вытрымаць на холадзе пяць-шэсць дзён, а затым адцадзіць.

200 г жытняга хлеба, 5 л вады, 20 г ячменю, 50 г мёду.

***ТЭКСТ***

**"Чуллівы" чалавек**

З свайго апетыту беларус заўсёды пасмейваўся (уменне іранізаваць не толькі над кімсьці, але і над самім сабою — адна з самых вартых рыс беларускага нацыянальнага характару):

"Прадаў на рынку кабана, пайшоў закусіць. З'еў тры міскі капусты з боханам хлеба, сала хатняга з фунт. Тут купіў яшчэ тры порцыі смажанай каўбасы ды ўмяў. Пасля бульбы змамоніў міскі тры. Зноў баршчу міску ўбіў з булкай. А пасля як успомніў, што брат у салдатах, то як завязала".

Чуллівы чалавек, праўда? Есці не можа, калі брату цяжка.

(Уладзімір Караткевіч)

**336. Адкажыце на пытанні:**

1. Якую рысу нацыянальнага беларускага характару лічыць пісьменнік адной з самых вартых?
2. Як паводзіць сябе беларус у расказаным аўтарам жарце?
3. Знайдзіце ў тэксце стылістычныя сінонімы да дзеяслова *з'еў (тры міскі капусты)*. За кошт чаго ствараецца эмацыянальнасць паведамлення?
4. Як вы разумееце выраз *як завязала*?
5. З якіх рысаў свайго характару жартуе ваш народ?

**337. Прачытайце ўрывак з паэмы Н.Гілевіча "Родныя дзеці". Якімі беларускімі стравамі частавалі аўтара ў гасцях?**

Вось ты ў гасцях — і нават слоўца
Табе сказаць няма калі:
Вяндлінку з водарам ядлоўца
Мяцеш — зараз па два скрылі!
А побач — зірк! — як цуд, як казка —
З каляндрай, з перцам, з часнаком —
Ляжыць вясковая каўбаска,
Таксама ўвітая дымком!
К таму ж падсохла на гарышчы —
Дык толькі плеўка шапаціць!
Умэнт кальцо з паўметра знішчыў —
Адно раз'ятрыў апетыт!
Калі ж дапаў да вантрабянкі —
Цягаць стамілася рука!
Глядзіш — а ўжо кіндзюк крывянкі
На блюда выклалі з гаршка!
О, гэны зверху і сысподу
Наскрозь усмажаны каўтух!
За чатырох змалоў — уходаў!
(Хоць сам ты лічыш, што за двух.)
Паспеў адчуць, што ўжо не слабка
І ў паясніцы, — а на стол
Тым часам едзе ў місе бабка
І парай дыхае пад столь:
З бакоў запечаная ў меру,
У бульбе скварачкі тырчаць… —
І так жа ўслед пайшла на змену —
Хоць замычы — каб не маўчаць!
"Усё! — сказаў. — На гэтым дзякуй!"
А на абрус — нясуць бліны
І к ім — мачанку-верашчаку
З наборам рэбрачак свіных!
Хвіліну выстагнаў ты моўчкі:
"Дзе месца ўзяць? Патоўпіць дзе?"
І неўпрыкмет на два-тры вочкі
Паслабіў пас на жываце…
Ужо не здыхацца! падпёрла —
Няйначай крушня камянёў!..
А перад носам… ставяць цёрла
Гарачых, тлустых калдуноў!
Калдун!.. Духмяны, самавіты,
У масле ўсмяглы, а паўзверх —
Смятанкай свежаю паліты!..
Ну што? Ізноў глядзіш, як звер?
І адчуваеш, адчуваеш:
Няхай хоць згэтуль у труну —
А не зганьбуеш, не стрываеш —
Дасі прытул і калдуну!
Дасі!.. І добра зробіш, браце!
І не ўпікай дарма сябе!
Ты за ядой — як і на працы:
На малацьбе ці на касьбе!
Калі на свеце нехта дзесьці
Умее добра працаваць, —
То ўмее ён і смачна з'есці
І — адпаведна — згатаваць!
Таму — дастойна, без эфекту
Прымай падзяку-пахвалу —
І беларускаму таленту,
І беларускаму сталу!
І цмокні ў ручку гаспадыні,
Каб сонцам пырснула яна,
І ўскінь яшчэ — а то астыне! —
Ускінь на сэрца… калдуна!..

**Каментарый:**
***кіндзюк*** **–** (разм.) страўнік

| | |
|---|---|
| ***вантробы*** | вантраб**янк**а |
| ***кроў (крывяная)*** | крыв**янк**а |

**Кулінарны рэцэпт**

**Калдуны**

Сырую бульбу нацерці і адціснуць. Змяшаць з патоўчанай зваранай бульбай, дадаць соль. Зляпіць аладкі, начыніць іх дробна нарэзаным мясам і абсмажыць іх на алеі. Калдуны пакласці ў гаршчок, заліць падлівай з падсмажанай цыбулі і смятаны. Паставіць у гарачую печ і добра прагрэць.

18-20 сырых бульбін і 3 звараныя, 200 г свініны, 3-4 сталовыя лыжкі алею, 1 цыбуліна, 3 сталовыя лыжкі смятаны, соль.

**338. Складзіце дыялогі (ці кароткія гісторыі), выкарыстаўшы наступныя сітуацыі і адпаведныя выразы.**

1. Вы прапануеце сваёй жонцы (сяброўцы) схадзіць лепш у рэстаран, чым гатаваць вячэру дома. Яна не згаджаецца з вамі. Яе і вашы аргументы?

*(Можна зберагчы час. Гэта будзе значна даражэй. Ежа не такая смачная, як дома).*

2. Вы хочаце перайсці на дыетычнае харчаванне. Запытайце ў доктара, якую дыетычную ежу ён мог бы вам параіць.

*(Можна есці гародніну, малако, дыетычнае мяса. Нельга ўжываць многа тлустага. Нельга есці многа хлеба, масла, солі.)*

## *ГРАМАТЫКА*

### Выражэнне ўступальных адносін у складаным сказе

1. Уступальныя адносіны афармляюцца пры дапамозе злучнікаў *хоць (хаця), няхай (хай), нягледзячы на тое, што, дарма што*, якія паказваюць, што сітуацыя, выказаная даданым сказам, *тэарэтычна* перашкаджае ажыццяўленню дзеяння, выражанага галоўным сказам, але *практычна* не ўплывае на яго.

*Хоць часу было мала, я наведаў сябра.* (Часу было мала, *але* я наведаў сябра).

*Мы гулялі па горадзе, нягледзячы на тое, што ішоў дождж.* (Ішоў дождж, *але* мы гулялі па горадзе).

| | | |
|---|---|---|
| **хоць (хаця)** | Стылістычна нейтральны і найбольш ужывальны сярод уступальных злучнікаў.<br><br>Часта ён выступае ў пары з супастаўляльнымі злучнікамі *а, але, ды.* | *Хоць маленькі, але ўдаленькі (Прык.);Хоць рукі чорныя, ды сумленне чыстае (Прык.); Хоць лясок быў невялічкі, ды шмат грыбоў расло ў ім.*<br>*Хоць я не багаты, а з гасцей рады (Прык.)* |
| **нягледзячы на тое, што** | Выкарыстоўваецца пераважна ў кніжных стылях маўлення. | *Нягледзячы на тое, што дзьмуў моцны вецер, мы выйшліў адкрытае мора.* |
| **няхай (хай)** | Выкарыстоўваецца, калі адна з сітуацый пазітыўная, а другая негатыўная. Ускладняе ўступальныя адносіны дадатковым мадальным значэннем дапушчальнасці. | *Няхай без хлеба пасяджу, але на мужы пагляджу (Прык.); Няхай у лапленым, ды не ў хапленым (Прык.)* |
| **дарма што** | Аслабляе ўступальныя адносіны, выкарыстоўваецца ў гутарковым маўленні. | *Яму ўсяго пад трыццаць год, дарма што барадою да вачэй зарос.* |

**339. З двух простых сказаў утварыце складаны сказ са злучнікам *хоць.***

**Узор:** ***Мая сяброўка ніколі не была ў Беларусі. Яна добра гаворыць па-беларуску. — Мая сяброўка добра гаворыць па-беларуску, хоць яна ніколі не была ў Беларусі.***

1. У маёй сям'і ўсе захапляюцца класічнай музыкай. Я люблю рок-музыку.
2. У мяне дома многа кніг. Я часта хаджу ў бібліятэку.
3. Час быў позні. Ніхто з пасажыраў не спаў.

4. На дварэ было холадна. Стаяла яшчэ лета.
5. У мяне многа сяброў. Часам мне самотна.

**340. Замяніце сказы са злучнікам *хоць* сказамі са злучнікамі *нягледзячы на тое, што* і *не*.**

2. Уступальныя адносіны ў складаным сказе могуць афармляцца злучнікамі *колькі, як, што* з часціцай *ні*. Такія сказы перадаюць дадатковы эмацыянальны стан моўцы: шкадаванне, раздражненне, перакананне і інш.

*Колькі вяровачцы ні віцца, а канец павінен быць (Прык.)*
*Колькі ні прасіў я яго, ён мяне не паслухаў.*
*Што ні кажыце, а хлопец ён слаўны!*
*Як ні цяжка мне пакідаць вас, а трэба ісці.*

**Значэнне ўступкі ў простым сказе**
выказваецца з дапамогай канструкцый:

| | | |
|---|---|---|
| **насуперак** | ***чаму?*** | Насуперак жаданню, справа не ладзілася. |
| **нягледзячы на** | ***што?*** | Нягледзячы на позні час, спаць не хацелася. |
| **незалежна ад** | ***чаго?*** | Незалежна ад мяне, такую выснову зрабілі мае сябры. |

**341. Закончыце сказы.**
1. Нягледзячы на дождж, мы …
2. Нягледзячы на свой узрост, яна …
3. Няхай ён не ўмее прыгожа гаварыць, але …
4. Хоць цяжка ў гэта паверыць, вы …
5. Нягледзячы на стому, …
6. Насуперак жаданню бацькоў, яна …
7. Як ні шкада мне пакідаць вас, я …
8. Колькі ні прасі яго,
9. Нягледзячы на туман, …
10. Колькі ні працуй, …

**342. Прачытайце і перакажыце.**

— Што такое экзамен?
— Экзамен – гэта гульня, у якой адзін хоць не ведае, але гаворыць, а другі хоць ведае, але маўчыць.

***ТЭКСТ***

**Народныя традыцыі застолля**

Кожны народ мае свае традыцыі гасціннасці, якія з'яўляюцца працягам старажытных этнічных звычаяў, традыцый мінулых часоў. Беларусы захавалі многа цікавых звычаяў, рытуалаў святкавання розных урачыстасцей.

Сярод шматлікіх нацыянальных сямейна-абрадавых святаў асаблівае месца займаюць вясельныя, радзінныя і памінальныя. Беларускае вяселле было і застаецца сёння вялікім і ўрачыстым святам. Яна напоўнена песнямі, народнымі танцамі, жанравай музыкай, гульнямі. Застолле праходзіць весела, з гумарам.

На вясельны стол, як правіла, падаюць традыцыйныя кулінарныя вырабы — халадзец, пячысты (звараныя, стушаныя або падсмажаныя тушкі парасяці, птушкі ці вялікія кавалкі свініны), каравай. У некаторых мясцовасцях для маладых ставяць на стол запечаную куру,

яечню-калатуху, узвар. Па народных павер'ях, гэтыя кулінарныя вырабы і напіткі — сімвалы прадаўжэння роду, дабрабыту і здароўя маладых. Па нормах маралі лічылася непрыстойным маладым піць віно і гарэлку.

Адной сям'і нялёгка было прыгатаваць на ўсіх стол. Таму сваякі, госці, па народнай традыцыі, бяруць з сабой хлеб, загорнуты ў прыгожы, вышыты беларускім арнаментам ручнік, а таксама халодныя закускі, розныя кулінарныя вырабы.

Беларускія радзіны мелі свае рытуальныя стравы і напіткі: хрусты, пернікі, аладкі з макам, яечня-калатуха, узвары, квасы. Сярод іх своеасаблівае месца займала "бабіна каша". Варылі яе з проса ці грэчкі ў гліняным гаршку. За права атрымаць кашу ішоў вясёлы "гандаль". Яе аддавалі таму госцю, чый падарунак быў найлепшым. Ён разбіваў гаршчок, рэзаў на кавалкі кашу, частаваў усіх прысутных.

Цяпер гэты рытуал змяніў сваю форму і змест. Замест кашы пякуць пірог ці торт, падаюць цукеркі, пячэнне. У вёсках вараць па традыцыі кашу, але часта ўжо ў каструлях, а не ў гаршках.

Да нашых дзён захаваліся таксама памінальныя звычаі і абрады. Значэнне іх ва ўмацаванні сваяцкіх сувязей, у згуртаванні сям'і. Асабліва вылучаецца культ восеньскіх "дзядоў", якіх памінаюць 26 кастрычніка (па старому стылю). Да "дзядоў" старанна рыхтаваліся: наводзілі парадак і чысціню ў хаце. На памінальны стол падавалі абрадавыя стравы і напіткі: квас, мядуху, збіцень, халадзец, куццю і інш.

Пэўныя традыцыі маюць беларусы і ў сервіроўцы стала. Для яго уласціва разнастайнасць посуду, выраблenага з гліны, дрэва, лазы, шкла, ільну, саломкі. Адметнасць беларускага стала — мінулага і цяперашняга — у тым, што многія стравы падаюць гарачымі ў той пасудзіне, у якой яны гатаваліся. Так падаюць яечню-калатуху, шкваркі з сала, дранікі, смажаную каўбасу. Разнастайныя супы і іншыя тушаныя нацыянальныя стравы гатуюць і падаюць у керамічных гаршчочках. Пячысты, смажаную птушку ці парасё разразаюць на часткі і падаюць так, каб яны захавалі першапачатковую форму.

Па традыцыі гасцям даюць ручнікі з нацыянальным узорам. Хлеб кладуць на льняны абрус і накрываюць палатнянай сурвэткай. Ён не толькі пачастунак, але і аздоба стала, сімвал дастатку сям'і. На стол заўсёды падаваўся бярозавы, кляновы сок ці квас, напіткі і настоі з розных ягад (брусніц, журавін, чарніц і іншых дзікарослых раслін), мядуху, кулагу, саладуху. Іх ставілі звычайна пасярод стала ў збанах.

Цікава нагадаць пра застольныя традыцыі і этыкет, якія існавалі з даўніх часоў. Маладзейшыя члены сям'і ніколі не садзіліся за абедзенны стол раней за старэйшых. У час яды не чуваць было сёрбання і прыцмоквання. Ніякіх гутарак за сталом не вялі. "Як ем — і глух і нем", — такой прымаўкай нярэдка настаўляў гаспадар хаты маладзейшых. Беларусы заўсёды вызначаліся акуратнасцю і гасціннасцю.

**343. Адкажыце на пытанні:**

1. Якія сямейна-абрадавыя ўрачыстасці захаваліся ў беларусаў?
2. Якія стравы падаюцца на вясельны беларускі стол? Якую сімволіку маюць гэтыя стравы?
3. Якія рытуальныя стравы і напіткі гатаваліся на радзінах?
4. Якія рытуалы звязаны з "бабінай кашай"?
5. Якое значэнне маюць памінальныя звычаі і абрады?
6. Што падавалі на памінальны стол?
7. У чым адметнасць сервіроўкі беларускага стала?
8. Якія напіткі ставіліся на святочны стол? Як падаваўся хлеб?
9. Якія правілы этыкету панавалі за беларускім сямейным сталом? Якія застольныя традыцыі існуюць у вашай краіне?
10. Якія народныя традыцыі застолля ёсць у вашай краіне?

## Кулінарныя рэцэпты

### Збіцень

Каб прыгатаваць старажытны напітак збіцень, трэба мёд развесці шклянкай вады. Гэтак жа ў шклянцы вады развесці цукар і пракіпяціць яго. Зліць абедзве часткі, паварыць на невялікім агні, каб выпарылася крыху вадкасці. У ваду, што засталася, пакласці прыправы, варыць іх 20-25 мінут. Зняць з агню і даць настаяцца на працягу 10 мінут, затым працадзіць, уліць мядова-цукровую сумесь. Падаць гарачым.

150 г мёду, 1,5-2 літры вады, 4 сталовыя лыжкі цукру, 2 бутоны гваздзікоў, 1 чайная лыжка карыцы, 506 гарошын чорнага перцу, 0,25 чайнай лыжкі імбіру (парашок), 2 чайныя лыжкі мяты, 2-3 чайныя лыжкі зверабою.

### Кулага

Для прыгатавання кулагі ідуць любыя свежыя лясныя ягады: суніцы, чарніцы, маліны, брусніцы, чаромха ці каліна. Можна выкарыстаць таксама слівы, вішні, ачышчаныя ад зярнят. Варыць на пліце ці ў духоўцы, пакуль ягады не разварацца. Дадаць мёд ці цукар і, пастаянна памешваючы, жытнюю муку. Падаць з блінамі (хлебам), свежым малаком.

1 кг ягад, 1,5 л вады, 3-4 сталовыя лыжкі жытняй мукі, 1 сталовая лыжка мёду ці 1 шклянка цукру.

**344. Прачытайце жарт і перакажыце яго:**

### Малы ласун

Падчас вячэры малы Юзік пытаецца ў бабкі, навошта яна носіць акуляры.

— Бо яны павялічваюць прадметы.

— Ой, бабулька, як будзеце мне кроіць пірагі, дык, калі ласка, здыміце іх.

**345. Раскажыце, што вы прыгатуеце, калі:**

1. да вас нечакана прыйшлі госці;
2. у вашай мамы (мужы, жонкі) дзень нараджэння;
3. вы прымаеце ўдзел у міжнародным конкурсе "Нацыянальныя традыцыі і нацыянальная кухня".

## VII. АДПАЧЫНАК. ПАДАРОЖЖА. ЭКСКУРСІІ

праца – адпачынак
працаваць – адпачываць
будны (працоўны) дзень – выхадны дзень
будзень – выхадны

адпачынак – адпачываць
вандроўка – вандраваць
падарожжа – падарожнічаць
экскурсія

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| падарожжа | ***куды?*** | на возера | ***па чым?*** | па возеры |
| | | на мора | ***(дзе?)*** | па моры |
| вандроўка | | на азёры | | па азёрах |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | у горы | | па гарах |
| экскурсія | | у Крым | | па Крыме |
| | | у музей | | па горадзе |
| | | у батанічны сад | | па гістарычных мясцінах |
| турыстычная | | у Еўропу | | |
| пуцёўка | | | | |
| рэйс | | на Варшаву | | |
| білет | | да Варшавы | | |

| | | |
|---|---|---|
| адпачынак | ***дзе?*** | у санаторыі |
| | | у Балгарыі |
| | | у доме адпачынку |
| | | у гарах |
| | | у вёсцы |
| | | на лецішчы |
| | | на курорце |
| | | на моры |
| | | на возеры |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| падарожнічаць | ***з кім?*** | з сябрам | ***на чым?*** | на параходзе | ***чым?*** | параходам |
| | | з жонкай | | на цягніку | | цягніком |
| ляцець | | з турыстыч- | | на самалёце | | самалётам |
| ехаць | | най групай | | на аўтобусе | | аўтобусам |
| вандраваць | | з сям'ёй | | на машыне | | машынай |
| | | з калегамі | | на электрыч- | | электрычкай |
| | | са знаёмымі | | цы | | |
| | | | | на лодках | | |
| | | | | на байдарках | | |
| | | | ***як?*** | на веласіпе- | | |
| | | | | дах | | |
| | | | | на конях | | |
| | | | | пяшком (пе- | | |
| | | | | хатой, пешкі) | | |
| | | | | аўтастопам | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ехаць | ***як?*** | па (турыстычнай) пуцёўцы | ***да каго?*** | да бацькоў |
| ляцець | | | | да сваякоў |
| | | | | да знаёмых |
| | | | | да калег |
| | | | | да сябра |
| | | | | да бабулі |
| | | | | да сяброўкі |

**Падарожнічаць, адпачываць, вандраваць**

| | |
|---|---|
| я падарожнічаю, вандрую | мы падарожнічаем, вандруем |
| ты падарожнічаеш, вандруеш | вы падарожнічаеце, вандруеце |
| ён, яна падарожнічае, вандруе | яны падарожнічаюць, вандруюць |

адпачываў, вандраваў, падарожнічаў
адпачывала, вандравала, падарожнічала

адпачывалі, вандравалі, падарожнічалі

**346. Пастаўце дзеясловы ў адпаведнай асабовай форме.**

1. У гэтыя выхадныя мы *(адпачываць)* за горадам. 2. Летам мае сябры *(вандраваць)* па азёрах Беларусі на байдарках. 3. Алесь заўсёды *(падарожнічаць)* на сваёй машыне. 4. Ты сёлета *(адпачываць)* на курорце ў Юрмале? 5. Летась я *(падарожнічаць)* па Еўропе аўтастопам. 6. Вы *(вандраваць)* пешкі ці на конях?

**347. Пастаўце назоўнікі ў адпаведных склонавых формах.**
**Узор: *У падарожжы мы плавалі (параход). – У падарожжы мы плавалі* на параходзе.**

1. Я больш люблю падарожнічаць *(самалёт)*, чым *(цягнік)*.
2. Бацька з сынам вандруюць толькі на *(коні)* ці *(байдаркі)*.
3. Экскурсія па горадзе можа быць на *(аўтобус)* або *(пяшком)*.
4. Мой калега адпачывае ў *(горы)* і толькі зрэдку ездзіць на *(мора)*.
5. Ты адпачываеш у *(санаторый)* ці на *(курорт)*?
6. Турыстычны маршрут па *(горы)* быў вельмі цікавы.
7. Мы ахвотна падарожнічалі на параходзе па *(Чорнае мора)*.
8. Вандроўка на веласіпедах па *(Беларусь)* пакінула прыемныя ўспаміны.

**Турыстычны рыштунак**

палатка гумавая лодка надзіманы матрац руказак

спальнік (спальны мяшок) коўдрагітара чыгунок вядро

запалкі

***ТЭКСТ***

**Алесіна прапанова**

Сёння нядзеля. Можна адпачыць ад напружанага працоўнага тыдня. Звычайна мы з сябрамі плануем наш выхадны дзень загадзя, у пятніцу-суботу. Так было і на гэты раз. Кожны прапанаваў свой варыянт адпачынку: фільм у кінатэатры, дыскатэка ў бары, вечарынка ў кафэ, паездка за горад. Усім спадабалася Алесіна прапанова паехаць на возера Нарач, бо адпачынак у спякоту каля вады – гэта цудоўна. Можна купацца, загараць на пляжы, плаваць на лодках ці катамаранах і нават вудзіць рыбу і гатаваць з яе юшку ці смажыць у вуголлі.

Алеся заахвочвала нас: "Вада ў возеры чыстая і празрыстая, падобная колерам на марскую. Здаецца, што знаходзішся на ўзбярэжжы Балтыйскага мора. Той жа колер вады, той жа бязмежны прастор, той жа залацісты пясок на пляжы і тыя ж высокія сосны на ўзгорках. Залаты бурштынавы бераг! А пах! У паветры ніводнай пылінкі! Яно проста ап'яняе сваёй чысцінёй і свежасцю".

Пасля такой прамовы сумненняў не было – едзем на Нарач!

Яшчэ з вечара ў суботу падрыхтавалі і склалі ў Віталеву машыну ўсё неабходнае: палатку, гумавую лодку, вуды, коўдры, гітару, мяч, бадмінтон, вядро, чыгунок, прадукты і кухоннае начынне. А з самай раніцы былі ўжо ў дарозе.

**348. Закончыце сказы згодна з тэкстам.**

1. У нядзелю можна адпачыць (…). 2. Звычайна (…) плануем наш выхадны дзень загадзя. 3. І на гэты раз было некалькі прапаноў: (…), (…), (…), (…). 4. Але вырашылі паехаць (…), бо там можна купацца, (…), (…) ці (…), вудзіць рыбу. 5. Вада ў возеры чыстая і празрыстая, падобная колерам (…). 6. Здаецца, што знаходзішся (…) Балтыйскага мора: той жа залаты пясок (…) і тыя ж высокія сосны (…). 7. Паветра ап'яняе сваёй (…).

**349. Адкажыце на пытанні.**

1. У які дзень можна адпачыць ад напружанага працоўнага тыдня?
2. Калі плануюць свой выхадны дзень Юрась з сябрамі?
3. Якія былі варыянты адпачынку?
4. Чаму ўсім спадабалася Алесіна прапанова?
5. Якое ўражанне стварае вада ў Нарачы?
6. Як падрыхтаваліся да паездкі сябры?
7. Дзе яны былі ў нядзелю з самай раніцы?

**350. Дапоўніце сказы неабходнымі словамі, пададзенымі ніжэй.**

1. У турыстычным паходзе нам спатрэбяцца наступныя рэчы: палатка, …
2. Пры адпачынку на возеры нам неабходныя вуды, …
3. На экскурсію мы бярэм з сабой фотаапарат, …
4. Для адпачынку на дачы самымі патрэбнымі будуць матыка, …

*Словы для даведак:* надзіманыя матрацы, чыгунок, вядзерца, лодка, вёслы, купальнік, ласты, …; відэакамера, план горада, размоўнік, гід, …; рыдлёўка, акуляры ад сонца, саламяны капялюш, бадмінтон, шашлычніца, шампуры, магнітафон, …; спальнікі, коўдры, рукзакі, запалкі, гітара, чыгунок, міскі, лыжкі, кружкі, надзейныя сябры, вытрымка, …

**351. Раскажыце пра возера Нарач, абапіраючыся на тэкст.**

***ДЫЯЛОГІ***

— Прабачце, дзе я магу атрымаць інфармацыю аб экскурсіях?
— У любой з турыстычных фірмаў. Але што спадара больш цікавіць: экскурсіі за межы горада ці за межы краіны?
— Экскурсіі па горадзе Мінску.

— Едзеш куды-небудзь?
— Так. Да сваякоў у Полацк.
— Па справах ці пагасціць?
— У госці, а таксама наведаю Сафійскі сабор, пахаджу па ціхіх вулачках, па берагах Дзвіны…

— Як прайшлі выхадныя?
— Была з сябрамі ў вандроўцы па гістарычных мясцінах Беларусі.
— А як вандравалі?
— Больш пешшу, але і аўтастопам.
— І што наведалі?
— Навагрудак і Вільню.

— Куды едзеце ў адпачынак?
— У нас адзін маршрут – лецішча.
— Дык які ж гэта адпачынак?

— Мы з мужам любім пакорпацца ў зямлі… І яна ў нас хутчэй для задавальнення, чым для забеспячэння.

— Дзе мяркуеш бавіць канікулы? Большасць нашых будзе ў летніках (летніх лагерах).
— А я еду на ўсё лета да бабулі і дзядулі ў вёску.
— А не засумуеш?
— Што ты! Там і рэчка, і рыба, і лес, і ягады, і грыбы, і луг, і сенакос, і…, і…, і…

**352. Складзіце свае дыялогі на ўзор прапанаваных. Запытайцеся ў сябра/калегі, як ён/яна бавіць вольны час  (адпачынак, канікулы, святы, выхадныя).**

***ГРАМАТЫКА***

**Родны склон множнага ліку**
***(каго? чаго?)***

**1. Назоўнік**

| | Н.скл. адз. л. | | | Р.скл. мн. л. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **м.р.** | сын<br>край<br>сшытак<br>герой | ш | → | сын-<br>крај-<br>сшытк-<br>герој- | оў<br>ёў<br>аў<br>яў | цвёрдая аснова + оў, аў<br>мяккая аснова + ёў, яў<br>оў (ёў) – пад націскам<br>аў (яў) – не пад націскам<br>*але: дзень – дзён* |
| **н.р.** | крэсл-<br>пра-<br>пол- | а<br><br>е | → | крэсл-<br>прав-<br>пал- | аў<br>оў<br>ёў | |
| **ж.р.** | вуліц-<br>рук-<br>форм-<br>станцы-<br>зямл-<br>ноч<br>гусь | а<br><br><br>я<br><br>ш | → | вуліц<br>рук<br>форм-<br>станцый<br>земл-<br>нач-<br>гус- | ш<br><br>аў<br>ш<br>яў<br>эй<br>ей | |

**2. Асабовыя займеннікі**

**Назоўны склон мн. лік** мы, вы, яны
**Родны склон мн. лік** нас, вас, іх

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Да каго | ідзеш? | → | Да | нас<br>вас<br>іх | —<br>—<br>— | мы<br>вы<br>яны |

**353. Пастаўце словы ў дужках у адпаведнай склонавай форме.**

1. Прыйдзеш да *(мы)* у госці?
2. Студэнты прыходзілі да *(вы)* учора.
3. Ездзілі да *(яны)* на выхадныя.

4. *(Мы)* сёння не будзе дома.
5. Можна да *(яны)* звярнуцца па дапамогу?
6. Не магу *(вы)* заспець дома.
7. Я адпачываю ад *(вы)*.

### 3. Прыметнікі

| | | |
|---|---|---|
| ЯкІХ | кветак | не любіш? |
| | дзяцей | |

| | | |
|---|---|---|
| Не люблю | ружовЫХ<br>сінІХ | кветак |
| | плаксівЫХ<br>ціхІХ | дзяцей |

**354. Дапасуйце прыметнікі, што ў дужках, да назоўнікаў.**

1. Турысты былі ў захапленні ад *(Аўстрыйскія)* Альпаў. 2. Трэба было ўзяць вёслы да *(гумавыя)* лодак. 3. У мяне няма *(надзіманыя)* матрацаў. 4. Алесь аўтастопам вяртаўся з *(заходнія)* краін. 5. У БДУ вучыцца шмат студэнтаў з *(розныя)* краін свету.

**355. Пастаўце словазлучэнні ў адпаведных формах.**

1. Студэнты прыехалі са *(Злучаныя Штаты)* Амерыкі. 2. Шмат *(турыстычныя маршруты)* мы яшчэ не зведалі. 3. Турысты спускаліся з *(высокія горы)*. 4. Мой бацька едзе адпачываць да *(блізкія сваякі)* у Крым. 5. Улетку людзі стараюцца выехаць з *(вялікія гарады)* на прыроду: у лес, да возера ці ракі.

### 4. Прыналежныя займеннікі

| | | |
|---|---|---|
| У чы**іх** | сяброў | гасцюеш? |

| | я | ты | ён | яна | мы | вы | яны |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| У маІХ | тваІХ | яго | яе | нашЫх | вашЫх | іх | |

| | | |
|---|---|---|
| Для | каго | кветкі? |
| Ад | | |

| | | |
|---|---|---|
| Для | маіх<br>тваіх<br>вашых | бацькоў<br>жанчын<br>дзяцей |
| Ад | нашых<br>яе | сыноў<br>студэнтаў |

**356. Пастаўце словы ў дужках у адпаведнай склонавай форме.**

1. *(Вашы)* знаёмых запрасілі ў паход.
2. Дзяўчына ідзе да *(нашы)* палатак.
3. Мы ляцім да *(свае)* сваякоў.
4. У мінулым месяцы наведалі *(нашы сябры)* у Віцебску.
5. Бабуля едзе да *(свае ўнукі)* на дзень нараджэння.
6. Не магу датэлефанавацца да *(твае калегі)*.
7. Гэтыя цукеркі для *(вашы дзеці)*.
8. Падарунак быў ад *(мае бацькі)*.

### 5. Няпэўна-колькасныя словы

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькі | маеш | грошай? | | Маю | шмат<br>многа<br>няшмат<br>трохі | грошай |
| | | слоўнікаў? | | | некалькі | слоўнікаў |

**357. Дапасуйце назоўнікі, што ў дужках, да няпэўна-колькасных слоў.**

1. У чытальнай зале шмат *(кнігі і часопісы)*. 2. На Беларусі многа *(рэкі, азёры)*. 3. У горадзе некалькі *(аэрадромы)*. 4. Некалькі *(дні)* ішоў моцны дождж. 5.У Міхася няшмат *(сябры)*. 6. Многа *(студэнты)* выступала на канферэнцыі. 7. Ты купіў шмат *(канверты і паштоўкі)*. 8. Колькі *(кіламетры)* да бліжэйшай станцыі? 9. Колькі зараз *(гадзіны)*? 10. Трохі *(грошы)* засталося ў кішэні.

***ТЭКСТ***

**Мінскі батанічны сад**

Жамчужынай у зялёным убранні называюць Цэнтральны батанічны сад Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ён заснаваны ў 1932 годзе як навукова-даследчыцкая ўстанова, і займае тэрыторыю ў 100 гектараў.

Планіроўка батанічнага саду своеасаблівая. У цэнтры — партэр, афармлены ў строгім класічным стылі. Ад яго промнямі разыходзяцца адзінаццаць алей з розных дрэў: арэха маньчжурскага, клёна серабрыстага, ясеня пенсільванскага, яблыні кітайскай, бярозы павіслай, ліпы дробналістай, елкі звычайнай, туі заходняй і інш.

У сектарах паміж алеямі — рэдкія дэкаратыўныя расліны, ландшафтны парк, дэндрарый, пладова-ягадныя культуры, гадавальнікі. У аранжарэях культывуецца больш за 2000 відаў, формаў і гатункаў трапічных і субтрапічных раслін. Беларускія вучоныя маюць навуковыя сувязі з батанічнымі садамі 52 краін, абменьваюцца з імі насеннем і раслінамі. Паводле складу калекцый, колькасці навуковых даследаванняў і ўзроўню добраўпарадкавання Цэнтральны батанічны сад — адзін з найбуйнейшых у Еўропе.

**Каментарый:**

***культываваць*** — разводзіць, вырошчваць (расліны)

**358. Адкажыце на пытанні:**

1. Як вобразна называюць Цэнтральны батанічны сад у Мінску?
2. Калі ён заснаваны?
3. Якую тэрыторыю займае батанічны сад?
4. У чым своеасаблівасць яго планіроўкі?
5. Якія расліны пасаджаны ў форме алей?
6. Што вырошчваюць у сектарах паміж алеямі?
7. Ці маюць вучоныя Цэнтральнага батанічнага сада Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі сувязь з вучонымі іншых краін?
8. Паводле чаго батанічны сад у Мінску лічыцца адным з самых буйных у Еўропе?

**359. Выпішыце з тэксту спалучэнні ў форме роднага склону множнага ліку.**

**Узор: *плошча ў 100 гектараў.***

**360. Дапоўніце сказы паводле ўзору, выкарыстоўваючы неабходныя словы: *вішня, дуб, клён, ліпа, таполя, сасна, бяроза, лаза, елка, алешына.***

**Узор: *Вішняк — гэта зараснік з вішнёвых дрэў.***

Сасняк — гэта …
Беразняк (бярэзнік) — гэта …

Дубняк — гэта …
Лазняк — гэта …
Ельнік — гэта …
Алешнік — гэта …

**361. Складзіце сказы, выкарыстоўваючы формы:**

| | |
|---|---|
| У пушчы | у гаі |
| у бары | у падлеску |

**Каментарый:**
***Пушча*** --вялікі лясны масіў
***Бор -*** хваёвы лес
***Гай*** -- лісцёвы лес
***Падлесак*** -- малады лес

***ГРАМАТЫКА***

**Месны склон множнага ліку**
***(аб кім? аб чым?)***

**1. Назоўнік**

| | **Н.скл. адз. л.** | | | **Р.скл. мн. л.** | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **м.р.** | студэнт<br>стол<br>пакой | ш | → | студэнт-<br>стал-<br>пако- | ах<br><br>ях | цвёрдая аснова + ах<br><br>мяккая аснова + ях |
| **ж.р.** | вуліц-<br>сястр-<br>ноч<br>зямл- | а<br><br>ш<br>я | → | вуліц-<br>сёстр-<br>нач-<br>земл- | ах<br><br><br>ях | |
| **н.р.** | крэсл-<br>пол-<br>дзіц- | а<br>е<br>я | → | крэсл-<br>пал-<br>дзец- | ах<br>ях | |

**2. Асабовыя займеннікі**

**Назоўны склон мн. лік** мы, вы, яны
**Месны склон мн. лік** нас, вас, іх

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Па кім | сумуеш? | → | Па | нас<br>вас<br>іх | —<br>—<br>— | мы<br>вы<br>яны |

**3. Прыметнікі**

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| У | як**іх** | гарадах | жывяце? | | У | старЫХ<br>сучаснЫХ<br>вялікІХ | гарадах |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Па | чым | маркоціцеся? | Па | добрых ціхіх | фільмах вечарах днях |
| | кім | | | шчырых вясёлых | сябрах дзецях |

**362. Дапасуйце прыметнікі, што ў дужках, да назоўнікаў.**

1. Бацькі паехалі на курорт па *(турыстычныя)* пуцёўках. 2. Дзяўчаты плавалі па вадзе на *(водныя)* веласіпедах. 3. Былі ў вандроўцы на *(Лепельскія і Браслаўскія)* азёрах. 4.Адправіліся ў вандроўку на *(спартыўныя)* конях. 5. Падарожжа па *(паўночныя)* краінах было пазнавальным. 6. Турысты выправіліся на экскурсію па *(гістарычныя)* мясцінах Беларусі. 7. Чалавек сумуе па *(родныя)* мясцінах.

**363. Пастаўце словазлучэнні ў адпаведных формах.**

1. У *(турыстычныя фірмы)* можна выбраць маршрут падарожжа на любы густ.
2. Алесь спрабаваў катацца на *(водныя лыжы)*.
3. Турысты блукалі па *(старажытныя вуліцы)* Вільні.
4. У Мінску і на *(шырокія праспекты)*, і на *(вузкія вуліцы)* шмат зеляніны.
5. У *(вялікія і маленькія вёскі)* Беларусі жывуць вельмі гасцінныя людзі.
6. Сёлета будзем адпачываць у *(маляўнічыя Татры)*.

## 4. Прыналежныя займеннікі

| | | | | я | ты | ён | яна | мы | вы | яны |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Па чыіх | дзецях | сумуеце? | | Па маіх | тваіх | яго | яе | нашых | вашых | іх |

**364. Пастаўце словы, што ў дужках, у адпаведнай склонавай форме.**

1. Я сумую па *(вы)*. 2. Маці замаркоцілася па *(мы)*. 3. Бацькі сумуюць па *(свае)* дзецях. 4. Алена смуткуе па *(нашы)* сябрах. 5. Маці гаварыла мне аб *(мае)* недахопах.

***ТЭКСТ***

### Мінскія аэрапорты

Усе вялікія гарады маюць свае аэрапорты, у тым ліку і міжнародныя. Ёсць аэрапорты і ў беларускай сталіцы. Іх два. Першы – аэрапорт "Мінск – 1". Ён знаходзіцца амаль у цэнтры горада, на вуліцы Чкалава. Тут прызямляюцца самалёты, якія звычайна лятаюць у блізкія рэйсы. Другі – аэрапорт "Мінск – 2". Гэта нацыянальны аэрапорт, абсталяваны ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі. Ён размешчаны за трыццаць кіламетраў ад горада. Аднак дабірацца туды зручна, бо кожную гадзіну сюды прыходзіць з Мінска спецыяльны рэйсавы аўтобус. Таксама маецца і стаянка таксі.

Аэрапорт "Мінск – 2" — вельмі людное месца. Адсюль можна трапіць у любы горад Еўропы ці нават у Амерыку. На англійскай, французскай, нямецкай і рускай мовах аб'яўляецца час адлёту і прылёту самалётаў. Неабходную інфармацыю можна ўбачыць і на электронным табло. Работнікі аэрапорта заўсёды дапамогуць вам, калі вы апынецеся ў складанай сітуацыі.

**365. Адкажыце на пытанні:**

1. Дзе знаходзіцца аэрапорт "Мінск – 1"?
2. Якія самалёты прызямляюцца ў аэрапорце "Мінск – 1"?
3. Ці далёка ад горада аэрапорт "Мінск – 2"?
4. Як можна дабрацца да аэрапорта "Мінск – 2"?
5. У якіх кірунках лятаюць самалёты з аэрапорта "Мінск – 2"?
6. Дзе можна атрымаць інфармацыю аб часе адлёту і прылёту самалётаў?

**366. Пастаўце спалучэнні ў множным ліку паводле ўзору.**

**Узор:** ***у міжнародным аэрапорце – у міжнародных аэрапортах.***

1. У сучаснай сталіцы —
2. На цэнтральнай вуліцы —
3. На рэйсавым аўтобусе —
4. Па спецыяльным маршруце —
5. На людным месцы —
6. На англійскай, французскай, нямецкай мовах —
7. У складанай сітуацыі —
8. У беларускім горадзе —

**367. Прачытайце і перакажыце жарт. Як вы яго зразумелі?**

**Аргументы**

— Дайце мне, калі ласка, два "дарослыя" білеты і адзін "дзіцячы", — папрасіў касіра мужчына.

— Чаму дзіцячы? Ваш сын ужо сапраўдны дзяцюк, у доўгіх штанах ходзіць! — заўважыў касір.

— Добра. Тады дайце "дарослы" сыну і "дзіцячы" жонцы. Яна … у шортах!

**Каментарый:**

***дзяцюк*** **–** юнак, дарослы хлопец

***ДЫЯЛОГІ***

— Ну, хлопцы, дзякуй! Што юшка, што рыба – адно другога вартае. Смакоцце! Алесь, можа ты вучышся ў кулінарным тэхнікуме, а не на матэматычным факультэце БДУ?

— Жартуй-жартуй, але гатаваць на свежым паветры – гэта маё хобі. Бацька з дзяцінства браў мяне з сабой у вандроўкі, там я і захапіўся гэтым.

— Так, Марылька. Калі мы едзем з сям'ёй куды ў лес ці на Браслаўскія азёры, то каля вогнішча шчыруюць выключна бацька з сынам. Нам з матуляй могуць дазволіць абабраць бульбу, аблупіць цыбулю ці пачысціць рыбу…

— А наша сям'я звычайна адпачывае летам у санаторыях на Беларусі ці на курортах Расіі або Еўропы. Мы заўсёды ездзім толькі па пуцёўках, каб адпачыць не толькі ад працы і вучобы, але і ад хатніх спраў. Праўда, бацька рэдка ездзіць з намі, бо яму больш даспадобы адпачынак зімой: горы, снег, мароз і лыжы. Ён наведваецца амаль штогод да свайго сябра ў Аўстрыйскія Альпы.

— А я люблю ўлетку паехаць да бабулі ў вёску. Там і баўлю амаль усе канікулы. Сасновы бор, рэчка, свежае паветра і вольны час – гэта я маю ў вёсцы, і гэтага мне не хапае ў горадзе.

**Каментарый:**

***бавіць час*** **–** праводзіць час

***БДУ*** **–** Беларускі дзяржаўны універсітэт

**368. Адкажыце на пытанні.**

1. Калі Алесь навучыўся гатаваць на свежым паветры?
2. Хто шчыруе каля вогнішча ў час адпачынку на Браслаўскіх азёрах?
3. Каму яны дазваляюць аблупіць цыбулю ці пачысціць рыбу?
4. Дзе звычайна адпачывае Марыльчына сям'я?
5. Як яны едуць у адпачынак?
6. Ад чаго адпачывае Марылька і яе маці?
7. Да каго наведваецца зімой Марыльчын бацька?
8. А куды едзе ўлетку Віталь?
9. Чаго не хапае ў горадзе Віталю?

**369. Перадайце дыялог у маналагічнай форме ад імя 1-й і 3-й асобы.**

**370. Раскажыце, што вы даведаліся пра адпачынак Алесевых сяброў і яго сям'і?**

**371. Раскажыце, як ахвотней адпачываеце вы і ваша сям'я?**

— Якія маеш планы на канікулы?

— Едзем з сяброўкай на экскурсію ў Белавежу.

— Куды?

— У Белавежскую пушчу. Гэта адзінае ў Еўропе месца, дзе лес захаваў свой першабытны характар. Яна знаходзіцца ў Беларусі на мяжы з Польшчай і займае тэрыторыю ў 74 тысячы гектараў. А назву, мяркуюць, атрымала ад вартавой вежы, якая была ўзведзена яшчэ ў XIII стагоддзі ля горада Камянца і была белага колеру.

— Дзякуй за даведку. Пра пушчу я ведаю, толькі не сцяміў, што Белавежа – тое ж самае.

— Ну а ты, куды мяркуеш падацца?

—Хочам з сябрамі на байдарках зведаць Заходнюю Дзвіну, а таксама і прыбярэжныя гарады: Віцебск, Полацк, Наваполацк.

— Добра. Цудоўная ідэя. Мы з групай у мінулым месяцы былі на экскурсіі ў Полацку. Аказваецца, гэты горад старэйшы за Маскву і Смаленск, Мінск і Санкт-Пецярбург. Ужо 11 стагоддзяў стаіць ён на стыку магутнай Дзвіны і ціхай Палаты. Там ёсць што паглядзець, ёсць чым палюбавацца. Адна Сафія чаго вартая!

**Каментарый:**

***Сафія*** – Сафійскі сабор

***сцяміць --*** зразумець

**372. Адкажыце на пытанні.**
1. З кім Алеся едзе на экскурсію?
2. Куды яны накіроўваюцца?
3. Што вы даведаліся пра Белавежскую пушчу з дыялогу?
4. Куды мяркуе падацца Міхась на канікулы?
5. Што паведаміла Алеся Міхасю пра Полацк?
6. Дзе знаходзіцца Полацк і працякае Заходняя Дзвіна? (Паказаць на карце).

**373. Перакажыце дыялогі ў асобах.**

**374. Складзіце дыялогі ў парах пра экскурсію па Беларусі, па вашай краіне.**

— Спадарыня Міхаліна, дзе мяркуеце правесці чарговы адпачынак?

— Дакладна яшчэ не ведаю. Спачатку думалі наведацца да сваякоў у Крым. Але дзеці жадаюць ехаць у падарожжа па краінах Еўропы. Зараз муж высвятляе, што прапаноўваюць

турыстычныя фірмы: якія яны маюць турыстычныя маршруты, сродкі перамяшчэння, а таксама тэрмін падарожжа, культурныя праграмы і кошт паездкі.

— Раю вам наведаць Італію, Грэцыю і Егіпет. Варта ўбачыць дзівосы гэтых краін на свае ўласныя вочы, а не толькі ведаць пра іх па тэлевізійных перадачах.

— Дзякуй за параду. А што плануеце вы на гэты сезон?

— Гэтым летам бацька з сынам вырашылі аб'ехаць на веласіпедах беларускія азёры: Браслаўскія, Лепельскія, Нарач і Свіцязь. Я ж паеду да сяброўкі ў Навагрудак, будзем адпачываць на Свіцязі, а потым да нас далучацца і мае хлопцы.

— Цудоўны выбар! Возера Свіцязь – самае прыгожае ў Еўропе пасля Рыца і азёр Швейцарыі. А яшчэ вы зможаце наведаць знакамітыя мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю Адама Міцкевіча. Навагрудак – яго радзіма.

**375 Адкажыце на пытанні.**

1. Дзе мяркуе правесці адпачынак спадарыня Міхаліна?
2. Да каго яны з мужам думалі наведацца?
3. Куды жадаюць ехаць дзеці?
4. Што мусіць зараз высвятляць муж спадарыні Міхаліны?
5. Якую параду дала калега спадарыні Міхаліне?
6. Як вы мяркуеце, чаму недастаткова ведаць пра Італію, Грэцыю і Егіпет толькі па тэлевізійных перадачах?
7. Што плануе на адпачынак сям'я калегі спадарыні Міхаліны?
8. Чым адметнае возера Свіцязь?
9. Чыёй радзімай ёсць Навагрудак?

**376. Раскажыце дыялог наступным чынам:**

Калега спадарыні Міхаліны запыталася ў яе, дзе яна мяркуе правесці адпачынак. Спадарыня Міхаліна адказала, што яшчэ не ведае дакладна, але…

**377. Раскажыце пра свой адпачынак ці падарожжа.**

**378. Запэўніце, пераканайце свайго сябра ў неабходнасці наведвання пэўных мясцін вашага краю ці краіны.**

## *ГРАМАТЫКА*

### Безасабовыя сказы
### са значэннем стану прыроды

| | | | **прэдыкат** | |
|---|---|---|---|---|
| | | | **форма** | **значэнне** |
| Дажджыла.<br>Парыла.<br>Світала.<br>Вечарэла. | Дажджыць.<br>Парыць.<br>Світае.<br>Вечарэе. | | дзеяслоў 3 ас. адз. л. цяп. часу ці ніякага роду прошлага часу | перадае дзеянне (працэс) або стан безадносна да суб'екта |
| Было сонечна.<br>Было ветрана.<br>Было душна.<br>Стала холадна. | Сонечна.<br>Ветрана.<br>Душна.<br>Холадна. | Будзе сонечна.<br>Будзе ветрана.<br>Будзе душна.<br>Стане холадна. | прэдыкатыў+ дзеяслоў-звязка *(было/стала* або *будзе/стане)* | |

У яскасці прэдыката могуць ужывацца безасабовыя дзеясловы: *віднее, світае, вечарэе, дажджыць, парыць, марозіць, пагодзіцца*; асабовыя дзеясловы ў безасабовай форме: *цямнее,*

*святлее, шарэе, хмарыцца*; прэдыкатывы (словы катэгорыі стану): *адліжна, воблачна, даждліва, марозна, парна, пахмурна, пыльна, цёпла, ціха, хмарна* і інш.

Стан прыроды могуць выражаць намінатыўныя сказы, прэдыкат якіх – назоўнік у назоўным склоне:

*Ноч. Цішыня. Спакой. Лета. Спякота. Духата. Зіма. Холад.*

**379. Пастаўце дзеясловы ў адпаведнай форме.**

1. У чэрвені хутка *(світаць)*.
2. На дварэ было горача і парна. У небе *(хмарыцца)*.
3. Збіралася на дождж. Моцна *(парыць)*.
4. На ўсходзе ўжо *(днець)*.
5. За акном паступова *(цямнець)*. Станавілася холадна.
6. Можа, заўтра надвор'е палепшае. *(Распагодзіцца)*.
7. Нейк раптоўна *(пахаладаць)* і закружыў першы снег.
8. *(Задажджыць)* на цэлы тыдзень.
9. Бралася на дзень. *(Святлець)* на дварэ.

**380. Апішыце надвор'е сённяшняга/учарашняга (пагоднага/непагоднага) дня ці спрагназуйце яго.**

**Няпэўна-асабовыя сказы**

| | **дзеяслоў** | | | ***перадае дзеянне няпэўнага суб'екта*** |
|---|---|---|---|---|
| | **лік** | **час** | **асоба** | |
| Адпачынак каля вады *лічаць* найлепшым.<br>У паход *не бяруць* туфлі на абцасах.<br>Пра чалавека *мяркуюць* і па яго размове.<br>Думаеш, пра гэта *напішуць*?<br>Краму *зачынілі* на абедзенны перапынак. | множны | цяперашні<br><br><br>будучы<br>прошлы | 3-я | |

**381. Пастаўце дзеяловы ў адпаведных формах часу, ліку і асобы.**

1. Зараз такіх спадніц ужо не *(насіць)*. 2. У іх дома *(размаўляць)* па-нямецку. 3. Найахвотней *(адпачываць)* каля вады. 4. У газету часта *(дасылаць)* асабістыя лісты. 5. Нам зноў *(адмовіць)* у візе. 6. Вам так хутка *(аформіць)* дакументы? 7. Маіх знаёмых *(запрасіць)* у круіз. 8. Увесь час па радыё *(рэкламаваць)* турыстычныя маршруты.

**Выражэнне аб'ектных адносін**

| **S** | **V** | **O** |
|---|---|---|
| **суб'ект**<br><br>Міхась | **дзеяслоў**<br><br>паведаміў | **аб'ект**<br><br>нешта цікавае.<br>пра канферэнцыю.<br>, хто прыедзе заўтра.<br>, што неабходна зрабіць. |

У галоўнай частцы складаных сказаў ёсць апорнае слова пэўнай семантыкі, якое патрабуе абавязковы *аб'ектны* пашыральнік: дзеясловы маўлення, мыслення, пачуцця.

Часткі сказа аб'ядноўваюцца пры дапамозе злучнікаў і злучальных слоў ***хто, што*** (у розных склонавых варыянтах), а таксама: ***ці, дзе, куды, адкуль, як, калі, быццам*** і інш.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Ведаю, | **што** трэба рабіць. | Мяркую, | **што** гэта праўда. |
| | **чаго** не хапае. | Думаю, | |
| | **чаму** так сталася. | Ён канстатаваў, | |
| | **чым** цябе здзівіць. | гаварыў, | |
| | **пра што** сказаць. | напісаў, | |
| | **аб чым** паведаміць. | казаў | |
| | | | |
| | **хто** прыйшоў. | Не ведаю, | **ці** праўда гэта. |
| | **каго** няма. | | **адкуль** такая думка. |
| | **каму** сказаць. | | **калі** ты прыйшоў. |
| | **кім** цябе запалохаць. | | **дзе** ты жывеш. |
| | **аб кім** расказаць. | | **чаму** так зрабіў. |
| | | | **як** гэта зрабіць. |

**382. Дапоўніце сказы злучальнымі словамі *хто* або *што*.**

1. Вы разумееце, … я гавару?
2. Я не чую, … яны кажуць.
3. Вы ведаеце, … сядзіць за сталом?
4. Я не разумею, … яна спявае.
5. Я не бачу, … ідзе да нас.
6. Вы не ведаеце, … тут жыве?
7. Студэнт не слухае, … расказвае выкладчык.
8. Я не ведаю, … размаўляе з прафесарам.

**383. Дапоўніце сказы адпаведнымі словамі *дзе, куды, як, адкуль.***

1. Маці не ведае, … расказаць пра здарэнне.
2. Турыст пытаецца, … накіроўваецца гэты аўтобус.
3. Прафесар яшчэ не ведае, … прыехалі новыя студэнты.
4. — Віталь, ты не ведаеш, … Алеся?
   — На жаль, не ведаю, … яна пайшла пасля лекцыі.
5. Я не разумею, … спяшаюцца гэтыя людзі.
6. Вы любіце слухаць, … спявае Данчык?
7. Ён не гаворыць, … ідзе сёння ўвечары.
8. Скажыце, калі ласка, … называецца гэта вуліца?
9. Прабачце, вы не падкажаце, … знаходзіцца бліжэйшы прыпынак?

**384. Пастаўце злучальныя словы *хто, што* ў адпаведных склонавых формах (з прыназоўнікамі *аб, з, ад* ці без іх).**

1. Брат пытаецца, … будзе апавядаць новы фільм. *(што)*
2. Вы не скажаце, … мне трэба размаўляць на гэтую тэму? *(хто)*
3. Міхась ужо ведае, … прапануе сваю пуцёўку ў дом адпачынку. *(хто)*
4. Студэнт не ведаў, … чакаць ад выкладчыка. *(што)*
5. Алеся хоча ведаць, … мы будзем рабіць. *(што)*
6. Ён так і не зразумеў, … адмовіўся. *(што)*
7. Яна патлумачыла, … мела на ўвазе. *(хто)*
8. Дзяўчынка апісала, … аддала кніжкі. *(хто)*
9. Маці пацвердзіла тое, … ужо паведаміў сын. *(што)*

***ТЭКСТ***

**Браслаў**

Браслаў раскінуўся на перашыйку між азёрамі. Адна з дзвюх яго асноўных вуліц цягнецца па беразе возера Навяты. Другая, паралельная першай, — уздоўж возера Дрывяты.

Паміж гэтымі вуліцамі высіцца пасярод перашыйка гара, на якой знаходзіўся калісьці замак. Ён быў пабудаваны ў часы полацкага князя Брачыслава, між 1001 і 1054 гадамі. Па імені князя горад і называўся раней – Брачыслаўль, а потым і да нашага часу – Браслаў.

Замак, як відаць, быў вялікі. Магчыма, на гары былі нават два замкі. Цяпер тут нічога няма, акрамя абеліска, устаноўленага на сродкі мясцовага насельніцтва у памяць папулярнага на Браслаўшчыне ўрача Нарбута. Унізе захаваліся па схілах нязначныя рэшткі мураванай сцяны, якая апаясвала калісьці ўсю гару. Характэрная сярэдневяковая кладка з каменю і цэглы нагадвае рэшткі замка Гедзімінаса ў Вільнюсе.

У стратэгічных адносінах месца для Браслаўскага замка было выбрана ўдала. Гара пануе над ваколіцамі. З вышыні замчышча далёка відаць усё наваколле. Подступы да Браслава лёгка было абараняць. Аховай служылі водныя прасторы.

Вада акружае горад з усіх бакоў. Уражанне такое, быццам знаходзішся на востраве. З вяршыні гары відаць на даляглядзе цэлы ланцуг азёр, малых і вялікіх, даўгіх і круглых. Рэчка Друйка звязвае іх, як пацеркі, у адну агульную водную сістэму. Іх тут каля трохсот. Край сініх азёр – так называюць Браслаўшчыну.

(Паводле Віталя Вольскага)

**385. Адкажыце на пытанні.**
1. Дзе знаходзіцца Браслаў? (Знайдзіце на карце)
2. Адкуль паходзіць назва горада?
3. Як размяшчаюцца яго асноўныя вуліцы?
4. Ці захаваўся Браслаўскі замак да сённяшняга дня?
5. Што вызначыла месца для яго пабудовы ў часы Брачыслава?
6. Як называюць Браслаўшчыну? Чаму?

**386. Перакажыце тэкст вусна, абапіраючыся на пытанні.**

**387. Паспрабуйце пераказаць пісьмова змест тэксту, выкарыстоўваючы сказы з аб'ектнымі адносінамі. Пачніце так:**

Браслаў – гэта невялікі раённы цэнтр на поўначы Віцебскай вобласці.

**А потым скарыстайце прапанаваныя спалучэнні:**

Лічыцца, што ён быў пабудаваны… Вядома, што … Верагодна і тое, што… Рэшткі мураванай сцяны сведчаць, што… Бясспрэчна і тое, што… Аўтар канстатуе, што … Далягляд з вяршыні гары пацвярджае распаўсюджанае меркаванне, што…

***ТЭКСТ***

**Нязменная памяць**

Ці мала на свеце цудоўных мясцін? Давялося і мне пабываць многа дзе. Бываў я на Поўдні і на далёкай Поўначы, захапляўся неразгаданым цудам прыроды – паўночным ззяннем. Ласкавы сонечны поўдзень, казачныя прасторы Чорнага мора, высокія снежныя горы Каўказа пакінулі незабыўны ўспамін аб іх гордай і ветлівай цеплыні. Мае жыццёвыя дарогі праляглі ва ўсе канцы нашай радзімы.

Так, на свеце вельмі многа прыгожых мясцін, добрых людзей, шчырых сяброў. Мабыць, нічога лепшага за іх на свеце няма. Аднак, дзе б ні быў, якія б цуды не здзіўлялі, перад маімі вачыма заўсёды ззяла прамяністае святло майго роднага мястэчка. Там жылі бацькі і бацькі маіх бацькоў, там я сам упершыню захапіўся шчодрай сонечнай прамяністасцю, пахам кветак на шаўковых мурожных лугах, спевам жаўранка пад высокім

сінім небам. Вось так і хочацца прыгадаць кожны куточак, кожную сцяжынку, узгорачак і лагчынку, дзе над люстрам блакітным нашага азярка зіхацяць празрыстыя воблакі.

Праз доўгія дзесяцігоддзі пранёс я нязменную памяць аб усім у сваім сэрцы. Напэўна, кожнаму здаецца, што няма нідзе на свеце такога хараства, якое ўбачыў упершыню яшчэ ў маленстве і якое зачаравала цябе назаўсёды.

(Мікола Хведаровіч)

**388. Адкажыце на пытанні.**

1. Дзе бываў аўтар і чым ён захапляўся?
2. Да якой высновы ён прыйшоў?
3. Чым гэта абумоўлена?

**389. Выкажыце свае ўласныя меркаванні наконт асноўнай думкі тэксту.**

**390. Выпішыце з тэксту спалучэнні слоў з родным склонам, напрыклад: *мала цудоўных мясцін, цуд прыроды…***

**391. Раскажыце, у якіх мясцінах прайшло ваша маленства, выкарыстоўваючы выпісаныя спалучэнні.**

***ТЭКСТ***

**Возера Svіцязь**

Я ішоў да возера, але разгубіўся: якою сцяжынкаю падацца?

— А тут усе вядуць на Свіцязь! – пачулася нечакана, глухавата, як з-пад зямлі. – Ступай, якой хочаш!..

Праз хвілінку Лесавік-праваднік зноў загаварыў сваё:

— Наша Свіцязь усім азёрам возера. Уяві сабе ланцуг узвышшаў. А на адным з хрыбтоў таго ланцуга – круглае люстра вады. Ва ўпадзіне. Наўкола – лес. І дрэвы навіссю над тым люстрам. Вада чысцюткая. А дно – белае. Толькі сям-там плёсы рэдкім чаротам засеяны. Уявіў? Ну вось – гэта будзе Свіцязь.

…Раптам бор расступіўся, і ля ног нашых нечакана ўзнікла вада.

— Свіцязь! – нібы робячы самае важнае ў жыцці адкрыццё, радасна ўскрыкнуў Лесавік.

Свіцязь ляжала перад намі адкрыта, даверліва і спакойна. У падвячоркавай цішыні ледзь чутна шамацелі блізкія чараты. Паволі гайдалася і само сябе закалыхвала возера. Надыходзіў вечар, і ўсё рыхтавалася да спачыну – і вада, і зямля: не трэсне сучок у бары, не ўсплёсне рыбіна ў возеры.

(Паводле Яўгена Пархуты)

**392. Знайдзіце і прачытайце апісанне Свіцязі. Зрабіце пісьмовы яго пераказ.**

**393. Пабудуйце дыялог паводле тэксту.**

**394. Апішыце адну з найбольш адметных мясцін вашага краю.**

## VIII. ЧАЛАВЕК. ЯГО ЗНЕШНАСЦЬ І РЫСЫ ХАРАКТАРУ

| ВАГА | РОСТ | ТВАР | ГУБЫ |
|---|---|---|---|
| худы<br>тоўсты (поўны)<br>нармальнага<br>целаскладу | высокі<br>(чалавек высокага росту//<br>высокі ростам)<br>нізкі<br>(нізкага росту // | круглы<br>вузкі<br>доўгі<br>загарэлы<br>белы | тонкія<br>поўныя<br>вузкія<br>шырокія |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | нізкі ростам) | | |
| ЛОБ<br>высокі<br>нізкі | НОС<br>прамы<br>вялікі<br>маленькі<br>курносы | ВОЧЫ<br>вялікія блакітныя<br>маленькія зялёныя<br>вузкія чорныя<br>круглыя шэрыя | |
| КОЛЕР<br>рудыя<br>светлыя<br>русыя<br>чорныя<br>пшанічныя | ВАЛАСЫ<br>СТРУКТУРА<br>прамыя<br>хвалістыя<br>кучаравыя<br>рэдкія<br>густыя | ДАЎЖЫНЯ<br>доўгія<br>кароткія<br>стрыжаныя | ВЕЙКІ<br>доўгія<br>кароткія<br>густыя<br>рэдкія |

**395.Назавіце часткі цела чалавека.**

**396. Прачытайце з правільным націскам.**

1. Твар – твары, далонь – далоні, павека – павекі, вейка – вейкі, зуб – зубы, пятка – пяткі, лытка – лыткі, калена – калені, спіна – спіны;

2. Волас – валасы, барада – бароды, галава – галовы;

3. Язык – языкі, вус – вусы, нос – насы, лоб – ілбы, бок – бакі, жывот – жываты, рот – раты;

4. Брыво – бровы, шчака – шчокі, губа – губы, рука – рукі, нага – ногі, бядро – бёдры, плячо – плечы, ступня – ступні;

5. Палец – пальцы, локаць – локці, ногаць – ногці, пазногаць – пазногці

6. Вока – вочы, вуха – вушы.

| | | |
|---|---|---|
| Н. | *дзве/абедзве* рукі | *два / абодва* вока, вухі |
| Р. | *дзвюх/абедзвюх* рук | *двух/абодвух* вачэй, вушэй |
| Д. | *дзвюм/абедзвюм* рукам | *двум/абодвум* вачам, вушам |
| В. | *дзве/абедзве* рукі | *два/абодва* вока, вуха |
| Т | *дзвюма/абедзвюма* рукамі | *двума/абодвума* вачыма, вушамі |
| М. | *у дзвюх/абедзвюх* руках | *у двух/абодвух* вачах, вушах |

Запомн?це: адз.л. ***вуха*** — мн. л. ***вушы***,
але: *два (абодва), тры, чатыры* ***вухі***

**397. Што гавораць пра чалавека, калі заўважаюць, што ён:**

1. Не ўмее нічога рабіць. 2. Часта расказвае плёткі. 3. Да ўсяго ставіцца несур’ёзна. 4. Вырашыў складаную праблему. 5. Сумуе і не можа прыняцца за работу. 6. Разгубіўся і сумуе. 7. Празмерна ганарыцца сабой. 8. Пачаў жыць самастойна. 9. Нікому не зрабіў зла. 10. Не ведае таго, што павінен ведаць. 11. Маўчыць, калі трэба гаварыць.

*Для даведак*: У яго дзве рукі і абедзве левыя; з плячэй камень зваліўся. Ён апусціў рукі; мае доўгі язык; вецер у галаве; павесіў нос; нос задраў; стаў на ногі; вока нікому не запарушыў; ні ў зуб нагой; вады ў рот набраў.

(які?) высок*ага* рост*у* (Р.) = (які?) высок*і* рост*ам* (Т.)

**398. Адкажыце на пытанні, выкарыстоўваючы словы для даведак.**

А. 1. – Ці высокі ростам Мікола?

– Так, Мікола...
2. – Ці высокі ростам Васіль?
– Не, Васіль – ...
3. – Ці Пятро нізкі ростам чалавек?
– Не, Пятро — ...

| | | |
|---|---|---|
| высокі | вышэйшы (за каго-небудзь) | самы высокі |
| нізкі | ніжэйшы (за каго-небудзь) | самы нізкі |

В. 1. – Ці вышэйшы Мікола за Васіля?
– Так, Мікола ....
2. – Ці вышэйшы Пятро за Васіля?
– Не, Пятро ...
3. – Ці Васіль вышэйшы за Пятра, але ніжэйшы за Міколу?
– Так, Васіль ...

**399. Дапоўніце сказы словамі.**

| | |
|---|---|
| высокая<br>стройная<br>зграбная<br>прыгожая<br>элегантная<br>ладная | 1. Алеся – ... дзяўчына. У яе ... фігура. 2. Матуля Ганны — таксама ... жанчына. Яна ... і .... 3. Усе дзяўчаты хочуць быць ..., а не .... |

**400. Адкажыце на пытанне, выкарыстоўваючы наступныя выразы.**

| | |
|---|---|
| А.: Ці Алеся — прыгожая дзяўчына.<br>В.: Так, яна вельмі прыгожая. У яе (што?)... | сімпатычны твар, правільныя рысы твару, белыя зубы, вялікія блакітныя (вялікія чорныя вочы), густыя доўгія валасы, чароўная ўсмешка |

**401. Дапоўніце адказ.**

| | |
|---|---|
| прыгожы, сімпатычны, прыемны, адкрыты, мілы, брыдкі, непрыгожы, непрыемны | А. Людзям *з якім* тварам вам лягчэй давяраць?<br>Б.: Мне лягчэй давяраць людзям з ... тварам. |

| | |
|---|---|
| А.: *Якога* колеру вашы вочы?<br>Б.: Мае вочы ... колеру.<br>А.:Якога колеру вочы вашага суседа (суседкі)?<br>В.: Вочы майго суседа (маёй суседкі) ... | блакітныя (сінія)<br>шэрыя<br>карыя<br>зялёныя<br>чорныя |

| | |
|---|---|
| каштанавыя<br>русыя<br>цёмна-русыя<br>светла-русыя<br>светлыя | А.: *Каго* мы назавём брунетам/брунеткай?<br>Б.: Брунетам/брунеткай мы назавём чалавека з ... валасамі.<br>А.: *Каго* мы назавём бландзінам/бландзінкай?<br>Б.: Бландзінам/бландзінкай мы назавём таго, у каго ... валасы.<br>А.: *Каго* мы назавём шатэнам/шатэнкай? |

| | |
|---|---|
| ільняныя<br>пшанічныя<br>цёмныя<br>чорныя<br>рудыя | Б.: Шатэн – гэта той чалавек, у якога валасы ... ці ... колеру. |

**402. Па якіх прыкметах вы пазнаеце: а) еўрапейца (беларуса, паляка, немца); б) афрыканца; в) кітайца?**

*Для даведак:* кучаравыя/прамыя, светлыя/цёмныя валасы; блакітныя/чорныя, вузкія/вялікія вочы; светлая/смуглая/жоўтая скура, тоўстыя/тонкія губы, высокі/невысокі рост.

**403. Якімі словамі вы апішаце Фрэдзі Кругера? Майкла Джэксана? Арнольда Шварцэнэгера? Дэвіда Каперфілда? Складзіце дыялогі, якія пачынаюцца з наступных слоў:**

а) — Ці падабаецца табе Майкл Джэксан?
— ...
б) — Ці ты глядзеў ужо "Кашмар на вуліцы Вязаў"?
— ...
в) — Гавораць, што славуты Дэвід Каперфілд хутка прыедзе ў Мінск!
— ...

*Для даведак*: моцны, магутны, мужны, справядлівы, брыдкі, вытанчаны, пластычны, бліскучы, грацыёзны, экстравагантны, незвычайны, гераічны, жартаўлівы, іранічны, дасціпны.

**Прыметнікі, якія выражаюць ацэнку**

| | | |
|---|---|---|
| дзівосны<br>добры<br>ладны<br>цудоўны<br>бліскучы<br>прыгожы<br>мілы<br>выразны<br>прыемны<br>зграбны<br>элегантны<br>тонкі<br>густыя<br>роўныя<br>белыя | чалавек<br>твар<br>вочы<br>усмешка<br>погляд<br>фігура<br>стан<br>рукі<br>ногі<br>зубы<br>губы<br>валасы | брыдкі<br>агідны<br>непрыгожы<br>жудасны<br>непрыемны<br>нязграбны<br>неўклюдны<br>рэдкія<br>крывыя<br>тоўстыя<br>маленькія<br>касыя<br>вузенькія |

**404. Дапоўніце дыялогі, карыстаючыся словамі з рамкі.**

1. — Вы сёння цудоўна выглядаеце!
— Дзякуй!
— У Вас вельмі элегантная прычоска.
— ...
2. — У вас ... голас!
— Дзякуй!
3. — Я ўчора пазнаёмілася з тваёй сястрой.
— ...
— У яе вельмі ... вочы.

**405. Апішыце знешнасць свайго суседа (суседкі) па плану:**

1. Фігура (стан, рукі, ногі).
2. Твар (вочы, губы, зубы, шчокі).
3. Выраз твару (погляд, усмешка).
4. Прычоска, валасы.

**Характар чалавека.**

**406. Утварыце ад прыметнікаў назоўнікі – назвы абстрактных якасцей.**

**Узор:** ***беражл?в-ы – беражл?в-асць***

Станоўчая ацэнка: ашчадны, ветлівы, добразычлівы дасведчаны, прыязны, дбайны гуманны, верны, шчыры, прыгожы

Адмоўная ацэнка: грубы, маўклівы, абыякавы, жорсткі, шчодры, сквапны.

**407. Дапоўніце адказ на пытанне словамі з рамкі.**

| | |
|---|---|
| шчырасць<br>дабрыня (дабрата)<br>працавітасць<br>акуратнасць<br>сардэчнасць<br>пунктуальнасць | А.: *Якія* рысы характару вам у людзях падабаюцца?<br>Б.: Мне падабаецца чалавечая ... |

**408. Пабудуйце адказы на пытанні пры дапамозе слоў з рамкі.**

| | |
|---|---|
| А.: *Якіх* людзей вы не паважаеце?<br>Б.: Я не паважаю (*якіх?* Він.) людзей. | лянівыя<br>гультаяватыя<br>нядбайныя<br>няшчырыя<br>неакуратныя<br>непунктуальныя<br>ілжывыя |

добры – дабрыня
харошы – хараство

***ДЫЯЛОГІ***

**409. Дапоўніце дыялог.**

— Гавораць, што знешнасць адлюстроўвае характар чалавека.
— Але так бывае не заўсёды.
— Часам ...
— Але ж і наадварот, ...

**410. Прачытайце дыялогі ў парах.**

1. Алесь: Каця, я ўчора бачыў тваю маму. Якая яна прыгожая жанчына!
   Каця: А ведаеш, ёй ужо пяцьдзесят год споўнілася!
   Алесь: Не верыцца! Яна так молада выглядае!
2. Мікіта: Стары, я сёння сустрэў на вуліцы славутага акцёра Манаева.
   Алесь: А ты часам не памыліўся? Манаеў паехаў з тэатрам на гастролі ў Варшаву.
   Мікіта: Ён такі невысокі, з блакітнымі вачыма, светлымі валасамі, у яго невялікая барoдка?

Алесь: Не, Мікітка, гэта зусім не Віктар Манаеў, гэта Іван Захарэвіч. Ён таксама вядомы акцёр. Эх ты, тэатрал!

3. Маці: Мне падабаецца Кастусёва дзяўчына. У яе, здаецца, мяккі характар.

Бацька: Так, яна, відаць, дзяўчына спагадлівая, добразычлівая.

Маці: Гэта шчасце для Кастуся. У яго нялёгкі характар.

Бацька: Што ж, яго ўжо не перайначыш, трэба быць памяркоўным з ім.

4. Марыля: Алеся, ты абяцала сёння вярнуць маю кнігу.

Алеся: Выбачай, сяброўка, але зноў забылася.

Марыля: І як можна так ставіцца да людзей! Гэта кніга мне вельмі патрэбна!

Алеся: Ну, ўжо такая я ўжо ёсць, галава ў мяне дзіравая. Заўтра прынясу. Але нагадай мне, калі ласка, увечары.

***ТЭКСТ***

**Кастусь жэніцца**

Кацярына: Ці ты ведаеш, Алеся, што мой брацік жэніцца?

Алеся: Не, Кася, не ведаю. А каго ж бярэ?

Кацярына Ды сваю дзяўчыну.

Алеся А ці бачыла я яе калі-небудзь?

Кацярына Ведама, бачыла. Яна была на маім дні нараджэння ў мінулым годзе.

Алеся А-а, гэта відаць тая маленькая таўставатая з кароткімі нагамі?

Кацярына: Што ты гаворыш! Зусім не тая. То была наша стрыечная сястра Яся. А Марыля высокая, стройная, вельмі прыгожая. У яе доўгія светлыя валасы. Яна так добра спявае!

Алеся Спяваць – справа няцяжкая. А ці добрая гаспадыня з яе будзе?

Кацярына: Добрая, добрая! Яна такая акуратная заўсёды. Як прыходзіць да нас, заўсёды размаўляе з мамай пра гаспадарку. А ўчора частавала нас смачным пірагом з яблыкамі.

Алеся: А жыць яны дзе будуць?

Кацярына: Пакуль будут наймаць кватэру.

Алеся: Вось жа дык пашанцавала дзяўчыне! Твой брат такі добры хлопец. Характар у яго залаты і на ўсе рукі майстар.

Кацярына: Ці ж ты, сяброўачка, не закахалася ў майго брацiка?

Алеся: Дык цяпер ужо кахай – не кахай, нічога не выйдзе!

**411. Выберыце правільны адказ.**

1. З кім жэніцца брат Кацярыны?
   а) з Марыляй;
   б) з Ядвісяй:
   в) з Ясяй.
2. Як выглядая нявеста?
   а) маленькая таўставатая з кароткімі нагамі;
   б) высокая стройная бландзінка;
   в) прыгожая невысокая брунетка.
3. Дзе бачыла Алеся нявесту Кацярынінага брата?
   а) на дні нараджэння;
   б) у тэатры;
   в) на дыскатэцы.
4. Якія рысы характару адзначае ў Марылі Кацярына?
   а) гаспадарлівасць;
   б) акуратнасць;
   в) неахайнасць.
5. Як характарызуе Алеся сяброўчынага брата?

а) добры хлопец;
б) старанны студэнт;
в) на ўсе рукі майстар.

**412. Складзіце вусны партрэт Марылі.**

**413. Як вы разумееце прыказкі і прымаўкі?**

1. За добрым гаспадаром і варона жона, а за кепскім і княгіня загіне. 2. Ні бэ ні мя, ні божае імя. 3. Ні жывы ні ўмёрлы. 4. Выбірай дзеўку не ў карагодзе, а ў агародзе. 5. Няма Саўкі — няма ўпраўкі. 6. Рэбры ды скура. 7. У ціхім балоце чэрці растуць.

**414. Выберыце адпаведную характарыстыку.**

1. Алесь — хлопец (разумны, старанны, акуратны, неакуратны, пунктуальны, лянівы). 2. Працоўны дзень Алеся (напружаны, цяжкі, лёгкі, кароткі, доўгі, нудны, цікавы). 3. Алесь і яго сябры слухаюць (цікавыя, карысныя) лекцыі (па фізіцы, па матэматыцы, па філасофіі, па мовазнаўству, па гісторыі, па літаратуры). 4. Сяброўка Алеся — (прыгожая, разумная, брыдкая/нябрыдкая, стройная, зграбная, тоўстая) дзяўчына. 5. Студэнты любяць (сур'ёзных, справядлівых, добрых, вясёлых, маладых, разумных) выкладчыкаў.

**415. Прачытайце і перакажыце жарт.**

**Гаспадарлівыя дзеці.**

Размова на вуліцы.
— У мяне дзеці з трох год са стала посуд убіраюць.
— А куды вы чарапкі выносіце?

***ТЭКСТ***

**Неўміручая прыгажосць**

Матка Боска Астрабрамска — гэта абраз, які знаходзіцца ў Вільні. Ён ужо некалькі стагоддзяў з'яўляецца запаветнай святыняй беларусаў-каталікоў. Гісторыкі сцвярджаюць, што з твару Мадонна падобна да Барбары Радзівіл, польскай каралевы, жонкі караля Зыгмунта Аўгуста. Мадонна не мае дзіцяці на руках. Барбара ж памерла беспатомнай. Другі важны доказ — тонкія, прыгожыя далоні Мадонны. Барбара Радзівіл славілася прыгожымі рукамі. Невядомы мастак стварыў цудоўны, поўны вытанчанай прыгажосці абраз, у якім адлюстраваў знешнасць Барбары. Гэты абраз стаў ёй пасмяротным помнікам.

Барбара Радзівіл, закаханая і каханая, адважная, сентыменальная, рамантычная, свабодалюбівая, унесла ў гісторыю чалавецтва незвычайна вялікае пачуццё. Пра такое каханне ў той час яшчэ не чулі.

Яе, прадстаўніцу слаўнага і багатага літоўскага роду, лічылі самай прыгожай жанчынай дзвюх дзяржаў — Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. Галоўнай каштоўнасцю Барбары была сапраўдная каралеўская высакароднасць, якая ўражвала не толькі землякоў, але і іншаземцаў. Гаварылі пра яе алебастравую скуру, далікатнай формы рукі, дзівосныя карыя вочы. Барбару параўноўвалі з класічнымі прыгажунямі, нават з міфічнай Аленай. Яе тонкую прыгажосць, злучаную з вялізнай абаяльнасцю, дапаўняла незвычайная элегантнасць. Тых, хто сустракаўся з Барбарай, захаплялі пяшчотнасць яе погляду, ласкавая гутарка, павольнасць і веліч рухаў.

Аб дзяцінстве і юнацтве Барбары вядома не вельмі многа. Нарадзілася яна 6 снежня 1522 г. Як прадстаўніца высокага роду, яна, безумоўна, атрымала еўрапейскую адукацыю і выхаванне, хутка і прыгожа пісала. Яе эпісталярная творчасць належыць да цікавейшых узораў карэспандэнцыі XVI ст. У пятнаццаць год Барбара выйшла замуж за вядомага трокскага ваяводу Станіслава Гаштольда, а ў дваццаць засталася ўдавой.

У 1543 г., ужо пасля смерці мужа, Барбара пазнаёмілася з наследнікам польскага трону маладым Зыгмунтам Аўгустам і стала яго каханкай. У 1547 г. яны патаемна абвянчаліся, але аб’явілі аб шлюбе праз год, толькі пасля смерці караля Зыгмунта Старога.

Зыгмунт Аўгуст ажаніўся з Барбарай Раздзівіл супраць волі маці, каралевы Боны. Старая каралева зрабіла ўсё, каб Сейм не каранаваў яе нявестку. Аднак намаганні каралевы Боны не далі плёну. Барбара Радзівіл была каранавана як польская каралева. Але ёй не давялося правіць краінай. Каранацыя адбылася ў снежні 1550 года, а праз шэсць месяцаў, у маі 1551 г., Барбара памерла. Паводле паданняў, старая каралева з чорнай нянавісці атруціла нявестку.

Пасля смерці каханай жонкі Зыгмунт Аўгуст вырашыў увекавечыць яе памяць у які-небудзь вялікім творы мастацтва, напрыклад, жывапісу. Цудоўны, услаўлены Адамам Міцкевічам абраз Маткі Боскай Астрабрамскай у Вільні быў намаляваны з партрэта Барбары Радзівіл.

(Паводле К.Шышыгінай-Патоцкай)

**416. Адкажыце на пытанні да тэксту.**

1. Як называецца абраз, які з’яўляецца запаветнай святыняй для беларусаў – каталікоў?
2. Дзе знаходзіцца гэты абраз?
3. Чаму абраз Божай Мацеры звязваюць з імем Барбары Радзівіл?
4. Кім была Барбара Радзівіл?
5. Які лёс напаткаў гэту жанчыну?
6. Чым славілася Барбара Радзівіл?
7. З кім параўноўвалі прыгажуню?
8. Чаму свякроў абвінавачваюць у забойстве Барбары?
9. Хто з паэтаў уславіў абраз Маткі Боскай Астрабрамскай?

**417. Якімі словамі аўтар апісвае Барбару Радзівіл? Раскажыце, якой вы ўяўляеце Барбару.**

**418. Перакажыце тэкст “Неўміручая прыгажосць”.**

**419. Раскажыце пра якую-небудзь гістарычную асобу, вядомую сваім незвычайным характарам паводле наступнага плана:**

1. Знешнасць.
2. Грамадская дзейнасць (здарэнні і ўчынкі, іх ацэнка).
3. Справа ўсяго жыцця.
4. Дэвіз у жыцці.
5. Ацэнка сучаснікаў і патомкаў.

***ТЭКСТ***

**Людзі зямлі беларускай**

1. *Якія яны, беларусы?*

...Што гэта за чалавек беларус? Што гэта за народ? Уласна кажучы, адказаць на гэта пытанне вельмі цяжка. Гэта задача амаль невырашальная. Як і паўсюль, ёсць сярод беларуса? мяшчане і падзвіжнікі, лайдакі і працаўнікі, дурні і мудрацы. І кожны паступае адпаведна свайму характару, і мудрыя разважаюць мудра і па-свайму, а дурні — як паўсюль.

Так што не трэба абагульненняў.

2. *Тыповыя рысы беларуса.*

Аднак, многа паездзіўшы па рэспубліцы, я насмелюся назваць некаторыя досыць тыповыя рысы, уласцівыя народнаму беларускаму характару. Гэта пераважна мой погляд, хаця многія людзі, і не толькі з беларусаў, падзяляюць яго.

Тыповага беларуса я досыць лёгка адрозню сярод іншых, хаця б ён яшчэ не сказаў ніводнага слова (калі скажа, тады ўжо, нават калі ён гаворыць на іншай мове і без акцэнта,

яго лёгка пазнаць па асаблівай будове сказа, па тым, што, колькі паветра набрана і лёгкія, столькі і аддадзена, шчодра, да апошняга, нават з лішнімі словамі, каб мелодыя сказа была завершана. Ён не скажа: ”Чым гэта скончыцца?”, а скажа: ”Дык чым, мо ўжо вы мне скажаце, скончыцца гэта — а, мо скажаце вы?”.

3. *Знешнасць беларусаў.*

Гэта тое, што ў аблічча, амаль няўлоўнае. Пераказаць яго цяжка. Яно ў форме носа, вушэй, у вачніцах і разрэзе саміх вачэй, у манеры рухацца. жэстыкуляваць, гаварыць, дый ці мала яшчэ ў чым. Паўночны беларус ростам пераважна высокі (не рэдкасць бамбізы па два метры ростам). На поўдні часцей трапляюцца людзі сярэдняга росту, больш прыземістыя, затое больш каржакаватыя.

Чарнявых сярод беларусаў няшмат. Найчасцей яны сустракаюцца ў Палессі, на поўдзень ад Прыпяці і чамусьці пераважна сярод мужчын, ды яшчэ ў некаторых мясцінах на Гродзеншчыне, што частка вучоных тлумачыць рэшткамі прымесі старажытнай ятвяжскай крыві. Пераважаюць на Беларусі валасы светла-русыя ці нават бялявыя. Цёмна-русых і шатэнаў менш. Адпаведна і колер вачэй часцей за ўсё блакітны, шэры ці сіні.

Рысы аблічча мяккія, склад здаецца на першы позірк крыху далікатным, але гэтая далікатнасць падманвае. Праявы знешняй сілы, якая ўразіць на хвіліну дый звяне, замяняе тут вынослівасць, жылаватасць, цягавітасць. Там, дзе другі можа апусціць рукі, беларус будзе цягнуць. Іначай, у старыя часы, чалавек проста не выжыў бы сярод гэтых дрымучых лясоў і неабсяжных балот, на гэтай скупаватай зямлі. І гарт той застаўся ў яго характары на вякі.

4. *Свабодалюбства беларусаў.*

Беларуса да рэвалюцыі заўсёды абражала думка аб ім, як аб “няшчасненькім”. Склалася тая думка недзе ў трыццатых гадах XIX ст. Гэты погляд адбіўся і ў творчасці некаторых беларускўх паэтаў. І ўсё гэта, мякка кажучы, не адпавядала ісціне. Той, хто жыў з гэтымі людзьмі, хто глыбока ведаў ці вывучаў іхняе жыццё, быў іншай думкі.

Гэтаму люду было, як заўсёды, у вышэйшай ступені ўласціва інстынктыўнае адчуванне справядлівасці і несправядлівасці. Галоўнай яго рысай з’яўлялася свабодалюбства. Ён давёў гэтае вальналюбства і, хай сабе не заўсёды спалучаную з зухаватасцю, спакойную смеласць і ў бясконцых паўстаннях супраць прыгнятальнікаў, і ў пераможных войнах з татарамі і крыжаносцамі, і ў вялікай мужыцкай вайне XVII ст., і, урэшце, у апошняй вайне з фашызмам.

5. *Любоў да працы.*

Зямляк наш вызначаецца і ўтрапёнай любоўю да працы. Я нават сказаў бы: валовай упартасцю ў ёй. Гэта таксама добра тлумачыцца. Скупая зямля ой як нялёгка давала хлеб. Для новага поля даводзілася (а часам і зараз давозіцца) карчаваць “ляду”. Сячы лес, выдзіраць з зямлі карчы, зносіць на межы камяні.

Мабыць, з-за гэтага працалюбства і кранальнай сваяцкай, кроўнай любові да зямлі — беларус і дагэтуль пераважна аратай, земляроб.

6. *Ашчаднасць.*

Тая самая няшчодрая зямля прывучыла калісьці беларуса да разліку ў вядзенні гаспадаркі, да ашчаднасці, да таго, што “нішто не прападае”, усё ідзе ў справу, нават падабраны цвік, нават лясіна ці калода, прыплаўленая ракой, і, аднак, дужа памыліўся б той, хто назваў бы яго скупым.

7. *Гасціннасць беларусаў.*

Беларус якраз адрозніваецца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе.

Але і ў звычайныя добрыя часы ўсе, хто прыязджае да нас, адзначаюць як адну з галоўных рыс — гасціннасць... “Госць у хаце — бог у хаце” — і ганьба таму дому, дзе не зробяць усяго, нават немагчымага, каб госць быў задаволены.

8. *Неацэнны скарб беларускага народа.*

Рэаліст у рэальным жыцці, беларус вялікі фантаст, рамантык і летуценнік у марах. Менавіта таму запісаныя фальклярыстамі беларускія казкі не ўлезлі б і ў сотню тамоў. Усіх сказак не назавеш, не пералічыш. Іх — безліч! Яны дагэтуль складаюць неацэнны наш скарб, тым больш вялікі, што яны былі народу замест кнігі ў тыя часы, калі кніга беларуская, нават мова беларуская былі забаронены. І тады толькі казка вяла дзяцей у далёкі край, “за сем гор і мораў, трошкі бліжэй да сонца і трошкі далей ад месяца”.

Паводле Уладзіміра Караткевіча

**420. Пытанні і заданні для абмеркавання тэксту.**

1. Якімі рысамі знешнасці і характару адзначаюцца беларусы паводле Уладзіміра Караткевіча?
2. Як вы самі ўяўляеце сабе беларусаў? Ці супадаюць вашы ўяўленні з назіраннямі Караткевіча?
3. Вядома, што агульныя, тыповыя ўяўленні пра іншыя народы бытуюць у кожным народзе. Як вы ставіцеся да гэтага так званага стэрэатыпнага уяўлення ці абагульненай ацэнкі іншых народаў? На чым засноўваюцца стэрэатыпы? Як яны ствараюцца?
4. Які стэрэатып характарызуе ваш народ? Ці супадае гэта ацэнка з самаацэнкай вашага народа?
5. Раскажыце пра свой народ.
6. Ці згодны Вы з тым, што людзей розных эпох мы ўяўляем сабе па стэрэатыпах? Якія рысы асобы мы маем на ўвазе, калі гаворым пра антычнага чалавека, чалавека эпохі Адраджэння, пра чалавека эпохі Асветніцтва, пра моладзь 60-х / 70-х гг. XX стагоддзя, пра хіпі, япі, савецкага чалавека? Ці сапраўды чалавечая асоба характарызуе эпоху?

## IX. МАСТАЦТВА

| тэатр | жывапіс | музыка | скульптура |
| --- | --- | --- | --- |
| *мастацтва дзеяння* | *мастацтва фарбаў* | *мастацтва гукаў* | *мастацтва пластыкі* |

| | |
|---|---|
| **архітэктура / дойлідства** | **літаратура** |
| *мастацтва будаўніцтва* | *мастацтва слова* |

**балет**

*мастацтва танца*

| | |
|---|---|
| **кіно** | **эстрада** |
| *мастацтва экрана* | *мастацтва сцэны* |

**421. Дапоўніце сказы прыдатнымі словамі са слупка.**
**Узор:** ***Тэатр — гэта мастацтва … — Тэатр — гэта мастацтва дзеяння***

| | |
|---|---|
| 1. Жывапіс — гэта мастацтва … | а) будаўніцтва |
| 2. Балет — гэта мастацтва … | б) танца |
| 3. Літаратура — гэта мастацтва … | в) слова |
| 4. Скульптура — гэта мастацтва … | г) гукаў |
| 5. Музыка — гэта мастацтва … | д) пластыкі |
| 6. Архітэктура (дойлідства) — гэта мастацтва … | е) фарбаў |

## Культурныя ўстановы

| | | |
|---|---|---|
| **Тэатр** | драматычны<br>оперы і балета (оперны)<br>аперэты (музычнай камедыі)<br>лялечны (лялек)<br>юнага гледача<br>маладзёжны | Філармонія<br>Канцэртная зала<br>Цырк<br>Палац культуры<br>Палац мастацтва |

**422. Скажыце, якія тэатры ёсць у Вашым горадзе? Якія тэатры ёсць у вашай краіне?**

| | | | |
|---|---|---|---|
| глядзець<br>***каго? што?*** | спектакль<br>балет<br>драму<br>камедыю<br>трагедыю<br>аперэту | слухаць<br>***каго? што?*** | оперу<br>сімфонію<br>песню |

| | |
|---|---|
| **Тэатральныя жанры:** | драма<br>трагедыя<br>камедыя<br>аперэта<br>балет<br>опера |

***ДЫЯЛОГІ***

— Ці любіце Вы тэатр?
— Вельмі. Асабліва мне падабаецца Купалаўскі тэатр.
— І мне таксама.
— А мая дачка ўпадабала лялечны тэатр.
—А мой сын любіць хадзіць у тэатр юнага гледача.

— Ці любіце Вы оперу?
— Безумоўна. І балет таксама.
— І аперэту?
— Аперэта мне падабаецца найперш саім аптымізмам і своеасаблівым спалучэннем дзеяння і грацыёзнай музыкі.

**423. Узнавіце дыялог, выкарыстаўшы наступныя словы:** ***любіце; асабліва мне падабаецца; эстраду / эстрада.***

**424. Адкажыце на пытанне: Ці любіце Вы …?**
**Узор:** ***— Ці любіце Вы оперу? (оперы)***
***— Так. Я люблю оперу // Безумоўна.***
***— Не. Я не люблю оперы.***

Ці любіце Вы балет? (балета)
Ці любіце Вы тэатр? (тэатра)
Ці любіце Вы аперэту? (аперэты)

| | | |
|---|---|---|
| Даваць | | спектакль, канцэрт |
| Праводзіць | *(каго?) што?* | вечар, свята, фестываль, сустрэчу |
| Ладзіць | | вечар, свята, сустрэчу, фестываль, спектакль |
| Ствараць / ставіць | | спектакль |

| | |
|---|---|
| *Спектакль* | ранішні, вячэрні<br>прэм'ера<br>у 2-х (дзвюх) дзеях, у 3-х (трох) дзеях, аднаактовы / у 1 (адной) дзеі |
| *(кіна)сеанс* | ранішні, дзённы, вячэрні |
| *канцэрт* | у 2-х (двух) аддзяленнях<br>аўтарскі<br>урачысты<br>урадавы<br>эстрадны |
| *вечар* | творчы<br>раманса |

| | |
|---|---|
| | паэзіі |
| *свята* | беларускай музыкі і паэзіі ў Маладзечне<br>дзіцячай кнігі |
| *фестываль* | нацыянальных культур Беларусі<br>беларускага сцэнічнага мастацтва<br>"Маладзечанская сакавіца"<br>тэатраў лялек<br>"Усе мы родам з дзяцінства"<br>жаночага кіно |
| *шоу* | эстраднае<br>цыркавое |

**425. Дапоўніце сказы прыдатнымі словамі.**

| | |
|---|---|
| **Узор:** ***Сёння а 19-й (а дзевятнаццатай гадзіне) у Доме літаратараў пройдзе творчы … паэта Сяргея Законнікава. — Сёння а 19-й гадзіне ў Доме літаратараў пройдзе творчы вечар паэта Сяргея Законнікава.*** | ***вечар – фестываль*** |
| 1. На … спектакль дзяцей не пускаюць. Ім у гэты час трэба класціся спаць. | ранішні – вячэрні |
| 2. З нагоды свайго юбілею кампазітар дае … канцэрт у 2-х аддзяленнях. | аўтарскі – творчы |
| 3. Штогод у Маладзечне праходзіць … беларускага сцэнічнага майстэрства "Маладзечанская сакавіца". | вечар – фестываль |
| 4. Эстраднае … патрабуе выдатнага рэжысёра. | шоу – канцэрт |
| 5. … канцэрт даецца найлепшымі артыстамі на дзяржаўныя святы. | аўтарскі – урадавы |

**Параўнайце:**

Канцэрт *даюць* найлепшыя *артысты.*
Канцэрт *даецца* найлепшымі *артыст**амі**.*

даецца              артыстам
даюцца    ***кім?***    артыстамі

**Узор:** ***дае***              ***артыст***
***даюць***    ***хто?***    ***артысты***

**Параўнайце:**
Фестываль *праводзяць музыканты.*
Фестываль *праводзіцца музыкант**амі**.*

**Узор:** ***праводзіць***              ***музыкант***
***праводзяць***    ***хто?***    ***музыканты***

праводзіцца              музыкантам
праводзяцца    ***кім?***    музыкантамі

**426. Устаўце прыдатныя словы са слупка. Прачытайце.**

| | |
|---|---|
| **Узор:** ***Спектакль ладзяць … Універсітэта культуры. Спектакль ладзіцца … Універсітэта культуры. — Спектакль ладзяць студэнты Універсітэта культуры. Спектакль ладзіцца студэнтамі Універсітэта культуры.*** | ***студэнтамі–студэнты*** |

| | |
|---|---|
| 1. Урачысты канцэрт даюць … мастацтва. Урачысты канцэрт даецца … мастацтва. | майстры – майстрамі |
| 2. Сустрэчу з чытачамі праводзяць беларускія … . Сустрэча з чытачамі праводзіцца беларускімі … . | пісьменнікамі–пісьменнікі |
| 3. Вечар перакладу ладзяць маладыя … . Вечар перакладу ладзіцца маладымі … . | паэткі – паэткамі |
| 4. Фестываль тэатральных калектываў праводзяць … Міністэрства культуры. Фестываль тэатральных калектываў праводзіцца … Міністэрства культуры. | супрацоўнікамі–супрацоўнікі |
| 5. Вечар балета ладзяць … Мінскага харэаграфічнага каледжа. Вечар балета ладзіцца … Мінскага харэаграфічнага каледжа. | выпускнікі–выпускнікамі |

**427. Змяніце актыўную канструкцыю пасіўнай:**

**Узор:** ***Спектакль ствараюць маладыя <u>рэжысёры</u>. — Спектакль ствараецца маладымі <u>рэжысёрамі</u>.***

1. Вечар ладзяць юныя *музыканты*.
2. Фестываль праводзяць маладыя *артысты*.
3. Канцэрт даюць *навучэнцы* тэатральнай студыі.
4. Спектакль ставяць аўтарытэтныя *майстры*.
5. Свята паэзіі ладзяць *вучні* Гуманітарнага ліцэя.
6. Фестываль балета праводзяць *харэографы*.
7. Сустрэчу з беларускімі мастакамі ладзяць *супрацоўнікі* Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

| | | | |
|---|---|---|---|
| **!** | ладзіць<br>праводзіць | ***(каго?) што?*** | вечар, фестываль, сустрэч**у** |
| | ладзіцца<br>праводзіцца | ***(хто?) што?*** | вечар, фестываль, сустрэч**а** |

**Хто працуе над спектаклем?**

| | | |
|---|---|---|
| аўтар<br>аўтарка | *сцэнарыя:* | сцэнарыст<br>сцэнарыстка |
| аўтар<br>аўтарка | *лібрэта:* | лібрэтыст<br>лібрэтыстка |

| | |
|---|---|
| (галоўны) рэжысёр | рэжысёры |
| рэжысёр-пастаноўшчык: | пастаноўшчык / пастаноўшчыца |

**Рэпетыцыя**

**Рэпетытар**

| | |
|---|---|
| акцёр – актрыса (акторка) | акцёры; актрысы |
| артыст балета – балерына | артысты балета; балерыны |

спявак – спявачка спевакі; спявачкі
эстрадны спявак – эстрадная спявачка
кінаакцёр – кінаактрыса
кіназорка

**Тэатральная праграма**

Аўтар і назва спектакля
Рэжысёр пастаноўкі
Ролі і іх выканаўцы
Галоўныя ролі / галоўная роля
Эпізадычныя ролі / эпізадычная роля
Роля ў масавых сцэнах
Змест спектакля / лібрэта оперы (балета)
Галоўны рэжысёр тэатра

***ДЫЯЛОГІ***

— Ці не купіць нам праграмку?
— Канешне. Цікава даведацца, хто сёння выконвае ролі.
— А мне цікава ведаць прозвішча рэжысёра.
— Ды і сюжэт трэба паглядзець

— Прабачце, колькі каштуе праграма?
— Гэта 20 тысяч, а тая 40 тысяч.
— А чым яны адрозніваюцца?
— У даражэйшай праграме ёсць ілюстрацыі, там пададзена таксама і гісторыя нашага тэатра.
—Тады, калі ласка, дайце мне (праграму) за 40 тысяч.

— Цікава, хто сёння выконвае галоўныя ролі?
— Пэўна, артысты асноўнага саставу?
— Здаецца, галоўную жаночую ролю выконвае артыстка асноўнага саставу, а галоўную мужчынскую — акцёр дапаможнага.
— Але, я чуў, гэта малады, вельмі перспектыўны акцёр.

**Перакажыце дыялогі ад імя 1-й асобы.**

**Глядзельная зала**

| | |
|---|---|
| гардэроб | вестыбюль |
| фае | хол |
| сцэна | экран |
| аркестровая яма | заслона |
| заслона | |
| люстра | |
| **у тэатры** | **у кінатэатры** |

| | | |
|---|---|---|
| *месца дзе?* | у партэры<br>у бенуары<br>у бельэтажы<br>на балконе | у пярэдніх радах<br>у задніх радах<br>у сярэдніх радах |

***ДЫЯЛОГІ***

**У тэатральнай касе**

— Добры дзень! Ці маеце Вы білеты на сёння ў Оперны тэатр?
— Колькі Вам трэба?
— Два.
— Магу Вам прапанаваць два ў бенуары або на балконе, таннейшыя.
— А ў партэры або бельэтажы няма?
— На жаль, не, на сёння няма. Але ёсць на наступнае прадстаўленне, якое адбудзецца праз тыдзень.
— Вельмі Вам удзячны. Дайце, калі ласка, два білеты ў партэры.
— Калі ласка.
— Дзякуй.

**У касе кінатэатра**

— Добры дзень! Дайце, калі ласка, два білеты на дзённы сеанс.
— Вам бліжэй ці далей?
— Будзьце ласкавы, бліжэй.
— На першым радзе падыходзіць?
— Гэта занадта блізка. Ці няма на радзе трэцім або чацвёртым?
— Вось Вам на трэці рад, у сярэдзіне.
— Вялікі дзякуй.

**Перакажыце дыялогі ад імя 1-й асобы, ад імя 3-й асобы.**

**428. Дапоўніце дыялогі прыдатнымі словамі.**

I. — Добры дзень! Мне, калі ласка, … на сёння.
— Вам у партэры або …?
— А на балконе няма?
— На балконе таксама … .
— Тады мне … білеты на балконе.

II. — Будзьце ласкавы, два білеты на заўтра, на … сеанс.
— Вам бліжэй або …?
— Калі ласка, далей.
— Ёсць на апошні … .
— Дзякую.

**429. Прачытайце і перакажыце жарт. Як вы яго зразумелі?**

Бацька з малым сынам сядзяць у тэатры і слухаюць хор.
— Татка, — пытаецца малы, — а чаму яны спяваюць усе разам?
— Бо паасобку баяцца.

**Каментарый:**

***Паасобку*** — кожны сам, адзін.

**!** Што ідзе ў тэатры (кінатэатры)?
Гэты спектакль (фільм) варта паглядзець.
Раю Вам паглядзець гэты спектакль (фільм).

***ДЫЯЛОГ***

— Сажыце, калі ласка, што сёння ідзе ў Купалаўскім тэатры?
— "Ідылія" Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Між іншым, гэта п'еса была пастаўлена ўпершыню ў Мінску ў 1852 г.
— А які спектакль ідзе заўтра?
— "Тутэйшыя" Янкі Купалы.
— Ці ёсць у тэатры п'есы на ваенную тэматыку?
— "Радавыя" Аляксея Дударава. Гэты аўтар па-новаму асэнсоўвае падзеі 2-й Сусветнай вайны, якая ў нашай гісторыі завецца Вялікай Айчыннай вайной. А нядаўна ў нас была прэм'ера твора гэтага аўтара пра нашу даўнюю гісторыю часоў Вялікага княства Літоўскага. Называецца спектакль "Князь Вітаўт". Раю вам абавязкова яго паглядзець.

**Перакажыце дыялог ад імя 1-й асобы.**

**430. Скажыце, якія драматургі і якія іх творы называюцца ў дыялогу?**

**431. Назавіце вашых драматургаў і п'есы, якія ідуць у тэатрах вашай краіны.**

***ГРАМАТЫКА***

**Адмоўныя займеннікі**

| | **Н.** | **Р.** | **Д.** | **В.** | **Т.** | **М.** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **хто →** | **ніхто:** | нікога | нікому | нікога | нікім | ні пры кім |
| **што →** | **нішто:** | нічога | нічому | нічога | нічым | ні пры чым |
| **які →** | **ніякі:** | ніякая | ніякаму | ніякага, ніякі | ніякім | ні пры якім |
| **якая →** | **ніякая:** | ніякай | ніякай | ніякую | ніякай | ні пры якой |
| **якое →** | **ніякае:** | ніякага | ніякаму | ніякае | ніякім | ні пры якім |
| **якія →** | **ніякія:** | ніякіх | ніякім | ніякіх, ніякія | ніякімі | ні пры якіх |
| **чый →** | **нічый:** | нічыйго | нічыйму | нічыйго, нічый | нічыім | ні пры чыім |
| **чыя →** | **нічыя:** | нічыёй | нічыёй | нічыю | нічыёй | ні пры чыёй |
| **чыё →** | **нічыё:** | нічыйго | нічыйму | нічыё | нічыім | ні пры чыім |
| **чые →** | **нічые:** | нічыіх | нічыім | нічые | нічыімі | ні пры чыіх |

**432. Адкажыце на пытанні, выкарыстоўваючы адмоўныя займеннікі.**
**Узор:** ***Хто глядзеў гэту тэатральную прэм'еру? — Ніхто.***

1. Які спектакль Вас зацікавіў?
2. Чый твор выклікаў увагу?
3. Хто з выканаўцаў Вам спадабаўся?
4. Што Вас непакоіць?
5. Каго Вы сустрэлі на вуліцы?
6. Чыім творам Вы зацікавіліся?

**Адмоўныя займеннікі** абазначаюць адсутнасць акрэсленага прадмета ці якасці. Утвараюцца пры далучэнні да пытальна-адносных займеннікаў *(хто, што, які, чый)* прыстаўкі *ні-*

**433. Устаўце займеннік *чый* у адпаведнай назоўніку форме і дайце адмоўны адказ на пытанне.**

**Узор: *… імя Вам вядомае?***

***Чыё імя Вам вядомае? — Нічыё.***

1. … прозвішча ўказана ў праграме?
2. … роля Вам запомнілася?
3. … сцэнарый Вы выбралі?
4. … спектакль Вы глядзелі?
5. … спектакль Вам больш падабаўся?
6. … рэпетыцыя была больш удалая?
7. … героі былі больш жыццёвыя?

Пры спалучэнні адмоўных займеннікаў з прыназоўнікамі ўтвараюцца тры словы, першае з якіх – *ні*, наступнае – адпаведны прыназоўнік і трэцяе – адпаведны займеннік.

***!  нічога + да = ні да чога***

| | |
|---|---|
| *Да каго* Вы ідзяце? | — *Ні да кога.* |
| *З кім* Вы хадзілі ў тэатр? | — *Ні з кім.* |
| *З чыім* удзелам складаўся рэпертуар? | — *Ні з чыім.* |
| *Да якога* рэжысёра Вы звярталіся? | — *Ні да якога.* |
| *Пры чыім* удзеле абмяркоўваўся спектакль? | — *Ні пры чыім.* |

Пры поўным адмоўным адказе на пытанні з пытальна-адноснымі займеннікамі пры дзеяслове ўжываецца адмоўная часціца *не*.

| | |
|---|---|
| *Да каго* Вы ідзяце? | — Я *ні да кога не* іду. |
| *З кім* Вы хадзілі ў тэатр? | — Я *ні з кім не* хадзіла (не хадзіў). |

**434. Дайце адмоўны адказ на пытанне.**

**Узор: *Які твор Вам запомніўся? — Ніякі.***

1. З якім спеваком Вы знаёмыя?
2. Да якога твора Вы звярталіся?
3. Чый гэта рэпертуар?
4. Хто Вам дапамагаў?
5. З кім Вы хочаце супрацоўнічаць?
6. Пры якой установе працуе тэатр?

**435. Дапоўніце сказы прыдатнымі словамі, каб утварыўся поўны адмоўны адказ.**

**Узор: *… з якім спеваком я … знаёмая.***

***Ні з якім спеваком я не знаёмая.***

1. … да каго на канцэрт я …трапіла.
2. … з кім з сяброў я на сустрэчу … хадзіў.
3. Ніхто з артыстаў … змог выканаць гэту ролю.
4. Нікому … пашанцавала атрымаць галоўную ролю.

5. Я … да кога … звяртаюся па дапамогу.
6. Вам ніякі рэжысёр … дагодзіць.
7. … да чаго гэта … прывядзе.

! 

| |
|---|
| Н. хто? (ёсць) — Р. нікога (няма) |
| Н. што? — Р. нічога |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | тут? | | |
| *Хто* | ў доме? | — Нікога (няма) | |
| | за дзвярыма? | | |
| | | | |
| | чуеш? | | не чую |
| *Што* ты | хочаш? | — Нічога | не хачу |
| | чытаеш? | | не чытаю |
| | робіш? | | не раблю |
| | | | |
| | здарылася? | | не здарылася |
| *Што* | адбылося | — Нічога | не адбылося |
| | сталася? | | не сталася |

**436. Адкажыце на пытанні поўным і кароткім адказам.**
**Узор:** ***Хто тут? — Нікога тут няма. Нікога.***

1. Хто ў доме?
2. Што здарылася?
3. Што ты чытаеш?
4. Хто тут ёсць?
5. Што ты чуеш?
6. Што тут сталася?
7. Што тут здарылася?

| | | |
|---|---|---|
| Здарылася | *з кім?* | са мной – з намі |
| адбылося | *з чым?* | з табой – з вамі |
| сталася | | з ім / ёй (ёю) – з імі |
| | | з п'есай – з п'есамі |
| | | з рэжысёрам – з рэжысёрамі |
| | | з фестывалем – з фестывалямі |
| | | з актрысай – з актрысамі |
| | | з роллю – з ролямі |
| | | з прозвішчам – з прозвішчамі |
| | | з дзіцем – з дзецьмі |

**437. Пастаўце словы ў дужках у адпаведную граматычную форму.**

1. Са *(я)* нічога не здарылася. 2. З *(мы)* адбылася цікавая гісторыя. 3. Што сталася з *(актрысы)*? 4. З *(фестываль)* нічога не адбылося. 5. З *(ён)* сталася дзіўная рэч. 6. З тэатральнымі *(фестывалі)* адбылося цудоўнае ператварэнне ў свята нацыянальных культур. 7. З *(чые)* дзецьмі гэта здарылася?

**! Устойлівыя выразы:**

| | |
|---|---|
| ***Нічога ніякага.*** | — Адмаўленне абвінавачвання |
| ***Нічога не зробіш (не папішаш)*** | — Немагчымасць змяніць абставіны |
| ***Нішто сабе / нічога сабе*** | — Стрыманая, але станоўчая ацэнка |

**438. Да адказаў падбярыце прыдатныя выразы са слупка.**

**Узор:** ***Нічога ніякага.*** ***Ты разбіў шклянку?***
***Нічога не зробіш.*** ***Вам не дазволілі прыходзіць.***
***Нішто сабе.*** ***Добра іграла актрыса?***

| | |
|---|---|
| 1. Нічога ніякага. | а) Ты ўзяў маю праграму? |
| 2. Нічога не зробіш. | б) Я не дазваляю табе браць маю праграму. |
| 3. Нішто сабе. | в) Прыгожая праграма? |
| | г) Добра спявала актрыса? |
| | д) Я не змагу пайсці ў тэатр. |
| | е) Які ў спявачкі голас? |
| | ж) Што ты хочаш ад мяне? |

**439. Пастаўце словы ў дужках у адпаведную назоўніку форму.**

**Узор:** ***Дзяўчына нішто сабе, (прыгожы).***
***Дзяўчына нішто сабе, прыгожая.***

1. П'еса нішто сабе, *(цікавы).*
2. Сцэнарый нішто сабе, *(займальны).*
3. Імя нішто сабе, *(мілагучны).*
4. Выканаўцы нішто сабе, *(здольны).*
5. Рэжысёр нішто сабе, *(арыгінальны).*

**440. Прачытайце беларускія прымаўкі, якія гаворацца ў сваё апраўданне або нясмелым чалавекам. Навучыцеся іх выразна вымаўляць.**

Каб жа я калі каму што якое, а то ж я ніколі нікому нічога.

Каб жа я калі каму што якое, а то ж я ніколі нікому нічога. А як калі каму што якое, дык што ў тым такога?

**Каментарый:**

Гэтыя прымаўкі ўтварыліся праз апушчэнне слоў:

*Каб жа я калі (-небудзь) каму (-небудзь) што якое (дрэннае зрабіў), а то ж я ніколі нікому нічога (не зрабіў). А як калі(-небудзь) каму(-небудзь) што якое (дрэннае зрабіў), дык што ў тым такога (дрэннага)?*

**441. Прачытайце і перааажыце жарт. Як вы яго зразумелі?**

**Булачка за нічога**

Адзін бедны хлопчык углядаўся ў вітрыну пякарні, дзе было шмат прыгожых булачак, аднак купіць сабе іх не мог, бо грошай не меў, а голад яго вельмі даймаў. Урэшце зайшоў у пякарню і запытаўся:

— Пачым гэтыя булачкі?

— Дванаццаць штук за адзінаццаць рублёў, — адказаў пекар.

— Ах. Дванаццаць за адзінаццаць рублёў. Гэта вельмі добра. Вось жа меў бы 11 булачак за 10 рублёў, 10 булачак за 9 рублёў, 9 булачак за 8 рублёў, 8 булачак за 7 рублёў, 7 булачак за 6 рублёў, 6 булачак за 5 рублёў, 5 булачак за 4 рублі, 4 булачкі за 3 рублі, 3 булачкі за 2 рублі, 2 булачкі за 1 рубель і адну булачку за нічога.

Калі ласка, дайце мне вось гэтую прыгожанькую булачку за нічога.

Пекар, рассмешаны доказамі хлапчука, споўніў яго просьбу і даў яму булачку за нічога.

**!** **Выражэнне катэгарычнага адмаўлення**

**Ні пры якіх абставінах не …**

Ні пры якіх умовах не …

**Ні ў якім разе не …**

Ні за якія грошы не …

Ніякім чынам не …

| **Жывапіс** | **Графіка** |
|---|---|
| **Жывапісныя працы** | **графічныя працы** |

захапляцца *чым?* жывапіс**ам** графік**ай**
займацца

Выстава Пейзаж Партрэт Нацюрморт
Пленэр

Жывапісец графік

мастак / мастачка

(на)пісаць
(на)маляваць *чым?*
(па)карыстацца

алеем / алейн**ымі** фарб**амі**
акварэллю
пастэллю
тушшу
пэндзлем

Вядомы / вядомая
Знакаміты / знакамітая *чым?*
Праславіўся / праславілася

сва**імі** жывапісн**ымі** палотн**амі**
твор**амі**
работ**амі**
пейзаж**амі**
партрэт**амі**
нацюрморт**амі**
акварэл**ямі**

**442. Пастаўце назоўнікі ў дужках у адпаведную форму.**

1. Мастачка яшчэ з дзяцінства захаплялася *(жывапіс)*.
2. Спачатку яна малявала на паперы *(акварэль)*.
3. Затым яна стала карыстацца *(пастэль і туш)*.
4. Пазнейшыя яе творы напісаны *(алейныя фарбы)*.
5. Цяпер яе *(жывапісныя палотны, акварэлі і пастэлі)* захапляюцца гледачы многіх краін свету.

**443. Прачытайце.**

Беларуская школа жывапісу бярэ традыцыі ад твораў Напалеона Орды (1807-1883), Язэпа Драздовіча (1888-1954), Вітольда Бялыніцкага-Бірулі (1872-1957), Міхася Савіцкага (1922), Міколы Сялешчука (1947-1997).

**Назавіце беларускіх мастакоў, імёны якіх ужыты ў сказе.**

**444. Назавіце мастакоў вашай краіны.**

**!** Мастацкі музей экспануе працы.
У мастацкім музеі экспануюцца працы.
Раю вам наведаць выставу, пленэр, экспазіцыю.

## Літаратура

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Празаічныя жанры** | раман<br>аповесць<br>апавяданне<br>абразок | **Паэтычныя жанры** | лірыка (вершы):<br>паэма<br>байка | інтымная,<br>грамадзянская,<br>пейзажная |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Аўтар | пісьменнік<br>пісьменніца | паэт<br>паэтка | драматург | празаік | літаратурны крытык |

Сюжэт
героі *твора* твор прываблівае / захапляе *чым?* сюжэтам / тэмай / героямі / вобразамі / дакладнымі дэталямі / выдатным стылем
вобразы
дэталі

| | |
|---|---|
| Выдатн**ымі** стыліст**амі** былі | Янка Купала (1882-1942)<br>Якуб Колас (1882-1956)<br>Цётка (1876-1916)<br>Максім Багдановіч (1891-1917)<br>Кузьма Чорны (1900-1944)<br>Уладзімір Дубоўка (1900-1976)<br>Рыгор Шкраба (1919-1998)<br>Ян Скрыган (1905-1992) |
| Выдатн**ымі** стыліст**амі** з'яўляюцца | Ніл Гілевіч (1931)<br>Рыгор Барадулін (1935)<br>Уладзімір Някляеў (1946)<br>Уладзімір Арлоў (1953) |

**445. Складзіце сказы з прыведзенымі вышэй словамі па ўказанай мадэлі.**
**Узор:** ***1. Выдатнымі стылістамі былі Максім Багдановіч, …***
***2. Выдатнымі стылістамі з'яўляюцца Ніл Гілевіч, …***

**446. Назавіце выдатных пісьменнікаў Вашай краіны.**

**!** Твор напісаны *кім?*

*ГРАМАТЫКА*

**Творны склон *кім? чым?***

**Множны лік**

| **назоўнікі** | | **займеннікі** | **прыметнікі, лічэбнікі** | |
|---|---|---|---|---|
| *-амі (-ямі)* | | намі<br>вамі<br>імі<br>чыімі<br>якімі | *-ымі (-імі)* | |
| спевак**амі**<br>спявачк**амі** | аснова на цвёрды | | таленавіт**ымі**<br>перш**ымі** | аснова на цвёрды |
| акварэл**ямі**<br>грудз**ямі** | аснова на мяккі | | | |
| *-мі* | | | апошн**імі**<br>друг**імі** | аснова на мяккі; г, к, х |
| людзь**мі**<br>грудзь**мі** | | | | |

**! Т.скл. -ыма / -амі**

вочы — вач**ыма** / вач**амі**
вушы — вуш**ыма** / вуш**амі**
дзверы — дзвяр**ыма** / дзвяр**амі**
грошы — граш**ыма** / граш**амі**
плечы — пляч**ыма** / пляч**амі**

**Канструкцыі з Т. склонам**

**I.** Ёсць дзе? за дзвяр**ыма**, вокн**амі**
Няма

**II.** З'яўляцца *кім?* мастак**амі**, майстр**амі**, аўтар**амі**
(Ёсць) мастак**ом**, мастачк**ай**
**Былі**

**III.** Адбылося *з кім?* з намі, вамі, імі, з таленавіт**ымі** артыст**амі**
Здарылася *з чым?* артыстк**амі** (артысткай), з перш**ымі** выканаўц**амі**
Сталася з фестывал**ямі**, з вечар**амі**

**IV.** Маляваць *чым?* фарб**амі** (фарб**ай**)
Пісаць пэндзл**ем**

**V.** Працаваць з аднадумц**амі**
Ствараць *з кім?* з іншымі артыст**амі**
Супрацоўнічаць з таленавітымі мастак**амі**

**VI.** Праводзіцца супрацоўнік**амі**
Ладзіцца *кім?* артыст**амі**
**Даецца** **рэжысёр**амі
Ставіцца

***ТЭКСТ***

**У тэатры**

Для сям'і Кавалёнкаў наведванне тэатра — гэта вялікая падзея. Алесь пільна сочыць за тэатральным жыццём Мінска, не прапускае ніводнай прэм'еры. Да тэатра ён вялікі ахвотнік. У школе некалі Алесь з Юрасём удзельнічалі ў драмгуртку. Алесю надзвычай удаваліся камедыйныя, парадыйныя ролі, такія, напрыклад, як пан Адольф Быкоўскі ў "Паўлінцы" Янкі Купалы. Юрась жа выдатна выконваў у гэтай Купалавай п'есе ролю Сцяпана Крыніцкага. У пастаноўцы ўдзельнічала і Яніна, увасабляла немаладую Агату з яе запамінальнай фразай "тудэма-сюдэма". Дзецьмі яны так стараліся хоць троху быць падобнымі на сапраўдных артыстаў-купалаўцаў, якія гэтыя ролі выконвалі — Арнольда Памазана, Генадзя Аўсяннікава, Галіну Макараву…

Захапленне дзяцей падабалася бацькам. Яны заўсёды падтрымлівалі іх ахвоту да творчасці, прыходзілі на школьныя спектаклі. Разам з дзецьмі яны паглядзелі ўвесь рэпертуар не толькі Купалаўскага тэатра, але і Опернага. Яніне вельмі падабаўся балет. Дома яна часта ўяўляла сябе балерынай, старалася выканаць некаторыя балетныя па. Цяпер яе дачка Васілінка ўвасабляе матуліну мару, ходзіць у балетную студыю. А сын Кастусь выдатна свявае. Ён вельмі любіць тэатр музычнай камедыі, ведае многія партыі кальманаўскіх і легараўскіх герояў. З беларускага рэпертуару хлопчык асабліва ўпадабаў "Паўлінку" Юрыя Семянякі (паводле купалаўскай камедыі) і "Несцерку" Рыгора Суруса — пастаноўку паводле п'есы Віталя Вольскага, названай імем галоўнага героя — дасціпнага беларуса, з адметным нацыянальным гумарам.

Захапленне тэатрам надзвычай узбагачае і дзяцей, і дарослых.

**Каментарый:**

***кальманаўскі герой*** – герой з аперэты Кальмана
***легараўскі герой*** – герой з аперэты Легара

**447. Адкажыце на пытанні:**

1. Як у сям'і Кавалёнкаў ставяцца да тэатра?
2. Хто сочыць за тэатральным жыццём Мінска?
3. Якія ролі ўдаваліся Алесю?
4. Якую ролю і ў якой п'есе выконваў Юрась?
5. Якую гераіню ўвасабляла Яніна?
6. На каго стараліся быць падобнымі дзеці ў сваёй ігры?
7. Ці падабалася бацькам захапленне дзяцей?
8. Рэпертуар якіх тэатраў бацькі паглядзелі разам з дзецьмі?
9. Які тэатральны жанр падабаўся Яніне?
10. Які тэатр любіць Кастусь?
11. Што ўпадабаў Кастусь з беларускага рэпертуару?

**448. Пастаўце назоўнікі ў дужках у творным склоне множнага ліку.**

**Узор:** ***Алесь пільна сочыць за новымі (прэм'ера).***
***Алесь пільна сочыць за новымі прэм'ерамі.***

1. Алесь пільна сочыць за новымі *(пастаноўка).*
2. Гледачы ўпадабалі вобраз Агаты з яе запамінальнымі *(словы).*
3. Разам з *(дзіця)* бацькі паглядзелі рэпертуар Купалаўскага тэатра.
4. Дзеці часта ўяўляюць сябе *(артысты).*
5. Захапленне новымі *(жанры)* спрыяе арыгінальнасці тэатра.
6. Гледачы з хваляваннем прыходзяць на сустрэчу з любімымі *(выканаўцы).*
7. Разам з іншымі *(наведнікі)* мы нецярпліва чакаем пачатку спектакля.

**449. Раскажыце пра сябе, выкарыстоўваючы ўзоры выказванняў.**

1. Я вялікі прыхільнік тэатра (тэатральнага мастацтва)
вялікая прыхільніца
Я з'яўляюся вялікім прыхільнікам … балета (балетнага мастацтва)
вялікай прыхільніцай … оперы (опернага мастацтва)
… жывапісу
… кіно (кінамастацтва)
… эстрады (эстраднага мастацтва)
… цырка (цыркавога мастацтва)
… мастацкай літаратуры
2. Я бываю ў тэатры (у кіно, у цырку) часта (амаль кожны тыдзень, месяц, рэдка, раз на год, на два гады).
3. Я не прапускаю ніводнай прэм'еры
пастаноўкі
ніводнага цікавага спектакля
4. Мяне мастацтва вельмі (надзвычай) цікавіць
не вельмі
зусім не
5. Асабліва мне падабаецца тэатр (опера, балет, кіно)
6. Мой любімы тэатр – Купалаўскі
Лялечны
Беларускай драматургіі
сучаснай інтэлектуальнай драмы
рэжысёр – Валерый Рубінчык (фільм "Культпаход у тэатр")
— Валерый Раеўскі (спектаклі "Страсці па Аўдзею" Уладзіміра Бутрамеева, "Князь Вітаўт" Аляксея Дударава)
— Мікалай Пінігін (спектаклі "Тутэйшыя" Янкі Купалы, "Ідылія" Вікенція Дуніна-Марцінкевіча)
балетмайстар – Валянцін Елізар'еў (балеты "Сатварэнне свету", "Карміна Бурана", "Тыль Уленшпігель", "Страсці" ("Рагнеда")
выканаўца – Генадзь Аўсяннікаў акцёры і актрысы Купалаўскага
Пётр Кармунін тэатра
Стэфанія Станюта
Зоя Белахвосцік
Кацярына Фадзеева балерыны, артысты балета
Таццяна Шаметавец
Уладзімір Далгіх
Валерый Захараў
мастак – Леанід Шчамялёў
Аляксей Марачкін
мастачка – Нінэль Шчасная
Таццяна Беразенская
Мой любімы аўтар – Янка Купала
Максім Багдановіч
Васіль Быкаў
7. Галоўную ролю ў гэтым спектаклі выконвае …
фільме
таленавіты (малады, перспектыўны, аўтарытэтны) акцёр…
таленавітая (маладая, перспектыўная, аўтарытэтная) актрыса…
Галоўнымі героямі ў гэтым творы з'яўляюцца…
8. П'еса выконваецца прафесійным тэатрам

самадзейным
прафесійнымі акцёрамі
самадзейнымі

9. Твор напісаны… прафесійным мастаком (кампазітарам, аўтарам, паэтам, празаікам,
самадзейным драматурнам)
…прафесійнай мастачкай (аўтаркай, паэткай)
самадзейнай

10. З творчасцю гэтага кампазітара можна пазнаёміцца…
паэта
мастака
рэжысёра
аўтара
… на фестывалі (мастацкіх калектываў,
прафесійных тэатраў,
"Беларуская музычная восень",
Адраджэнне беларускай капэлы)
… на мастацкай выставе
… на пленэры Марка Шагала ў Віцебску
Вітольда Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве

**450. Раскажыце, прыхільнікам якога мастацтва Вы з'яўляецеся. Пачніце фразай: *Я з'яўляюся вялікім прыхільнікам…***

**451. Назавіце вядомых мастакоў, празаікаў, драматургаў, паэтаў вашай краіны.**

**452. Назавіце найбольш вядомыя кінафільмы, створаныя ў Вашай краіне. Хто іх рэжысёр? Хто выконваў у іх галоўныя ролі?**

**453. Дапоўніце дыялогі.**

— Ты ведаеш, што сёння ў Оперным тэатры прэм'ера?
—…
— Як гэта не ведаеш? Не чытала сённяшнюю газету?
—…
— Тады трэба цікавіцца тэатральнымі афішамі.

## *ДЫЯЛОГІ*

— Сёння я даведаўся з тэатральнай афішы пра прэм'еру ў Оперным тэатры.
— Так, і я, праглядаючы сённяшнія газеты, заўважыў гэту інфармацыю
— Вы маеце на ўвазе балет "Страсці" ("Рагнеда") у пастаноўцы Валянціна Елізар'ева?
— Так. Трэба абавязкова паглядзець гэты спектакль.
— Згодны. Маеш рацыю.

— Ведаеш, я заўсёды, падыходзячы да тэатра, адчуваю незвычайнае хваляванне.

— Чаму? Ведаючы тваю прыхільнасць да мастацтва, ніколі не падумала б, што ты можаш хвалявацца.

— Так, я вялікі прыхільнік не толькі тэатра, але і балета, оперы, жывапісу, літаратуры. Мастацтва заўсёды хвалявала і будзе мяне хваляваць.

— Ты згодная, што звярнуўшыся да традыцый батлейкі, беларускага народнага лялечнага мастацтва, гэты рэжысёр стварыў надзвычай арыгінальны спектакль?

— Ты маеш на ўвазе рэжысёра Аляксея Ляляўскага?

— Так. Спектакль "Прывіды ў калядную ноч" ("Цар Ірад") па п'есе Г.Барышава, напісаную па матывах старадаўняга беларускага лялечнага тэатра батлейкі, што ідзе ў Дзяржаўным тэатры лялек.

— Улічваючы, што традыцыі, калі яны творча развіваюцца, заўсёды ў мастацтве даюць добры плён, цалкам з табой згодная.

**Перакажыце дыялогі ад імя 1-й асобы, ад імя 3-й асобы.**

**454. Закончыце сказы дыялогаў.**

— Праходзячы сёння ля тэатральнай афішы, я даведаўся пра…
— А я, праглядаючы газеты, заўважыў паведамленне пра…
— Ці паспеем мы на дзве прэм'еры?
— Безумоўна, …
— Тады трэба выбраць нешта адно.
— Добра памеркаваўшы, думаю, варта выбраць…
— Выбраўшы добрую п'есу, гэты рэжысёр паставіў вельмі ўдалы…
— І я лічу, паглядзеўшы некалькі рэжысёрскіх версій, гэту пастаноўку надзвычай… (Т.скл.).
— Добра, што ў нас адзінства ў поглядах.

***ГРАМАТЫКА***

## Дзеепрыслоўе

**Дзеепрыслоўе** – гэта нязменная форма дзеяслова, якая абазначае дадатковае дзеянне пры асноўным, выражаным дзеясловам. Дзеепрыслоўе адказвае на пытанні *што робячы? што зрабіўшы?*

| **Абазначае** | **Дадатковае дзеянне, адначасовае з асноўным** ***(што робячы?)*** | **Дадатковае дзеянне, што папярэднічае асноўнаму ці наступае за ім** ***(што зрабіўшы?)*** |
|---|---|---|
| **Утвараецца** | Дзеяслоў 1-й асобы цяп. часу + -учы (-ючы), -ачы (-ячы)<br><br>*суму**ю** – суму**ючы***<br>*бач**у** – бач**ачы*** | Інфінітыў + -ушы, -шы<br><br>*схаваць – схаваў**шы***<br>*выбраць – выбра**ўшы***<br>*заўважыць – заўважы**ўшы*** |
| | Сумуючы, ён не пераставаў пісаць. Бачачы прыгажосць, ён імкнуўся яе ўвасобіць у пейзажы. | Рэжысёр меў поспех, выбраўшы гэту п'есу.<br>Заўважыўшы афішу, ён падышоў да яе.<br>Мы перачакалі дождж, схаваўшыся ў альтанцы. |

**455. Утварыце ад дзеясловаў пры дапамозе ўказаных суфіксаў дзеепрыслоўі.**

**Узор:** ***зважаць / -ючы — зважаючы***

| | |
|---|---|
| заўважыць / -ўшы | напаткаць / -ўшы |
| іду / -учы | сцярпець / -ўшы |
| праходзіць / -ячы | ужываць / -ючы |
| выбіраць / -ючы | праглядаць / -ючы |
| выбраць / -ўшы | спёк / -шы |
| зважаць / -юч | спяваю / -ючы |

**456. Прачытайце беларускія прыказкі. Знайдзіце ў іх дзеепрыслоўі.**

1. Не скончыўшы адну работу, за другую не бярыся.
2. Умеючы, зрабіць нядоўга.
3. Умеючы, і мядзведзя навучыш танцаваць.
4. Нюхаючы, не пад'ясі.
5. Гуляючы, розуму не прыдбаеш.

**Ці ёсць прыказкі з падобным значэннем у вашай роднай мове? Назавіце іх, паспрабуйце даць іх пераклад на беларускую мову.**

***Выразы, якія вам могуць спатрэбіцца:***

Дакладней кажучы, …
Не зважаючы ні на што.
Паклаўшы руку на сэрца, …
Мяркуючы па словах аўтара, …

**457. Прачытайце. Утварыце сказы, дадаючы выразы са слупка.**

| | |
|---|---|
| **Узор:** ***Я,…, гэту п'есу ўспрымаю як эксперымент. — Я, дакладней кажучы, гэту п'есу ўспрымаю як эксперымент.*** | ***дакладней кажучы*** |

| | |
|---|---|
| 1. Выканаўца галоўнай ролі, …, яшчэ маладая актрыса.<br>2. Я павінен быў выконваць галоўную ролю, …, быў на яе запрошаны. | *дакладней кажучы* |
| 3. Я, …, усё ж такі стала актрысай.<br>4. Ён стаў мастаком, …<br>5. Ён, …, працягваў пісаць. | *не зважаючы ні на што* |
| 6. …, трэба прызнаць, што спектакль выдатны.<br>7. Мушу вам сказаць, …, што мастака з вас не будзе.<br>8. Вы скажыце ўсё як ёсць, … | *паклаўшы руку на сэрца* |
| 9. Галоўны герой, …, з'яўляецца адмоўным.<br>10. П'еса, …, напісана ў сінтэтычным жанры. | *мяркуючы па словах аўтара* |

**!** Мяркуючы па вашых словах
… словах аўтара (сведкі, прысутных)
… водгуках прэсы
… дасягненнях тэатра (акцёра, актрысы)

У сказе дзеепрыслоўе, якое абазначае дадатковае дзеянне, і дзеяслоў, які абазначае асноўнае дзеянне, павінны быць спалучаны з адным і тым жа суб'ектам дзеяння, ужытым у форме Н.скл.

| дзеепрыслоўе | суб'ект (Н.скл.) | дзеяслоў |
|---|---|---|
| *Не скончыўшы* адну работу, | *(ты)* | за другую *не бярыся.* |

**458. Дапоўніце сказы прыдатнымі дзеепрыслоўямі са слупка.**

**Узор:** ***Добра… цану капейцы, я працую аддана. —***
***Добра ведаючы цану капейцы, я працую аддана.***
***… Цяжкую працу, ён стаў спагадлівым да іншых. —***
***Зведаўшы цяжкую працу, ён стаў спагадлівым да іншых.***

***ведаючы***
***зведаўшы***

1. Ён стаіць, … у акно.
2. … у акно, ён заўважыў на вуліцы машыну.
3. … да тэатра, я заўсёды адчуваю хваляванне.
4. … да афішы, я ачуў хваляванне.
5. … ля тэатральнай касы знаёмую, я накіраваўся да яе.
6. Ён глядзеў спектакль, … усе дробязі.
7. Ён зараз плённа працуе, … адразу некалькі твораў.
8. Ён стаў знакамітым, … толькі адну п'есу.

*пазіраючы*
*паглядзеўшы*
*падыходзячы*
*падышоўшы*
*заўважыўшы*
*заўважаючы*
*пішучы*
*напісаўшы*

**!** У сказах з дзеепрыслоўямі пры немагчымасці ўжыць суб'ект дзеяння ў Н.скл. дзеяслоў у форме інфінітыва павінен спалучацца са словамі *трэба, варта, неабходна, хочацца.*

*(мне)* аналізуючы п'есу, *неабходна адзначыць…*
гаворачы пра аўтара, *трэба спыніцца* на…
ацэньваючы пастаноўку, *варта падкрэсліць…*
слухаючы гэту актрысу, *хочацца сказаць…*

**459. Дапоўніце сказы дзеясловамі ў прыдатнай форме.**

**Узор:** ***Гаворачы пра тэатр,варта… яго майстроў. —***
***Гаворачы пра тэатр, варта ўспомніць яго майстроў.***

***успамінаю***
***успомніць***

1. Аналізуючы пастаноўку, хочацца… на рэжысёрскіх знаходках. — *спыняюся / спыніцца*
2. Гаворачы пра мастацтва, нельга не… пра балет. — *успамінаю / успомніць*
3. Звяртаючыся да класікі, неабходна… пра традыцыі. — *памятаць / памятаю*
4. Выконваючы гэту ролю, варта… вопыт папярэднікаў. — *ведаю / ведаць*
5. Выбіраючы рэпертуар, трэба… свае здольнасці. — *улічваю / улічваць*

## *ДЫЯЛОГІ*

— Ты часта ходзіш у тэатр?
— Мне няма з кім хадзіць, а адна я не хачу.
— Дазволь мне запрасіць цябе ў тэатр.
— Дзякую. Пайду з табой з задавальненнем.

— Ты ідзеш сёння на эстрадны канцэрт?
— Мне няма як на яго трапіць. Усе білеты прададзены.
— Ну тады пойдзем разам. У мяне ёсць яшчэ адзін білет.
— Вялікі дзякуй.

— Што ты сумуеш?
— Мне няма што рабіць.
— Тады я запрашаю цябе на выставу жывапісу.
— Дзякуй, пайду з табой з задавальненнем.

**460. Складзіце дыялогі ў наступных сітуацыях:**
**а) Запрасіце сябра ў тэатр.**
**б) Прапануйце яму білет на прэм'еру.**

***ГРАМАТЫКА***

**Выражэнне адмоўя словам *няма***

у беларускай мове з'яўляецца характэрнай асаблівасцю пры спалучэнні з займеннікамі *(няма ў чым, няма каму, няма што…)* і прыслоўямі *(няма як, няма куды, няма адкуль)*. У сказе суб'ект абазначаецца формай ускоснага склону.

**1. Няма + займеннік *чым, каму, што,* прыслоўе *як, куды, адкуль* + інфінітыў**

| | |
|---|---|
| **Мне *няма як* дабрацца дадому.**<br>**Дзяўчыне *няма што* рабіць.**<br>**Дзяўчыне рабіць *няма што*.**<br>***Няма што* рабіць дзяўчыне.**<br>***Няма што* дзяўчыне рабіць.** | Інтанацыяй падкрэсліваецца апошняе слова |

**2. Няма + назоўнік**

**У мяне *няма дзяцей* = Я не маю дзяцей**

**461. Устаўце ў сказы інфінітывы са слупка і слова *няма*.**
**Узор: *Мне … каму … .*** — ***пісаць***
***Мне няма каму пісаць.***

| | |
|---|---|
| 1. Ёй… што… | *апрануць* |
| 2. Нам… што і … | *казаць* |
| 3. Рэжысёру… як… рэпетыцыю. | *праводзіць* |
| 4. … пра што і… | *гаварыць* |
| 5. … чаго вам… | *рабіць* |

**Народныя выразы:**

Няма ладу дзе
Няма ладу калі
Няма ладу колькі
Няма ладу яго
Няма як

***ТЭКСТ***

## Тэатральная Беларусь

Няма сумнення, што тэатр на Беларусі з'яўляецца адным з найбольш старажытных відаў мастацтва. І гэтаму спрыялі дзве асноўныя акалічнасці. Па-першае, беларус па сваёй прыродзе вельмі тэатральны чалавек, які здольны пра падзеі, учынкі людзей не толькі маляўніча расказаць, а і вобразна іх паказаць, разыграць, скарыстоўваючы багатую міміку, тэмперамент, імправізацыйны дар. Яшчэ і цяпер, у наш цывілізавана-рацыянальны час, можна нямала сустрэць, асабліва ў вёсках, мястэчках, ды і гарадах таксама, народных ад прыроды ўмельцаў, якія таленавіта, з бляскам, як няма чаго рабіць, могуць увасобіць і камічныя, і трагічныя сцэнкі.

Другая прычына – геаграфічнае размяшчэнне Рэспублікі Беларусь, якая знаходзіцца якраз у самым цэнтры Еўропы. Праз яе пралягаюць магістральныя дарогі ў заходнія, усходнія, паўднёвыя, паўночныя краіны. На працягу доўгай гісторыі —разам са шматлікімі войнамі, якія рэдка абміналі Беларусь, разам з рабаваннем і знішчэннем насельніцтва чужынцамі – на нашу зямлю дзьмулі і дабратворныя вятры, найперш звязаныя з культурнымі хвалямі.

Першымі беларускімі прафесійнымі акцёрамі былі скамарохі, якія да XI стагоддзя называліся па-рознаму – гудцы, плясцы і інш. У іх творчасці сінтэзаваліся ўсе віды сцэнічнага мастацтва – драматычнае, музычнае, вакальнае, танцавальнае, цыркавое, этраднае. Гэтыя традыцыі ў розных формах фальклорнага тэатра дажылі да XX стагоддзя.

У тэатральных працэсах на Беларусі няма адрознення ад Заходняй Еўропы. З XVI стагоддзя шырокае распаўсюджанне атрымаў школьны тэатр. Для яго былі створаны высокія па тым часе ўзоры драматургіі Сімяонам Полацкім (пераехаўшы ў Маскву, гэты беларускі асветнік заснаваў рускі школьны тэатр), Каэтанам Марашэўскім, Міхаілам Цяцерскім.

У XVIII стагоддзі сталі ўтварацца прыватныя гарадскія і маёнткавыя тэатры. 13 чэрвеня 1746 года ў Альбе пад Нясвіжам была сыграна камедыя Уршулі Радзівіл "Дасціпнае каханне". Працавалі калектывы ў Нясвіжы, Слуцку, Слоніме, Гродне, Шклове, Магілёве, Глуску, Чачэрску і ў шэрагу іншых гарадоў і мястэчак. У Беларусі меліся свае тэатральныя школы, дзе высокія еўрапейскія майстры рыхтавалі салістаў оперы, балета, акцёраў драмы, музыкантаў.

Яшчэ большай папулярнасцю і любоўю карыстаўся народны лялечны тэатр батлейка, вядомы з XVI стагоддзя. Падобны да батлейкі тэатр апісвае яшчэ Герадот. Лялькі-персанажы і скрынка-сцэна рабіліся з дрэва. Рэпертуар батлейкі складаўся звычайна з дзвюх частак: кананічнай (рэлігійнай) і свецкай (народна-бытавой). Да традыцыі батлейкі актыўна звяртаюцца сённяшнія самадзейныя і прафесійныя калектывы. Вышэйшым дасягненнем фальклорнага тэатра стала народная драма. Нешматлікая на кананічныя сюжэты, яна таксама, як і батлейка, багатая і яркая на інтэрмедыйныя народныя сцэны.

Цяпер на Беларусі працуе 27 прафесійных тэатраў.

(Паводле А.Сабалеўскага)

**Каментарый:**

***як няма чаго рабіць*** – лёгка, без намаганняў

**462. Адкажыце на пытанні:**

1. Якія дзве акалічнасці вызначаюць старажытныя традыцыі тэатра на Беларусі?
2. Хто былі першыя прафесійныя акцёры на Беларусі?
3. Якія віды сцэнічнага мастацтва сінтэзаваліся ў іх творчасці?
4. Якім чынам развіваліся ў Беларусі тэатральныя працэсы?
5. З якога часу атрымаў распаўсюджанне школьны тэатр?
6. Хто пісаў для школьнага тэатра п'есы?
7. Якія тэатры сталі ўтварацца ў XVIII стагоддзі?
8. Ці меліся ў Беларусі свае тэатральныя школы?
9. Якія жанры мелі папулярнасць у народзе?
10. Колькі сёння тэатраў на Беларусі?

**463. Дапоўніце сказы словамі з тэксту.**

Беларус па сваёй прыродзе вельмі… чалавек. Ён здольны пра падзеі, учынкі людзей не толькі… расказаць, а і… іх паказаць, разыграць, скарыстоўваючы… міміку, тэмперамент, … дар.

**Якія яшчэ словы можна выкарыстаць у тэксце? Перакажыце яго.**

**464. Дапоўніце сказы па тэксту.**

1. Скамарохі былі *першымі…*
2. Высокія па тым часе ўзоры драматургіі былі створаны *Сімяонам…*
3. Лялечны тэатр батлейка карыстаўся яшчэ *большай…*
4. Народная драма стала *вышэйшым…*

**Якія ўжытыя вамі словы, акрамя вылучаных, таксама маюць форму Тв. склона (адзіночнага і множнага ліку)?**

***ТЭКСТ***

**У падмурку беларускай драматургіі**

Самай буйной і магутнай постаццю ў беларускім сцэнічным мастацтве першай паловы XIX стагоддзя лічыцца Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Менавіта яму было наканавана закладваць падмурак беларускай драматургіі. Працаваць на ніве роднай культуры, арганізоўваць беларускі тэатр – задача па тым часе неймаверна цяжкая. І ўсё ж Дунін-Марцінкевіч выбірае гэты складаны шлях. Ён аб'ядноўвае вакол сябе тых, хто верыў у яго тэатральныя пачынанні і стаў памочнікам і паплечнікам.

Тэатр выступаў пераважна ў фальварку Дуніна-Марцінкевіча – Люцынка, у Мінску, Бабруйску, Глуску… Выступленні прымяркоўваліся да свят і ўрачыстасцей, для чаго драматург спецыяльна пісаў новую п'есу.

У літаратурна-тэатральным гуртку Дуніна-Марцінкевіча было больш за 20 чалавек (не лічачы ўдзельнікаў хора). Сярод іх вельмі здольныя акцёры Авяр'ян Васільеў і Ляўданскі, а таксама дочкі Дуніна-Марцінкевіча Каміля, Цэзарына, Эладыя і сын Міраслаў.

9 лютага 1852 года на сцэне Мінскага гарадскога тэатра самадзейным калектывам пад кіраўніцтвам аўтара Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча была ажыццёўлена пастаноўка камічнай оперы "Сялянка", музыку да якой напісалі Станіслаў Манюшка і К.Кжыжаноўскі. Гэтая пастаноўка знаменавала пачатак сучаснага нацыянальнага тэатра. Зноў, як некалі ў школьнай драме XVIII стагоддзя, загучала з тэатральных падмосткаў беларуская мова. Спектакль адбыўся пры перапоўненай зале і прайшоў з небывалым уздымам.

Нягледзячы на поспех, улады забаранілі пастаноўку беларускай оперы. Яе і іншыя п'есы сталі паказваць тайна, на прыватных сцэнах.

Зараз "Сялянка" пад назвай "Ідылія" з'яўляецца адной з самых яркіх пастановак Купалаўскага тэатра.

**465. Адкажыце на пытанні:**

1. Хто закладаў падмурак беларускай драматургіі?
2. Дзе выступаў тэатр?
3. Колькі людзей было ў літаратурна-тэатральным гуртку Дуніна-Марцінкевіча?
4. Ці ўдзельнічалі ў пастаноўках дзеці Дуніна-Марцінкевіча? Як іх звалі?
5. Калі і дзе адбылася прэм'ера оперы "Сялянка"?
6. Як прайшоў спектакль?
7. Які быў лёс спектакля?

**466. Перавядзіце тэкст у дыялог.**

! Нягледзячы на поспех, спектакль… = не ўлічваючы
цяжкасці
добрыя рэцэнзіі

Не гледзячы на сябра = не пазіраючы
рэжысёра
сцэну

**467. Пастаўце ў сказы прыдатныя словы са слупка.**

| | |
|---|---|
| 1. Нягледзячы на вялікі…, улады забаранілі пастаноўку. | *цяжкасці* |
| 2. Нягледзячы на пэўныя…, спектакль усё ж быў пастаўлены. | *поспех* |
| 3. Не гледзячы на…, ён адчуваў сваё адзінства з ёй. | *занятасць* |
| 4. Не гледзячы ні…, яна з годнасцю падымалася на сцэну. | *залу* |
| 5. Нягледзячы на сваю…, аўтар усё ж закончыў п'есу. | *на кога* |
| 6. Не гледзячы на…, ён сэрцам адчуваў жаль расстання. | *яе* |
| 7. Нам трэба закончыць працу, нягледзячы ні на якую… | *перашкоду* |

**468. Устаўце прыметнікі, ужытыя ў тэксце.**

1. Самай … і … постаццю ў … … мастацтве першай паловы XIX ст. лічыцца Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.
2. Арганізоўваць … тэатр – задача…
3. І ўсё ж Дунін-Марцінкевіч выбірае гэты … шлях.
4. Ён аб'ядноўвае вакол сябе тых, хто верыў у яго … пачынанні.
5. У … гуртку Дуніна-Марцінкевіча было больш за 20 акцёраў.
6. Пастаноўка "Сялянкі" знаменавала пачатак … … тэатра.
7. Пасля забароны "Сялянку" паказвалі на … сцэнах.

! Не лічачы *каго?* У пастаноўцы ўдзельнічала пяць асоб, *не лічачы* рэжысёра.
*чаго?* Мастак напісаў 10 пейзажаў, *не лічачы* эцюдаў.

**Дзеепрыслоўе з залежнымі словамі** ўтварае **дзеепрыслоўны зварот**, які суадносіцца з залежным сказам.

*Сярод прысутных, калі не лічыць дзяцей, можна заўважыць прадстаўнікоў старэйшага пакалення. = Сярод прысутных, не лічачы дзяцей, можна заўважыць прадстаўнікоў старэйшага пакалення.*

**469. Трансфармуйце дадзены сказ у дзеепрыслоўны зварот.**

**Узор:** ***Усе ўдзельнікі выставы, калі не лічыць маладых аўтараў, добра вядомыя грамадскасці. — Усе ўдзельнікі выставы, не лічачы маладых аўтараў, добра вядомыя грамадскасці.***

1. Мы, калі не гаварыць пра іншых жыхароў дома, з вялікай увагай ставімся да дзяцей.
2. Выставу праводзяць маладыя мастакі, калі не лічыць яе спонсара.
3. Калі не браць пад увагу самадзейныя тэатры, трэба падкрэсліць, што на Беларусі працуе 27 тэатральных калектываў.
4. Найбольш складаным падаецца мастацтва балета, калі не лічыць музыкі.
5. Кожнае мастацтва, калі не лічыць здольнасцей, патрабуе вялікай руплівасці.

***ГРАМАТЫКА***

**Адносіны спосабу дзеяння**

абазначаюць, *якім чынам* адбываецца дзеянне, раскрываюць *спосаб* ажыццяўлення дзеяння.

Перадаецца злучнікамі *як, нібы, быццам, што*. У галоўнай частцы складанага сказа можа ўжывацца часціца *так*.

| | | |
|---|---|---|
| **як** | Дзень прайшоў не **так, як** ёй хацелася. | *як* – указвае на меркаванае дзеянне |
| **нібы** | Мы трымаліся **так, нібы** нічога не было. | *нібы* – указвае на дзеянне, якое падмяняе сапраўднае |
| **быццам** | Людзі замітусіліся, **быццам** неспадзеўку пачулі трэці званок. | *быццам* – указвае на спосаб дзеяння па асацыяцыі |
| **каб** | Дом пабудаваны **так, каб** усім было ўтульна. | *каб* – указвае на мэту дзеяння |
| **што** | Ліло **так, што** вуліцы затапіла вадой. | *што* – указвае на вынік дзеяння |
| **аж** | Герой спяваў **так** кранальна, **аж** нам стала не па сабе. | *аж* – указвае на вынік дзеяння |

**470. Утварыце сказы з залежнымі часткамі спосабу дзеяння.**

**Узор:** ***Сталася так, як мы і чакалі.***

| | |
|---|---|
| 1. Сталася так, | … што яе голас лунаў над залай. |
| 2. Артысты гралі так, | … як мы і чакалі. |
| 3. Актрыса так спявала, | … быццам у яго заставаўся адзін дзень. |
| 4. Мастак працаваў так, | …нібы з імі нічога не здарылася. |
| 5. Рэжысёр так працуе з акцёрамі, | … як ніхто іншы да яго. |

***ТЭКСТ***

**"Дзікае паляванне караля Стаха"**

Прэм'ера оперы "Дзікае паляванне караля Стаха" адбылася 6 сакавіка 1989 г. у Мінску. Развіваючы лепшыя традыцыі беларускага мастацтва, кампазітар Уладзімір Солтан напісаў сучасную оперу на аснове народных паданняў.

Знамянальны сам зварот да аднайменнай аповесці Уладзіміра Караткевіча (1930-1984) – пісьменніка, якога актыўна чытаюць і глыбока шануюць. У яго творы за авантурнай інтрыгай пра таямнічае паляванне, што з'яўляецца, каб адпомсціць за здраду, схаваныя думкі пра беларускі народ, яго гісторыю. "Я … шукаў свой народ, -- гаворыць галоўны герой аповесці этнограф-фальклярыст Андрэй Беларэцкі, -- і пачынаў разумець, як многія ў той час, што ён тут, побач… І паўсюль … я бачыў гора народа майго, даражэй за які – я зараз ведаю гэта – у мяне не было нічога на свеце".

Аповесць Уладзіміра Караткевіча рамантычная. Яна музычная ў сваёй аснове. Чытач міжволі ўнутраным слыхам успрымае гучанне дзікага палявання, ад якога дрыжыць зямля і халодным страхам скоўваюцца сэрцы герояў.

Музыка нібы "зыходзіць" і ад галоўнага героя – фалькларыста Беларэцкага, і ад прыроды, што акаляе палац.

Жанр оперы вызначаны Уладзімірам Солтанам як лірыка-драматычная аповесць. Жанравы сінтэз вынікае са спалучэння рамантычнага пачатку і традыцый эпічнай оперы.

Вялікую вобразна-псіхалагічную ролю адыгрывае ў оперы аркестр. Музыка выступае як элемент дзеі. Гэта перш за ўсё выяўляецца ў тэме дзікага палявання. Вось як яно апісана ў Караткевіча:

"З боку пушчы па пустках рухалася нейкая цёмная маса, даволі вялікая і рухавая. Я доўгі час не мог здагадацца, што гэта такое. Пасля пачуў я дробны і роўны пошчак капыт. Шамацеў верас. Пасля ўсё знікла, маса, відаць апусцілася ў нейкую лагчыну, а калі з'явілася зноў – пошчак змоўк. Яна мчалася бязгучна, быццам плыла ў паветры, рабілася ўсё бліжэй і бліжэй… Яшчэ хвіліна, і я аж падаўся наперад. У хвалях слабага празрыстага туману ясна вымалёўваліся сілуэты коннікаў, якія імчалі шалёным намётам, аж конскія грывы веялі па ветры. Я пачаў лічыць іх і налічыў дваццаць. Дваццаць першы скакаў наперадзе. Я яшчэ

сумняваўся, калі вецер прынёс аднекуль далёкі водгук паляўнічага рога. Халодны сухі мароз прайшоў па маёй спіне.

Цьмяныя цені коннікаў беглі наўскос да дрыгвяністай лагчыны. Веялі па ветры плашчы, коннікі прама, як лялькі, сядзелі ў сядле, і ніводны гук не далятаў адтуль. Менавіта ў гэтым маўчанні і было самае жахлівае…

Дзікі верас спяваў пад іх нагамі".

Сам кампазітар падкрэслівае: "Да аповесці Караткевіча я стаўлюся з вялікай павагай, гэта мой самы любімы твор. Колькі думак і музычных інтанацый узнікла пасля яе прачытання!"

Опера У.Солтана стала сімвалам духоўнага жыцця беларусаў.

(Паводле Святланы Лабанавай)

**Каментарый:**

***намётам*** – хуткі спецыфічны ход каня

**471. Адкажыце на пытанні:**

1. Калі адбылася прэм'ера оперы "Дзікае паляванне караля Стаха"?
2. За што шануюць Уладзіміра Караткевіча?
3. Што гаворыць галоўны герой аповесці?
4. Якім чынам Уладзімір Солтыс вызначыў жанр оперы?
5. Якую ролю адыгрывае ў оперы аркестр?
6. Як ставіцца кампазітар да аповесці У.Караткевіча?
7. Сімвалам чаго стала опера?

**472. У апісанне дзікага палявання дадайце прыметнікі з тэксту.**

Пасля пачуў я … і … пошчак капыт. У хвалях … … туману ясна вымалёўваліся сілуэты коннікаў, якія імчалі … намётам, аж конскія грывы веялі на ветры. Я яшчэ сумняваўся, калі вецер прынёс аднекуль … водгук … рога. … … мароз прайшоў па скуры.

**473. Знайдзіце і прачытайце сказы з залежнымі часткамі спосабу дзеяння.**

***ТЭКСТ***

**Як белая птушка …**

Пры набліжэнні да Спаса-Ефрасіньеўскага манастыра ў Полацку паступова сціхае людская гамонка, шум гарадскога транспарту. Тут захавалася адзіная на Беларусі дзеючая царква XII стагоддзя.

"І потым святая Еўфрасіння заклала царкву каменну Святога Спаса. Ад пачатку і да завяршэння за 30 тыдняў", — так апавядае жыціе Ефрасінні Полацкай. Дойлід Іаан зрабіў нешта неверагоднае. Храм паўстаў не толькі хутка. Сваімі абрысамі, стромкай, узнёслай кампазіцыяй ён быў непадобны ні на адзін храм ва ўсёй Усходняй Еўропе. Разам з тым ён быў невялікі – усяго 8*12 метраў, вось чаму і сёння з'яўляецца жаданне "паставіць царкву на далонь". Новыя архітэктурныя і дэкаратыўныя прыёмы, якія ўжыў дойлід у спасаўскім храме, пачалі распаўсюджвацца і на Усход, і на Захад: Смаленск, Масква, Гародня. Вучоныя назвалі яго вяршыняй архітэктурнай думкі Полацка. Па праву можна сказаць – усёй Беларусі.

На працягу аднаго толькі XII стагоддзя ў старажытнай сталіцы княства паўстала дзевяць цэркваў. Да трох з іх прычыніўся Іаан. Сярод згаданых храмаў стаяў у горадзе адзін, так званы "трыконх". Гэтага тыпу храмы былі шырока распаўсюджаны на Балканах – Балгарыя, Сербія, Харватыя. А Спаса-Ефрасіньеўская царква архітэктурай нагадвае вешчуна-бусла, які ўказаў адной з манашак у яе сне месца будаўніцтва храма.

Мінулі стагоддзі. Царква Спаса, як і Сафійскі сабор, змяніла свой знешні выгляд. Але яе ўнутраная прастора засталася ранейшай. Тыя ж сцены, скляпенні, падпорныя слупы, што трымаюць высока ўзнятую галаву-барабан. Наверсе келля, у якой малілася Ефрасіння, і другая келля, яе сястры Гарыславы. Пад шматлікімі напластаваннямі позніх запісаў і

афарбоўкі захаваліся тут першапачатковыя фрэскі XII стагоддзя. Сёння іх вядома дзевяць, але кожны год пад асцярожнымі рукамі рэстаўратараў з'яўляюцца ўсё новыя і новыя лікі святых. Яны паглядаюць на нас, людзей XX стагоддзя, пільнымі, пранізлівымі позіркамі. Шчыльна сцятыя вусны маўчаць. Затое гавораць вочы.

Цяжка знайсці мастацкі вобраз, з якім можна было б параўнаць хараство і прыгажосць гэтага твора старажытных полацкіх дойлідаў – страйнюткага белага і гожага, як той бусел. Гэта – і белая птушка над Палатою, і жамчужына, і застылая ў камені песня, што лунае на прасторы вось ужо болей за 800 год…

(Паводле С.Тарасава)

**Каментарый:**

***8*12 метраў*** **–** восем на дванаццаць

**474. Адкажыце на пытанні:**

1. Дзе на Беларусі захавалася адзіная дзеючая царква XII стагоддзя?
2. Колькі часу спатрэбілася дойліду Іаану на пабудову храма?
3. Якія памеры храма?
4. Куды пачалі распаўсюджвацца новыя архітэктурныя і дэкаратыўныя прыёмы, ужытыя Іаанам?
5. Што нагадвае царква?
6. Што захавалася ў царкве ад даўніх часоў?
7. З чым параўноўваюць царкву?

**475. Прачытайце. Замяніце ў залежным сказе злучнік.**

**Узор:** ***Царква была пабудавана так, што нагадвала бусла.*** | ***каб***

***Царква была пабудавана так, каб нагадвала бусла.***

| | |
|---|---|
| 1. Іаан працаваў так хутка, што праз 30 тыдняў царква была закончана. | *каб* |
| 2. Царква выглядала так, нібы на зямлю апусцілася белая птушка. | *быццам* |
| 3. Царква выглядала так прыгожа, што Ефрасіння залюбавалася. | *аж* |

## X. БЕЛАРУСКІЯ СВЯТЫ, АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ

| | |
|---|---|
| святкаваць (што?)<br>адсвяткаваць<br>праўляць (што?)<br>справіць | свята<br>дзень нараджэння<br>вяселле<br>юбілей |
| адзначаць (што?)<br>адзначыць | Каляды<br>Новы год<br>Вялікдзень |
| рыхтавацца (да чаго?)<br>падрыхтавацца<br>ладзіцца (да чаго?) | да свята<br>да Новага года<br>да Каляд |
| запрашаць (каго?)<br>запрасіць | гасцей<br>сяброў<br>родных<br>сваякоў<br>знаёмых |
| ісці | у госці |

пайсці (куды?) на свята
завітаць

са святам
з Калядамі
віншаваць (з чым?) з Новым годам
павіншаваць з Вялікаднем
з днём нараджэння
з вяселлем
з юбілеем

| Беларускія традыцыйныя святы | Беларускія грамадзянскія святы |
|---|---|
| Новы год *(1 студзеня)* | |
| Каляды *(25 снежня, 7 студзеня)* | Дзень жанчын *(8 сакавіка)* |
| Вялікдзень | Дзень Працы *(1 мая)* |
| Купалле | Дзень Перамогі *(9 мая)* |
| Дзяды | Дзень Незалежнасці (Дзень Рэспублікі) *(3 ліпеня)* |

**476. Устаўце дзеясловы замест кропак. Выкарыстайце словы для даведак.**

1. На дзень нараджэння я ... шмат гасцей.
2. Калі беларусы ... Вялікдзень?
3. Заўтра Алесь ... Марыю з днём нараджэння.
4. Учора мы ... ў госці.
5. Ці ... вы да Калядаў?

*Словы для даведак*: адзначаць, запрашаць, падрыхтавацца, пайсці, павіншаваць.

**477. Дапоўніце сказы прыдатнымі словамі, пададзенымі ў дужках.**

1. Алесь быў (запрасіць, завітаць, адзначаць) на дзень нараджэння да свайго сябра Андрэя.
2. Міхась добра (святкаваць, рыхтавацца, віншаваць) да свята.
3. Таццяна (пайсці, віншаваць, спраўляць) сяброўку з Новым годам.
4. Новы год мы (адзначаць, святкаваць, віншаваць) 1 студзеня.

***ТЭКСТ***

**Любімае свята**

Самае любімае свята дзяцей і дарослых – Новы год. Адзначаюць яго з вечара 31 снежня па 1 студзеня.

Навагоднія ўрачыстасці маюць на Беларусі сваю гісторыю. Да 16 стагоддзя беларусы святкавалі новы год вясной, калі абуджалася зямля. Пачатак вясны пачынаў і земляробчы год селяніна. Старажытныя навагоднія рытуалы працягваліся больш за месяц.

Каля двух стагоддзяў таму з'явіўся звычай ставіць навагоднюю ёлку. Яе ўпрыгожваюць цацкамі, гірляндамі, свечкамі, ватай, дожджыкам з бліскучай фальгі або цэлафана. Ёлка сімвалізуе вечнае жыццё, яго бясконцасць і неўміручасць. Самыя жаданыя госці на навагоднім свяце – Дзед Мароз і Снягурка.

Новы год – свята сямейнае. Бліжэй да поўначы за святочны стол збіраецца ўся сям'я. Першыя тосты звернуты да года мінулага. Як толькі гадзіннік праб'е дванаццаць, падымаюць келіхі “за Новы год”. Усю навагоднюю ноч гарыць святло, гучыць вясёлая музыка. Людзі не толькі віншуюць адзін аднаго з Новым годам, але

і абменьваюцца падарункамі. Для дзяцей пад ёлку ў навагоднюю ноч кладуць цукеркі, лялькі, цацкі, якія нібыта прыносіць Дзед Мароз.

У першы дзень новага года запрашаюць у госці сваякоў, сяброў або ходзяць самі да іх павіншаваць з Новым годам. Усе спадзяюцца, што новы год будзе лепшы за мінулы.

**478. Адкажыце на пытанні:**

1. Якое свята самае любімае для дзяцей і дарослых?
2. Калі адзначаюць свята Новага года?
3. Ці заўсёды на Беларусі сустракалі Новы год зімой?
4. Да чаго прымяркоўвалі старажытныя навагоднія святы?
5. Калі на Беларусі пашырыўся звычай ставіць навагоднюю ёлку?
6. Чым упрыгожваюць ёлку?
7. Што сімвалізуе навагодняя ёлка?
8. Да чаго звернуты першыя тосты?
9. Як віншуюць з Новым годам дзяцей?
10. Каго запрашаюць у госці ў першы дзень новага года?

**479. Закончыце сказы.**

1. Самае любімае свята дзяцей і дарослых – ...
2. Свята Новага года адзначаюць...
3. Навагодняя ёлка сімвалізуе...
4. Самыя жаданыя госці на навагоднім свяце – ...
5. За святочны стол збіраецца...
6. Як толькі гадзіннік праб′е дванаццаць...
7. У першы дзень новага года запрашаюць у госці...
8. Усе спадзяюцца, што...

**480. Вызначце, ці сапраўдныя наступныя сцверджанні (адкажыце: так / не).**

1. Да 16 стагоддзя беларусы святкавалі новы год летам.
2. Старажытныя навагоднія рытуалы працягваліся больш за месяц.
3. Навагодняя ёлка сімвалізуе пачатак зімы.
4. Новы год – свята сямейнае.
5. Усю навагоднюю ноч гарыць святло, гучыць вясёлая музыка.

**481. Раскажыце, што вы даведаліся пра святкаванне Новага года ў Беларусі.**

**482. Раскажыце, як у вашай краіне адзначаецца свята Новага года.**

**483. Прачытайце і перакажыце жарт. Як вы яго зразумелі?**

– Прывітанне, Алесь! Чаму ты такі сумны?
– Не ведаю, што падарыць жонцы на Новы год...
– Дык пацікаўся ў жонкі, што б яна хацела атрымаць у падарунак.
– А дзе ж я знайду столькі грошай?

**484. Прачытайце.**

* На Новы рок прыбудзе дня на зайчын скок.
* На Новы год ясна – будзе ў гумне цясна.

* * *

Навагоднія традыцыі забараняюць:

*  спаць у навагодні вечар (бо будзеш хадзіць сонны ўвесь год);

*  сустракаць Новы год, не вярнуўшы каму-небудзь пазыку (бо цэлы год будзеш мецць справу з даўгамі);

* * *

Да навагодняга вечара трэба абавязкова памірыцца з тым, каго ты пакрыўдзіў ці абразіў, бо ў новым годзе ад цябе “адвернуцца” многія з тваіх блізкіх і знаёмых.

**485. Якія народныя прыкметы, звязаныя са святкаваннем Новага года ў вашай краіне, вы ведаеце?**

*ГРАМАТЫКА*

**Зборныя лічэбнікі абодва, абедзве**

| *Склон* | *Мужчынскі і ніякі род (цвёрдая аснова)* | *Жаночы род (мяккая аснова)* |
|---|---|---|
| Н. | абодва вучні, палі | абедзве сцежкі |
| Р. | абодвух вучняў, палёў | абедзвюх сцежак |
| Д. | абодвум вучням, палям | абедзвюм сцежкам |
| В. | = Н. (= Р.) | = Н. (= Р.) |
| Т. | абодвума вучнямі, палямі | абедзвюма сцежкамі |
| М. | (пры) абодвух вучнях, палях | (пры) абедзвюх сцежках |

**486. Складзіце словазлучэнні па схеме *абодва / абедзве* + *назоўнік* з наступнымі словамі:**

Сшытак, вучаніца, стол, рака, возера, сястра, артыкул, прадпрыемства, настаўнік, жанчына.

**487. Прачытайце сказы. Замест кропак устаўце зборныя лічэбнікі *абодва / абедзве* ў належнай форме.**

1. ... вёскі былі разлучаны разводдзем.
2. Нас чакалі ... сябры.
3. На ... дрэвах схаваліся буслянкі.
4. ... дзяўчынкі засмяяліся.
5. Былі ў яго два сыны, і ... не вярнуліся з вайны.

*ТЭКСТ*

**Беларускія святы**

Беларускія святочныя звычаі і абрады ідуць з глыбокай старажытнасці. Вельмі пашыранымі былі земляробчыя святы. Яны перадаваліся з пакалення ў пакаленне.

Самае старажытнае веснавое свята – *гуканне вясны*. У дахрысціянскія часы яно адзначалася 1 сакавіка. Вясеннія святкаванні пачыналіся з рытуалу спальвання зімы. На высокіх пагорках моладзь разводзіла агні, на якіх палілі зношанае адзенне і абутак, розныя непрыдатныя ў хатнім ужытку рэчы. Штогод адзначаецца *Дабравесце*. Праваслаўныя беларусы святкуюць яго 7 красавіка, а каталікі – 25 красавіка. “На Дабравесце дзяўчына касу не пляце, птушка гнязда не ўе, курыца яйкі не нясе”, – гавораць у народзе, надаючы гэтаму святу асаблівую павагу і набожнасць. Галоўнае хрысціянскае свята ўваскрэсення распятага Хрыста – *Вялікдзень*. Яго сустракаюць вельмі ўрачыста. Гатуюць багата смачных страў, фарбуюць яйкі, гуляюць імі ў біткі.

На пачатку лета спраўляюць *Сёмуху*. Услаўляецца культ зеляніны, шлюбу і продкаў. Летняе свята *Купалле* сімвалізуе сонца і яго жыццёвую сілу. На ўзлеску, паляне, рачным беразе раскладваецца купальскае вогнішча. На Купалле водзяць

карагоды, скачуць цераз агонь, купаюцца. У лістападзе адзначаецца дзень памяці продкаў – *Дзяды*. Зімою святкуюць *Каляды*. Гэтае свята на Беларусі адзначаецца двойчы: 25 снежня па каталіцкім календары і 7 студзеня па праваслаўным. Абавязковай каляднай стравай лічыцца куцця – ячная каша. У святочныя дні па хатах ходзяць калядоўшчыкі, якія выконваюць велічальныя песні. На Каляды ладзяцца шматлікія забавы і гульні.

Беларускія святы – люстэрка духоўнага жыцця нацыі, багатая крыніца вопыту продкаў, народнай творчасці і мудрасці.

**488. Адкажыце на пытанні:**

1. Калі ўзніклі беларускія святочныя звычаі і абрады? – (у нашым стагоддзі, у глыбокай старажытнасці, нядаўна).
2. Якія беларускія святы вы ведаеце?
3. Якое свята адзначалася вясной самым першым? – (Сёмуха, Каляды, гуканне вясны).
4. Што сімвалізуе свята Купалле? – (сямейны дабрабыт, добры ўраджай, сонца і яго жыццёвую сілу).
5. Калі беларусы святкуюць Каляды? – (вясною, летам, зімою).

**489. Закончыце сказы.**

1. На Вялікдзень гатуюць...
2. На пачатку лета спраўляюць...
3. Купалле сімвалізуе...
4. У лістападзе адзначаецца дзень памяці продкаў, які меў назву...
5. Зімою святкуюць...
6. У дахрысціянскія часы гуканне вясны адзначалася...
7. Вясеннія святкаванні пачыналіся з...
8. Абавязковай стравай на Каляды лічыцца...
9. 7 студзеня беларусы святкуюць..., а 25 снежня адзначаюцца...
10. 8 сакавіка – ...

**490. Вызначце, ці сапраўдныя наступныя сцверджанні (адкажыце: так / не).**

1. Земляробчыя святы з'яўляюцца адметнай рысай беларускай культуры.
2. Вялікдзень – галоўнае хрысціянскае свята ўваскрэсення распятага Хрыста.
3. На Вялікдзень ладзяць варажбу на кінутых у ваду вянках.
4. На Каляды фарбуюць яйкі.
5. Навагодняе свята адзначаецца 1 мая.

**491. Якія святы адзначаюцца ў вашай краіне? Апішыце адно з найбольш адметных нацыянальных святаў вашай краіны.**

**492. Раскажыце, якія са святаў самыя любімыя для вас? Чаму?**

**493. Прачытайце.**

- І праца, і свята свой час маюць.
- Калядны мароз добра кусае.
- З Вялікадня птушкі пачынаюць пецць.
- На Радаўніцу да абеду пашуць, па абедзе плачуць, а ўвечары скачуць.

***ГРАМАТЫКА***

**Пабочныя канструкцыі**

*Пабочнымі* называюць словы і сказы, якія выражаюць адносіны асобы да зместу паведамлення: ***Адным словам**, працаваць было вельмі цікава.*

| Канструкцыі | Што выражаюць | Прыклады |
|---|---|---|
| *на шчасце, на жаль, на здзіўленне, як на бяду* | эмацыянальныя адносіны да выказвання | *На шчасце*, хлопчык сустрэў бацьку. |
| *кажуць, па звестках..., на маю думку, па-твойму, паводле чутак* | крыніцу паведамлення | Гэта, *па-мойму*, і ёсць сапраўднае жыццё. |
| *безумоўна, бясспрэчна, відаць, канечне, несумненна, магчыма, можа, здаецца, напэўна, па сутнасці* | ступень верагоднасці выказвання (упэўненасць, няўпэўненасць, меркаванне, магчымасць і г.д.) | *Відаць*, ён не мог жыць без працы. |
| *адным словам, карацей кажучы, уласна кажучы, дарэчы сказаць, можна сказаць* | адносіны да спосабу выражэння думкі | *Адным словам*, адпачылі мы вельмі добра. |
| *бачыш (бач), ведаеце, разумееце, ці паверыце, згадзіцеся, уявіце сабе;* | зварот да суразмоўцы з мэтай прыцягнуць яго ўвагу, выклікаць рэакцыю | Цяжка, *разумееце*, прызвычаіцца да невядомага. |
| *па-першае, па-другое, з аднаго боку, з другога боку, паўтараю, наадварот, нарэшце, прынамсі, між іншым* | паслядоўнасць выкладу думкі, адносіны паміж часткамі выказвання | Трэба ж, *нарэшце*, пачынаць і больш сур'ёзную справу. |

**494. Прачытайце сказы. Знайдзіце пабочныя словы, растлумачце іх значэнне.**

1. Пануры лес, здаецца, дрэмле на сонцы.
2. Хата, сапраўды, стаяла сярод глухога балота.
3. Ён чытаў, безумоўна, шмат кніжак.
4. Бачыш, як вырас наш горад за апошнія гады!
5. Між іншым, я вельмі люблю кветкі.
6. Хлопцы адышліся, прынамсі, на кіламетр.

**495. Дапоўніце сказы пабочнымі канструкцыямі. Выкарыстайце словы для даведак.**

1. Такія дні бываюць,..., толькі на Беларусі.
2. Дождж,..., ужо скончыўся.
3. Позняй восенню,..., світае позна.
4. Лесу,..., не было канца-краю.
5. ..., ён прыйшоў дадому.
6. ..., у лесе было цёмна і глуха.

*Для даведак*: нарэшце, сапраўды, вядома, мусіць, здаецца, на шчасце.

У ролі пабочных слоў ужываюцца:

| | |
|---|---|
| мадальныя словы | *безумоўна, бясспрэчна, відавочна, вядома, сапраўды, мабыць, можа, мусіць, напэўна* |
| назоўнікі з прыназоўнікамі і без іх | *на шчасце, на думку, па праўдзе, на бяду, праўда, словам* |
| субстантываваныя прыметнікі | *самае большае, галоўнае, самае галоўнае, самае лепшае* |
| займеннікі з прыназоўнікамі | *між іншым, між намі, апрача таго* |
| прыслоўі | *па-мойму, па-вашаму, па-нашаму, па-першае, па-другое, наадварот, нарэшце* |
| дзеяслоўныя формы | *бачу, кажу, ведаеце, разумееш* |
| словазлучэнні | *адным словам, інакш кажучы, уласна кажучы, галоўным чынам, з аднаго боку, разам з тым* |

### 1. Радаўніца

Памяць аб сваім родзе і ўшанаванне продкаў спрадвеку захаваліся ў беларускім народзе. Гэта – адметная рыса беларускага нацыянальнага характару. У родавым летапісе ніхто не застаецца незаўважаным, незалежна ад таго, добрую ці дрэнную памяць пра сябе пакідае чалавек.

З даўніх часоў беларусы верылі, што памёршы не знікае бясследна, а ператвараецца ў Духа свайго роду, яго заступніка. Людзі лічылі, што духі продкаў нябачна наведваюць іх дом, дапамагаюць або шкодзяць гаспадарам. З гэтым вераваннем звязана паходжанне назвы Радаўніцы. Гэтае свята адзначаецца на наступным пасля Вялікадня тыдні ў аўторак. У гэты дзень людзі прыходзяць да магіл сваякоў, каб парадзіцца з імі аб вырашэнні гаспадарчых праблем, цяжкасцей і турбот, што ўзнікаюць у паўсядзённым жыцці. Каля трох гадзін дня пачынаецца абед. За радаўнічным абедам успамінаюць добрыя справы памёрлых, расказваюць пра іх жыццё, характар, звычкі. Для малодшых членаў сям′і гэтыя ўспаміны робяцца своеасаблівым урокам па гісторыі свайго радаводу.

**496. Якія пытанні трэба задаць, каб атрымаць наступныя адказы?**

1. Свята Радаўніцы адзначаецца на наступным пасля Вялікадня тыдні ў аўторак.
2. На Радаўніцу людзі прыходзяць да магіл сваякоў, каб параіцца з імі аб вырашэнні праблем, цяжкасцей і турбот.
3. За радаўнічным абедам успамінаюць добрыя справы памёрлых, расказваюць пра іх жыццё, характар, звычкі.

**497. Закончыце сказы.**

1. Памяць аб сваім родзе і ўшанаванне продкаў...
2. Спрадвеку беларусы верылі, што...
3. Свята Радаўніцы адзначаецца...
4. У дзень Радаўніцы людзі прыходзяць..., каб...
5. За радаўнічным абедам...

**498. Выкажыце свае ўласныя меркаванні наконт асноўнай думкі тэксту.**

**499. Перакажыце тэкст. Што вы ведаеце пра свята Радаўніцы?**

## Віншавальныя паштоўкі і тэлеграмы

| | |
|---|---|
| атрымаць / атрымліваць (што?)<br>дасылаць / даслаць (што?)<br>накіраваць / накіроўваць (што?) | [віншавальную] паштоўку<br>ліст (пісьмо)<br>[тэрміновую] тэлеграму<br>бандэроль |

| | |
|---|---|
| напісаць (што?) | ліст (пісьмо)<br>зваротны адрас<br>адрас атрымальніка |

| | |
|---|---|
| пісаць / напісаць (куды?)<br>даслаць / дасылаць (куды?) | на адрас |

| | | |
|---|---|---|
| класці / пакласці (што?) | паштоўку (куды?)<br>ліст (пісьмо) | у канверт |

| | |
|---|---|
| клеіць (што?)<br>наклеіць | [паштовую] марку |

| | | |
|---|---|---|
| апускаць (што?)<br>апусціць | паштоўку<br>ліст (пісьмо) (куды?)<br>канверт | у паштовую скрынку |

**500. Закончыце дыялогі.**

– Я хачу даслаць віншавальную тэлеграму на мастацкім бланку. Дзе я магу атрымаць бланк для тэлеграмы?
– ...
– Вы не маглі б дапамагчы мне правільна запоўніць бланк тэлеграмы?
– ...

– Колькі трэба заплаціць за тэлеграму?
– Гэта залежыць ад колькасці слоў.
– Якая плата за адно слова?
– ...
– Гэтых грошай даволі? Ці трэба нейкая даплата?
– ...

*Як пісаць адрас на канверце*

| *Прыватны ліст (паштоўка)* | *Афіцыйны ліст (паштоўка)* |
|---|---|
| Кавалёнку Алесю<br>вул. М.Багдановіча, д. 25, кв. 15<br>220029, г.Мінск | Беларускі дзяржаўны універсітэт<br>праспект Францыска Скарыны, д.4<br>220050, г.Мінск |

*Зваротак*

| *Прыватны ліст* | *Афіцыйны ліст* |
|---|---|

| *(паштоўка, тэлеграма)* | *(паштоўка, тэлеграма)* |
|---|---|
| • дарагі (-ая) Алесь (Таццяна)<br>• любы (-ая) Міхась (Ірына) | • глыбокапаважаны (-ая) Мікалай Пятровіч (Ганна Віктараўна)<br>• глыбокашаноўны (-ая) Іван Мікалаевіч (Алена Пятроўна)<br>• паважаны (-ая) Зміцер Іванавіч (Марыя Сцяпанаўна)<br>• шаноўны (-ая) Пётр Аляксандравіч (Ірына Сымонаўна) |

***Дарагі Алесь!***

Прымі мае шчырыя віншаванні са святам Новага года! Хай здзейсняцца ўсе твае мары і спадзяванні! Здароўя і радасці табе, тваім родным і сябрам!

З Новым годам! З новым шчасцем!

Антось.

***Віншаванні***

| |
|---|
| * Віншую Вас (цябе)! |
| * Шчыра віншую Вас (цябе) з... (са святам...) |
| * Дазвольце павіншаваць Вас з... (са святам...) |
| * Са святам! |
| * Дасылаю Вам (табе) свае віншаванні з нагоды свята... |
| * Мне хочацца павіншаваць Вас (цябе) з вялікім святам... |
| * З Калядамі! |
| * З Новым годам! З новым шчасцем! |
| * Нашы Вам (табе) віншаванні! |

***Пажаданні, зычэнні***

| |
|---|
| * Жадаю Вам (табе) шчасця! // Шчасця і радасці Вам (табе)! // Хай Вам (табе) шчасціць! // Так хочацца, каб Вам (табе) пашчасціла! |
| * Каб Вы здаровы былі і радаваліся! |
| * Хай Вас (цябе) Бог беражэ! // Беражы Вас (цябе) Бог! |
| * Хай здаровыя будуць вашы дзеткі! |
| * Зычу Вам (табе) усяго самага добрага! |
| * Здароўя і шчасця Вам (табе) у новым годзе! |
| * Хай збудуцца (здзейсняцца) усе Вашы (твае) спадзяванні (планы, мары)! |
| * Бывайце здаровы, жывіце багата! |
| * Хай усё будзе добра! |
| * Найлепшыя святочныя пажаданні! |
| * Хай Вам (табе) лёс не здрадзіць! |

*Заканчэнне*

| |
|---|
| * З найлепшымі пажаданнямі... |
| * Са шчырасцю... |
| * З павагаю... |
| * З глыбокаю пашанай... |
| * З прывітаннем і пашанаю... |
| * З прыемнасцю... |

| | |
|---|---|
| * | Перадайце прывітанне і мае шчырыя віншаванні Вашай сям'і... |
| * | Моцна цалую і абдымаю цябе... |
| * | Горача цябе абдымаю і вітаю... |
| * | Шчыра Ваш... |

**501. Напішыце віншаванне з Новым годам; з днём нараджэння; з Калядамі**

1. вашым бацькам;
2. вашаму сябру (сяброўцы);
3. вашаму выкладчыку.

**502. У якім выпадку ў пісьме можна напісаць:**

1. Загадзя ўдзячны Вам...
2. Даруйце за турботы...
3. Дазвольце папрасіць Вас...
4. Не ведаю, як Вам дзякаваць...
5. Мы вам вельмі ўдзячныя...

**503. Прачытайце і перакажыце жарт. Як вы яго зразумелі?**

– Міхась, ці магу я выканаць якое-небудзь тваё жаданне да свята? – спытала бабуля.

– Зрабі так, каб Рым быў сталіцай Францыі.

– Навошта, унучак?

– Я так напісаў сёння ў сачыненні.

## 2. Купалле

Купалле – старажытнае свята ў гонар летняга сонца. Адзначаецца яно ў ноч з 23 на 24 чэрвеня ў католікаў і з 6 на 7 ліпеня ў праваслаўных беларусаў. У купальскіх абрадах і рытуалах чалавек выказвае спалучэнне са станам прыроды, яе найвышэйшым летнім росквітам і зямной прыгажосцю.

Свята пачынаецца з надыходам вечара, калі сонца садзіцца за небакрай. Дзяўчаты, аздобіўшы галовы вяночкамі, ідуць з поля да месца купальскага агню. Кветкі для вянкоў збіраюць з розных палёў, што адносяцца да суседніх вёсак. Паводле павер'яў, такім чынам можна заманіць да сябе жаніхоў з гэтых вёсак. Хлопцы на скрыжаванні дарог рыхтуюць месца для вогнішча.

Вакол агню дзяўчаты водзяць карагоды і спяваюць купальскія песні, хлопцы ладзяць гульні з пераскокваннем праз агонь. Людзі вераць, што агонь павінен паспрыяць ачышчэнню душы, папярэдзіць злыя чары, зняць хваробы. Закаханыя скачуць праз агонь удвух, узяўшыся за рукі. На заканчэнне святочных гульняў моладзь пускае на ваду вянкі, на якія задумваюць на будучае свайго роду і лёсу.

**504. Якія пытанні трэба задаць, каб атрымаць наступныя адказы?**

1. Купалле – старажытнае свята ў гонар летняга сонца.
2. Купалле адзначаецца ў ноч з 23 на 24 чэрвеня ў католікаў і з 6 на 7 ліпеня ў праваслаўных беларусаў.
3. Купальскае свята пачынаецца з надыходам вечара, калі сонца садзіцца за небакрай.

**505. Закончыце сказы:**

1. Купальскія абрады і рытуалы сімвалізуюць...
2. Калі сонца садзіцца за небакрай дзяўчаты..., а хлопцы...

3. Вакол агню моладзь водзіць карагоды,...
4. Людзі вераць, што агонь...
5. На заканчэнне свята...

**506. Выкажыце свае ўласныя меркаванні наконт асноўнай думкі тэксту.**

**507. Перакажыце тэкст. Што вы ведаеце пра Купалле?**

***ГРАМАТЫКА***

**Простая і ўскосная мова**

| Простая мова | Ускосная мова |
|---|---|
| “Я ўжо даўно падрыхтаваў падарункі”, –сказаў бацьку Антось. | Антось сказаў бацьку, **што** ён ужо даўно падрыхтаваў падарункі. |
| Іван Мікалаевіч папрасіў нас: “Наведвайцеся да мяне часцей!” | Іван Мікалаевіч папрасіў, **каб** мы наведваліся да яго часцей. |
| “Хутка прыйдуць госці?” – спытала маці. | Маці спытала, **ці** хутка прыйдуць госці. |

**508. Прачытайце сказы. Замяніце сказы з простай мовай сказамі з ускоснай мовай.**

**Узор:** ***“Вяртайся хутчэй”, – папрасіла Ірына бацьку. Ірына папрасіла бацьку, каб ён вяртаўся хутчэй.***

1. “Якая гэта ў цябе кніга?” – спытаў Антось у Таццяны.
2. “Рабі людзям толькі дабро”, – нагадваў бацька сыну.
3. Іван Пятровіч падумаў: “Ужо надыходзіць вясна”.
4. “Цудоўнае надвор′е!” – пагадзіўся бацька з Віктарам.
5. “Мне трэба параіцца з маці”, – адказаў Алесь.

**509. Падбярыце сінонімы да наступных дзеясловаў. Выкарыстайце словы для даведак.**

1. сказаць
2. спытаць
3. папрасіць
4. думаць
5. патрабаваць

*Словы для даведак:* паведаміць, загадаць, параіць, нагадаць, гаварыць, пярэчыць, казаць, адказаць, запытаць, пацікавіцца, разважаць, меркаваць, азвацца, адгукацца, прамовіць.

**510. Замест пропускаў устаўце дзеясловы ў належнай граматычнай форме. Выкарыстайце словы для даведак**

1. “Заўтра Дзед Мароз прынясе вам падарункі”, – ... маці дзецям.
2. Жанчына зірнула на Алеся і ...: “Ты адкуль?”
3. Віктар Мікалаевіч ... : “Малайцы, добры святочны канцэрт атрымаўся!”
4. Паглядзеўшы на гадзіннік, бацька з неспакоем ... : “О, ужо дзесяць гадзін”.
5. “Не адыходзь далёка!” – ... Андрэй сыну.

*Словы для даведак:* сказаць, загадаць, запытаць, пахваліць, прамовіць.

* дзеясловы маўлення: *сказаць, заўважыць, паведаміць, закрычаць, папрасіць, загадаць*;

| |
|---|
| * дзеясловы са значэннем унутранага стану: *здзіўляцца, дзівіцца, схамянуцца, усумніцца, пакрыўдзіцца;*<br>* дзеясловы са значэннем мімікі, жэсту: *усміхнуцца, узрадавацца, зморшчыцца, насупіцца, скрывіцца*;<br>* дзеясловы думкі: *падумаць, успомніць, задумацца, меркаваць, развaжаць.* |

**511. Прачытайце сказы. Замяніце сказы з ускоснай мовай сказамі з простай мовай.**

**Узор:** ***Андрэй папрасіў, каб бацька ўзяў яго з сабой. “Вазьмі мяне з сабой”, – папрасіў Андрэй бацьку.***

1. Алесь сказаў брату, што на свята ён запросіць сяброў.
2. Маці папрасіла, каб мы прыязджалі да яе часцей.
3. Дзядзька спытаў, ці атрымаў Міхась віншавальную паштоўку.
4. Я сказаў бацьку, што ў нас будуць госці.
5. Ганна папрасіла, каб настаўніца растлумачыла тэму яшчэ раз.

**Знакі прыпынку пры простай мове**

| *Словы аўтара перад простай мовай – двукроп'е + вялікая літара* | *Словы аўтара пасля простай мовы – коска (пытальнік, клічнік) + працяжнік + малая літара* | *Словы аўтара ў сярэдзіне простай мовы вылучаюцца коскамі і працяжнікамі + малая літара* |
|---|---|---|
| Алесь спытаў у сябра: “Ты ўжо падрыхтаваўся да свята?” | “Шчыра віншую цябе з днём нараджэння”, – звярнуўся да гаспадара Міхась. | “Вельмі прыемна, – сказала Таццяна Пятроўна, – сядайце, калі ласка!” |

**3. Дзяды**

У коле традыцыйных абрадаў беларусаў важнае месца займаюць Дзяды – штогадовыя памінанні продкаў у сваёй сям'і. Іх паходжанне і бытаванне звязана са старажытным земляробчым календаром.

На Дзяды, згодна са спрадвечнымі вераваннямі, продкі нібыта выходзяць з царства мёртвых і наведваюць сваіх родных і блізкіх. У гэты дзень мужчыны, як звычайна, займаюцца гаспадарчымі справамі, а жанчыны з самага ранку рыхтуюцца да святкавання. Вымываюць падлогу, вокны, сталы, вешаюць на вокны лепшыя фіранкі, прыгожа засцілаюць ложкі. Дзеці чыста вымятаюць двор і пасыпаюць яго жоўтым пяском.

З абеда гаспадар топіць лазню і перад вячэрай усе жыхары хаты ідуць мыцца. У дзядоўскі вечар апранаюцца ў чыстае святочнае адзенне. Гаспадыня падпяразвае новы фартух і падае на стол прыгатаваную ежу: бліны, булачкі, кашу, бульбу з мясам і каўбасой. Старэйшы член сям'і запальвае перад абразамі свечку і моліцца за памерлых родзічаў.

**512. Якія пытанні трэба задаць, каб атрымаць наступныя адказы?**

1. Дзяды – штогадовыя памінанні продкаў у сваёй сям'і.
2. У дзядоўскі вечар апранаюцца ў чыстае святочнае адзенне.
3. Старэйшы член сям'і запальвае перад абразамі свечку і моліцца за памерлых родзічаў.

**513. Закончыце сказы:**

1. Паходжанне і бытаванне Дзядоў звязана...
2. Згодна са старажытнымі вераваннямі, на Дзяды памерлыя продкі...
3. У святочны дзень мужчыны..., жанчыны..., а дзеці...
4. Перад святочнай вячэрай...
5. Гаспадыня падае на стол...

**514. Выкажыце свае ўласныя меркаванні наконт асноўнай думкі тэксту.**

**515. Перакажыце тэкст. Што вы ведаеце пра Дзяды?**

# БЕЛАРУСКАЯ ПУНКТУАЦЫЯ

| Знакі | Правілы пастаноўкі | Прыклады |
|---|---|---|
| Кропка [.] | 1) У канцы апавядальнага сказа, які закончаны граматычна, сэнсава і інтанацыйна. | Я вывучаю беларускую мову. |
| | 2) У канцы пабуджальнага сказа, які не мае эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкі. | Няхай жа ўсё у вас будзе добра. |
| Пытальнік [?] | У канцы пытальнага сказа, які закончаны граматычна, сэнсава і інтанацыйна. | Ці ведаеце вы, дзе знаходзіцца бібліятэка? |
| Клічнік [!] | 1) У канцы клічнага або пабуджальнага сказа, якія закончаны граматычна, сэнсава і інтанацыйна. | Як прыгожа вясною ў лесе! |
| | 2) Пасля зваротку. | Мой родны Мінск! Ты – прыгажосць і слава Беларусі. |
| Шматкроп′е [...] | У канцы апавядальнага сказа, які не закончаны граматычна або па сэнсу. | Алесь увайшоў у пакой і... |
| Коска [,] | 1) Паміж аднароднымі членамі сказа | Ён слухае, але нічога не чуе. |
| | 2) Паміж словамі, якія паўтараюцца ў сказе. | Снег сыпаў усё мацней, мацней, мацней. |
| | 3) Паміж часткамі складанага сказа. | Дзень быў пахмурны, ліў дождж. |
| | 4) Пры адасобленых членах сказа. | Нягледзячы на позні час, госці не разыходзіліся. |
| | 5) Пры адасобленых членах сказа. | Жыта, як лес, шуміць залатою сцяной. |
| | 6) Пры зваротках. | Добры дзень, Мікалай Пятровіч. |
| | 7) Пры пабочных канструкцыях. | Была, між іншым, зіма. |
| | 8) Пры даданай частцы складаназалежнага сказа, размешчанай у сярэдзіне галоўнай часткі. | Усё тое, пра што ён даведаўся, было праўдай. |
| Кропка з коскай [;] | 1) Паміж развітымі аднароднымі членамі сказа, якія звязаны бяззлучнікавай сувяззю і маюць свае знакі прыпынку. | Азалаціла восень поле іржышчам, дрэвы лісцем, гумны снапамі; абвеяла хаты жытнім пылам; вострым пахам траў напоўніла вуліцу. |
| | 2) У бяззлучнікавым складаным сказе паміж простымі часткамі, якія не набліжаюцца па сэнсу або маюць свае знакі прыпынку. | Вее вецер, свішча ў коміне, горка плача, надрываецца; і цяпер мне тая музыка, як жывая, успамінаецца. |
| Працяжнік [–] | 1) Паміж дзейнікам і выказнікам, калі яны аддзелены | Мінск – сталіца Рэспублікі Беларусь. |

| | | |
|---|---|---|
| | адзін ад другога працяглай паўзай і выдзяляюцца лагічна. | |
| | 2) Паміж аднароднымі членамі сказа і абагульняючым словам, якое размяшчаецца пасля іх. | Поле і лес – усё пакрыта снегам. |
| | 3) Для ўказання на пропуск пэўнага члена сказа. | Сіняе неба – над полем. |
| | 4) Паміж часткамі складанага сказа, калі ўзмоцнена падкрэсліваецца іх процiпастаўленне. | На полі яшчэ працуюць – затое ў лесе ўжо зусім цёмна. |
| | 5) Пры выдзяленні ўстаўных канструкцый. | Сярод ночы – нібыта ад сутыкнення – ён прачнуўся. |
| | 6) Перад рэплікамі дыялога. | – Адкуль ты тэлефануеш?<br>– З універсітэта. |
| Двукроп′е [:] | 1) Паміж аднароднымі членамі сказа і абагульняючым словам, якое размешчана перад імі. | Снег засыпаў усё: лес, хаты, поле, дарогу. |
| | 2) Паміж часткамі складанага сказа, якія звязаны бяззлучнікавай сувяззю і адна раскрывае, дапаўняе змест другой. | Цяпер хлопчык быў задаволены: ён атрымаў у падарунак тое, што хацеў. |
| | 3) Паміж простай мовай і словамі аўтара, калі яны размяшчаюцца перад простай мовай. | Дзядзька глянуў на неба і падумаў: “Няўжо пойдзе дождж?” |
| Дужкі [( )] | 1) Пры выдзяленні ўстаўных канструкцый. | Ён (стары Міхась) быў добрым гаспадаром. |
| | 2) Пры выдзяленні спасылак, якія падаюцца непасрэдна за цытатай. | Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі (Ф.Багушэвіч) |
| Двукоссе [ “ ”] | 1) Пры выдзяленні простай мовы, якая падаецца ў адным радку са словамі аўтара. | “Добры дзень!” – адгукнуўся госць. |
| | 2) Пры выдзяленні цытаты. | Янка Купала адзначаў, што “самы важнейшы і непраломны закон жыцця – гэта людская мова”. |

**СЛОЎНІК**
**СЛОВАРЬ**
**VOCABULARY**

| Беларуская мова | Русский язык | English language |
|---|---|---|
| абавязко*ва | обязательно | without fail |
| абаграва*ць | обогревать | warm |
| абагульні*ць | обобщить | generalize |
| абанеме*нт *м.* | абонемент | subscription (*to, for*), season-ticket |
| абараня*цца | защищаться | defend oneself |
| абараня*ць | защищать | defend; protect; stand up (*for*) |
| абаро*на *ж.* | защита | defence; protection; cover |
| абая*льнасць *ж.* | обаяние, обаятельность | fascination, charm |
| абвяшча*ць | объявлять | declare; announce |
| абе*д *м.* | обед | dinner |
| абе*даць | обедать | have (take) dinner; dine |
| абкла*сці | обложить | face; cover; tax; rate |
| аблі*чча *н.* | облик | appearance, figure; cast of mind, manner |
| абмеркава*ць | обсудить | discuss; talk over |
| абра*д *м.* | обряд | rite, ceremony |
| абража*ць | оскорблять | insult, offend; outrage |
| абра*з *м.* | икона | icon, image |
| абслуго*ўваць | обслуживать | serve, attend (*to*) |
| абста*віны | обстоятельства | circumstance |
| абся*г *м.* | простор | spaciousness, space |
| абудзі*ць | пробудить | wake up |
| аб′яўля*ць | объявлять | declare, announce |
| абша*р *м.* | пространство | space; area |
| абы* | лишь бы, чтобы только | if only |
| абыя*кавы | безразличный | indifferent |
| авё*с *м.* | овёс | oats |
| аве*чка *ж.* | овца | sheep |
| агаро*д *м.* | огород | kitchen-garden, market- garden, truck- garden |
| агаро*дніна *ж.* | овощи | vegetables |
| агі*дны | отвратительный | disgusting |
| агульнавядо*мы | общеизвестный | generally known |
| агуро*к *м.* | огурец | cucumber |
| адва*жны | отважный | brave, fearless |
| адвака*т *м.* | адвокат | lawyer, barrister, attorney |
| адзнача*ць | отмечать | mark; celebrate |
| адка*зны | ответственный | responsible |
| адлюстрава*ць | отразить | reflect |
| адме*тны | особенный | special; particular; peculiar |
| аднаві*ць | восстановить | restore; recover |
| адпачыва*ць | отдыхать | rest; have/take a rest |
| адпачы*нак *м.* | отдых | rest; holiday; relaxation |
| адпраўле*нне *н.* | отправление | sending, departure |

| | | |
|---|---|---|
| адка*зваць | отвечать | answer; reply |
| а*драс *м.* | адрес | address |
| адраса*т *м.* | адресат | addressee |
| адука*цыя *ж.* | образование | education |
| адце*нне *н.* | оттенок | shade; hue |
| ажані*цца | жениться | marry |
| актуа*льны | актуальный | actual |
| акуля*ры | очки | glasses, spectacles; goggles |
| акура*тна | аккуратно | punctually; neatly |
| акура*тнасць | аккуратность | punctuality; tidiness, neatness |
| акура*тны | аккуратный | punctual, tidy, neat |
| але*й *м.* | подсолнечное масло | oil |
| алфаві*т *м.* | алфавит | alphabet |
| антэ*на *ж.* | антенна | antenna, aerial |
| аперэ*та *ж.* | оперетта | musical comedy |
| апіса*ць | описать | describe |
| апо*шні | последний | last; latter; new, the latest |
| апрана*цца | одеваться | dress (oneself); put smth. on |
| апрана*ць | одеть | dress |
| аптэ*ка *ж.* | аптека | chemist′s shop; drug-store |
| архітэкту*ра *ж.* | архитектура | architecture |
| асаблі*вы | особый | special |
| а*стра *ж.* | астра | aster |
| асо*бны | отдельный | separate; individual |
| асфа*льт *м.* | асфальт | asphalt |
| асфа*льтавы | асфальтовый | asphalt |
| атруці*ць | отравить | poison |
| атрыма*ць | получить | receive; get |
| аўдыто*рыя *ж.* | аудитория | lecture-hall, lecture-room; audience |
| аўтамабі*ль *м.* | автомобиль | (motor-)car, auto |
| аўто*бус *м.* | автобус | bus |
| аўто*рак *м.* | вторник | Tuesday |
| ацяпле*нне *н.* | отопление | heating |
| ашча*дны | бережливый | economical; thrifty |
| ба*бка *ж.* | бабушка | grandmother, granny |
| бабу*ля *ж.* | бабушка | grandmother, granny |
| бага*ж *м.* | багаж | luggage; baggage |
| бага*ты | богатый | rich, wealthy |
| бага*цце *н.* | богатство | riches, wealth |
| бадзё*ры | бодрый | cheerful |
| байда*рка *ж.* | байдарка | canoe |
| ба*йка *ж.* | басня | fable |
| бале*т *м.* | балет | ballet |
| балко*н *м.* | балкон | balcony; upper circle |
| бало*та *н.* | болото | swamp, marsh |
| бало*тны | болотный | swamp, marshy |
| бандэро*ль *ж.* | бандероль | printed matter |
| барада* *ж.* | борода | beard |
| ба*цька *м.* | отец | father |

| | | |
|---|---|---|
| бацькі* | родители | parents |
| бая*цца | бояться | be afraid (*of*), fear |
| белару*скі | белорусский | Belarusian |
| Белару*сь *ж.* | Беларусь | Belarus |
| бе*дны | бедный | poor |
| бе*лы | белый | white |
| бе*раг | берег | shore; seashore, coast; bank |
| біле*т *м.* | билет | ticket |
| бландзі*н *м.* | блондин | fair-haired man |
| бландзі*нка *ж.* | блондинка | blonde |
| бланк *м.* | бланк | form |
| блі*зка | близко | near; close; it is not far |
| блі*зкі | близкий | near; like; intimate; close |
| блі*зкія | близкие | my people |
| блін *м.* | блин | pancake |
| бліску*чы | блестящий | shining; brilliant |
| блок *м.* | блок | bloc, pulley |
| блука*ць | бродить | wander; stroll |
| брат *м.* | брат | brother |
| брыво* *н.* | бровь | eyebrow; brow |
| бры*дкі | отвратительный, безобразный | disgusting |
| будава*ць | строить | build, construct |
| будаўні*цтва *н.* | строительство | construction |
| бу*дзень *м.* | будний день | day |
| будзі*ць | будить | wake, call; rouse, awaken |
| будо*ўля *ж.* | стройка | building, construction |
| буйны* | крупный | large; big; large-scale |
| бу*льба *ж.* | картофель | potatoes |
| бульва*р *м.* | бульвар | boulevard |
| бура*к *м.* | свёкла | beet, beetroot |
| буфе*т *м.* | буфет | sideboard, refreshment room |
| бык *м.* | бык | bull |
| бытава*ць | бытовать | exist |
| быць | быть | be; happen |
| бэ*лька *ж.* | балка | beam, rafter |
| бясе*да *ж.* | беседа | conversation, talk |
| бяско*нцасць *ж.* | бесконечность | infinity |
| ваго*н *м.* | вагон | carriage |
| вадзі*цель *м.* | водитель | driver |
| ва*жна | важно | it is important; with an air of importance |
| ва*жны | важный | important; significant; grand; pompous |
| ва*за *ж.* | ваза | vase, bowl |
| вакза*л *м.* | вокзал | (railway) station |
| валасы* | волосы | hairs |
| вандрава*ць | странствовать | wander |
| вандро*ўка *ж.* | странствие | wandering |
| ва*нна *ж.* | ванна | bath |

| | | |
|---|---|---|
| вары*ць | варить | boil; cook |
| ве*зці | везти | carry; drive, take |
| ве*йка *н.* | веко | eyelid |
| веласіпе*д *м.* | велосипед | bicycle; cycle |
| веласіпеды*ст *м.* | велосипедист | cyclist |
| ве*льмі | очень | very; very much |
| вера*нда *ж.* | веранда | verandah |
| ве*расень *м.* | сентябрь | September |
| ве*рнасць | верность | faithfulness, loyalty |
| ве*рны | верный | faithful, true, loyal |
| верталё*т *м.* | вертолёт | helicopter |
| вё*ска *ж.* | деревня, село | village; country |
| ве*тлівы | вежливый | polite, civil |
| ве*цер *м.* | ветер | wind |
| ве*чар *м.* | вечер | evening |
| ве*шалка *ж.* | вешалка | peg, rack, stand; tab, hanger |
| вінава*ты | виновный | guilty |
| віншава*ць | поздравлять | congratulate |
| віншава*нне *н.* | поздравление | congratulation |
| вісе*ць | висеть | hang |
| віта*ць | приветствовать | greet, welcome; hail |
| ві*шня *ж.* | вишня | cherry; cherry-tree |
| во*гнішча *н.* | костёр | camp fire; bonfire |
| во*дар *м.* | аромат | aroma, fragrance |
| во*зера *н.* | озеро | lake |
| во*ка *н.* | глаз | eye |
| во*цат *м.* | уксус | vinegar |
| во*льны | свободный | free; vacant; spare |
| во*сень *ж.* | осень | autumn |
| ву*да *ж.* | удочка | fishing-rod |
| ву*дзіць *(ры*бу)* | ловить *(рыбу)* | fish |
| ву*зкі | узкий | narrow; tight |
| ву*ліца *ж.* | улица | street |
| вус *м* | ус | moustache; whisker; feeler |
| ву*ха *н.* | ухо | ear |
| вучы*цца | учиться | learn; study |
| вучы*ць | учить | teach; learn |
| выгляда*ць | выглядеть | look |
| выго*да *ж.* | удобство | comfort; convenience |
| выда*тны | отличный | excellent, perfect |
| вы*канаць | выполнить | execute, fulfil; carry out |
| выкарысто*ўваць | использовать | use |
| вы*лет *м.* | вылет | flight; start |
| выра*зны | выразительный | expressive; significant |
| вы*садка *ж.* | высадка | disembarkation |
| высакаро*днасць *ж.* | благородство | nobility; generosity |
| высо*кі | высокий | high, tall; elevated, lofty |
| вы*танчаны | утончённый | refined |
| вы*хад *м.* | выход | going out; exit, outlet |
| выхадны* *(дзень) м.* | выходной *(день)* | day off; rest-day |

| | | |
|---|---|---|
| вядо*мы | известный | known; well-known, famous; certain |
| вялі*зны | огромный | huge, vast, enormous |
| вялі*кі | большой | big, large, great |
| вярба* *ж.* | верба | willow |
| вяргі*ня *ж.* | георгин | dahlia |
| вярта*цца | возвращаться | return, come back |
| вярта*ць | возвращать | return, give back, reimburse |
| вясё*лка *ж.* | радуга | rainbow |
| вясё*лы | весёлый | merry, gay |
| вясна* *ж.* | весна | spring |
| вячэ*ра *ж.* | ужин | supper |
| вячэ*раць | ужинать | have (take) supper |
| Вялі*кдзень *м.* | Пасха | Easter |
| вяне*ц *м.* | венец | wreath |
| гадзі*на *ж.* | час | hour; o′clock |
| гадзі*ннік *м.* | часы | watch; clock |
| газ *м.* | газ | gas |
| га*завы | газовый | gas |
| газе*та *ж.* | газета | newspaper |
| галава* *ж.* | голова | head |
| гало*ўны | главный | chief, principal, main |
| га*нак *м.* | крыльцо | porch |
| гара* *ж.* | гора | mountain |
| гарадскі* | городской | town; urban; municipal |
| гара*чы | горячий, жаркий | hot |
| гардзі*на *ж.* | гардина | curtain |
| гарніту*р *м.* | гарнитур | set; suite |
| гарчы*ца *ж.* | горчица | mustard |
| гаршчо*к *м.* | горшок | pot |
| гары*шча *н.* | чердак | garret |
| гаспада*р *м.* | хозяин | master; boss; owner, proprietor; host; landlord |
| гаспады*ня *ж.* | хозяйка | mistress; hostess; landlady |
| гера?*чны | героический | heroic |
| гірля*нда *ж.* | гирлянда | garland |
| гістары*чны | исторический | historic(al) |
| гісто*рыя *ж.* | история | history; story |
| глі*на *ж.* | глина | clay |
| гліня*ны | глиняный | earthenware |
| глядзе*ць | смотреть | look; gaze |
| год *м.* | год | year |
| го*рад *м.* | город | town; city |
| го*рача | жарко | it is hot |
| госць *м.* | гость | guest; visitor |
| грамадзя*нскі | гражданский | civil |
| грані*т *м.* | гранит | granite |
| гра*фіка *ж.* | графика | graphic arts, drawing |
| грацыё*зны | грациозный | graceful |
| гро*шы | деньги | money |
| гру*дзі | грудь | breast; chest |

| | | |
|---|---|---|
| гру*ша *ж.* | груша | pear; pear-tree |
| гумно* *н.* | гумно, рига | threshing-floor |
| гу*мавы | резиновый | rubber |
| гу*бы | губы | lips |
| гума*нны | гуманный | humane |
| гуркі* | огурцы | cucumbers |
| густ *м.* | вкус | taste |
| густы* | густой | thick, dense |
| гусь *ж.* | гусь | goose |
| дабрыня* *ж.* | доброта | kindness |
| даво*лі | довольно | rather, fairly |
| дадо*му | домой | home |
| дазваля*ць | позволять | allow, permit |
| дакла*дна | точно | exactly, just; sharp |
| дакла*дны | точный | exact; precision, accuracy; punctuality |
| дакрану*цца | дотронуться | touch |
| далё*ка | далеко | far off; a long way off |
| даліка*тны | деликатный | delicate, tactful |
| дало*нь *ж.* | ладонь | palm |
| далуча*цца | присоединяться | join; add |
| дапамагчы* | помочь | help; assist, aid; do smb. good |
| даспадо*бы | по вкусу | to smb.′s taste (liking) |
| дасыла*ць | посылать | send; dispatch; mail |
| да*та *ж.* | дата | date |
| да*ча *ж.* | дача | summer cottage, country house |
| дачка* *ж.* | дочка, дочь | daughter |
| дба*йны | прилежный, старательный, усердный | diligent |
| двор *м.* | двор | court, yard; farmstead |
| дзве*ры | двери | doors |
| дзед *м.* | дед | grandfather |
| Дзед Маро*з *м.* | Дед Мороз | Santa Claus |
| дзень *м.* | день | day |
| дзіві*цца | удивляться | be surprised (*at*) |
| дзіво*сны | удивительный, чудесный | astonishing, surprising |
| дзіво*сы | чудеса | miracles, wonders |
| дзіця* *н.* | ребёнок | child; baby |
| дзіця*чы | детский | child′s, children′s; childish |
| дзя*дзька *м.* | дядя | uncle |
| дзяду*ля *м.* | дедушка | grandfather |
| до*бра | хорошо | well; it is nice (good) |
| добразычлі*вы | доброжелательный | benevolent; well-disposed |
| до*бры | хороший, добрый | good; fine |
| дом *м.* | дом | house |
| до*ўгі | длинный | long |
| до*шка *ж.* | доска | board; plank |
| дра*нікі | оладьи из тёртого картофеля | draniki (potato pancakes) |
| драўля*ны | деревянный | wooden |
| драўні*на *ж.* | древесина | wood |

| | | |
|---|---|---|
| дрэ*ва *н.* | дерево | tree; wood |
| дрэ*нна | плохо | bad(ly); that′s bad |
| дру*жны | дружный | friendly, amicable |
| друк *м.* | печать | publishing |
| дуб *м.* | дуб | oak(-tree) |
| дубо*вы | дубовый | oak, oaken |
| ду*маць | думать | think |
| духо*ўны | духовный | spiritual |
| ду*шна | душно | it is stuffy |
| дыва*н *м.* | ковёр | carpet, rug |
| дыспе*тчар *м.* | диспетчер | dispatcher |
| дэкараты*ўны | декоративный | decorative |
| дэсе*рт *м.* | десерт | dessert |
| е*жа *ж.* | еда | food; meal |
| е*лка *ж.* | ель | fir-tree |
| ё*лка *ж.* | ёлка *(новогодняя)* | New-Year′s tree |
| е*сці | есть | eat |
| е*хаць | ехать | drive; ride |
| жало*ба | траур | mourning |
| жана*ты | женатый | married |
| жані*цца | жениться | marry |
| жано*чы | женский | feminale; feminine; woman′s |
| жанчы*на *ж.* | женщина | woman |
| жарабя* *н.* | жеребёнок | foal |
| жартава*ць | шутить | joke; jest |
| жартаўлі*вы | шутливый | playful |
| жахлі*вы | страшный, ужасный | terrible |
| жні*вень *м.* | август | August |
| жо*нка *ж.* | жена | wife |
| жо*рсткі | жёсткий, жестокий, суровый | strict, rigid; cruel |
| жо*ўты | жёлтый | yellow |
| жу*дасны | жуткий, страшный | terrible |
| жы*вапіс *м.* | живопись | painting |
| жы*тні | ржаной | rye |
| жы*ць | жить | live |
| жэто*н *м.* | жетон | counter |
| забараня*ць | запрещать | forbid, prohibit; ban |
| забы*цца | забыть | forget; leave behind |
| завіта*ць | наведаться, заглянуть, пожаловать | call on; visit; inquire (*about*) |
| заву*лак *м.* | переулок | by-street, side-street |
| за*гадзя | заранее | beforehand; in good time |
| загара*ць | загорать | become sunburnt |
| задаво*лены | удовлетворённый | satisfied, contented |
| задаво*ліць | удовлетворить | satisfy; answer, meet |
| закапа*ць | закопать | bury |
| закаха*ны *м.* | влюблённый | in love; lover |
| закаха*цца | влюбиться | fall in love |
| заку*ска *ж.* | закуска | snack; appetizer |

| | | |
|---|---|---|
| за*ла *ж.* | зал | hall, room |
| за*ла *(перо*нная) ж.* | зал *(перронный)* | platform-room |
| за*ла (*чака*ння) ж.* | зал *(ожидания)* | waiting-room |
| замо*жны | зажиточный | well-to-do; prosperous |
| занаве*ска *ж.* | занавеска | curtain |
| запа*лка *ж.* | спичка | match |
| запраша*ць | приглашать | invite, ask; call; engage |
| запрашэ*нне *н.* | приглашение | invitation |
| запаве*днік *м.* | заповедник | reserve; reservation; preserve |
| заста*цца | остаться | remain, stay |
| заўсё*ды | всегда | always |
| захава*ць | сохранить | keep; maintain |
| захапі*цца | увлечься | be carried away; be fascinated (*by*); be infatuated (*with*) |
| захо*дзіць | заходить | drop in; call on; go; get; turn (*on*) |
| зацікa*ўлены | заинтересованный | interested (*in*) |
| збіра*цца | собираться | gather; prepare (*for*); be going to; intend |
| зблі*зку | вблизи, с близкого расстояния | near by, not far from |
| збянтэ*жыцца | оторопеть | be struck dumb |
| звыча*йна | обычно | usually; as a rule |
| звыча*йны | обычный | ordinary, usual |
| здалё*к | издалека | from afar; from far away |
| здзіўля*ць | удивлять | be surprised (*at*) |
| зваць | звать | call; be called; invite, ask |
| зве*даць | узнать, испытать, ощутить | try, test; feel |
| звы*чай *м.* | обычай | custom |
| звыча*йна | обычно | usually |
| звярну*цца | обратиться | address, apply (*to*) |
| земляро*бчы | земледельческий | agricultural |
| зіма* *ж.* | зима | winter |
| зле*ва | слева | from the left; left, on the left |
| змага*цца | сражаться | fight |
| знаё*мы | знакомый | familiar; acquaintance |
| знакамі*ты | известный, знаменитый | famous |
| знахо*дзіцца | находиться | be found |
| зніка*ць | исчезать | disappear, vanish |
| зні*шчыць | уничтожить | destroy; abolish; put an end (*to*) |
| зо*рка *ж.* | звезда | star |
| зру*чны | удобный | comfortable; convenient |
| зу*б *м.* | зуб | tooth |
| зэ*длік *м.* | скамеечка | footstool |
| зялё*ны | зелёный | green |
| зяць *м.* | зять | son-in-law; brother-in-law |
| ілжы*вы | лживый | lying, false |
| ілюміна*тар *м.* | иллюминатор | bull′s-eye; illuminator |
| імгне*нне *н.* | мгновение | instant, moment |
| імкну*цца | стремиться | aspire |
| імя* *н.* | имя | name |

| | | |
|---|---|---|
| інжыне*р *м.* | инженер | engineer |
| інспе*ктар *м.* | инспектор | inspector |
| інтэр′е*р *м.* | интерьер | interior |
| ірані*чны | иронический | ironical |
| існава*ць | существовать | exist |
| ісці* | идти | go; walk; go by, pass, go on |
| каба*н *м.* | кабан | wild boar |
| кабі*на *ж.* | кабина | cabin |
| кабіне*т *м.* | кабинет | study; cabinet |
| ка*ва *ж.* | кофе | coffee |
| кава*лак *м.* | кусок | piece, bit; scrap; lump; slice |
| казыро*к *м.* | козырёк | peak |
| калідо*р *м.* | коридор | corridor |
| калы*ска *ж.* | колыбель | cradle |
| Каля*ды | Рождество | Christmas |
| калянда*р *м.* | календарь | calendar |
| каляро*вы | цветной | coloured; colour |
| камба*йн *м.* | комбайн | (harvesting) combine |
| кампазі*тар *м.* | композитор | composer |
| кампо*т *м.* | компот | stewed fruit compote |
| камп′ю*тэр *м.* | компьютер | computer |
| кана*па *ж.* | диван | sofa |
| канве*рт *м.* | конверт | envelope, cover |
| кані*кулы | каникулы | vacation, holidays; recess |
| кантралё*р *м.* | контролёр | controller, inspector |
| капу*ста *ж.* | капуста | cabbage |
| капялю*ш *м.* | шляпа | hat; bonnet |
| караго*д *м.* | хоровод | sing and dance in a ring |
| карале*ва *ж.* | королева | queen |
| каранава*ць | короновать | crown |
| каро*ва *ж.* | корова | cow |
| каро*ль *м.* | король | king |
| каро*ткі | короткий | short |
| карці*на *ж.* | картина | picture; oil-painting; scene |
| кары*сны | полезный | useful; good (*for*); healthy |
| карыста*цца | пользоваться | make use (*of*); profit (*by*) |
| ка*са *м.* | касса | booking-office, pay-desk |
| касі*р *м.* | кассир | cashier |
| кастры*чнік *м.* | октябрь | October |
| касы* | косой | slanting |
| каталі*к *м.* | католик | (Roman) catholic |
| каталі*цкі | католический | (Roman) catholic |
| катле*та *ж.* | котлета | cutlet; chop |
| катэ*дж *м.* | коттедж | cottage |
| ка*тэр *м.* | катер | cutter |
| каха*нне *н.* | любовь | love |
| каха*ны *м.* | любимый, возлюбленный | lover |
| кацяня* *н.* | котёнок | kitten |
| ка*чка *ж.* | утка | duck |

| | | |
|---|---|---|
| кашта*навы | каштановый | chestnut |
| кашто*ўнасць *ж.* | ценность | value |
| кашто*ўны | ценный | valuable |
| кварта*л *м.* | квартал | block |
| кве*тка *ж.* | цветок | flower |
| кве*тнік *м.* | цветник | flower garden |
| ке*пскі | плохой | bad; poor |
| кіно *н.* | кино | cinema |
| кіраўні*к *м.* | руководитель | leader; instructor; manager |
| кісе*ль *м.* | кисель | kissel, jelly |
| кладо*ўка *ж.* | кладовая | pantry; store-room |
| клас *м.* | класс | class; form; classroom |
| кла*сці | класть | put; place |
| кло*пат *м.* | забота | care; anxiety, trouble |
| кні*га *ж.* | книга | book |
| ко*лішні | прежний | previous, former |
| ко*жны | каждый | each, every |
| ко*ла *н.* | колесо | wheel |
| ко*лькі | сколько | how much?; how many?; how old?; how long? |
| конь *м.* | конь | horse; steed; knight; vaulting-horse |
| ко*стка *ж.* | кость | bone; die |
| кот *м.* | кот | cat |
| коўдра *ж.* | одеяло | blanket |
| ко*шка *ж.* | кошка | cat |
| красаві*к *м.* | апрель | April |
| кроп *м.* | укроп | dill, fennel |
| кру*глы | круглый | round |
| крывы* | кривой | crooked, curved |
| крыло* *н.* | крыло | wing |
| крышта*ль *м.* | хрусталь | cut glass, crystal |
| крэ*сла *н.* | стул | chair |
| культу*ра *ж.* | культура | culture |
| купа*льнік *м.* | купальник | bathing suit |
| купа*цца | купаться | bathe |
| купля*ць | покупать | buy, purchase |
| купэ* *н.* | купе | compartment |
| кураня* *н.* | цыплёнок | chicken |
| куро*рт *м.* | курорт | health resort |
| ку*рыца *ж.* | курица | hen; fowl; chicken |
| кут *м.* | угол; уголок | corner; angle |
| ку*хня *ж.* | кухня | kitchen; cookery |
| кучара*вы | курчавый, кудрявый | curly; curly-headed |
| ла*дан *м.* | ладан | incense |
| ла*дны | приличный, довольно большой, довольно хороший | decent; considerable; rather good |
| ла*зіць | лазить | climb |
| ласка*вы | ласковый | tender, affectionate |
| ла*ўка *ж.* | скамейка | bench |
| леге*нда *ж.* | легенда | legend |

| | | |
|---|---|---|
| ле*гчы | лечь | lie down |
| ле*свіца *ж.* | лестница | staircase; stairs; ladder |
| ле*та *н.* | лето | summer |
| лі*нія *ж.* | линия | line |
| лі*па *ж.* | липа | lime-tree |
| лі*пень *м.* | июль | July |
| лістапа*д *м.* | ноябрь | November |
| літарату*ра *ж.* | литература | literature |
| лічы*ць | считать | consider; count |
| лоб *м.* | лоб | forehead |
| ло*жак *м.* | кровать | bed |
| ло*каць *м.* | локоть | elbow |
| луг *м.* | луг | meadow |
| лы*сы | лысый | bald |
| лы*тка *ж.* | голень | calf |
| любі*ць | любить | love; like, be fond (of) |
| лю*стра *ж.* | люстра | lustre, chandelier |
| люстэ*рка *н.* | зеркало | looking-glass; mirror |
| лю*ты *м.* | февраль | February |
| ляжа*ць | лежать | lie; be situated |
| ля*мпа *ж.* | лампа | lamp |
| ляні*вы | ленивый | lazy |
| ляце*ць | лететь | fly |
| магістра*ль *ж.* | магистраль | highway |
| магнітафо*н *м.* | магнитофон | tape-recorder |
| май *м.* | май | May |
| мак *м.* | мак | poppy |
| макаро*ны | макароны | macaroni |
| малаво*пытны | малоопытный | of small experienced |
| маладасве*дчаны | малосведущий | empty |
| маладзі*к *м.* | молодой месяц, новолуние | new moon |
| малады* | молодой | young; new |
| мало*дшы | младший | younger; junior |
| малы* | маленький, малый | little, small |
| мане*та *ж.* | монета | coin |
| ма*рка *ж.* | марка | (postage-)stamp |
| марко*ціцца | грустить | be melancholy |
| маро*жанае *н.* | мороженое | ice-cream |
| маршру*т *м.* | маршрут | route, itinerary |
| маста*цтва *н.* | искусство | art; skill |
| матацы*кл *м.* | мотоцикл | motor cycle |
| матра*ц *м.* | матрас | mattress |
| мату*ля *ж.* | мамочка | mother |
| маўклі*вы | молчаливый | taciturn |
| ма*ці *ж.* | мать | mother |
| машы*на *ж.* | машина | (motor-)car, auto |
| машыні*ст *м.* | машинист | engine-driver |
| маянэ*з *м.* | майонез | mayonnaise |
| мёд *м.* | мёд | honey |
| мемарыя*льны | мемориальный | memorial |

| | | |
|---|---|---|
| ме*сца *н.* | место | place |
| металі*чны | металлический | metallic |
| метро* *н.* | метро | the underground, Metro |
| мець | иметь | have; possess; mean |
| мікраараё*н *м.* | микрорайон | microregion, district |
| мі*ксер *м.* | миксер | mixer |
| мі*лы | милый | nice, sweet; dear |
| міна*ць | миновать; обходить; проходить | pass, be over; leave behind; escape, elude |
| міну*лы | прошедший | past; last |
| мітуслівы | суетливый | fussy |
| мітусня* *ж.* | суета | fuss |
| міфі*чны | мифический | mythical |
| мо*ва *ж.* | язык | language |
| мо*ра *н.* | море | sea |
| мо*рква *ж.* | морковь | carrot |
| мох *м.* | мох | moss |
| мужчы*на *м.* | мужчина | man, male |
| мужчы*нскі | мужской | masculine; male |
| музе*й *м.* | музей | museum |
| музыка*нт *м.* | музыкант | musician |
| мы*тнік *м.* | таможенник | custom-house specialist |
| мы*тня *ж.* | таможня | custom-house |
| мы*цца | мыться | wash (oneself) |
| мыць | мыть | wash |
| мэ*бля *ж.* | мебель | furniture |
| мясі*ць | замешивать | knead |
| мяшо*к *м.* | мешок | bag; sack; kit-bag |
| набыва*ць | приобретать | acquire |
| навако*лле *н.* | окрестности | environs |
| наве*дваць | посещать, навещать | visit; call on |
| нага*дваць | напоминать | remind (*of*) |
| надво*р′е *н.* | погода | weather |
| надзё*нны | злободневный | present-day |
| надзе*я *ж.* | надежда | hope |
| надзіма*ны | надувной | inflate |
| на*зва | название | name; title |
| называ*ць | называть | call, name |
| найма*ць | нанимать | rent; hire; engage |
| накірава*ць | направить | direct |
| накіро*ўвацца | направляться | go, make (*for*) |
| наме*рыцца | собраться | be going to; gather; prepare (*for*) |
| наро*д *м.* | народ | people |
| нарэ*шце | наконец | at last; finally; lastly; after all |
| натура*льны | естественный | natural |
| неаха*йнасць | неаккуратность | carelessness |
| невядо*мы | неизвестный | unknown |
| невялі*кі | небольшой | small; short |
| незале*жнасць *ж.* | независимость | independence |
| незнаё*мы | незнакомый | unknown |

| | | |
|---|---|---|
| незразуме*лы | непонятный | incomprehensible; strange |
| не*калькі | несколько | several, a few |
| некато*ры | некоторый | some |
| непрыго*жы | некрасивый | plain |
| непрые*мны | неприятный | unpleasant |
| неўміру*часць *ж.* | бессмертие | immortality |
| нідзе* | нигде | nowhere |
| но*вы | новый | new |
| нос *м.* | нос | nose |
| ноч *ж.* | ночь | night |
| ну*мар *м.* | номер | number |
| няда*ўна | недавно | lately, recently, not long ago |
| нядба*йны | нерадивый, небрежный | negligent, indolent |
| нядзе*ля *ж.* | воскресенье | Sunday |
| нязгра*бны | нескладный, неуклюжий | clumsy, awkward |
| няма* | нет | there is (are) no, there is none |
| няўло*ўны | неуловимый | elusive; difficult to catch; subtle |
| нячы*сцік *м.* | дьявол, бес | devil |
| няшча*сце *н.* | несчастье | misfortune; disaster |
| няшчо*дры | нещедрый | miserly, stingy |
| няшчы*ры | неискренний | insincere |
| о*пера *ж.* | опера | opera |
| пабудава*ць | построить | build, construct |
| паве*р'е *н.* | поверье | popular belief |
| паве*рх *м.* | этаж | floor; storey |
| паву*к *м.* | паук | spider |
| падаба*цца | нравиться | please |
| падаро*жжа *н.* | путешествие | journey; voyage |
| падаро*жнік *м.* | попутчик | fellow-traveller |
| падарожнічаць | путешествовать | travel |
| падару*нак *м.* | подарок | present, gift |
| падары*ць | подарить | give as a present; present smb. (*with*) |
| пада*цца | податься; почудиться | draw; seem |
| пад'е*зд *м.* | подъезд | porch, entrance |
| падло*га *ж.* | пол | floor |
| падму*рак *м.* | фундамент | foundation |
| падніма*цца | подниматься | rise; climb; go upstairs; revolt |
| паду*шка *ж.* | подушка | pillow; cushion |
| пазна*ць | узнать | earn; find out; recognize |
| пазно*гаць *м.* | ноготь | nail |
| паказа*ць | показать | show; bear witness; testify |
| пакале*нне *н.* | поколение | generation |
| пакла*сці | положить | put; place |
| пако*й *м.* | комната | room |
| пако*й *(ва*нны) м.* | комната *(ванная)* | bath-room |
| пала*тка *ж.* | палатка | tent |
| палі*ца *ж.* | полка | shelf |
| палу*дзень *м.* | полдень | noon |
| памярко*ўны | рассудительный | reasonable |

| | | |
|---|---|---|
| панядзе*лак *м.* | понедельник | Monday |
| паме*рці | умереть | die |
| памідо*р *м.* | помидор | tomato |
| пара*да *ж.* | совет | advise; counsel |
| пара*іцца | посоветоваться | take counsel; talk smb. over |
| парася* (-ё*) *н.* | поросёнок | sucking-pig |
| паро*г *м.* | порог | threshold |
| парк *м.* | парк | park |
| пасава*ць | подходить, подобать, соответствовать | fit; suit; do (*for*) |
| паса*дка *ж.* | посадка | landing |
| пасажы*р *м.* | пассажир | passenger |
| пасве*дчанне *н.* | свидетельство, удостоверение | certificate |
| пасмяро*тны | посмертный | posthumous |
| пасо*льства *н.* | посольство | embassy |
| пасы*лка *ж.* | посылка | parcel |
| патае*мна | тайно | secretly |
| патана*ць | тонуть, утопать | be drowned; sink, go down |
| паўгадзі*ны | полчаса | half an hour |
| пача*так *м.* | начало | beginning; basis, principle; origin, source |
| пача*ць | начать | begin, start |
| пачуццё* *н.* | чувство | sense; feeling |
| па*шпарт *м.* | паспорт | passport |
| пашто*ўка *ж.* | открытка | postcard |
| пашы*ць | сшить | make; have a dress made |
| паэ*зія *ж.* | поэзия | poem |
| паэ*т *м.* | поэт | poet |
| пе*вень *м.* | петух | cock |
| перакла*д *м.* | перевод | translation; interpretation |
| перамагчы* | победить | conquer; win the victory (*over*); overcome |
| перамо*жны | победный | triumphal |
| пераса*дка *ж.* | пересадка | change, transfer |
| перасма*жаны | пережаренный | overdone, burnt |
| перасяле*нне *н.* | переселение | migration; move |
| перахо*д *м.* | переход | passage; conversion |
| перахо*дзіць | переходить | cross, get over; pass (to) |
| пе*рац *м.* | перец | pepper |
| пе*р'е *н.* | перья | feathers |
| перо*н *м.* | перрон | platform |
| печ *ж.* | печь | stove; oven |
| піло*т *м.* | пилот | pilot |
| піса*ць | писать | write |
| пісьмо* *н.* | письмо | letter |
| піць | пить | drink |
| піяні*на *н.* | пианино | piano |
| пла*ваць | плавать | swim |
| платфо*рма *ж.* | платформа | platform |

| | | |
|---|---|---|
| пле*сці | плести | braid; weave; spin; net |
| пліта* *ж.* | плита | plate; slab; flagstone |
| пло*шча *ж.* | площадь | square |
| пляж *м.* | пляж | beach |
| пляме*ннік *м.* | племянник | nephew |
| пляме*нніца *ж.* | племянница | niece |
| плячо* *н.* | плечо | shoulder |
| плыт *м.* | плот | raft, float |
| по*бач | рядом | beside; next (*to*); side by side, close by |
| по*зірк *м.* | взгляд | look; gaze, glare |
| по*куць *м.* | красный угол | corner |
| по*ле *н.* | поле | field; ground; margin |
| по*ліўка *ж.* | похлёбка | skilly |
| по*мнік *м.* | памятник | monument; memorial |
| по*ўдзень *м.* | юг | south |
| по*ўнач *ж.* | север | north |
| правадні*к *м.* | проводник | guard, conductor |
| праваcла*ўны | православный | Orthodox |
| пра*дзед *м.* | прадед | great-grandfather |
| прайграва*льнік *м.* | проигрыватель | record player |
| прапано*ва *ж.* | предложение | offer, suggestion; motion; proposal; supply |
| праспе*кт *м.* | проспект | avenue |
| пра*ўнук *м.* | правнук | great-grandson |
| працо*ўны | трудовой | working; labour |
| праця*гваць | продолжать | continue, go on |
| прыбыццё* *н.* | прибытие | arrival |
| прыва*біць | привлечь | attract |
| прыва*бны | привлекательный | attractive |
| пры*гарад *м.* | пригород | suburb |
| прыго*жы | красивый | beautiful, handsome; fine; pretty |
| прые*мна | приятно | pleasantly, agreeably; it is a pleasant (agreeable) |
| прые*мны | приятный | agreeable, pleasant |
| прызямле*нне *н.* | приземление | landing |
| прызямля*цца | приземляться | land |
| прыкме*та *ж.* | примета | sign, token |
| прыпы*нак *м.* | остановка | stop, station |
| прыпы*нак *(канцавы) м.* | *(конечная)* остановка | terminus |
| прыса*ды | аллеи | avenues; alleys |
| прыўзня*ць | приподнять | raise |
| прыя*знасць *ж.* | приязненность, расположение | inclination |
| прэсты*жны | престижный | prestige |
| псеўдані*м *м.* | псевдоним | pseudonym; pen-name |
| пту*шка *ж.* | птица | bird; poultry |
| пурпуро*вы | пурпуровый | purple |
| пуцё*ўка *ж.* | путёвка | permit; accommodation card |

| | | |
|---|---|---|
| пуць *м.* | путь | road, way |
| пшані*чны | пшеничный | wheaten |
| пыта*цца | спрашивать | ask |
| пэ*ўны | определённый | definite; certain |
| пясо*к *м.* | песок | sand |
| пята* *ж.* | пятка | heel |
| пя*тніца *ж.* | пятница | Friday |
| пячы* | печь | bake; scorch, parch |
| пяшчо*та *ж.* | нежность | tenderness; delicacy |
| рабі*ць | делать | do; make |
| рабо*та *ж.* | работа | work |
| рабры*на *ж.* | ребро | rib |
| ра*дасць | радость | joy, gladness |
| радзі*ма *ж.* | родина | native land, mother country, motherland; homeland |
| раё*н *м.* | район | region; district; area |
| развaжа*ць | рассуждать | reason; discuss |
| развіта*цца | попрощаться | say good-bye (*to*), take leave (*of*) |
| размяшча*цца | размещаться | be accommodated, be placed; take seats |
| размяшча*ць | размещать | place, accommodate, quarter |
| разу*мны | умный | clever |
| разьба* *ж.* | резьба | carving, fretwork |
| раслі*на *ж.* | растение | plant |
| расчырване*цца | раскраснеться | get red in the face; become flushed |
| ра*іць | советовать | advise |
| ра*ніца *ж.* | утро | morning |
| раскі*нуцца | раскинуться | lie, spread |
| расці* | расти | grow; increase; grow up |
| ро*дны | родной | kindred, own; native |
| ру*жа *ж.* | роза | rose |
| ружо*вы | розовый | pink, rosy |
| рука* *ж.* | рука | hand; arm |
| рукза*к *м.* | рюкзак | rucksack, knapsack |
| ру*сы | русый | blond, fair |
| ру*хацца | двигаться | move, advance; set out |
| ручні*к *м.* | полотенце | towel |
| ры*ба *ж.* | рыба | fish |
| рыдлё*ўка *ж.* | лопата | spade; shovel |
| рыс *м.* | рис | rice |
| рытм *м.* | ритм | rhythm |
| рытуа*л *м.* | ритуал | rite, ceremony |
| рыхтава*ць | готовить | prepare, make ready; cook |
| рэгістрату*ра *ж.* | регистратура | registry |
| рэгістра*цыя *ж.* | регистрация | registration |
| рэжысё*р *м.* | режиссёр | producer |
| рэ*йка *ж.* | рельс | rail |
| рэйс *м.* | рейс | trip, voyage |
| рэлігі*йны | религиозный | religious |
| рэ*па *ж.* | репа | turnip |

| | | |
|---|---|---|
| саба*ка *м.* | собака | dog; hound |
| сад *м.* | сад | garden |
| сакаві*к *м.* | март | March |
| саламя*ны | соломенный | straw |
| сала*та *ж.* | салат | lettuce |
| сало*дкі | сладкий | sweet |
| сало*ма *ж.* | солома | straw |
| самалё*т *м.* | самолёт | aircraft, aeroplane, air liner |
| сапра*ўдны | настоящий | genuine, real; regular |
| сардэ*чнасць *ж.* | сердечность | warmth, heartiness |
| све*тла | светло | it is light |
| све*тлы | светлый | light; bright; clear; luminous |
| свая*к *м.* | родственник | relation, relative; kinsman |
| све*жы | свежий | fresh; latest |
| све*чка *ж.* | свечка | candle |
| свіння* *ж.* | свинья | pig; hog |
| свя*та *н.* | праздник | holiday |
| свята*р *м.* | священник | priest |
| святкава*ць | праздновать | celebrate |
| святкава*нне *н.* | празднование | celebration |
| святлафо*р *м.* | светофор | traffic lights; light signal |
| се*кцыя *ж.* | секция | section |
| селяні*н *м.* | крестьянин | peasant |
| сентымента*льны | сентиментальный | sentimental |
| серада* *ж.* | среда | Wednesday |
| се*яць | сеять | sow, drill |
| сё*ння | сегодня | today |
| сімвалізава*ць | символизировать | symbolize |
| сі*ні | синий | blue |
| сказ *м.* | предложение | sentence |
| сква*пны | алчный, жадный | greedy (*of, for*) |
| сквер *м.* | сквер | public garden |
| ске*птык *м.* | скептик | sceptic |
| скрыжава*нне *н.* | перекрёсток | cross-road |
| скульпту*ра *ж.* | скульптура | sculpture |
| славу*ты | знаменитый | famous |
| слі*ва *ж.* | слива | plum, plum-tree |
| сма*жыць | жарить | fry; roast |
| сма*чны | вкусный | good; tasty, delicious; nice |
| сме*ласць *ж.* | смелость | courage, boldness |
| снег *м.* | снег | snow |
| сне*даць | завтракать | have breakfast (lunch) |
| сне*жань *м.* | декабрь | December |
| Снягу*рка *ж.* | Снегурочка | Snow-Maiden |
| соль *ж.* | соль | salt |
| спадзява*нне *н.* | надежда | hope |
| спадзява*цца | надеяться | hope (*for*), rely (*on*) |
| спазня*цца | опаздывать | be late (*for*) |
| спако*йны | спокойный | quiet, calm |
| спа*льны | спальный | bedding |

| | | |
|---|---|---|
| спа*льня *ж.* | спальня | bedroom |
| спатка*нне *н.* | встреча, свидание | meeting; reception |
| спекта*кль *м.* | спектакль | performance, show; matinee |
| спе*ў *м.* | пение | singing |
| спра*ва | дело | affair, business; act, deed; cause; file |
| спра*ва | справа | to the right (*of*) |
| справядлі*вы | справедливый | just, fair |
| спраўля*ць | отмечать | celebrate |
| спыня*цца | останавливаться | stop (at), pull up (at) |
| спяко*та *ж.* | жара | heat, hot weather |
| спяша*цца | спешить | hurry, make haste; be fast |
| ста*віць | ставить | put, place, set; stage, produce |
| сталі*ца *ж.* | столица | capital |
| ста*нцыя *ж.* | станция | station |
| старажы*тны | древний | ancient |
| стара*ннасць *ж.* | старательность, прилежание | diligence |
| стара*нны | старательный, прилежный | diligent |
| стары* | старый | old |
| старэ*йшы | старший | oldest; eldest; senior |
| стая*нка *ж.* | стоянка | parking |
| стая*ць | стоять | stand; stop; be situated |
| стол *м.* | стол | table |
| столь *ж.* | потолок | ceiling |
| стра*ва *ж.* | кушанье, блюдо | dish |
| страха* *ж.* | крыша | roof |
| стро*йны | стройный | harmonious; slender, slim |
| стрые*чны | двоюродный | cousin |
| сту*дзень *м.* | январь | January |
| ступня* *ж.* | ступня | foot |
| сумава*ць | тосковать | be melancholy; feel lonely |
| сурвэ*тка *ж.* | скатерть | table-cloth |
| суседзе*д *м.* | сосед | neighbour |
| сустрака*ць | встречать | meet; receive; welcome |
| сустрэ*ча *ж.* | встреча | meeting; reception |
| суча*сны | современный | modern |
| схава*ць | спрятать | hide; put away |
| сцюардэ*са *ж.* | стюардесса | stewardess |
| сця*міць | сообразить | understand, grasp; consider |
| сцяна* *ж.* | стена | wall |
| сын *м.* | сын | son |
| ся*бар (ся*бра) *м.* | друг | friend |
| сябро*ўка *ж.* | подруга | friend; playmate |
| сябро*ўства *н.* | дружба | friendship |
| сядзі*ба *ж.* | усадьба | farmstead |
| сям'я* *ж.* | семья | family |
| сярэ*дні | средний | middle; average; neuter |
| табурэ*тка *ж.* | табуретка | stool |
| такі* | такой | such |
| таксі*ст *м.* | таксист | taxi-driver |

| | | |
|---|---|---|
| тале*рка *ж.* | тарелка | plate |
| тало*н *м.* | талон | coupon |
| там | там | there |
| та*та *м.* | папа | papa; dad(dy) |
| той | тот | that; the other; the right |
| то*нкі | тонкий | thin; slim; delicate; keen; clever |
| тост *м.* | тост | toast |
| то*ўсты | толстый | thick; stout; fat |
| традыцы*йны | традиционный | traditional |
| трады*цыя *ж.* | традиция | tradition |
| трале*йбус *м.* | троллейбус | trolley-bus |
| трамва*й *м.* | трамвай | tramway; tram |
| тра*нспарт *м.* | транспорт | transport |
| трап *м.* | трап | ladder |
| тратуа*р *м.* | тротуар | pavement; sidewalk |
| тро*хі | немного | some, few, a little; somewhat, slightly |
| туале*т *м.* | туалет | dress; lavatory |
| туры*ст *м.* | турист | tourist |
| тут | тут | here; on the spot |
| тушы*ць | тушить | stew |
| ты*дзень *м.* | неделя | week |
| тыпо*вы | типичный | typical |
| тэа*тр *м.* | театр | theatre |
| тэлеба*чанне *н.* | телевидение | television, TV |
| тэлеві*зар *м.* | телевизор | (television) set, TV set |
| тэлегра*ма *ж.* | телеграмма | telegram; wire; express message |
| тэлефо*н *м.* | телефон | telephone |
| ува*жлівы | внимательный | attentive; kind, considerate |
| увахо*д *м.* | вход | entrance |
| увахо*дзіны | новоселье | house-warming |
| удзе*льнік *м.* | участник | participant, participator |
| ужо* | уже | already |
| узва*жыць | взвесить | weigh |
| уздо*ўж | вдоль | along |
| узлё*т *м.* | взлёт | take-off |
| узлята*ць | взлетать | fly up; take-off |
| узніка*ць | возникать | arise |
| узо*р *м.* | образец | example, model; specimen, sample |
| узро*ст *м.* | возраст | age |
| узя*ць | взять | take |
| умяша*цца | вмешаться | interfere, intervene |
| упа*ртасць *ж.* | упорство; упрямство | persistence; obstinacy, stubbornness |
| упершыню* | впервые | for the first time, first |
| упо*перак | поперёк | across |
| упрыго*жыць | украсить | adorn; decorate |
| ура*жанне | впечатление | impression |
| урачы*стасці | торжества | celebrations |
| уро*к *м.* | урок | lesson |
| усміха*цца | улыбаться | smile |

| | | |
|---|---|---|
| успрыма*ць | воспринимать | perceive; assimilate |
| усхо*д *м.* | восток | east, orient |
| уту*льны | уютный | cosily, comfortably |
| фанта*н *м.* | фонтан | fountain |
| фа*рба *ж.* | краска | paint; dye; colour |
| фаршырава*ць | фаршировать | stuff |
| фіра*нка *ж.* | занавеска | curtain |
| фія*лка *ж.* | фиалка | violet |
| хадзі*ць | ходить | go, walk; go to see, visit |
| халадзі*льнік *м.* | холодильник | refrigerator; ice-box |
| халасця*к *м.* | холостяк | bachelor |
| хало*днае *н.* | холодное | jelly |
| хало*дны | холодный | cold |
| хапа*ць | хватать | suffice, be sufficient |
| харчава*цца | питаться | feed (*on*), live (*on*) |
| ха*тні | домашний | domestic; house, home |
| хаце*ць | хотеть, желать | want; wish |
| хваро*ба *ж.* | болезнь | illness |
| хлеў *м.* | хлев | cattle-shed; sheep-cote; pigsty |
| ху*ткасць *ж.* | скорость | speed; rate |
| цагля*ны | кирпичный | brick |
| цень *м.* | тень | shade; shadow |
| цё*мна | темно | it is dark |
| цё*плы | тёплый | warm; cordial |
| цё*тка *ж.* | тётя | aunt |
| цвісці* | цвести | bloom, flower, blossom |
| ціка*вы | интересный | interesting; good-looking, attractive |
| ці*ха | тихо | quietly; calmly; slowly |
| цыбу*ля *ж.* | лук | onion; spring onions |
| цэ*гла *ж.* | кирпич | brick |
| цэ*нтр *м.* | центр | centre |
| цэнтра*льны | центральный | central |
| цюль *м.* | тюль | tulle |
| цюльпа*н *м.* | тюльпан | tulip |
| цягні*к *м.* | поезд | train |
| цяжа*рнасць *ж.* | беременность | pregnancy |
| цяля* *н.* | телёнок | calf |
| цяплі*ца *ж.* | теплица | hothouse |
| цясля*р *м.* | плотник | carpenter |
| чай *м.* | чай | tea |
| чалаве*к *м.* | человек | man |
| чалаве*цтва *н.* | человечество | humanity, mankind |
| чарада* *ж.* | стая | flock; shoal |
| чарапі*ца *ж.* | черепица | tile |
| чарапі*чны | черепичный | tiled |
| чаро*ўны | прекрасный, чудесный чарующий | wonderful, marvellous |
| час *м.* | время | time |
| часо*піс *м.* | журнал | journal, magazine |
| ча*ста | часто | often, frequently |

| | | |
|---|---|---|
| ча*стка *ж.* | часть | part; share |
| чацве*р *м.* | четверг | Thursday |
| чо*вен *м.* | чёлн | boat |
| чо*рны | чёрный | black |
| чужы* | чужой | smb. else′s, another′s; strange |
| чу*ць | слышать | hear |
| чыгу*нка *ж.* | железная дорога | railway |
| чыгуно*к *м.* | котелок, горшочек | pot, kettle |
| чырво*ны | красный | red |
| чысло* *н.* | число | number; quantity; date |
| чэ*рвень *м.* | июнь | June |
| шарсцяны* | шерстяной | woollen |
| ша*фа *ж.* | шкаф | cupboard; dresser; bookcase |
| шафё*р *м.* | шофёр | driver |
| шаша* *ж.* | шоссе | highway; motor road |
| шкло *н.* | стекло | glass |
| шкляны* | стеклянный | glass |
| шко*ла *ж.* | школа | school |
| шпа*ркі | быстрый | quick, rapid, fast; swift; prompt |
| штове*чар | каждый вечер, ежевечерне | every evening |
| штогадзі*ны | каждый час, ежечасно | hourly |
| штогадо*вы | ежегодный | annual, yearly |
| штодзе*нь | каждый день, ежедневно | every day, daily |
| штора*ніцы | каждое утро | every morning |
| штохвілі*ны | каждую минуту, ежеминутно | every minute |
| штрафава*ць | штрафовать | fine |
| шука*ць | искать | look (*for*), search |
| шу*мны | шумный | noisy |
| шчака* *ж.* | щека | cheek |
| шчаня* *н.* | щенок | puppy |
| шчаслі*вы | счастливый | happy; fortunate; lucky |
| шчо*драсць | щедрость | generosity |
| шчо*дры | щедрый | generous, open-handed |
| шчупа*к *м.* | щука | pike |
| шчы*льна | тесно | narrowly; tight; closely |
| шчы*ра | искренно | sincerely |
| шчырава*ць | усердствовать | show zeal |
| шчы*расць | искренность | sincerity |
| шчы*ры | искренний | sincere |
| шыро*кі | широкий | broad, wide |
| шэ*ры | серый | grey |
| экскурсаво*д *м.* | экскурсовод | guide |
| экску*рсія *ж.* | экскурсия | excursion |
| экспана*т *м.* | экспонат | exhibit |
| экстравага*нтны | экстравагантный | extravagant |
| элега*нтны | элегантный | elegant |
| электры*чка *ж.* | электричка | electric(al) locomotive |
| электры*чны | электрический | electric(al) |
| эпісталя*рны | эпистолярный | epistolary |

| | | |
|---|---|---|
| эскала*тар *м.* | эскалатор | escalator, moving staircase |
| юна*цкі | юношеский | youthful |
| ю*шка *ж.* | ушица, соус | fish-soup, sauce; gravy |
| я*блык *м.* | яблоко | apple |
| я*блыня *ж.* | яблоня | apple-tree |
| яда* *ж.* | еда | food; meal |
| язы*к *м.* | язык | tongue |
| я*касць *ж.* | качество | quality |
| яшчэ* | ещё | still; some more |